
ПАМЯТЬ



ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

РЭЧЫЦКІ РАЁН

У 2-х КНІГАХ

Кніга 2

МІНСК "БЕЛАРУСЬ" 1998

УДК 947.62
ББК 63.3(4Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Э. Н. ГНЕЎКА, Т. І. ЛІТВІНАВА, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ, П. П. РАБЯНОК

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

Т. І. ЛІТВІНАВА (старшыня камісіі), В. М. КЛЕЙМАН (нам. старшыні камісіі),
У. М. АНОХІН, А. М. БАГАЦКАЯ, В. С. БЫШЫК, І. А. БЯЛЯЕЎ, М. М. ВІНІЦКІ,
Л. А. ДВОРНІК, М. М. ЗАРАЗАКА, У. М. ЗАРЭЦКІ, Т. Ф. ЕЛІСЕЕВА,
А. С. КРАЎЧАНКА, У. Л. КУНЦЭВІЧ, Н. І. МІХАЛЕЎСКАЯ,
П. Н. ПАЎЛЯНОК, П. П. РАБЯНОК, С. П. СМОЛЬСКІ,
І. Г. СЯРГЕЕЎ, І. Ф. ТАЧЫЛКІН, А. В. ЧУРЫЛАЎ, М. І. ШАРАМЕТ, І. А. ШАФІР,
Р. К. ШПАКАЎ, Г. П. ШЫЛЯНОК, У. І. ШЫРОКІ, М. І. ЯНКОВІЧ

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК «ПАМЯЦІ»
ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

А. Л. Петрашкевіч (кіраўнік цэнтра), У. І. Лемяшонак (галоўны рэдактар),
М. З. Башлакоў (галоўны метадыст).

Рэдактары: В. Ц. ВОЛЬСКІ, Э. Н. ГНЕЎКА (вядучы),
Г. Б. КРАСОЎСКАЯ, В. П. СОБАЛЕВА

Укладальнік П. П. РАБЯНОК

Мастак Э. Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В. А. РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-01-0162-8

© Выдавецтва «Беларусь», 1998



Курган Славы ў в. Глыбаў

1943 г., 10 лістапада — 30 лістапада

Гомельска-Рэчыцкая наступальная аперацыя.

Брацкія магілы ў гарадскім скверы

1943 г., ліста-
пад — 1951 г.

Аднаўленчы перыяд.

Гарвыканкам (былая жаночая гімназія Гаўрылавай)

1965 г.,
29 красавіка

Рэчыцкая нафта падключана да нафтаправо
да «Дружба».

Народны хор в. Азершчына

1975 г.

У лік дзеючых прадпрыемстваў увайшоў Рэчыцкі піўзавод.

Нафтавая свідравіна

1976 г., люты — Пачаў дзейнічаць Рэчыцкі газаперапрацоўчы завод.

Чарнобыльскі пасёлак, в. Дварец

1970—1977 гг. Перыяд шырокага будаўніцтва. Узведзены памяшканні СШ № 9 і СШ № 2, рэстарана «Палессе», магазіна «Славуціч» і г. д.

Раённая бібліятэка ў Рэчыцы

1984 г.,
31 студзеня

Пачаў функцыяніраваць завод «Рытм».

Дом быта

1986 г. Узведзены Дом культуры «Нафтавік».
1987 г. Завершана будаўніцтва цэнтральнай раённай бальніцы.

Урок матэматыкі ў сярэдняй школе № 6

1995 г.,
верасень

Была асвечана капліца ў гонар святой зямлі беларускай Ефрасінні Полацкай.

Плавальны басейн

1997 г., ліпень

У Рэчыцы адкрыты помнік М. В. Доўнар-Запольскаму, прайшла міжнародная навуковая канферэнцыя «Жыццё і дзейнасць М. В. Доўнар-Запольскага».

У ПОЛЫМІ ВАЙНЫ

І вызвалення дзень прыйшоў

У другой палове кастрычніка 1943 года войскі левага крыла Беларускага фронту авалодалі плацдармам на левым беразе Дняпра ў раёне Лоева, тым самым стварылі спрыяльныя ўмовы для ажыццяўлення Гомельска-Рэчыцкай аперацыі. Яе задача заключалася ў разгроме групоўкі ворага, вызваленні міжрэчча Сожа і Дняпра, заняцці зручных пазіцый на правым беразе Дняпра.

...Апоўдні 10 лістапада 1943 года на сутыку Лоеўскага і Рэчыцкага раёнаў цішыню разарвалі сотні гармат і рэактыўных мінамётаў. Праляцелі, кіруючы на захад, знішчальнікі і бамбардзіроўшчыкі 16-ай паветранай арміі генерал-лейтэнанта С. І. Рудэнкі.

Артпадрыхтоўка працягвалася амаль гадзіну. З пераносам агню ў глыбіню варожай абароны ў прарыў пайшлі брыгады 1-га гвардзейскага Данскога танкавага корпуса, 23-яя брыгада 9-га танкавага корпуса. Следам рушылі падраздзяленні 2-га і 7-га гвардзейскіх артылерыйскіх корпусаў. І толькі потым — стралковыя палкі і батальёны.

17-ая гвардзейская танкавая і 1-ая мотастралковая брыгада 1-га гвардзейскага Данскога танкавага корпуса на працягу першага дня наступлення прасунуліся, пераадольваючы шалёнае супраціўленне 383-яй нямецкай пяхотнай дывізіі, больш чым на 6 кіламетраў і падышлі да так званых «надзвінскіх пазіцый».

Узяць з ходу названыя вышэй варожыя ўмацаванні не ўдалося. І тады цяжкія самаходна-артылерыйскія ўстаноўкі нанеслі па агнявых сродках праціўніка ўдар.

За першы дзень баёў на рэчыцкім напрамку фашысты страцілі больш як 3 тысячы салдат і афіцэраў. Было захоплена 49 гармат, 13 мінамётаў, 4 танкі і шмат іншай баявой тэхнікі і рыштунку.

У першы дзень наступлення былі здзейснены дзесяткі гераічных подзвігаў.

У раёне вёскі Дабраволец 17-ая танкавая брыгада палкоўніка Б. В. Шульгіна сутыкнулася з варожай танкавай групай з 25 браніраваных машын. Фашысцкіх танкістаў падтрымлівалі 2 батальёны пяхоты. Ацаніўшы становішча, Б. В. Шульгін прыняў рашэнне вывесці ўперад батарэю цяжкіх самаходна-артылерыйскіх установак гвардыі лейтэнанта І. В. В'югава. У баі, які распачаўся неўзабаве, батарэйцы падпалілі каля дзесятка варожых машын, рассеялі пяхоту. Пяць танкаў знішчыў асабіста І. В. В'югаў.

Поспех батарэйцаў даў магчымасць танкаваму батальёну гвардыі капітана Н. В. Іскры ўварвацца ў населены пункт Дабраволец і вызваліць яго.

І. В. В'югаў быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза.

Камандзір стралковай роты 37-ай гвардзейскай стралковай дывізіі лейтэнант Садавікоў з кулямёта знішчыў разлік варожай гарматы, а потым, развярнуўшы яе, ударыў па фашыстах іхнімі ж снарадамі.

У крытычны момант бою, калі гітлераўцы наблізіліся да бліндажа, дзе знаходзіліся цяжкапараненыя байцы, яфрэйтар Мікалай Кладаў падарваў сябе і некалькі фашыстаў апошняй супрацьтанкавай гранатай.

10 лістапада, у першы дзень Гомельска-Рэчыцкай наступальнай аперацыі, падпольны абкам партыі і штаб Гомельскага злучэння партызанскіх атрадаў атрымалі радыёграму сакратара ЦК КП(б)Б, начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху П. К. Панамарэнкі. У радыёграме ўказвалася: абста-



Артылерысты вядуць агонь па варожых пазіцыях у раёне Рэчыцы

ноўка на фронце патрабуе тэрміновага вываду са строю чыгуначных дарог Гомель — Жлобін — Магілёў, Гомель — Калінкавічы, шашы Гомель — Калінкавічы. Ад камандавання злучэння патрабавалася распрацаваць план аперацый на чыгунцы і шашы.

За кожнай брыгадай былі замацаваны ўчасткі чыгункі з такім разлікам, каб там на працягу сутак ад кожнага атрада знаходзіліся не менш двух падрыўнікоў. Групы мелі задачні выкарыстоўваць кожную магчымасць для падрыву варожых эшалонаў і рэек.

Разам з тым рэчыцкая брыгада імя. К. Я. Варашылава накіравала на шашу Гомель — Калінкавічы некалькі спецыяльных груп з мэтай як мініравання дарогі, так і наладжвання засад.

...11 лістапада два палкі варожай пяхоты пры падтрымцы танкаў і артылерыі перайшлі ў контратаку, ставячы перад сабой мэту зноў узяць лінію абароны каля Надзвіна. Але фашыстаў сустрэлі танкісты 1-га Данскога танкавага корпуса, падраздзяленні 170-ай і 69-ай стралковых дывізій.

Вызначыўся разлік супрацьтанкавага ружжа ў саставе малодшага сяржанта К. А. Скобы і радавога П. А. Дзмітрычэнкі. Падбіўшы тры танкі, гвардзейцы затрымалі варожую атаку.

Жорсткія баі каля Надзвіна працягваліся да паловы дня 13 лістапада. У гэты ж дзень дывізіі 65-ай арміі і злучэнні 42-га стралковага корпуса 48-ай арміі авалодалі ўмацаванымі апорнымі пунктамі Холмеч, Дварэц, Іванаўка, Вазнясенск. 14-ая і 16-ая гвардзейскія кавалерыйскія дывізіі з баямі выйшлі праз Надзвін да вёсак Маладуша і Смагарын, маючы задачу перарэзаць дарогу Рэчыца — Хойнікі.

У раёне вёскі Андрэеўка 52-і кавалерыйскі полк 14-ай кавалерыйскай дывізіі фашысты сустрэлі знішчальным

Палкоўнік Б. В. Шульгін са сваім экіпажам

артылерыйска-мінамётным агнём. І тады ў бой уступіла палкавая батарэя 82-міліметровых мінамётаў. Наводчык мінамёта Атабай Аразназараў знішчыў разам з разлікамі два кулямёты праціўніка. Агнявую кулямётную кропку падавіў мінамётчык М. В. Мораў.

Пры падыходзе да вёскі Бярозаўка коннікі натрапілі на мінныя палі. Пад варожым агнём да размініравання прыступілі сапёры. Асабліва вызначыліся Н. І. Цырын і С. Ф. Сарычаў. Коннікі зноў рушылі ўперад. Яны занялі перакрыжаванне дарог на ўсход ад Андрэеўкі і замацаваліся там.

13 лістапада надзвычай цяжкія баі ішлі ў раёне вёсак Ганчароў Падзел, Грушаўка, Кузмінка, Асінаўка, Вадзяное.

14 лістапада танкісты генерала М. Ф. Панова і злучэнні 19-га стралковага корпуса генерала Д. Н. Самарскага (65-ая армія) авалодалі ўчасткамі шашы з Рэчыцы на поўдзень і паўднёвы захад, падышлі да чыгуначнай станцыі Дземяхі. У раёне вёскі Іванішча экіпаж старшага сяржанта П. В. Калеснікава знішчыў у танкавым баі тры варожыя машыны, супрацьтанкавую гармату і кулямётны разлік. Падраздзяленні 170-ай стралковай дывізіі выбілі гітлераўцаў з вёскі Свірыдавічы і бліжэйшых населеных пунктаў. Асабліва мужна паводзілі сябе ў баі камсорг Л. П. Сімкін, радавыя Багамолаў і Бліннікаў. На подступах да вёсак Бязуеў і Падроўнае два варожыя танкі падбілі сяржант І. В. Курыцын і радавы П. А. Галубенка. Яны былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У ходзе баёў 14 лістапада былі вызвалены вёскі Калочын, Іванішча, Вятхінь, Арол, Яноўка, Бярозаўка.

14 лістапада ў баі каля вёскі Кузмінка загінуў гвардыі старшы сяржант, памочнік камандзіра кулямётна-

Штурм варожых умацаванняў каля Надзвіна

га ўзвода 60-га гвардзейскага кавалерыйскага палка Тачмамед Ніязмамедаў, якому пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (15.1.1944).

У ноч з 14 на 15 лістапада сіламі 1-га Данскога танкавага корпуса і 19-га стралковага корпуса фашысты былі выбіты са станцыі Дземяхі. Тым самым была канчаткова перарэзана чыгуначная магістраль Гомель — Калінкавічы. Рэчыцкая групоўка праціўніка была ізалявана. А гэта азначала, што гітлераўцам адступаць няма куды, апроч як праз зону размяшчэння атрадаў Гомельскага партызанскага злучэння.

Улічваючы рэальную абстаноўку, камандуючы 65-ай арміі генерал П. І. Батаў прыняў рашэнне 15-ую і 16-ую гвардзейскія танкавыя брыгады 1-га Данскога танкавага корпуса, 37-ую гвардзейскую стралковую дывізію генерала Е. Г. Ушакова, а таксама 162-ую стралковую дывізію палкоўніка С. І. Чарняка, якія ўваходзілі ў састаў 19-га стралковага корпуса, павярнуць направа і авалодаць Рэчыцай. Гэты план знайшоў адабрэнне камандуючага Беларускім фронтам К. К. Ракасоўскага.

У ноч з 15 на 16 лістапада ў раёне вёскі Стара-Краснае партызаны брыгады імя К. Я. Варашылава і спецатрада «Дружба» сустрэліся з разведчыкамі Чырвонай Арміі. Праз некалькі гадзін каля вёскі Перавалока з разведчыкамі 69-ай стралковай дывізіі сустрэліся байцы партызанскай брыгады «Мсцівец». Яны перадалі армейскаму камандаванню даныя аб месцазнаходжанні варожых часцей, абарончых збудаванняў, выказалі жаданне ісці з падраздзяленнямі дывізіі ў якасці правадніковў. Дарэчы, двума днямі раней 17-ую танкавую брыгаду ад вёскі Малчаны да Коззя і Дземяхоў правяла Г. М. Бондар, партызанка брыгады «Мсцівец».

Да канца дня 16 лістапада танкавыя брыгады разам з падраздзяленнямі

19-га стралковага корпуса выйшлі да Дняпра на поўнач ад Рэчыцы.

Раніцай 17 лістапада пасля кароткай артылерыйскай падрыхтоўкі, у якой бралі ўдзел і славутыя рэактыўныя ўстаноўкі «кацюшы», танкавыя і стралковыя падраздзяленні рушылі на штурм Рэчыцы.

З паўночнага боку фашыстаў цяснілі часці 19-га стралковага корпуса 65-ай арміі, з захаду — 194-ая стралковая дывізія 48-ай арміі.

У другой палове дня да станцыі Рэчыца падышлі палкі і батальёны 170-ай стралковай дывізіі, якая незадоўга перад гэтым вызваліла вёскі Гарывада, Перасвятое, Рабусу і Барэц.

Лёс варожай групоўкі, якая знаходзілася ў Рэчыцы, быў фактычна вырашаны. Але фашысты не думалі здавацца без бою.

Некалькі варожых танкаў і каля роты пяхоты прарваліся да штаба 2-га батальёна 391-га стралковага палка 170-ай стралковай дывізіі. Капітан Гардзееў выклікаў артылерыйскі агонь на сябе. Варожыя танкі былі падпалены, а пяхота рассеяна.

Разведчыкі 170-ай стралковай дывізіі на чале з лейтэнантам П. А. Мірашнічэнкам непрыкметна зайшлі да фашыстаў у тыл. А калі першы батальён перайшоў у атаку, лейтэнант са сваім узводам ударыў па фашыстах з тылу. Вораг быў ашаломлены. Пазней лейтэнант П. А. Мірашнічэнка загінуў у вёсцы Печышчы былога Парыцкага раёна. Пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Фашысты, якія не чакалі ўдару нашых войск з заходняга і паўночнага бакоў Рэчыцы, адступілі на паўднёва-ўсходнюю ўскраіну горада. Схаваўшыся за збудаваннямі заводскага раёна, аказвалі ўпартае супраціўленне, утрымліваючы чыгуначны мост праз Дняпро. Гэты мост злучаў рэшткі гарнізона Рэчыцы з гомельскай групоўкай нямецка-фашысцкіх войск, якія знаходзіліся ў міжрэччы Дняпра і Сожа.

Ачысціць ад ворага заводскую зону Рэчыцы павінны былі падраздзяленні 194-ай стралковай дывізіі.

Асабліва вызначыліся воіны 470-га стралковага палка падпалкоўніка І. Е. Рубяжанскага, які асабіста вадзіў байцоў у атакі. Ініцыятыўна і мужна дзейнічалі разведчыкі 616-га стралковага палка на чале са старшым лейтэнантам А. А. Калганавым. На працягу дня фашысты некалькі разоў атакоўвалі разведчыкаў, але яны не адступілі, прынеслі камандаванню даныя аб сістэме абароны і сілах праціўніка.

Сем варожых атак вытрымаў батальён 616-га стралковага палка маёра Т. Джаўлібаева, але ўпэўнена набліжаўся да моста, каб перарэзаць ворагу магчымасць для адступлення.

У раёне Рэчыцы агнявы ўзвод 297-га гвардзейскага знішчальнага артылерыйскага палка на чале з лейтэнантам Г. М. Марчанкам збіў тры варожыя самалёты.

У сярэдзіне дня 18 лістапада 1943 года Рэчыца была цалкам вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Войскам, якія прымалі ўдзел у вызваленні горада, Вярхоўны Галоўнакамандуючы аб'явіў падзяку. Увечары 18 лістапада ў іх гонар у Маскве быў дадзены першы з пачатку вызвалення Беларусі салют. 124 гарматы зрабілі 12 залпаў. Часцям, якія найбольш вызначыліся, былі прысвоены ганаровыя найменні «Рэчыцкія». Іх атрымалі: 37-ая гвардзейская, 170-ая і 194-ая стралковыя дывізіі, 1-ая гвардзейская мотастралковая, 15-ая і 16-ая гвардзейскія і 23-яя танкавая брыгады, 2-ая гвардзейская гаўбічная, 68-ая асобная гарматная артылерыйская і 35-ая гвардзейская мінамётная брыгады, 4-ая гвардзейская і 20-ая знішчальная супрацьтанкавая артылерыйская брыгады і інш. 1-ы гвардзейскі Данскі танкавы корпус і 162-ая стралковая дывізія былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Нягледзячы на тое, што Рэчыца была цалкам вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, баі на тэрыторыі раёна працягваліся. Жорсткія сутычкі з фа-

Першыя танкі на вуліцах Рэчыцы

Уручэнне ўзнагарод байцам, якія вызначыліся пры вызваленні Рэчыцы



17-ая танкавая брыгада пасля баёў за Рэчыцу

шыстамі мелі месца ў раёне вёсак Вышамір, Новы Барсук, Маладуша, Пераволока.

18 лістапада жорсткі бой успыхнуў каля вёскі Раманаўка. Гітлераўцам удалося акружыць назіральны пункт батарэі старшага лейтэнанта Ф. А. Трыфанава. Калі вораг наблізіўся, старшы лейтэнант выклікаў агонь на сябе. Пасмяротна Ф. А. Трыфанаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

18 лістапада баявыя сябры хавалі камандзіра кавалерыйскага эскадрона 53-га гвардзейскага кавалерыйскага палка гвардыі лейтэнанта М. Т. Маструкова, які загінуў 17 лістапада ў час разведкі каля Васілевіч. М. Т. Маструкову было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Самая крытычная сітуацыя за ўвесь перыяд вызваленчых баёў на тэрыторыі Рэчыцкага раёна склалася каля вёскі Каравацічы.

15 лістапада бой з фашыстамі распачалі тут палкі 14-ай гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі 7-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса.

16 лістапада падышла 172-ая асобная Паўлаградская стралковая дывізія генерала Цімафеева. Яе 514-ы полк, на чале якога быў маёр Штэйн, немец па нацыянальнасці, атрымаў загад выбіць фашыстаў з цэнтра Каравацічы. Гэта ўдалося зрабіць 17 лістапада.

172-ая стралковая дывізія чакала боепрыпасы.

Непадалёку ад Каравацічы знаходзіліся, пад покрывам лесу, нямецкія 4-ая танкавая і адна з пяхотных дывізій 2-ой палявой арміі.

У ноч на 18 лістапада камандзіры гэтых дывізій атрымалі загад праз Каравацічы выйсці на дапамогу групоўцы, якая была акружана ў Рэчыцы.

Камандаванне 65-ай арміі здагадвалася, што падзеі могуць разгортвацца

такім чынам, таму на дапамогу 172-ой стралковай дывізіі, 14-ай гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі і 160-му асобнаму танкаваму палку, якія вызвалілі і ўтрымлівалі Каравацічы, была накіравана 41-ая знішчальна-супрацьтанкавая брыгада.

Да 4 гадзін раніцы 18 лістапада брыгада заняла вызначаныя пазіцыі. Артылерысты бачылі, як з заходняга боку вёскі адыходзілі, не маючы боепрыпасаў, падраздзяленні 514-га стралковага палка 172-ой стралковай дывізіі.

Артылерысты брыгады не паспелі як след падрыхтаваць агнявыя кропкі, а фашысты пайшлі ў наступленне. Паветра страсянулася ад выбухаў. Гэта ўдарылі гарматы батарэй Ахундава, Барэева, Букалава, Іваннікава, Сулейманава, Сухарукава.

Першая варожая атака была адбіта. На нейкі час усталявалася цішыня. Але ў 15 гадзін 30 хвілін пасля агнявога налёту фашысты зноў рушылі ў наступленне. Пяхоту падтрымлівалі 9 танкаў. Неўзабаве 4 «тыгры» былі падбіты.

Бой перамясціўся ў вёску Каравацічы. 2-ая і 3-яя батарэі 1958-га палка падпалкоўніка М. М. Забелы знішчылі яшчэ два «тыгры». Астатнія павярнулі назад. Ноччу з 18 на 19 лістапада фашысты захапілі цэнтр вёскі. Батарэйцы былі вымушаны ўступіць з ворагам у рукапашны бой.

Двое сутак без перадыху змагаліся артылерысты 41-ай брыгады. У асобных батарэях амаль не засталося байцоў. Але брыгада выстаяла, фашысты не прайшлі. К. К. Ракасоўскі, камандуючы Беларускім фронтам, у адным з сваіх загадаў адзначаў: «Только благодаря самоотверженной борьбе всего личного состава 41-й артиллерийской бригады и умелому руководству боем командира полковника Когана Короватичи были удержаны в наших руках».

«...В результате боев за Короватичи фашисты оставили на поле боя до 1500 трупов своих солдат и офицеров...» — пісала газета «Красная Звезда» ў артыкуле «Бой противотанковой артиллерии с немецкой пехотой и танками» ў нумары ад 17 снежня 1943 года.

Чатыром мужным артылерыстам, якія найбольш вызначыліся ў баях за Каравацічы, прысвоена званне Героя Савецкага Саюза — камандзірам батарэй М. І. Барэеву, А. Я. Сухарукаву, Ш. Сулейманаву і камандзіру гарматы В. В. Крыкліваму. Камандзір 1958-га палка 41-ай брыгады падпалкоўнік М. М. Забела быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Ордэн Леніна атрымалі яшчэ чацвёра мужных. Двое адзначаны ордэнам Чырвонага Сцяга, многія — ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

На працягу ўсяго перыяду Гомельска-Рэчыцкай наступальнай аперацыі вялікую дапамогу рэгулярным часцям аказвалі партызаны.

Раніцай 17 лістапада камандаванне Гомельскага злучэння і камандзір Рэчыцкай брыгады імя. К. Я. Варашылава М. П. Аніпка сустрэліся ў Дземяхах з камандзірам 19-га стралковага корпуса Д. І. Самарскім. Генерал Самарскі папрасіў выдзеліць для корпуса людзей, якія добра ведаюць мясцовасць. Была да партызан і просьба расчысціць ад завалаў і мін дарогу Рэчыца — Стара-Краснае — Шацілкі. Па гэтай дарозе падраздзяленні корпуса мелі намер працягваць наступленне. А вось дарогу Рэчыца — Горваль — Шацілкі фашысты, як паказала разведка, рыхтавалі для адступлення, таму яе патрэбна было як мага больш вывесці са строю.

Да расчысткі дарогі Рэчыца — Стара-Краснае — Шацілкі прыступіў атрад імя Фрунзе. Атрад імя Варашылава выбіў фашыстаў з вёскі Унорыца. Разам з чырвонаармейцамі партызаны вызвалілі вёску Азершчына.

У раёне вёскі Берагавая Слабада гітлераўцы ўзводзілі мост, па якім можна было б перапраўляцца з аднаго берага Дняпра на другі. Атрад імя Будзённага атрымаў баявую задачу знішчыць мост і ўтрымліваць Берагавую Слабаду да падыходу часцей Чырвонай Арміі.

У ноч на 18 лістапада штурмавыя групы на чале з камандзірам атрада А. П. Яўтуховым і камісарам К. В. Раманавым атакавалі варожы гарнізон. Трэцяя група ў гэты час правяла мініраванне аб'екта. Праз некалькі хвілін пераправа ўзляцела ў паветра. Раніцай у Берагавую Слабаду ўвайшлі падраздзяленні 19-га стралковага корпуса.

Левы бераг Дняпра знаходзіўся ў руках фашыстаў. Тут чужынцы маглі наладзіць пераправу для сваіх часцей, якія абаранялі Гомель, а цяпер адступалі. У сувязі з такой пагрозай генерал Д. І. Самарскі прыняў рашэнне арганізаваць на Дняпры абарону. 19-ы стралковы корпус працягваў наступленне, таму асноўны цяжар па абароне клаўся на партызан.

Раніцай 19 лістапада акопы і траншэі на беразе Дняпра, падрыхтаваныя фашыстамі, занялі атрады імя Варашылава і імя Будзённага. Знаходзіліся там да 24 лістапада.

18 і 19 лістапада партызанам давялося вытрымаць сур'ёзнае выпрабаванне ў баях за вёску Горваль *(гл. успаміны Я. Р. Садавога «Горвальская аперацыя». Апроч атрадаў, названых у матэрыяле, актыўны ўдзел браў і спецатрад імя Кірава).*

На левым беразе Дняпра, дзе гаспадарылі яшчэ фашысты, знаходзілася і дзейнічала Уваравіцкая брыгада імя Шчорса. Яе становішча было вельмі цяжкім. У ноч з 22 на 23 лістапада брыгада ў раёне вёскі Азершчына пераправілася на правы бераг ракі. 500 байцоў брыгады ўмацавалі абарону берага Дняпра на ўчастку Азершчына — Рэчыца.

30 лістапада 1943 года закончылася Гомельска-Рэчыцкая наступальная аперацыя. У баях за вызваленне Рэчыцы і раёна загінулі звыш 5 тысяч байцоў і афіцэраў Чырвонай Арміі. У партызанскіх атрадах светлы дзень вызвалення набліжалі сотні жыхароў Рэчыцы, Васілевіч, буйных вёсак і невялікіх населеных пунктаў. Шмат хто з іх загінуў. Мужна і самаадданa змагаліся з акупантамі дзесяткі членаў падпольных патрыятычных груп. Мала каму з іх пашчасціла застацца ў жывых.

Пеця Ульянаў

Смерць кожнага байца-мужчыны — трагедыя. Смерць змагара-жанчыны — трагедыя ўдвая. У барацьбе ж з захопнікамі на рэчыцкай зямлі склалі галовы і зусім юныя — Міша Борсук, Саша Верамейчык, Валодзя Канеў, Валодзя Панятоўскі, Пеця Ульянаў, Коля Яроцкі...

За час акупацыі чужынцы і іхнія памагатыя знішчылі звыш 5 тысяч жыхароў Рэчыцы і раёна. Яны цалкам разбурылі вытворчыя карпусы запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік», фанернага завода, лесазавода імя Кірава, дубільна-экстрактавага завода імя Варашылава, цвікавага завода «Інтэрнацыянал», гарадскую электрастанцыю, хлебазавод, 6 школ, 4 дзіцячыя дамы, 3 клубы, цэнтральную гарадскую бібліятэку, сотні дамоў жылога фонду. На тэрыторыі раёна цалкам ці часткова былі спалены 119 вёсак...

(Больш дэталёва аб мужнасці і патрыятызме нашых землякоў — падпольшчыкаў і партызан — ва ўспамінах непасрэдных удзельнікаў падзей, у дакументах, артыкулах і г. д.

Аб эпізодах, звязаных з вызваленнем Рэчыцы і тэрыторыі раёна, — ва ўспамінах байцоў і афіцэраў Чырвонай Арміі, у дакументах, артыкулах і г. д.

Аб зверствах фашыстаў падчас акупацыі Рэчыцы і раёна — ва ўспамінах, у актах партызанскіх і надзвычайных камісій, іншых дакументах.)

Пасля Гомельска-Рэчыцкай наступальнай аперацыі, у ходзе якой былі вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Рэчыца і раён, фронт адсунуўся на захад, але быў зусім блізка. Нярэдка фашысцкая авіяцыя наносіла бомбавыя ўдары па тэрыторыі раёна. У асноўным — па чыгуначных станцыях.

23 чэрвеня 1944 года пачалася Беларуская аперацыя (кодавая назва — аперацыя «Баграціён»).

Да Вялікай Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй заставалася менш года. У змаганні за яе на франтах Вялікай Айчыннай загінулі звыш 12 тысяч нашых землякоў.

П. П. Рабянок

Горвальская аперацыя

З успамінаў Яўгена Рыгоравіча Садавога, камісара партызанскай брыгады імя Панамарэнкі

Это было в конце 1943 г. Партизаны Гомельщины, в том числе и нашей бригады, действовали на территории Речицкого, Паричского и Стрешинского районов. Приближение фронта, вступление Красной Армии в пределы Гомельской области еще более активизировали нашу деятельность.

Помню, 11 ноября 1943 г. в штаб нашего соединения были вызваны командиры и комиссары бригад и отрядов. Начальник штаба партизанского соединения Е. И. Барыкин зачитал только что полученную радиограмму Белорусского штаба партизанского движения. Суть ее сводилась к следующему: в связи с вступлением Красной Армии в пределы Белоруссии задача партизан — преградить путь отступающим фашистским войскам. Надо активнее разрушать вражеские коммуникации и переправы, из всех видов оружия уничтожать живую силу и технику противника.

Здесь же, на совещании, был обсужден план боевых действий, разработанный штабом соединения. Для нанесения более сильных и уничтожающих ударов по отступающим фашистским войскам командование партизанского соединения решило объединить некоторые бригады и отряды в мощные боевые группы. Так, бригада «Железняк» Жлобинского и бригада им. Пономаренко Стрешинского районов и несколько отдельных отрядов были объединены в одну группу. Командиром ее назначили В. И. Шаруда, а комиссаром — автора данных воспоминаний.

Перед нами поставили задачу — оседлать Горвальский шлях, по которому предполагалось отступление гитлеровских войск. Этот шлях тянется от Речицы до местечка Горваль вдоль Днепра, а затем вдоль Березины на Шатилки.

Что необходимо было предпринять? Прежде всего, создать искусственные препятствия на дороге. На участке от деревни Сведское в направлении на Горваль партизаны, вооружившись пилами и топорами, начали рубить толстый лес и делать завалы. Другие группы перекапывали дорожное полотно.

Выполнив эти работы, партизаны рассредоточились, залегли и замаскировались вдоль дороги в ожидании противника. Прошло некоторое время, и наша разведка доложила, что из Речицы движется колонна немецкой мотопехоты. Это оказалась колонна грузовых автомобилей, переполненных солдатами, а на прицепах находились орудия и минометы.

У препятствий колонна остановилась. По команде немецкого офицера солдаты начали освобождать проезжую часть дороги от завалов. В этот момент прозвучала команда:

— Партизаны, огонь!

Несколько гитлеровцев тут же упали замертво. Враг залег и открыл бешеную беспорядочную автоматную стрельбу. Артиллеристы развернули пушки и минометы.

Да, это была жаркая схватка. Но партизаны не дрогнули. Колонне гитлеровцев так и не удалось прорваться. Она повернула в обратном направлении.

Утром 16 ноября мы с командиром В. И. Шарудо послали первое донесение о действиях боевой партизанской группы. А к вечеру поступило новое распоряжение. Насколько я помню, в этом документе говорилось, что Речица окружена Красной Армией. На помощь фронтовикам посланы кировцы, чапаевцы, ворошиловцы. Гитлеровцы отступают по единственному Горвальскому шляху. Задача нашей группы — уничтожить живую силу врага, захватить его технику. Мы усилили наблюдение.

17 ноября на дороге появилась колонна вражеских танков. Вслед за ней шли автомашины с пехотой и разным грузом. Пропустив танки, партизаны открыли огонь по машинам. Колонна была разорвана. Несколько автомашин прорвались за танками, а часть из них повернула назад.

Было принято решение: бригаде «Железняк» под командованием В. И. Шарудо преследовать противника, удалявшегося на Шатилки, а бригаде им. Пономаренко под моим командованием — гитлеровцев, уходивших на Горваль.

Партизаны нашей бригады заняли оборону примерно в километре от Горваля. Вечером я направил в местечко группу разведчиков, которую возглавил Василий Демидович. Поздно ночью ребята возвратились и доложили, что в Горвале скопилось много немецкой техники и пехоты. Противник готовит переправу через Березину. Этого нельзя было допустить. На рассвете 18 ноября три отряда бригады им. Пономаренко скрытно подошли к окраине местечка Горваль и по команде с возгласами «ура!» ринулись на противника.

Мы открыли сильный огонь. Враг в панике устремился к реке, оставляя оружие. Многие гитлеровцы бросались в воду, где их настигали партизанские пули. Лишь немногим удалось достичь противоположного берега. У переправы мы захватили легковые и грузовые автомобили с имуществом и продовольствием. Наши ребята, умевшие водить машины, тут же угоняли их в укрытия.

На левом берегу Березины находились немецкие подразделения. Они предпринимали попытки снова захватить Горваль. Под прикрытием артиллерийского огня группы фашистов на лодках не раз пускались через Березину. Но партизаны, окопавшись на берегу, открывали пулеметный и автоматный огонь, вынуждая гитлеровцев поворачивать вспять. Мы видели, как они, причалив к левому берегу, выносили убитых и раненых.

Наши позиции оказались выгодными. Правый берег Березины значительно выше левого, поэтому любое движение в стане врага не ускользало от партизанских наблюдателей. Как только гитлеровский вояка вылезал из кустарника, его настигала меткая пуля.

Не хватало, к сожалению, боеприпасов. Мы доложили об этом в штаб соединения. Оттуда поступило сообщение, что на подкрепление к нам вышли кировцы и чапаевцы и два расчета с пушками, направлено также 10 ящиков патронов. Штаб уведомил о том, что в районе Унорицы наступают советские войска, а отряд им. Буденного устремился к деревне Береговая Слобода для уничтожения немецкого парома. Это радовало и воодушевляло наших партизан на ратные подвиги.

Гитлеровцы не успокаивались. 19 ноября они возобновили артиллерийский и минометный огонь. Под его прикрытием снова бросили в бой несколько лодок с автоматчиками. Но и на этот раз им не удалось достигнуть цели.

Вскоре к нам прибыло подкрепление. Две полковые пушки с ходу открыли огонь по врагу на противоположном берегу Березины. Бригадная разведка доложила, что со стороны Шатилок в направлении на Горваль движется несколько немецких танков. Наши артиллеристы, заняв новые огневые позиции, подпустили танки на прицельное расстояние и открыли огонь. Один танк застыл на дороге, а остальные повернули в обратном направлении. По пути на Шатилки возле деревни Чернейки 2 танка подорвались на минах. Этот сюрприз гитлеровцам преподнес наш подрывник Желязко. После этого враг предпринял попытку уничтожить наши отряды с воздуха. Это тоже ему не помогло.

Но фашистам становилось жарко и на левобережье Березины. Их теснили наступающие части Красной Армии, создавая угрозу окружения. В такой обстановке гитлеровцы отказались от попыток вернуть свои потери. Стало ясно, что в Горвальской операции нами одержана победа. 19 ноября к Горвалю подошли авангардные части Красной Армии.

Вечером 19 ноября связной вручил мне записку за подписью И. П. Кожара. В ней говорилось, что 20 ноября к 4 часам я должен прибыть в штаб соединения для доклада о Горвальской операции. Отправился ночью вместе с четырьмя партизанами на лошадях.

В землянке штаба соединения находилось несколько человек. Они сидели за столом, сбитым из неотесанных досок, на котором горел всем нам знакомый гильзовый светильник.

И. П. Кожар и Е. И. Барыкин поздоровались со мной и представили присутствующих. Оказывается, это были первый секретарь Гомельского обкома партии Ф. В. Жиженков и секретарь обкома по промышленности А. А. Куцак. Они внимательно выслушали доклад об итогах борьбы за освобождение Горваля. А итоги были такие: за время боев мы освободили около 1600 советских граждан, которых гитлеровцы намеревались угнать в Германию, уничтожили свыше сотни вражеских солдат. Захватили 110 автомашин, в том числе 7 легковых. Грузовые автомобили были загружены продовольствием, обмундированием и боеприпасами. Нашими трофеями оказались также паром, большое количество понтонного имущества и средний танк.

После возвращения в Горваль мы стали свидетелями радостных встреч партизан с воинами Красной Армии и местными жителями. Это было неописуемое торжество, которое, однако, длилось недолго. Войска двигались туда, где еще бушевала война. В ряды фронтовиков вливались и наши народные мстители.

Друкуецца па кн.: В грозные годы. Успаміны ўдзельнікаў барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Гомельскай і Палескай абласцей. Мн., «Беларусь», 1973 г., с. 344—348.

Пісьмо камандавання 37-ай гвардзейскай Чырванасцяжнай Рэчыцкай стралковай дывізіі сакратару Гомельскага абкама КП(б)Б І. П. Кожару з нагоды вызвалення Чырвонай Арміяй г. Гомеля

С чувством глубокой радости рядовой и офицерский состав 37-й гвардейской Краснознаменной Речицкой стрелковой дивизии узнал, что славные части Белорусского фронта в результате смелого обходного маневра овладели областным центром Белоруссии — городом Гомель.

Мы рады, что и на нашу долю выпала честь участвовать в освобождении белорусских сел и городов.

Проходя с боями по белорусской земле, мы постоянно чувствовали помощь белорусского народа и его народных мстителей, частью которых руководство осуществлялось Вами.

Теперь, когда наше соединение имеет наименование «Речицкой» за участие в боях по освобождению города Речица Белорусской ССР, мы чувствуем дополнительную ответственность, которая ложится на нас в деле освобождения нашей родной Белоруссии.

...Добьемся общими усилиями фронта и тыла полного освобождения нашей священной Родины.

Да здравствует белорусский народ и его питомцы — бесстрашные партизаны и партизанки!

Да здравствует наша великая Родина!

Смерть немецким оккупантам!

Командир 37-й гвардейской Краснознаменной Речицкой стрелковой дивизии генерал-майор (Ушаков).

Начальник политотдела 37-й гвардейской Краснознаменной Речицкой стрелковой дивизии гвардии полковник (Смирнов).

ЦАМА РФ. Ф. 870. Воп. 45078с. Спр. 13. Л. 23.

Дакумент выявіў і падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак.

З дакладной запіскі начальніка тылу 1-га Беларускага фронту Анціпенкі ваеннаму савету 1-га Беларускага фронту, ЦК КП(б)Б аб ходзе выканання пастановы 1-га Беларускага фронту № 046 ад 25.02.1944 г. «Аб мерах дапамогі з боку фронту ў аднаўленні народнай гаспадаркі Беларускай рэспублікі» з 1 па 30 красавіка 1944 г.

6 мая 1944 года
№ 0778

II. По службе интендантского снабжения

3. Для обеспечения организуемых детских домов отпущен материал на пошивку 200 пар детских ботинок и 200 костюмов. Ботинки и костюмы шьются в Военторговской мастерской.

4. Совнаркомом СССР удовлетворено наше ходатайство о выделении для детских домов БССР: хлеба — 33 тонны, мяса-рыбы — 3,3 тонны, жиров — 1,1 тонны, крупы разной — 3,85 тонны, сахара — 2,45 тонны, картофеля и овощей — 43,9 тонны, яиц — 55 тыс. штук, молока — 17,1 тонны.

5. В соответствии с Постановлением СНК БССР от 25.3.1944 года в целях оказания материальной помощи населению БССР, выделено из своих ресурсов и израсходовано на довольствие населения: сухарей — 54 тонны, муки хлебной — 64,5 тонны, крупы разной — 28,3 тонны, концентратов — 605 кг, консервов мясных — 61 319 условных банок, жиров — 1,74 тонны, сахара — 4,75 тонны, соли — 3,8 тонны, чаю — 89 кг.

Для довольствия населения освобожденных районов БССР было организовано 4 питательных пункта: в Хойниках, Речице, Василевичах и Юрковичах, которыми обслужено 30 тыс. человек. Питательные пункты работали в течение месяца.

ЦАМА РФ. Ф. 233. Оп. 2374, Л. 177–179.

В дополнение к моему письму от 6.5.1944 года № 0778 докладываю о ходе выполнения постановления Военного совета фронта № 046 от 25.2.1944 года за время с 1 по 30 апреля с. г.

III. По 48-й армии

1. Помощь в проведении весенне-посевной кампании: вспахано 225,6 га, засеяно — 4,4 га, забороновано — 16,5 га, вывезено удобрений на колхозные поля и огороды колхозников — 163 тонны, отремонтировано плугов разных — 68 (из них тракторных — 4), борон — 24, повозок для колхозов — 32, выделено для оказания помощи на местах рядового и сержантского состава 52 человека, агрономов — 1 человек, направлено кузнецов для ремонта сельхозинвентаря 3 человека. Выделено для работы на временно-посевной кампании 24 лошади.

2. В гор. Речица отремонтировано и оборудовано 4 здания под детский дом общей площадью зданий 825 кв. м.

Для детдомов изготовлено и сдано 21.4.44 г. по акту: кроватей детских деревянных 160, столов разных 50, скамеек 50, табуреток 100, вешалок — 15, шкафов — 6, умывальников — 9 (22 соска), противней — 6, ведер — 10, бочков под умывальники — 5, корыт для стирки — 2, багров пожарных — 4, кочережек — 4, ножей кухонных — 10, черпаков — 5, наволочек матрацных — 150, наволочек подушечных — 300, простыней — 300, полотенец — 300, тапочек — 150 пар, одеял — 150, белья нательного — 300, домино — 12 комплектов.

ЦАМА РФ. Ф. 233. Д. 253. Оп. 2374. Л. 186–189.

Дакументы выявіў і падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак

Герой з вёскі Горваль

Варанчук Андрэй Якаўлевіч нарадзіўся 15.6.1915 г. у м. Горваль Рэчыцкага раёна. З сялян. Беларус. Скончыў Рэчыцкі педагагічны тэхнікум (1932), Артылерыйскую школу ў Куйбышаве (1939), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1947), Кіеўскі універсітэт (1965). У 1932–1937 гг. працаваў настаўнікам, з 1937 г. — інспектарам раённага аддзела народнай асветы. У Чырвонай Арміі з 1938 г. Быў удзельнікам баёў з японскімі захопнікамі на рацэ Халхін-Гол у 1939 г. У час Вялікай Айчыннай вайны на фронце з 1941 года — камандзір батарэі, дывізіёна, начальнік артылерыі стралковага палка. Удзельнік баёў на Курскай дузе, вызвалення Украіны, Беларусі.

Восенню 1943 года стралковы полк, у якім Варанчук камандаваў батарэяй супрацьтанкавых гармат, выйшаў да воднага рубяжа, каб пераправіцца на правы бераг Дняпра ў раёне Лоева.

Пачалася пераправа. Трымаючыся за плыты, на якіх былі гарматы і скрынкі з боепрыпасамі, падштурхоўваючы іх, плылі артылерысты ў ледзяной вадзе насустрач берагу, дзе павінны былі захапіць плацдарм. У ліку першых пераадолелі магутную водную перашкоду і прамой наводкай ударылі па фашыстах.

А. Я. Варанчук — Герой Савецкага Саюза

Пра подзвіг лейтэнанта А. Варанчука на Дняпроўскім плацдарме пісала 27 кастрычніка 1943 года франтавая чырвонаармейская газета «Баявы сцяг»:

«Яго чакала спакутаваная родная Беларусь. І ён ішоў скрозь віхуры ваеннай навальніцы. Нішто не спыняла Варанчука, не спыніў і шырокі Дняпро.

Калі ягоная батарэя пераправілася на заходні бераг, ён стаў на калені, узяў кавалачак зямлі, пацалаваў яе і ўсхвалявана вымавіў:

— Дзень добры, родная мая матуля — Беларусь! Я прыйшоў вызваліць цябе ад фашысцкіх вылюдкаў...

Артылерысты бачылі слёзы радасці на вачах баявога таварыша Андрэя Варанчука. Яны прасякнуліся ягонай любоўю да Бацькаўшчыны і гарачым жаданнем бачыць яе свабоднай.

На наступны дзень батарэя адбіла тры нямецкія танкі, сем варожых контратак і знішчыла каля роты гітлераўцаў. І ўсё ж 60 нямецкіх аўтаматчыкаў акружылі батарэю. Байцы пачулі голас любімага камандзіра:

— З гэтай зямлі не сыдзем! Выстаім, таварышы, і пойдзем далей. Гэта маё слова камуніста!

Артылерысты не пахіснуліся. Яны разгромілі нямецкіх аўтаматчыкаў і захапілі 10 кулямётаў і аўтаматаў.

Афіцэр Варанчук загінуў смерцю героя...»

На шчасце, памыліўся франтавы карэспандэнт. Андрэй Варанчук быў цяжка паранены на тым Дняпроўскім плацдарме, але выжыў. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 30 кастрычніка 1943 года мужнаму артылерысту было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля шпіталя старшы лейтэнант Варанчук вярнуўся ў свой полк і сваю батарэю, удзельнічаў у наступальнай аперацыі «Баграціён», якая скончылася поўным выгнаннем акупантаў з беларускай зямлі. Дарэчы, яму давялося вызваляць мясціны непадалёк ад роднай вёскі. А пад Рэчыцай, у якой да вайны закончыў педтэхнікум, батарэя Героя Савецкага Саюза А. Я. Варанчука адбіла на адным з рубяжоў контратакі двух узмоцненых батальёнаў эсэсаўцаў і забяспечыла ўсяму палку паспяховы рух наперад.

Герой Дняпра ішоў на захад, туды, адкуль пачалася вайна.

Да 1960 г. А. Я. Варанчук служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Жыве ў Кіеве.

Л. Сузін

«Выклікаю агонь на сябе!»

Дзюбко Анатоль Фёдаравіч нарадзіўся 15.12.1923 г. у м. Горваль Рэчыцкага раёна. З рабочых. Беларус. Скончыў Адэскае артылерыйскае вучылішча (1942), Ваенную артылерыйскую камандную акадэмію (1954). З лістапада 1942 г. на Паўночна-Заходнім, 2-ім Прыбалтыйскім і Ленінградскім франтах. Камандзір батарэі А. Ф. Дзюбко вызначыўся ў 1944 г. пры вызваленні Латвіі.

Званне Героя Савецкага Саюза А. Ф. Дзюбко прысвоена 24.3.1945 г. Да 1976 г. служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Жыве ў Мінску.

...Асыпала лісце чацвёртая ваенная восень. Далей і далей адкатваліся на захад нямецка-фашысцкія захопнікі. Савецкія войскі вялі ўпартыя баі за вызваленне Прыбалтыкі.

У адным з баёў на подступах да сталіцы Латвіі стралковы батальён пры падтрымцы артылерыйскай батарэі гвардыі малодшага лейтэнанта Анатоля Фёдаравіча Дзюбко захапіў вышыню ў размяшчэнні варожых войск. Гітлераўцы прыкладвалі ўсе намаганні, каб вярнуць страчаную важную вышыню. Пяць атак адбілі савецкія воіны. Фашысты пайшлі ў шостую. Кінулі супраць абаронцаў вышыні пяхоту і шэсць самаходных гармат.

Гітлераўцам удалося прабіцца да назіральнага пункта, з якога малодшы лейтэнант Анатоль Дзюбко карэкціраваў агонь сваёй батарэі. Узвод упраўлення артылерыстаў заняў кругавую абарону.

«Стаяць да апошняга!» — такім быў загад А. Ф. Дзюбко.

На кожную спробу фашыстаў адарвацца ад зямлі і ўварвацца ў назіральны пункт артылерысты адказвалі трапным агнём. Але сілы былі няроўнымі. Радзелі рады абаронцаў вышыні. Вораг жа атрымаў падмацаванне. Склалася крытычная сітуацыя.

А. Ф. Дзюбко перадаў артылерыстам но-

выя каардынаты цэлі — уласнай пазіцыі. З батарэі перапыталі, ці не памыліўся ён. «Выклікаю агонь на сябе!» — адказаў малодшы лейтэнант.

Грымнуў залп. Снарады клаліся ў гушчы гітлераўцаў. Ацалелыя, пакідаючы забітых і параненых, папаўзлі назад. А. Ф. Дзюбко перадаў батарэйцам новыя каардынаты. Пасля яшчэ аднаго залпа ён падняў падначаленых у атаку.

Малодшы лейтэнант сабраў пехацінцаў і артылерыстаў-разведчыкаў у адну групу, звязаўся па радыё з камандзірам палка: «Контратакі адбіты. Прыняў камандаванне батальёнам. Батальён замацаваўся на дасягнутым рубяжы...»

Б. Ільін

Мужнасць была бязмежнай

Каваленка Анатоль Якаўлевіч нарадзіўся 23.1.1919 г. у в. Якімаўка Рэчыцкага раёна. Скончыў Гомельскі аўтамабільны тэхнікум (1938), Харкаўскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча (1940), Адэскі педагагічны інстытут (1951). З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Крымскім, Паўночна-Каўказскім, Закаўказскім, Ленінградскім, 3-ім Прыбалтыйскім і 1-ым Беларускім франтах — лётчык разведвальнага авіяпалка. Удзельнік абароны Севастопаля, Ленінграда, Керчы. Старшы лейтэнант Каваленка зрабіў 173 баявыя вылеты, знішчыў 7 танкаў, 10 гармат, 15 вагонаў і 30 аўтамашын з ваеннымі грузамі, 50 агнявых кропак, выявіў 23 аэрадромы, 15 абарончых рубяжоў, каля 50 перапраў, сфатаграфаваў 900 чыгуначных эшалонаў ворага, у паветраных баях збіў 7 самалётаў праціўніка, 16 знішчыў на зямлі.

Званне Героя Савецкага Саюза А. Я. Каваленку было прысвоена 22.2.1945 г. Да 1946 г. служыў у Савецкай Арміі, капітан. Жыве ў г. Херсоне (Украіна).

Мужнасць і бясстрашша лётчыка Анатоля Якаўлевіча Каваленкі былі бязмежнымі. Падумаць толькі: сем разоў гарэў у самалёце, быў некалькі разоў цяжка паранены, у адным з баёў ягоны самалёт атрымаў 150 прабоін. Але лётчык зноў і зноў станавіўся ў баявы строй і працягваў бязлітасна граміць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Баявы шлях Анатоля Якаўлевіча пачаўся ў першы ж дзень вайны. Але асабліва цяжкім для яго выдалася 19 лістапада 1942 года. У гэты дзень нашаму земляку давялося тройчы вылятаць на адказныя заданні па разведцы і бамбардзіроўцы варожых аб'ектаў.

Пры выкананні трэцяга задання ў раёне Краснадара самалёт Каваленкі загарэўся. З вялікімі цяжкасцямі лётчыку ўдалося збіць полымя. Пасля гэтага ён скінуў на варожы аэрадром бомбы, якія дакладна леглі ў цэль. Успыхнуў адзін «юнкерс», за ім другі, загарэўся «хейнкель»... 7 ахопленых агнём самалётаў былі сфатаграфаваны. Толькі пасля гэтага камандзір экіпажа А. Я. Каваленка вывеў свайго «петлякова» з зоны агню, узяў кірунак да станцый Еўсцігнееўскай і Пашкоўскай, дзе меў намер сфатаграфаваць яшчэ адзін аэрадром.

З кожнай хвілінай было цяжэй. Асколкі снарадаў варожых зенітак прабівалі абшыўку, засядалі ў фюзеляжы. Над станіцай Северскай на самалёт Каваленкі абрынуліся 11 варожых знішчальнікаў.

Анатолю Якаўлевічу ўдалося вырвацца з вогненнага кола і давесці машыну да горада Гарачы Ключ. І толькі тут самалёт загарэўся. Спробы збіць полымя скальжэннем або наборам вышыні поспеху не мелі. Дацягнуць да свайго аэрадрома таксама не выпадала, бо кожны момант самалёт мог узарвацца.

А. Я. Каваленка прыняў рашэнне зрабіць пасадку на мора. Апавіты полымем «петлякоў» сеў на ваду ў 7 кіламетрах ад берага. Штурман і стралок-радыст былі паранены. Камандзір экіпажа, таксама з абпаленымі рукамі, нагамі, тварам, кінуўся ратаваць баявых таварышаў. Але не паспеў:

А. Я. Каваленка — Герой Савецкага Саюза

самалёт патануў. Яго ж, А. Я. Каваленку, у цяжкім стане праз некалькі гадзін падабралі маракі баявога катэра.

І вось лячэнне закончана. 24 красавіка 1944 года Анатоль Якаўлевіч атрымаў магчымасць зноў адправіцца на фронт. Быў накіраваны ў 742-і асобны Чырванасцяжны Астраўскі разведвальны авіяполк. Гэта былі дні падрыхтоўкі контрнаступлення савецкіх войск у Прыбалтыцы.

У адзін з чэрвеньскіх дзён Каваленка атрымаў загад ляцець на разведку ў раён Таліна. Па маршруту былі скінуты бомбы на судны, якія стаялі каля прычалаў. Потым быў заход з боку мора і яшчэ адзін бомбавы ўдар па ворагу. Успыхнуў адзін з катэраў. Але асколкам снарада варожай зеніткі быў смяротна паранены стралок-радыст.

У наступны раз самалёт-разведчык А. Я. Каваленкі быў накіраваны ў напрамку Пскова, куды фашысты перакідвалі рэзервы. Трэба было разведаць месцы канцэнтрацыі часцей праціўніка.

Імгліў дождж, бачнасць была абмежаванай. Таму ляцець давялося на вышыні 150—200 метраў пад моцным агнём варожых зенітак. Удалося высветліць, дзе знаходзяцца замаскіраваныя танкі і бронемашыны фашыстаў. Але тут загарэўся правы матор. З цяжкасцю пашанцавала перацягнуць самалёт праз лінію фронту. Калі ж А. Я. Каваленка адчуў, што баявая машына пачынае рэзка губляць вышыню, ён зрабіў усё, каб пасадзіць самалёт. Яго застаўся ахоўваць стралок-радыст, а старшы лейтэнант Каваленка дабраўся да свайго аэрадрома. Праз дзень туды ж быў дастаўлены і ягоны Пе-2.

І зноў былі баявыя вылеты, мужнасць і бясстрашша, падмацаваныя гарачым жаданнем нашага земляка зрабіць усё для таго, каб як мага хутчэй прыйшоў светлы Дзень Перамогі. Яго Анатоль Якаўлевіч Каваленка сустрэў Героем Савецкага Саюза.

М. Салаўёў,
старшы лейтэнант запасу

«Загадваю: толькі ўперад!»

Масальскі Уладзімір Рыгоравіч нарадзіўся 22.1.1920 г. у Рэчыцы. З сям'і рамесніка. Беларус. Скончыў курсы малодшых лейтэнантаў (1942), Ленінградскае артылерыйскае вучылішча. У Чырвонай Арміі з 1939 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны (1939—1940). У час Вялікай Айчыннай вайны з 1941 г. на Ленінградскім фронце. Камандзір роты гвардыі капітан У. Р. Масальскі вызначыўся ў наступальных баях на ўчастку Пулкава — Краснае Сяло (студзень 1944 г.).

Званне Героя Савецкага Саюза У. Р. Масальскаму прысвоена 13.2.1944 г. Да 1954 г. служыў у Савецкай Арміі. Падпалкоўнік. Жыў у Ленінградзе. У. Р. Масальскі памёр 21.07.1965 г.

...Чатыры, пяць, шэсць варожых атак былі адбіты. Сілы байцоў, здавалася, былі на зыходзе, але яны працягвалі весці смяротны паядынак з фашыстамі.

Падмога прыйшла ў самы крытычны момант. Роту капітана У. Р. Масальскага падтрымалі артылерысты. І гэта вырашыла зыход бою. Але адпачынак быў зусім кароткім. Патрабавалася штурмам авалодаць буйным умацаваным пунктам ворага — Варонінай Гарой. Гэта давала магчымасць нашым падраздзяленням весці эфектыўнае наступленне на Краснае Сяло.

...Вароніна Гара дыхала агнём. Яе крутыя схілы былі як бы перарэзаны траншэямі і калючым дротам. А яшчэ шматлікія ўмацаваныя дзоты і доты.

Аўтаматчыкі роты ціха, адзін за адным, ішлі па ачышчаных ад снегу траншэях: рота падыходзіла да пярэдняга краю.

Капітан Масальскі загадаў сяржанту Іванову выбраць байца, непрыкметна прайсці ў размяшчэнне праціўніка і бясшумна зняць вартавога.

У. Р. Масальскі — Герой Савецкага Саюза

Праз хвіліну-другую разведчыкі рушылі ў цемру. А калі вярнуліся назад, сяржант Іваноў паведаміў Уладзіміру Рыгоравічу: заданне выканана, шлях адкрыты.

Ротны зірнуў на гадзіннік:

— Пара!

Без адзінага стрэлу, разыходзячыся ў розныя бакі, байцы роты абмінулі баявую ахову фашыстаў і падышлі да траншэі праціўніка.

Аўтаматчыкі атакавалі фашыстаў неспадзявана для іх. І бой распачаўся адразу ж з рукапашнай сутычкі.

Гітлераўцы, крыху ачомаўшыся, адкрылі страляніну ўсляпую. А рота далей і далей рухалася ўглыб нямецкай абароны. Уперадзе быў капітан У. Р. Масальскі.

Неўзабаве яму апякло плячо — асколак варожай гранаты ўпіўся ў цела. Капітан супыніўся толькі на момант. А потым, перасільваючы боль, загадаў узводным камандзірам:

— Уперад! Толькі ўперад! Не затрымлівацца!

Байцы крок за крокам прабіваліся да падножжа Варонінай Гары. Праціўнік жа, разумеючы згубнасць свайго становішча, абрынуў літаральна шквал агню. Застукалі і кулямёты, схаваныя ў дзотах і дотах.

Варожая куля прабіла капітану У. Р. Масальскаму нагу. Рабіць перавязку не было калі. Сабраўшы сілы, капітан з дапамогай ракетніцы паказаў цэль сваім аўтаматчыкам. І неўзабаве два фашысцкія дзоты сціхлі назаўсёды, потым яшчэ адзін.

Разгарачаныя боем, байцы роты капітана У. Р. Масальскага настойліва карабкаліся па заледзянелых схілах Варонінай Гары. Да крыві раздзіралі пальцы, скочваліся назад, але падымаліся зноў і, выбіваючыся з апошніх сіл, паўзлі і паўзлі ўперад, як загадаў камандзір.

Бой ужо грымеў з усіх бакоў. Вакол ірваліся міны. Яны разбівалі камяні. Таму не толькі асколкі гарачага металу, але і каменя як бы жадалі спыніць аўтаматчыкаў роты У. Р. Масальскага.

Байцы роты былі ўжо на паўдарозе да вяршыні гары. І тут у твар капітана ўдарылі камякі мёрзлай зямлі. Уладзімір Рыгоравіч упаў. Аўтамат выслізнуў з ягоных рук. Гэта было чацвёртае раненне, атрыманае ў адным баі.

Да раніцы 19 студзеня 1944 года чырвоны сцяг, як і загадваў камандзір палка падпалкоўнік А. Афанасьеў, залунаў на вяршыні Варонінай Гары. Задача, пастаўленая перад ротай капітана У. Р. Масальскага, была цалкам выканана.

У тую незабыўную ноч і раніцу Уладзімір Рыгоравіч Масальскі не змог падняцца на запаветную гару. Зрабіў тое значна пазней, калі цяжкія раны загаіліся, і ён зноў вярнуўся ў строй, каб ісці далей на захад і граміць ворага да пераможнага канца.

Два ордэны Чырвонага Сцяга, ордэны Аляксандра Неўскага і Суворава III ступені, каля дзесяці медалёў, Залатая Зорка Героя Савецкага Саюза і ордэн Леніна — баявыя адзнакі мужнага сына Рэчыцы — У. Р. Масальскага.

А. Д. Марчанка

Вытрымаць і перамагчы

Радзіма **Аляксандра Карпавіча Васільева** — Рэчыца. Тут прайшло ягонае дзяцінства, тут ён вучыўся. У Чырвоную Армію быў прызваны ў верасні 1941 года. Жадаў адразу ж патрапіць на фронт, але быў накіраваны на курсы малодшых камандзіраў. У 1942 годзе камандзір сапёрнага аддзялення старшы сяржант А. К. Васільеў прыняў першы бой з фашыстамі.

Сапёры павінны не толькі добра валодаць зброяй, але і абясшкоджваць міны, снарады, авіябомбы. Павінны, урэшце, наладжваць пераправы. Ад працы сапёра залежыць не толькі ўласнае жыццё, але і жыцці тых, хто будзе ісці за ім.

І ён, А. К. Васільеў, быў сапраўдным сапёрам і камандзірам. Гэта яскрава пацвердзілася пры вызваленні Польшчы і на тэрыторыі Германіі. Так, 14 студзеня 1945 года разам з падначаленымі ён правёў разміраванне двух мінных палёў, зрабіў праход для стралковага падраздзялення і тэхнікі. У гэты дзень Аляксандр Карпавіч асабіста абясшкодзіў 75 варожых мін.

5—7 лютага 1945 года сапёрнае падраздзяленне нашага земляка пераправіла праз раку Одэр 250 пехацінцаў і 40 скрынь з боепрыпасамі.

10 сакавіка ў час баёў за расшырэнне плацдарма на левым беразе Одэра падраздзя-

ленне А. К. Васільева зрабіла тры праходы ў мінных палях. І гэта пры шквальным агні гітлераўцаў.

У ноч на 16 красавіка былі зроблены яшчэ два праходы ў мінных палях. Аляксандр Карпавіч асабіста зняў 65 мін.

Сапёры не ведалі спачынку і ў час наступлення, калі патрабавалася як мага хутчэй размініраваць шашу Лебус — Франкфурт-на-Одэры.

З вайны Аляксандр Карпавіч вярнуўся поўным кавалерам ордэна Славы. Абставіны склаліся так, што месцам жыхарства ён абраў Томскую вобласць. Працаваў начальнікам змены на Асінаўскім лесапрамысловым камбінаце.

23 красавіка 1956 года А. К. Васільеў памёр. Яму было толькі 55 гадоў. На фронце Аляксандр Карпавіч дзейнічаў па прынцыпу: вытрымаць і перамагчы. Вучыў гэтаму і падначаленых. Не шкадаваў сябе і ў мірнай працы. Ды адчуваліся франтавыя дарогі і раненні. Але і да апошняга свайго дня наш зямляк заставаўся верным раз і назаўсёды абранаму: змагацца да апошняга.

П. Рабянок

Ад Валадарска да Прусіі

Капітан Лязгоўка быў, як заўсёды, нешматслоўным. Паведаміў: рота атрымала заданне рухацца на Парычы. Пільна паглядзеў у твары тых, якія павінны былі весці за сабой астатніх. Вядома, на душы капітана не было спакойна. Рота адчувальна парадзела ў баях за Рэчыцкі раён, на месца загінуўшых прыйшлі ў асноўным маладыя, якім не давялося, як кажуць, нюхаць пораху. Спадзявацца на такіх байцоў справа не зусім апраўданая. Але ж папоўнілі роту і хлопцы, якія змагаліся з фашыстамі ў партызанскіх атрадах. Напрыклад, Аляксандр Якаўлевіч Кастрама.

Лязгоўка ведаў: радавы Кастрама — былы падрыўнік, на ягоным баявым рахунку варожыя эшалоны. Зараз Кастрама ў разліку станковага кулямета «максім». Словам, хлопец загартаваны ў баях. Такі не падвядзе.

Ротны не памыліўся. Калі падраздзяленне пайшло ў атаку, Кастрама быў уперадзе астатніх.

Фашысты, ачомаўшыся, прымусілі роту акапацца. Самі рушылі ў наступ. Але і тут радавы Кастрама трапным агнём прыціснуў гітлераўцаў да зямлі. Гэта дало роце магчымасць атрымаць дапамогу з боку суседзяў. І тады фашысты, агрызаючыся, пасунуліся назад. Баявая задача, пастаўленая перад ротай капітана Лязгоўкі, была выканана.

Там, пад Парычамі, А. Я. Кастрама быў паранены. Лячыўся ў шпіталі. А калі вярнуўся ў роднае падраздзяленне, даведаўся: яго адзначылі ордэнам салдацкай Славы III ступені. Быў задаволены, бо, як ведаў, такім ордэнам узнагароджваюць за асабістую мужнасць.

Прайшоўшы з баямі Беларусь, наш зямляк А. Я. Кастрама браў удзел у вызваленні Польшчы. На календары быў верасень 1944 года.

Аднойчы рота атрымала заданне зайсці ў варожы тыл.

Калі сцямнела, капітан Лязгоўка сказаў: «Пара!» Рота пасунулася ўперад. Кожны гатовы быў да любой нечаканасці. Ішлі па тэрыторыі, якую пакуль утрымліваў вораг. Але не, абышлося. Фашысты нічога не заўважылі.

Вось і рака. Ад вады патыхае холадам. Байцы пакідалі на ваду набітыя саломай палаткі, асцярожна паставілі на іх куляметы. Адзін з «максімаў» павінен быў пераправіць камандзір кулямётнага разліку сяржант А. Я. Кастрама.

Неўзабаве ён адпіхнуўся ад цвёрдага берага і, падтрымліваючы палатку, паплыў. Цела заходзілася ад холаду, але ж плыць патрэбна было як мага асцярожна, каб вораг не пачуў ды не адкрыў агонь, калі рота яшчэ ў вадзе.

Пашанцавала на гэты раз. Пераправіўшыся на другі бераг, падраздзяленне капітана Лязгоўкі акапалася, пачало чакаць раніцу.

...З першымі промнямі сонца фашысты заўважылі «гасцей». Над пазіцыяй роты з'явіліся самалёты, пачалі скідваць бомбы. Ды амаль усе шкоды не прынеслі, бо патрапілі ў ваду. Бачачы тое, у атаку пайшла фашысцкая пяхота.

Шэрыя постаці бліжэй і бліжэй. «Агонь!» — скамандаваў капітан Лязгоўка, і трапная чарга, якую выпусціў з «максіма» сяржант Кастрама, прымусіла назаўсёды ўтыркнуцца ў зямлю некалькіх фашыстаў.

Гітлераўцы атаку паўтарылі, але на гэ-

ты раз з яшчэ большымі стратамі для сябе. Неўзабаве пабеглі, пакідаючы забітых і параненых, назад. Скарыстаўшы момант, рота капітана Лязгоўкі ўдала праследвала адступаючых. У палон былі ўзяты некалькі варожых салдат. Удалося захапіць і трафеі: дзве гарматы.

У кастрычніку 1944 года А. Я. Кастраму выпала новае выпрабаванне. Ля ягонага кулямёта разарвалася варожая міна. Быў забіты сяржант Ладышкін. Смяротнае раненне атрымаў старшына Уладзімір Суслаў, які, дарэчы, быў лепшым сябрам нашага земляка. А. Я. Кастрама, сам паранены, падхапіў Суслава на рукі, вынес яго з поля бою. Спадзяваўся, што медыкі здолеюць уратаваць ягонага сябра.

У хуткім часе Аляксандр Якаўлевіч атрымаў яшчэ адзін ордэн салдацкай Славы. І зноў... III ступені. Вядома, тут была памылка. Ды не было часу разблытваць яе.

Наш зямляк прымаў удзел і ў жорсткіх баях ва Усходняй Прусіі. Атрымаў за мужнасць ордэн Славы II ступені.

На радзіму вярнуўся восенню 1945-га. Пасяліўся ў вёсцы Салтанова, бо ад роднага Валадарска амаль нічога не засталося. Працаваць пайшоў лесніком. Пасля вайны захацелася цішыні.

Ішоў час, вырас сын Міхаіл, выправіўся ў армію. А калі прыйшоў у каротка-тэрміновы адпачынак, падзяліўся з бацькам сумненнямі: не можа таго быць, каб узнагародзілі двума ордэнамі адной і той жа ступені. Значыць, нешта не ўлічылі ў аддзеле ўзнагарод. Ён жа, Міхаіл, напісаў у Маскву, папрасіў разабрацца.

І вось былога партызанскага падрыўніка і франтавога кулямётчыка А. Я. Кастраму запрасілі ў Рэчыцкі гаррайваенкамат.

Ехаў Аляксандр Якаўлевіч у райцэнтр і не ведаў, што праз некалькі гадзін вернецца дамоў поўным кавалерам ордэнаў салдацкай Славы.

— Прабачце, Аляксандр Якаўлевіч, за памылку, — сказаў яму ваенком. — Замест аднаго з ордэнаў Славы III ступені Вам належыць вось гэты ордэн Славы I ступені за нумарам 2922. Так што Вы — поўны кавалер.

Аляксандр Якаўлевіч узяў у рукі карабок, які яму падаў ваенком, потым дакументы, што давалі яму права мець ільготы нароўні з Героямі Савецкага Саюза. Удзячна кіўнуў галавой.

Хацелася хутчэй дамоў, у лес. Пабыць аднаму. Нагадаць у думках сяброў, якія змагаліся з ім у партызанскім атрадзе, на фронце. Шмат каму з іх не выпала дажыць да Перамогі. Што ж, вайна без страт не бывае. І ён, А. Я. Кастрама, зрабіў усё, каб прыйшла Перамога.

П. П. Рабянок

З кагорты мужных

Дзмітрый Данілавіч Валенцік нарадзіўся 23 лютага 1907 г. у вёсцы Райкова (Полацкі раён, Віцебская вобласць). У трынаццацігадовым узросце стаў сіратой. Быў змушаны пайсці ў батракі. Пасвіў жывёлу, араў і сеяў. У 1925 годзе пашчасціла ўладкавацца на будаўніцтва ваеннага гарадка. Працаваў, вучыўся. У 1929 годзе быў прызваны на вайсковую службу. Спачатку Дз. Д. Валенцік — курсант стралковага палка, затым — авіяцыйнай школы Ленінградскай ваеннай акругі. Быў накіраваны ў разведвальную авіяцыйную эскадрыллю горада Чырвонагвардзейска (ЛВА). Рос у званні, вучыўся на спецкурсах. Савецка-фінскую вайну сустрэў у званні капітана, камандзірам эскадрыллі.

Пад камандаваннем Дз. Д. Валенціка эскадрылля тройчы лятала ў глыбокі тыл праціўніка, знішчыла аператыўна-стратэгічную базу каля Раваніемі, збіла 5 варожых знішчальнікаў.

Вяртаючыся на базу, эскадрылля патрапіла пад шквал агню зенітак. Адзін з на-

Д. Д. Валенцік — Герой Савецкага Саюза

шых самалётаў быў вымушаны прызямліцца на лёд возера. Да яго спяшаліся фінскія лыжнікі. Здавалася, авіятарам не выкараскацца з цяжкага становішча: давядзецца загінуць ці здацца ў палон.

У гэты крытычны момант Дз. Д. Валенцік прыняў бясстрашнае рашэнне: загадаў намесніку камандзіра эскадрыллі весці самалёты на свой аэрадром, а сам зрабіў пасадку на лёд побач з падбітым самалётам. Члены экіпажа кінуліся да падбітай машыны, якая пачала ўжо дымець. Яны перанеслі параненых таварышаў у свае кабіны. Камэск Валенцік зрабіў разгон, і самалёт, равучы рухавікамі, амаль над галовамі варожых лыжнікаў падняўся ў паветра.

У маі 1940 года Дз. Д. Валенціку было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Ордэны атрымалі і члены ягонага экіпажа.

У час Вялікай Айчыннай вайны Дзмітрый Данілавіч камандаваў авіяцыйным палком. Змагаўся на Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Паўднёвым, 4-ым Украінскім, 3-ім Беларускім франтах.

284-ы авіяполк 8-ай паветранай арміі, які ўзначальваў Дз. Д. Валенцік, знішчаў жывую сілу і тэхніку ворага на тэрыторыі Украіны і Растоўскай вобласці, браў удзел у вызваленні горада Таганрога, за што атрымаў ганаровае найменне «Таганрогскі». Лётчыкі палка наносілі ўдары па абарончых умацаваннях фашыстаў, тапілі ў Чорным моры варожыя караблі, вызвалялі Феадосію, Сімферопаль, Джанкой, Севастопаль і іншыя гарады Крыма.

...У аперацыі «Багратыён» Дзмітрый Данілавіч камандаваў 135-ым гвардзейскім авіяцыйным Таганрогскім Чырванасцяжным, ордэнаў Кутузава і Аляксандра Неўскага палком 6-ай гвардзейскай авіядывізіі. Браў удзел у вызваленні Мінска, Оршы, Гродна, Вільнюса. У лётнай кніжцы Дз. Д. Валенціка — 115 баявых вылетаў.

Да 1955 года Дзмітрый Данілавіч служыў у Савецкай Арміі. 14 наступных гадоў героя былі звязаны з Рэчыцай. Сэрца мужнага чалавека спынілася 30 сакавіка 1969 года. Яго імем названа адна з найбольш прыгожых вуліц горада.

П. Рабянок

Бясстрашны камандзір

Мікалай Пятровіч Сінюцін нарадзіўся ў 1911 годзе ў невялікім мястэчку Могельшчына, што на тэрыторыі Польшчы. Да 1915 г. ягоныя бацькі займаліся сельскай гаспадаркай, а затым пераехалі ў Рэчыцу.

У 1928 г. Мікалай Сінюцін скончыў восем класаў сярэдняй школы № 1. Марыў вучыцца далей, але матэрыяльнае становішча сям'і прымусіла пайсці працаваць. Рабіў на запалкавай фабрыцы «Дняпро», затым — на хлебазаводзе.

У 1932 г. скончыў рабфак. На другі год паступіў у Гомельскі педагагічны інстытут. Неўзабаве быў прызваны ў армію.

Курсант, камандзір аддзялення, памочнік камандзіра ўзвода, камандзір узвода. Скончыў курсы сярэдняга каманднага саставу. Займеў выбар — працягваць службу ці звольніцца ў запас. Выбраў звальненне, бо марыў вучыць дзяцей. Але праз некалькі месяцаў быў зноў прызваны на вайсковую службу.

У верасні 1939 г. старшы лейтэнант М. П. Сінюцін камандуе стралковай ротай, бярэ ўдзел у дзеяннях на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Украіны. Зімой 1940 г. М. П. Сінюцін, ужо ў званні капітана, камандаваў стралковым батальёнам на савецка-фінскім фронце.

Быў паранены, адзначаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 студзеня 1940 г. яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Скончылася савецка-фінская вайна. Часць, у якой служыў капітан М. П. Сінюцін, перадыслацыравалася ў Адэсу. Пачаліся дні напружанай вучобы. Камандаванне бачыла ў асобе нашага земляка здольнага і растучага афіцэра. Яму было прысвоена званне маёра. М. П. Сінюцін быў прызначаны на пасаду намесніка камандзіра палка.

Вясна 1941 года. Яна прынесла ў сям'ю Сінюціных радасць: нарадзілася дачка Валянціна.

22 чэрвеня Адэса прачнулася ад выбухаў бомбаў. Нават не развітаўшыся, М. П. Сінюцін выбег з кватэры...

Толькі праз год Кацярына Іванаўна Сінюціна даведалася, што яе муж загінуў. Але дзе канкрэтна? Доўгі час гэта заставалася невядома. Усё праяснілася толькі праз 25 гадоў пасля вайны. Былы камісар палка, у якім служыў М. П. Сінюцін, Камалдзі-

наў даслаў у Рэчыцкі гаррайваенкамат ліст, у якім згадваў: М. П. Сінюцін загінуў восенню 1941 года ў раёне Мелітопаля, дзе ішлі тады надзвычай цяжкія баі.

У Рэчыцы жывуць родныя Героя Савецкага Саюза М. П. Сінюціна. А яшчэ — памяць аб чалавеку, які марыў вучыць дзяцей, але замест гэтага давялося абараняць Айчыну.

А. Д. Марчанка

СЫДЗЬКО Міхаіл Пятровіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 18.9.1906 у в. Сініцкае Поле Лельчыцкага р-на. У Чырвонай Арміі з 1928. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939. У час Вялікай Айчыннай вайны на фронце з 1941. Палітрук роты, сакратар партбюро, камісар, камандзір палка. Удзельнік баёў пад Масквой, Сталінградам, у Крыме, Прыбалтыцы, Германіі. Полк пад камандаваннем падпалкоўніка М. П. Сыдзько вызначыўся пры вызваленні Крыма. 1.11.1943 з баямі фарсіраваў Сіваш, 5.4.1944 — Айгульскае возера, зайшоў праціўніку ў тыл, чым садзейнічаў прарыву яго абароны, 7.4.1944 перарэзаў чыгунку Воінка — Джанкой. 8.5.1944 уварваўся ў Севастопаль, у вулічных баях знішчыў 10 гармат, 19 кулямётаў, больш за 550 гітлераўцаў, захапіў 12 эшалонаў з грузам, 25 аўтамашын, 6 мінамётаў, 90 кулямётаў, узяў у палон больш за 200 гітлераўцаў. Да 1954 г. у Савецкай Арміі, палкоўнік. Ганаровы грамадзянін г. п. Лельчыцы. Жыў у Рэчыцы.

М. П. Сыдзько памёр 30.4.1983. Ягоным імем названы вуліцы ў Рэчыцы і Лельчыцах.

За паядынак з «тыграмі»

У сям'і з сямі братоў і сясцёр **Цэзар Сільвестравіч Раскавінскі** быў малодшым. Працаваў трактарыстам у рэчыцкім прыгарадным саўгасе. Тут яго прынялі ў камсамол, адсюль выправілі на службу ў Чырвоную Армію. А неўзабаве пачалася Вялікая Айчынная вайна.

Як памятаецца, быў Цэзар крыху ніжэй сярэдняга росту, каржакаватым, круглатварым. Умеў цікава расказваць.

...11 чэрвеня 1943 г. разгарэўся жорсткі бой. На нашы баявыя пазіцыі рушылі 98 варожых танкаў, каля палка пяхоты. Наша батарэя 76-міліметровых гармат адкрыла па ворагу агонь. Тое ж самае зрабілі і суседнія батарэі.

На гармату Ц. С. Раскавінскага рухаліся не менш дзесятка сталёвых машын. Упераддзе — чатыры «тыгры».

Другім ці трэцім снарадам разлік Раскавінскага падбіў адзін з танкаў. Той задыміў. Пад покрывам чорнага дыму другі «тыгр» пачаў абстрэльваць пазіцыі батарэі. Але менш чым праз хвіліну ўспыхнуў і ён.

А бой набіраў сілу. Была разбіта панарама гарматы, смяротна паранены байцы разліку. Ц. С. Раскавінскага аглушыла, адкінула ўбок. Хвіліну ці дзве ён прыходзіў у свядомасць. А потым падпоўз да гарматы, працягваў няроўны паядынак...

Калі гітлераўцы адступілі, у сектары абстрэлу гарматы Ц. С. Раскавінскага стаялі падбітымі 9 варожых танкаў.

За мужнасць і адвагу, паказаныя пры вызваленні белгарадскай зямлі, у лістападзе 1943 года Цэзару Сільвестравічу было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Ц. С. Раскавінскі не дажыў да Вялікай Перамогі. Ён загінуў пры вызваленні сяла Новая Прага Кіраваградскай вобласці (Украіна). Імя Героя носіць мясцовая сярэдняя школа.

К. Дзераўцоў

Вуліца імя героя

Міхаіл Якаўлевіч Сарокін нарадзіўся 9.10.1910 года ў г. Абдуліна Арэнбургскай вобласці. Бацькі — рабочыя. Быў ім і сам, а пасля скончыў будаўнічы тэхнікум. Але зусім мала часу выпала яму на тое, каб узводзіць дамы, прамысловыя аб'екты. Усё перапыніла вайна.

На фронт прыбыў у красавіку 1942-га. Прымаў удзел у шматлікіх баях. Поспех спрыяў афіцэру-артылерысту. Але па-са-

праўднаму талент камандзіра артылерыйскага дывізіёна раскрыўся ў кастрычніку 1943 года ў час фарсіравання Дняпра каля Лоева. За ўдзел у гэтай аперацыі маёру Сарокіну было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Дывізіён маёра М. Я. Сарокіна адыграў важную ролю ў час прарыву надзвінскіх пазіцый, вызваляў дзесяткі населеных пунктаў Рэчыцкага раёна і гарпасёлак Васілевічы.

11 снежня 1943 г. на адным з участкаў фронту склалася трывожная сітуацыя. Фашысты, валодаючы вышынёй, не давалі магчымасці прасоўвацца ўперад стралковаму падраздзяленню. Маёр Сарокін атрымаў загад артналётам падавіць гітлераўцаў. Адна з артылерыйскіх батарэй, дзе знаходзіўся і камандзір дывізіёна М. Я. Сарокін, вылучылася ўперад і падрыхтавалася да выканання баявой задачы. Але фашысты пайшлі ў контратаку. Неўзабаве пачалі закідваць гранатамі і бліндаж, дзе знаходзіўся маёр Сарокін. Але ён працягваў кіраваць боем. Артылерысты падавілі варожыя бронетранспарцёры, якія падтрымлівалі дзеянні сваёй пяхоты. Але гітлераўцы не думалі адступаць. І тады Сарокін аддаў загад камандзіру батарэі лейтэнанту А. І. Шаўцову перанесці агонь на скапленне варожай пяхоты. Гэта азначала: Сарокін выклікае агонь на сябе.

Міхаілу Якаўлевічу пашчасціла і тут. Фашысты былі вымушаны адступіць. Але 12 снежня М. Я. Сарокін быў цяжка паранены. Артылерысты вынеслі мужнага камандзіра з поля бою. Яго прывезлі ў Васілевічы, у шпіталь. Але рана была смяротнай...

Герой Савецкага Саюза маёр М. Я. Сарокін пахаваны ў г. Куйбышаве. Ягоным імем названа вуліца ў Рэчыцы. На радзіме Героя ўстаноўлены помнік.

А. Рабянок

Сцяганосец Перамогі

Дзень 30 красавіка 1945 г. выдаўся на рэдкасць цёплым і ясным. І толькі, бадай, над Берлінам неба было ахутана дымам і пылам. То там, то тут у горадзе ўспыхвалі перастрэлкі.

Гэты дзень, 30 красавіка 1945 г., стаў свайго роду гістарычным для разведчыкаў былога 674-га стралковага палка. Яны захапілі дом Гімлера. А зусім побач — рэйхстаг.

Раніцай да разведчыкаў завіталі камандзір палка падпалкоўнік Аляксей Дзмітрыевіч Плехаданаў, яго намеснік маёр Яўген Субоцін і парторг узвода Віктар Праватораў. Яны ж і паведамілі байцам, што неўзабаве пачнецца штурм рэйхстага.

— Будзем рыхтавацца, — адказаў за ўсіх лейтэнант, камандзір узвода С. Сарокін. Ён аддаў распараджэнне падрыхтаваць сцяг.

У штурмавую групу, якой належала ўзняць гэты сцяг над рэйхстагам, уключылі самых адважных і вопытных разведчыкаў. Сярод іх быў і радавы, беларус, ураджэнец Рэчыцы Міхаіл Антонавіч Пачкоўскі.

І вось пачалася артылерыйская падрыхтоўка. Рэйхстаг ахутаўся дымам. А калі гарматы і «кацюшы» сціхлі, штурмавыя падраздзяленні кінуліся ўперад. І тут высветлілася, што пераадолець плошчу, якая перад рэйхстагам, страшэнна цяжка, бо гітлераўцы, адчуваючы сваю гібель, адкрылі сапраўды знішчальны агонь. Але савецкіх байцоў ужо не магло стрымаць нішто. Шлях наперад яны пракладвалі і гранатамі, і аўтаматнымі чэргамі, і штыкамі.

Група разведчыкаў прабілася да франтона рэйхстага, замацавала на ім сцяг. Заўважыўшы гэта, нашы байцы, якія былі вымушаны залегчы пад агнём праціўніка, зноў падняліся ў атаку.

Гадзіннік паказваў у гэты час 14.25 па маскоўскаму часу.

Было баявое данясенне штаба 674-га стралковага палка. У ім паведамлялася аб тых, хто першым уварваўся ў рэйхстаг. Адзначалася, што ў гэты час ніякіх часцей, апрача падраздзяленняў палка, у рэйхстагу не было. Падпісаў дакумент начальнік штаба палка маёр Жаваронкаў. Дарэчы, факт, указаны вышэй, пацвярджае і баявое данясенне штаба былой 150-ай стралковай дывізіі за № 001/154, якое было адпраўлена ў штаб корпуса ў 4 гадзіны раніцы 1 мая. У данясенні называўся і дакладны час, калі над рэйхстагам быў узняты сцяг, — 14 гадзін 25 хвілін, 30 красавіка 1945 г. Пад дакументам гэтым стаяў подпіс палкоўніка Дзьячкова.

Разведчыкі, якія замацавалі над рэйхстагам сцяг, былі прадстаўлены да прысвоення звання Героя Савецкага Саюза. Вось іх

прозвішчы: Г. Н. Булатаў, М. С. Габідулін, С. Г. Арэшка, В. Праваторaў, а таксама камандзір узвода лейтэнант С. Сарокін. Праўда, названым вышэй людзям, у тым ліку і майму бацьку С. Г. Арэшку, за гэты подзвіг былі ўручаны ордэны Баявога Чырвонага Сцяга. Але невядома, чаму ніякай узнагароды не атрымаў М. А. Пачкоўскі. Ён жа быў разам з разведчыкамі, прозвішчы якіх названы вышэй.

3 мая 1945 г. газета былой 150-ай стралковай дывізіі «Воін Радзімы» ў артыкуле «Яны вызначыліся ў баі» з глыбокай павагай называла прозвішчы герояў. Было названа і прозвішча М. А. Пачкоўскага. А вядомыя ваенныя фотакарэспандэнты газеты «Правда» Якаў Румкін і Іван Шагін з «Комсомольской правды» сфатаграфавалі беларуса Міхаіла Пачкоўскага, казаха М. С. Габідуліна, рускіх Праваторава, Лысенку і Сарокіна, а таксама майго бацьку, украінца Арэшку, са сцягам Перамогі ля адной са скульптурных груп. Героі салютавалі сцягу, які быў узняты імі над рэйхстагам.

Гэта фота абышло потым увесь свет. Напярэдадні 40-годдзя з дня нашай Вялікай Перамогі фота зноў было змешчана ў газеце «Правда». Тады ж газета паведаміла, дарэчы ўпершыню, што сцяг быў узняты 30 красавіка 1945 г. у 14 гадзін 25 хвілін. На жаль, прозвішчы герояў названы не былі.

Неўзабаве такое ж фота было змешчана і на першай старонцы часопіса «Огонек». На фотакартцы разведчыкі былога 674-га стралковага палка — В. П. Праваторaў, М. Пачкоўскі, С. Арэшка, Г. Булатаў, С. Сарокін, П. Брахавецкі, М. Габідулін. Афіцэр жа з узнятым угару пісталетам — камандзір першага стралковага батальёна былога 756-га стралковага палка капітан Неустроеў.

Не лішне нагадаць і наступнае. У загадзе № 06 ад 30 красавіка 1945 г. па Першаму Беларускаму фронту гаварылася: «Войскі трэцяй ударнай арміі генерал-палкоўніка Кузняцова, працягваючы наступленне, зламалі супраціўленне праціўніка, занялі галоўны будынак рэйхстага, і сёння, 30 красавіка 1945 г. у 14 гадзін 25 хвілін узнялі над ім наш савецкі сцяг. У баях за раён і галоўны будынак рэйхстага вызначыўся 79-ы стралковы корпус генерал-маёра Перавёрткіна, 171-ая стралковая дывізія палкоўніка Нягоды і 150-ая стралковая дывізія генерал-маёра Шацілава». У дакуменце называліся і прозвішчы людзей, якія ўзнялі над рэйхстагам сцяг.

У свой час я адшукаў франтавога фотакарэспандэнта Якава Румкіна, вёў з ім гутарку. Ён падараваў мне на памяць гістарычны здымак.

...Назаўсёды захаваецца ў памяці той дзень, калі па цэнтральнаму тэлебачанню паказвалі 18-ы фільм кінаэпапеі «Вялікая Айчынная». Называўся ён «Бітва за Берлін». Як толькі на экране з'явіліся кадры ўзяцця рэйхстага, бацька не ўтрымаўся: «Толя, — закрычаў ён мне, — глядзі!»

Што ж узрушыла бацьку? Аказваецца, на прыступках галоўнага ўваходу ў рэйхстаг падымаліся са сцягам разведчыкі былога 674-га стралковага палка. Побач з Булатавым бег мой бацька, амаль поплеч з ім — парторг узвода Віктар Праваторaў, Іван Лысенка. Затым — Міхаіл Пачкоўскі, Павел Брахавецкі, камандзір узвода лейтэнант Сямён Сарокін.

Кадры гэтыя былі адзняты кінадакументалістам Раманам Карменам.

З ім я сустракаўся ў Маскве. Кінадакументаліст паабяцаў мне яшчэ раз вярнуцца да матэрыялу, які ён адзняў 30 красавіка 1945 г., калі штурмаваўся рэйхстаг. На жаль, гэтым планам Рамана Кармена не суджана было здзейсніцца, бо ён неўзабаве памёр.

Я звяртаўся ў Цэнтральны архіў Міністэрства абароны СССР. Атрымаў адтуль копію хадайніцтва камандзіра былога 674-га стралковага палка А. Д. Плехаданава, камандзіра былой 150-ай стралковай дывізіі генерал-маёра В. М. Шацілава і камандзіра былога 79-га стралковага корпуса генерал-маёра Перавёрткіна. Яны хадайнічалі, каб С. Г. Арэшку было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Сустракаўся я і з удзельнікамі штурму рэйхстага. Быў у Героя Савецкага Саюза І. Н. Лысенкі (сяло Кузняцы Бранскай вобласці), ездзіў да былога камандзіра ўзвода былога 674-га стралковага палка С. Сарокіна. Двойчы наведаў Рэчыцу, дзе гасцяваў у Міхаіла Антонавіча Пачкоўскага. Як памятаецца, гэта быў чалавек вялікай сціпласці. Ён не наракаў на тое, што яго абышлі, калі давалі ўзнагароды ўдзельнікам штурму рэйхстага.

Пасля вайны М. А. Пачкоўскі жыў на Украіне, працаваў забойшчыкам на шахце Горлаўкі. Але медыкі параілі яму змяніць работу. Міхаіл Антонавіч вярнуўся на радзіму. Скончыў тэхнікум. Працаваў у гандлі.

У 1983 годзе М. А. Пачкоўскі памёр.

А. Арэшка

Трагедыя сям'і Шпакавых

Бацькі

Напрыканцы мінулага стагоддзя з вёскі Вуць, што ў Добрушскім раёне, выправілася ў Рэчыцкі павет купка сялян, каб нагледзець прыдатную мясціну для перасялення. Тое, што шукалі, знайшлі каля Старога Барсука. Сустрэліся з мясцовым панам Кербічам, выпрасілі ў яго, каб прадаў латку лесу, дазволіў лес сячы ды ставіць на расцяробах жытло.

Пан згадзіўся. Мусіць, убачыў у Караленках, Данільчанках, Лабудзевых, Пшановых, што стаялі пачціва перад ім, добрых работнікаў і суседзяў.

Выслухаў тады панскую ласку і Рыгор Парфенавіч Шпакаў. Разам з іншымі заспяшаўся дамоў, каб сказаць жонцы Яўланні Яфімаўне коратка і рашуча: «Едзем!»

На новае месца маладая сям'я Шпакавых выправілася ўчатырох: бацькі ды іхнія зусім малыя сыны — Міхаіл з Пятром. Яшчэ сямёра дзяцей народзяцца ў Рыгора Парфенавіча і Яўланні Яфімаўны тут, у Новым Барсуку, названым як бы ў гонар суседняе вёскі, куды неўзабаве пацягнуцца і каторыя тутэйшыя.

Напэўна ж, не раз і не два думалася Рыгору Парфенавічу і Яўланні Яфімаўне пра тое, як будзе яно на новай старане. Але была ў іх упэўненасць на лепшае. Ды і як інакш: меў гаспадар па-сапраўднаму залатыя рукі. Цесля — што пашукаць. Да справы звыклы змалку. Пераймаў добрае ад продкаў сваіх. То і дзяцей потым вучыў: галоўнае з багацця — майстэрства ў рамястве, а хлеб найсмачнейшы, што ўласнымі рукамі вырашчаны.

...Карчавалі Шпакавы лес ды ляда, адваёўвалі зямлю пад жытло ды агарод. Паставілі хату. І поўнілася яна звонкімі дзіцячымі галасамі. Было ў ёй восем братоў ды сястра.

Неўзабаве давялося Рыгору Парфенавічу і Яўланні Яфімаўне рупіцца пра новую хату. Гэта калі надумаліся разам з іншымі пераехаць у пасёлак Шчытоў (Зара Свабоды).

На гэты раз працавалася спарней. Бацькам дапамагалі хлопцы.

Прыйшла чарга ставіць хаты і ім. І зноў усё рабілася спорна і з ахвотаю.

Пазіраў Рыгор Парфенавіч на сыноў, адчуваў задавальненне. Разумеў: здолеў-ткі перадаць ім галоўнае, што меў, — майстэрства ды ахвоту да працы, настойлівасць і старанне.

Пётр Рыгоравіч Шпакаў (сядзіць) з сябрамі

Дзеці жаніліся. Працавалі ў калгасе. Ехалі вучыцца. Спакойна было за іх на душы ў Рыгора Парфенавіча і Яўланні Яфімаўны. А бяда прытаілася зусім блізка. Страшэнная бяда. Яна забярэ шасцярых з сыноў, двух унукаў, унучку...

Пачалася вайна. Вялікая Айчынная...

Дзеці

Міхаіл. Нарадзіўся ў 1894-ым. Працаваў у калгасе. Падчас вайны меў чацвярых дзяцей — сыноў Паўла і Фёдара, дачок Ліду і Таццяну. На фронт яго не ўзялі. Туды ішлі маладзейшыя. Меў сувязь з партызанамі, выправіў у атрад «Мсцівец» старэйшага сына. Павел загінуў у адным з баёў.

Страшэнны лёс напаткаў і самога Міхаіла Рыгоравіча. Немцы схапілі, каб вывезці ў Германію. Але... У Заспе яго закатавалі мясцовыя здраднікі...

Ягонае мёртвае цела знайшла пад гарою тутэйшая жыхарка, што некалі жыла ў Духанаўцы. Яна і пахавала пакутніка.

Пятро. Нарадзіўся ў 1896-ым. Працаваў

у калгасе. Гадаваў сыноў Мікалая і Івана, дачку Ліду. На фронт адправіўся ў першыя дні вайны. Зачыніў за сабою дзверы назаўсёды...

З ворагам змагаўся ва Украінскім партызанскім злучэнні С. А. Каўпака старэйшы сын Пятра Рыгоравіча, Мікалай. Потым, калі фронт адкаціўся на захад, служыў Мікалай у органах НКУС. Змагаўся з бандытамі. Жыў у Кіеве. Палкоўнік. На жаль, памёр дачасна.

Згарэла ад тыфусу дачка Пятра Рыгоравіча, Ліда. У 1943-ім, калі ўжо выходзілі людзі з лесу, дзе хаваліся ад чужынцаў...

Малодшы сын Пятра Рыгоравіча — Іван — жыў у Чарнобылі. Працаваў механізатарам. А як здарылася там вялікая бяда, мусіў перасяліцца бліжэй да Кіева. Хаця і там шчодра натрусілася чарнобыльскага попелу.

Купрыян. Нарадзіўся ў 1902-ім. Працаваў у калгасе. Гадаваў сына Рыгора, названага так у гонар дзеда. На фронт пайшоў у 41-ым. Трапіў у акружэнне. Прабіцца да сваіх не ўдалося. Вярнуўся дамоў. Неўзабаве стаў байцом Украінскага партызанскага злучэння С. А. Каўпака. Удзельнічаў у цяжкім рэйдзе па Карпатах. Каўпакаўцы нішчылі тады нафтапромыслы на граніцы з Румыніяй. Немцы акружылі, заціснулі ў цясніне. Раз-пораз налятала варожая авіяцыя. Здавалася, што выйсця не будзе. Але С. А. Каўпак зразумеў: прабіцца можна праз гарадок, дзе на кожным кроку немцы... Мужны партызанскі важак загадаў выходзіць любымі групамі, а збірацца на мяжы Беларусі і Жытоміршчыны.

Купрыян Шпакаў выходзіў з акружэння разам з земляком Ігнатам Пшановым і баявым сябрам з Лоева. На месцы ж умоўленага збору нікога не знайшлі. Рушылі ў родныя мясціны. Прыйшлі з кулямётам, аўтаматам і вінтоўкай.

Дома Купрыян Рыгоравіч пабыў толькі дзень. Назаўтра адправіўся ў партызанскі атрад «Мсцівец». Загінуў у пачатку 1944-га ў жорсткім баі каля Стрэшына...

Уладзімір. Нарадзіўся ў 1905-ым. Працаваў у калгасе. Гадаваў сына Івана. На фронт пайшоў, як і брат Пятро, у першыя дні вайны. Прапаў без вестак...

А сын яго вырас. Жыве на Украіне.

Восіп. Нарадзіўся ў 1907-ым. Выправіўся, як падрос, з бацькоўскае хаты ў Кемераўскую вобласць. Працаваў на чыгунцы. А чыгуначнікі, як вядома, былі на брані. Таму і не выпала ісці на фронт.

Купрыян Рыгоравіч Шпакаў



Пракоп Рыгоравіч Шпакаў

Піліп. Нарадзіўся ў 1910-ым. З вайны вярнуўся інвалідам. Даведаўся, што загінулі не толькі шасцёра братоў, але і памёр ягоны сын Міхаіл. Да апошніх сваіх дзён жыў у Шчытове.

У сыноў Піліпа Рыгоравіча, Івана і Мікалая, свае сем'і. Адзін жыве ў Новым Барсуку, другі — у Нова-Беліцы.

Пракоп. Нарадзіўся ў 1913-ым. Па камсамольскай пуцёўцы паехаў ва Уладзівасток. Працаваў на будоўлі. А тут вайна. Пайшоў на яе з першых дзён. Ужо на фронце скончыў паскораныя курсы афіцэраў. У канцы 43-га бацькі яго, Рыгор Парфенавіч і Яўланія Яфімаўна, атрымалі ад сына ліст. Прасіў паведаміць і пра братоў. Напісалі, выціраючы слёзы: няма Міхаіла, Пятра, Уладзіміра, Фёдара... Неўзабаве загіне і Купрыян...

Пракоп адказаў: за смерць братоў будзе помсціць ворагу бязлітасна.

Афіцэр-танкіст Пракоп Рыгоравіч Шпакаў дайшоў да Берліна. Там і загінуў. У апошні дзень вайны — 8 мая 1945-га...

Фёдар. Нарадзіўся ў 1915-ым. Скончыў школу ў родным Барсуку. Паехаў на Кемераўшчыну да брата Восіпа. Паступіў у Томскае артылерыйскае вучылішча. Служыў у г. Балашове Саратаўскай вобласці. Ажаніўся. Быў надта рады, калі нарадзілася дачка Ларыса. Перад вайной быў накіраваны ў Беларускую асобую ваенную акругу. Артылерыйская брыгада, у якой служыў, прыняла на сябе адзін з першых удараў ворага. Адступаў. На тэрыторыі Украіны брыгада трапіла ў акружэнне. Дакументы часці разам са спісам асабовага саставу давялося закапаць у зямлю. Усё гэта будзе знойдзена следапытамі ў канцы 80-ых гадоў. На

Фёдар Рыгоравіч Шпакаў

адным з аркушаў следапыты прачытаюць, хаця і з цяжкасцю, прозвішча афіцэра Фёдара Рыгоравіча Шпакава.

Але ён, Фёдар Рыгоравіч, тады, у пачатку восені 1941-га, не загінуў. Трапіў у палон. Здолеў вырвацца адтуль. Прыйшоў дамоў. Узяўся за наладжванне патрыятычнага падполля. Стаў партызанам. Восенню 1942-га далучыўся да С. А. Каўпака. Загінуў вясной наступнага года ў жорсткім баі, што адбыўся на мяжы Украіны і Лельчыцкага раёна. Пахаваны камандзір партызанскай роты Фёдар Рыгоравіч Шпакаў у вёсцы Будча.

Таццяна. Нарадзілася ў 1900-ым. Працавала ў калгасе разам з мужам Міхаілам Сяргеевічам Хадоркіным. Ганарылася ім: майстра на ўсе рукі. Усё ў яго ладзілася.

Ды нядоўгім было шчасце. Чыркануў на яго нейкі хцівы ды крывослівы чалавечак. Арыштавалі Міхаіла Сяргеевіча 7 лютага 1938 года. Забралі маёмасць. Абвінавацілі ў антысавецкай агітацыі.

Праз восем дзён выслухаў М. С. Хадоркін страшны і несправядлівы прысуд: ВМП (вышэйшая мера пакарання). «За што?!» — пакутліва білася ў галаве думка. Але асобая тройка НКУС БССР тады, у 1938 годзе, сваіх рашэнняў не адмяняла. Ніколі.

Расстралялі мужа Таццяны Рыгораўны 13 сакавіка 1938 года. Рэабілітавалі 14.6.1989. Больш як праз 50 гадоў...

* * *

...Восень 1943-га. Рыгор Парфенавіч і Яўлання Яфімаўна хаваліся з унукамі і іншымі насельнікамі Шчытова ў лесе. Даглядалі 7 кароў і некалькі коней. Каровы і коні толькі гэтыя і ацалелі на ўвесь сельскі Савет.

У лістападзе, калі прыйшлі нашы і фронт адкаціўся на захад, вярнуліся ў Новы Барсук. Перазімавалі тут. А вясною два Рыгоры, дзед і ўнук, узяліся за будаўніцтва. За плячыма Рыгора Парфенавіча было ўжо як не восемдзесят гадоў. Але ён, скамянелы душою ад гора, знайшоў у сабе сілы, каб пабудаваць яшчэ адну хату. Усё звычайнай сякерай. І падлогу, і дзверы... Трымаў каля сябе ўнука. Каб акарыў бервяно, дапамог адрэзаць пілою. А ўнуку было ўсяго дзевяць гадкоў.

Сёння Рыгору Купрыянавічу Шпакаву, унуку Рыгора Парфенавіча, за 60. І ў гэтым чалавеку выразна бачыцца ўсё тое, чым адметны Шпакавы. Сумленне і настойлівасць, патрабавальнасць да сябе і іншых. А яшчэ — грунтоўнасць і абавязковасць.

1 красавіка 1969 года быў абраны старшынёй калгаса «50 гадоў Кастрычніка». Колькі было пасля гэтага справаздачна-выбарчых сходаў! А людзі нязменна галасуюць за яго. Калгас жа, які ўзначальвае, адзін з лепшых у раёне.

Р. К. Шпакаў — старшыня Савета РАПА, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі рэспублікі, ардэнаносец.

Р. К. Шпакаў — у пэўнай ступені чалавек кансерватыўны. Але ж кансерватыўнасць ягоная грунтуецца на глыбокім перакананні, што нельга ламаць, не збудаваўшы новае. «Хаюць калгас, — разважае Рыгор Купрыянавіч, — раяць дзяліць зямлю і тэхніку, жывёлу, збудаванні ... Можна падзяліць. А як дзяліць вёску? Тых нямоглых ужо, што не патрэбны ніякаму фермеру?..»

Шпакаўскі характар уласцівы і дзецям Рыгора Купрыянавіча. Так, старэйшы сын Сяргей скончыў вайсковае вучылішча, а потым і акадэмію. З залатым медалём. Зараз падпалкоўнік, дэпутат Вярхоўнага Савета рэспублікі. Малодшы сын Аляксандр скончыў Гомельскі політэхнічны інстытут. Жыве і працуе ў Рэчыцы дачка Таццяна.

Дарэчы, склаў галаву ў баі пад Смаленскам і бацька Лілії Трыфанаўны, жонкі Р. К. Шпакава, — Трыфан Варфаламеевіч Ціманенка. Мужна змагаліся з ворагам і яе дзядзькі — Аляксандр і Барыс. Лілія Трыфанаўна — дырэктар Левашоўскай няпоўнай сярэдняй школы.

...Шпакавы... Суровы лёс не раз гнуў гэты род. А яны, Шпакавы, жывуць. Смела і адкрыта глядзяць у вочы людзям. Бо на такіх, як яны — змагарах і будаўніках, — і трымаецца зямля.

П. Рабянок

На Рэчыцкім напрамку

З успамінаў П. І. Батава, генерала арміі, двойчы Героя Савецкага Саюза

БАТАЎ Павел Іванавіч нарадзіўся 1.6. 1897 г. у в. Філісава Рыбінскага р-на Яраслаўскай вобл. Член КПСС з 1929 г. У Чырвонай Арміі з 1918. Скончыў курсы «Выстрал» (1927), Вышэйшыя курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба (1950). Удзельнік 1-ай сусветнай і грамадзянскай войнаў, нацыянальна-рэвалюцыйнай вайны ў Іспаніі 1936—1939 гг., савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. З чэрвеня 1941-га камандзір стралковага корпуса, намеснік камандуючага, камандуючы арміяй, намеснік камандуючага войскамі Бранскага фронту. З кастрычніка 1942 г. камандуючы 65-ай арміяй, якая дзейнічала на Данскім, Сталінградскім, Цэнтральным, 1-ым і 2-ім Беларускіх франтах. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў. У кастрычніку 1943 г. 65-ая армія фарсіравала Дняпро каля Лоева, захапіла плацдарм, у лістападзе 1943 г. прымала актыўны ўдзел у вызваленні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Рэчыцкага р-на. 65-ая армія брала таксама ўдзел у вызваленні Мазыра, Бабруйска, Асіповіч, Слоніма, у 1945 г.— Ростака, Шчэціна, Гданьска і інш.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны П. І. Батаў на камандных пасадах у Савецкай Арміі. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1937—1950 гг., 1954—1966 гг. Аўтар кнігі «В походах и боях» (М., 1974) і інш. П. І. Батаў — ганаровы грамадзянін Рэчыцы. Разам з тым ён ганаровы грамадзянін Баранавіч, Бабруйска, Калінкавіч, Лоева, Светлагорска, Слоніма.

П. І. Батаў памёр 19.4.1985 г.

П. І. Батаў

Войска 1-го Белорусского фронта под командованием К. К. Рокоссовского, форсировав Десну, Сож, Днепр, 15 октября 1943 года захватили плацдарм оперативного значения южнее Лоева и тем самым положили начало освобождению Белоруссии.

...В войсках шла напряженная подготовка к новой наступательной операции. Победа на Днепре высоко подняла боевой дух войск. 183 воинам 65-й армии было присвоено звание Героя Советского Союза. Политработники и командиры стремились закрепить этот подъем в войсках. Во всех соединениях и частях шли разборы форсирования Днепра и прорыва «Восточного вала». Предстояла новая операция — надо было прорвать надвинские позиции гитлеровских войск.

10 ноября 1943 года в 11 часов после 40-минутной артиллерийской подготовки войска 65-й армии начали наступление. Прорвав сильно укрепленную оборону немцев, решительным ударом наступающие части устремились вперед. Уже через два часа были взяты шесть сильных опорных пунктов в тактической глубине. Противник, опираясь на хорошо подготовленную оборону, оказывал упорное сопротивление. Через четыре часа после атаки пехоты был введен в бой 1-й гвардейский танковый корпус. Его танки, сокрушая оборону противника, неудержимо двигались вперед.

По данным фронтовой и армейской разведки и по сведениям, полученным от белорусских партизан, было известно, что в ближайших тылах противника, особенно в районе станции Демехи и города Речицы, скапливаются отходящие из-под Гомеля значительные силы. Там уже находились части 4-й и 12-й пехотных дивизий, 733-й полк охранной 203-й дивизии и несколько других армейских частей 2-й немецкой армии. К утру резервные части могли занять оборону на каком-нибудь промежуточном рубеже, и тогда войска нашей армии вновь встретились бы с организованной обороной и сопротивлением. Нужно было упредить врага вводом новых оперативных резервов.

Глубоко вклинившись за ночь в тыл противника, танковые и кавалерийские части перерезали все дороги, ведущие из Гомеля на Калинковичи. Встретив наши танки и кавалерию, немцы повернули назад на Речицу. Они, видимо, рассчитывали вновь переправиться на восточный берег Днепра и соединиться с главными силами гомельской группировки, для которой теперь оставался единственный путь отступления — через полесские болота. Но за Днепром к Речице уже подходили стрелковые корпуса 48-й армии.

Путь врагу был отрезан.

Речица не входила в полосу наступления 65-й армии. Но создалась благоприятная обстановка для глубокого маневра и удара по городу с тыла. Здесь действовали 19-й кор-

пус, танковый Донской корпус, партизанское соединение под командованием И. Кожара, которые к этому моменту вели активные боевые действия в районе севернее станции Демехи.

Соединение Кожара очистило от немецко-фашистских войск значительную территорию вдоль рек Шибенка, Днеприк. Встреча наших войск и партизан в этом районе положительно сказалась на совместных действиях. Партизаны надежно прикрыли левый и правый фланги нашей армии, они дали ценную информацию о гарнизоне немцев в Речице.

Генерал Д. И. Самарский к этому времени сумел переправить через Днепр все свои четыре дивизии. Упустить такую возможность было бы непростительно. Я доложил об этом К. К. Рокоссовскому.

— Решение считаю правильным, — одобрил командующий. — Действуйте без промедлений.

План разгрома немецкого гарнизона в Речице предусматривал следующее: партизанское соединение И. Кожара перерезает дорогу Озерщина — Горваль, преграждает путь отхода немцев. Для этого были выделены две партизанские бригады, находящиеся в районе Береговая Слобода, Глыбов. Две танковые бригады танкового корпуса Панова во взаимодействии с 37-й гвардейской и 162-й стрелковыми дивизиями нанесли удар по Речице с северо-запада, ворвались и завязали бой на улицах города. С востока наступал стрелковый корпус соседней 48-й армии. Он сковал значительные вражеские силы, предназначенные для обороны города. Мы овладели Речицей без потерь, не дали врагу разрушить город, захватили богатые трофеи и много пленных.

Внезапный огонь по городу с тыла создал условия для нашей армии вместе с левофланговыми соединениями армии П. Л. Романенко, при надежном обеспечении со стороны партизанского соединения И. Кожара, окружить и разгромить вражескую группировку. Через несколько дней она сдалась в плен. Лишь часть сил врага, в основном штабы соединений, прорвались на запад. В числе первых в Речицу ворвался старшина роты 194-го стрелкового полка А. Морозов, который водрузил на самом высоком здании города — техникуме красный флаг. В это время 37-я гвардейская стрелковая дивизия совместно со 115-й стрелковой бригадой вели напряженные бои на южной окраине Речицы, сдерживая большие силы врага, пытавшегося прорваться в город с юга.

Перед правым флангом войск армии в результате достигнутого успеха на речицком направлении образовался почти полностью открытый фронт. На отдельных рубежах оборонялись разрозненные группы противника. Корпус генерала Д. И. Самарского быстро продвигался вперед. Вскоре он вышел на правый берег Березины и взял направление на Паричи. Начались полесские болота. В центре и на левом фланге войска армии продолжали стремительное наступление, преодолевая промежуточные оборонительные рубежи гитлеровцев. С минуты на минуту ждали донесения об освобождении Василевичей.

...В течение ноября наша армия, преодолевая упорное сопротивление неприятельских войск, продолжала наступление. За полтора месяца после форсирования Днепра было уничтожено: 375 орудий и минометов, 258 танков и самоходных орудий, 34 бронетранспортера, один бронепоезд и много другой техники. Захвачено в качестве трофеев 53 танка и самоходных орудий, четыре бронетранспортера, 249 орудий и минометов, до 1000 автомашин, 53 различных склада.

За это время войсками 65-й армии было освобождено более 300 населенных пунктов Белоруссии. Среди них города Лоев, Речица, Василевичи, поселки Ветхинь, Горваль, Короватичи, Шатилки, Здудичи и другие. Наступление войск армии развивалось успешно, особенно на правом фланге 19-го корпуса генерала Д. И. Самарского.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: В боях за Белоруссию. Мн., «Беларусь», 1974. Стар. 252—258.

Першымі пайшлі мы

З успамінаў Б. Краснова, былога камандзіра ўзвода

...З надыходам цемры ў тую памятную лістападаўскую ноч 1943 года падраздзяленні 162-ой Сярэднеазіяцкай Ноўгарад-Северскай стралковай дывізіі непрыкметна для ворага выходзілі да паўночных і паўночна-заходніх ускраін Рэчыцы, каб на досвітку раптоўна ўдарыць па фашыстах. Прыкрываючыся густой заслонай туману, падраздзяленні 194-га Чырванасцяжнага Ташкенцкага і 209-га Зайсанскага стралковых палкоў шчыльным паўкальцом ахоплівалі горад.

Да атакі ўсё гатова. Але праходзіць гадзіна, другая — туман не спадае. Афіцэры трывожна пазіраюць на гадзіннікі, а сігналу ўсё няма. І толькі гадзін у дзесяць, калі туман крыху рассеяўся і пачалі вызначацца абрысы гарадскіх пабудоў, у небе павіслі чырвоныя ракеты. У той жа момант ранішнюю цішыню раскалолі гарматныя і мінамётныя залпы, а з туманнай імглы пачулася дружнае «ура». Штурм пачаўся!

Раптоўнай, імгненнай атакай палкі зламалі ў многіх месцах супраціўленне гітлераўцаў і пачалі праследаваць асобныя групы фашыстаў непасрэдна ў горадзе.

Першай да цэнтра Рэчыцы прарвалася група разведчыкаў у складзе старшыны Л. Я. Марозава, яфрэйтара Д. Р. Фаміна, радавых В. С. Чарвочкіна, Г. Д. Афанасьева і іншых. Хто ж яны, воіны-героі, якія першымі ўзнялі пераможны сцяг над Рэчыцай?

Камандзір узвода разведкі старшына Л. Я. Марозаў — рускі, сын луганскага рабочага. Да вайны сам працаваў рабочым. Памятаючы нашэсце немцаў на ўкраінскую зямлю яшчэ ў 1918 годзе, Марозаў люта ненавідзеў фашысцкіх акупантаў. Таму ў кожным баі быў сярод першых. Асабіста знішчыў нямала фашыстаў. Падначаленыя яго любілі — патрабавальнага, але ў той жа час сціплага, клапатлівага і смелага. Курская дуга, Сеўск, пераправы на Дзясне, Сажы, Дняпры, вызваленне Рэчыцы і Палесся — вось ягоны баявы шлях. За ратныя подзвігі быў узнагароджаны ордэнамі Славы II і III ступеней, двума медалямі «За адвагу».

Яфрэйтар Д. Р. Фамін — сібірак, пагранічнік, таксама смелы і знаходлівы разведчык. Удзельнічаў у многіх жорсткіх баях, смелых вылазках у тыл ворага. І заўсёды з'яўляўся прыкладам мужнасці, адвагі, узорнага выканання воінскага абавязку. Баявыя подзвігі Фаміна былі адзначаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За адвагу».

Радавыя В. С. Чарвочкін і Г. Д. Афанасьеў — маладыя салдаты. Марозаў называў іх сынамі. Па ўзросту яны і сапраўды для яго былі сынамі, таму што не мелі яшчэ і па васемнаццаць гадоў. Іхні баявы шлях — тры месяцы. Тым не менш хлопцы ўжо мелі па баявым медалі.

...Пасля вызвалення Рэчыцы наш полк рушыў на захад, вызваляючы гарады і вёскі шматпакутнай Беларусі. На жаль, старшына Л. Я. Марозаў і радавы В. С. Чарвочкін не дажылі да светлага Дня Перамогі. Яны загінулі смерцю герояў у адзін і той жа дзень — 17 студзеня 1944 года. Пахаваны ж у брацкіх магілах палескіх вёсак Верхнія Казловічы і Цыдаў. У адным з баёў на беларускай зямлі восем раненняў атрымаў яфрэйтар Д. Р. Фамін. Але зноў вярнуўся у баявы строй, працягваў барацьбу з лютым фашысцкім ворагам.

Крок за крокам

З успамінаў С. Шышкіна, камандзіра мінамётнай роты былога 120-га стралковага палка 69-ай стралковай Сеўскай двойчы Чырванасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава дывізіі

...У сярэдзіне дня 11 лістапада 1943 года на подступах да вёскі Надзвін у цяжкім баі з варожымі танкамі сапраўдны подзвіг здзейснілі малодшы сяржант К. А. Скоба і радавы П. А. Дзмітрычэнка. З супрацьтанкавага ружжа яны падбілі тры фашысцкія браніраваныя машыны, тым самым затрымалі чарговую атаку гітлераўцаў і забяспечылі рух наперад стралковых падраздзяленняў дывізіі. А на зыходзе таго ж дня наш полк заняў заходнюю ўскраіну Надзвіна.

Увесь наступны дзень — 12 лістапада і палову дня 13 лістапада падраздзяленням

дывізіі давялося адбіваць шматлікія контратакі ворага. І толькі ў другой палове 13 лістапада пасля артылерыйскай падрыхтоўкі нам удалося нарэшце выбіць фашыстаў з вёскі. Але на гэтым баі за Надзвін не скончыліся, бо немцы некалькі разоў спрабавалі атакоўваць нашы пазіцыі. Праўда, поспеху іхнія атакі не мелі.

У баях за Надзвін вызначыўся наводчык супрацьтанкавага ружжа старшы сяржант П. С. Собалеў. Удала выбраўшы пазіцыю, адважны бранябойшчык падбіў два варожыя танкі. А вось трэцяму ўдалося дабрацца да нашых акопаў. Танк струшчыў гусеніцамі ружжо старшага сяржанта, а сам ён быў засыпаны зямлёй.

У нашым палку яго лічылі загінуўшым. Толькі праз некаторы час мы даведаліся, што параненага бранябойшчыка Собалева падабралі санітары аднаго з падраздзяленняў дывізіі і накіравалі ў шпіталь.

Праз два месяцы Собалеў вярнуўся ў родны полк. Даведаўся, што яго прадставілі да ўзнагароды амерыканскім ордэнам. І тады мужны сяржант звярнуўся з пісьмом да члена ваеннага савета 65-ай арміі генерала М. А. Радзецкага, у якім расказваў сутнасць справы. Собалеў прызнаваўся, што савецкая ўзнагарода для яго даражэй за любую іншую.

Пісьмо старшага сяржанта глыбока кранула Мікалая Антонавіча. І ён, генерал Радзецкі, звярнуўся ў сваю чаргу да генерала П. І. Батава. Павел Іванавіч таксама згадзіўся, што атрымалася не зусім добра: героя адзначылі замежнай узнагародай, а айчыннага ордэна не далі.

Неўзабаве старшы сяржант П. С. Собалеў апроч амерыканскага ордэна атрымаў і ордэн Айчыннай вайны II ступені.

...18 лістапада 1943 года Рэчыца і раён у асноўным былі вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Заслуга ў тым была і падраздзяленняў нашай дывізіі, якія крок за крокам, з цяжкімі баямі прасоўваліся ўперад па зраненай, здратаванай танкамі шматпакутнай зямлі Беларусі.

У тыя памятныя дні

З успамінаў Віктара Рыгоравіча Арлова, былога камсорга 220-га гвардзейскага знішчальна-супрацьтанкавага артылерыйскага палка 48-ай арміі

...Сярод часцей і злучэнняў, якія прымалі актыўны ўдзел у баях за вызваленне Рэчыцы і Рэчыцкага раёна, быў і наш 220-ы гвардзейскі знішчальна-супрацьтанкавы артылерыйскі полк, які ўваходзіў у састаў былой 48-ай арміі генерала П. Л. Раманенкі. За плячыма палка слаўны баявы шлях. Гэта і бітва за Сталінград, за Курск і г. д.

У кастрычніку 1943 года падраздзяленні палка пераправіліся праз Дняпро каля Лоева. Замацаваўшыся на рубяжы, некалькі дзён стрымлівалі шалёны націск фашыстаў.

Калі распачаліся баі за вызваленне Рэчыцкага раёна, наш полк браў удзел у разгроме варожых часцей у раёне вёскі Холмеч. Але асабліва запамятаўся мне жорсткі бой за вёску Ровенская Слабада. Асабліва вызначыўся тут Мікалай Рыгоравіч Лагута. У Сталінградзе і пад Курскам гэты чалавек быў наводчыкам, а потым камандзірам гарматы, з'яўляўся сапраўдным майстрам артылерыйскага агню прамой наводкай. Потым ён быў прызначаны старшынай батарэі. І вось пад Ровенскай Слабадой Лагута даставіў на агнявыя пазіцыі снарады, загнаў машыну ва ўкрыццё. Пачаў сачыць, як разгортваюцца падзеі на батарэі. І тут заўважыў, што адна з нашых гармат змоўкла. Гэта азначала тое, што або гармата выйшла са строю ў выніку пападання нямецкага снарада, або загінуў разлік.

Старшына падпоўз да гарматы і ўбачыў: з разліку ў жывых няма нікога. Мікалай Рыгоравіч стаў да прыцэла і зрабіў усё, каб адбіць варожую атаку. Потым была яшчэ адна, і яшчэ... Але Лагута не адступіў, ён стаяў, як кажуць, да апошняга і ўтрымаў рубеж.

Прыклад гераізму і мужнасці ў баі за Ровенскую Слабаду паказалі таксама наводчыкі гармат Бутэнка, Каламытцаў, камандзіры разлікаў Осіпаў, Багамолаў, Цяслюк, камандзіры батарэй Сафонаў, Смірноў і многія іншыя. Днём і ноччу працавалі начальнік штаба палка Г. П. Малышукоў і ягоны памочнік П. Ф. Усенка, начальнік сувязі палка М. Д. Лукашоў. Умела манеўраваў батарэямі камандзір палка П. М. Бублікаў. Шмат работы клалася на плечы артылерыйскага майстра Аносава, які нярэдка пад шквалам варожага агню вяртаў пашкоджаныя гарматы ў строй.

Давялося падраздзяленням палка змагацца з фашыстамі пад Каравацічамі, вызваляць іншыя вёскі раёна. Нямала зрабіў полк і для таго, каб выбіць гітлераўцаў з Рэчыцы.

Дарэчы, многія ўдзельнікі баёў за Рэчыцу і раён прыклады мужнасці і гераізму паказалі і ў наступных выпрабаваннях. Так, наводчыку гарматы Дзмітрыю Лявонцьевічу Чапусову ў 1944 годзе было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Так адзначыла яго Радзіма за асабістую мужнасць пры ліквідацыі Мінскага катла. Наводчык Чапусоў, а потым камандзір гарматы быў прыкладам для іншых і пры вызваленні Ровенскай Слабады, Рэчыцы.

Дарэчы, нашаму палку была прысвоена назва Рэчыцкага і ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Да канца вайны полк падтрымліваў сувязь з камсамолам Рэчыцы і раёна, шэфстваваў над мясцовым дзіцячым домам.

Яны ўдзельнічалі ў вызваленні Рэчыцы і раёна

У сярэдзіне студзеня прайшоў раённы партыйны сход, на якім абмяркоўваліся рашэнні ЦК ВКП(б) па справаздачы Гомельскага абласнога камітэта партыі. Згодна з рашэннем Дзяржаўнага Камітэта Абароны, у Рэчыцы павінна было распачацца ўзвядзенне домабудаўнічага камбіната, аднак зроблена было зусім мала. У Рэчыцы і раёне марудным тэмпамі ішло будаўніцтва жылля для калгаснікаў, рабочых і служачых.

У першай палове лютага раён выканаў дзяржаўны план здачы льнасемя. Перадавікамі з'яўляліся калгасы «Чырвоны барэц» Артукоўскага, імя Фрунзе Нова-Барсуцкага і імя Кірава Свірыдавіцкага сельсаветаў.

У першым квартале 1945 г. прадпрыемствы Рэчыцы змагаліся за дастойную сустрэчу 27-ай гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Пераможцамі спаборніцтва сталі калектывы суднабудаўнічай верфі, заводаў імя Кірава і імя Інтэрнацыянала.

На перадавым прадпрыемстве камса-

мольска-маладзёжныя брыгады Вольгі Барысенкі, Таісы Алтынбаевай, Марыі Пінчук, Івана Лапіна і Івана Вераб'я дзённыя заданні рэгулярна выконвалі на 140—200 працэнтаў. Суднабудаўнічая верф рыхтавалася да новага метаду работы — паточнага. Адкрыліся курсы па падрыхтоўцы цесляроў. Быў створаны цяслярскі цэх, дзе выраблялі будаўнічыя матэрыялы. Найбольшага плёну дасягала тут камсамольска-маладзёжная брыгада Любы Чудноўскай, у якой былі толькі дзяўчаты.

На цвіковым заводзе імя Інтэрнацыянала не было роўных брыгадзе слесараў Васіля Мельнічэнкі. За кароткі тэрмін яна адрамантавала і ўкамплектавала 3 шрубарэзныя станкі-аўтаматы. 2 цвіковыя аўтаматы падрыхтавала да работы брыгада ў саставе слесараў Уладзіміра Кавалеўскага і Барыса Цітава, якой дапамагалі трое вучняў.

На Рэчыцкай аўтабазе быў узведзены цэх па вырабу цурак для газагенератарных машын. Заканчвалася будаўніцтва электразварачнага цэха. Арцель «Чырвоны баец» асвоіла выпуск літровых кружак для запраўкі трактароў. Да 1 красавіка іх было выпушчана амаль 3 тысячы. 17 красавіка быў пушчаны ў эксплуатацыю Заспенскі крухмальны завод. Да 25 красавіка было выраблена 5 тон крухмалу. Аднавіла работу прамысловая арцель «Кустметал». З 1 красавіка тут пачала дзейнічаць кузня. Пры арцелі адкрыліся цырульня, майстэрні па рамонту гадзіннікаў і музычных інструментаў, фатаграфія.

Ганчарны цэх цагельнага завода № 2 заданне квартала перавыканаў на 70 працэнтаў. Новыя судны, баржы і цягачы атрымалі рэчыцкія рачнікі.

Рыхтаваўся да сезону перапрацоўкі малочных прадуктаў Рэчыцкі маслазавод. Прадпрыемства абсталявала ў раёне 7 пунктаў па прыёму малака ад гаспадарак і насельніцтва.

Да сярэдзіны студзеня калектыў Васілевіцкай МТС адрамантаваў 10 трактароў.

У пачатку красавіка ў раёне распачалася *веснавая сяўба*. Паўсюдна не хапала коней, таму ў плугі ўпрагалі кароў. 21 красавіка першым у раёне сяўбу скончыў калгас імя Ліцвінава Азершчынскага сельсавета.

Прадпрыемствы, арцелі і майстэрні Рэчыцы змагаліся за дастойную сустрэчу Першамая. Першынство заваяваў калектыў завода імя Варашылава. План адгрузкі спажыўцам лесаматэрыялаў Рэчыцкая лесабаза перавыканала на 163 працэнты.

Больш чым удвая заданне красавіка перавыканалі бляшаны цэх арцелі «Чырвоны баец» і ганчарны цэх райпрамкамбіната.

Сярод лепшых быў і калектыў леспрамгаса. Ён не толькі перавыконваў заданні, але і прыняў актыўны ўдзел у зборы сродкаў для будаўніцтва танка «Ударнік лесу».

20 красавіка распачалася здабыча торфу на торфазаводзе «Закрашынскі Мох». Калектыў прадпрыемства працаваў у 2 змены, за першыя 8 гадзін змена Матруны Малчанавай выпрацавала 25 тысяч торфацаглін.

1 мая лепшым стаханаўцам торфазавода былі ўручаны Ганаровыя граматы Наркамбумпрама СССР.

...Раніцай 3 мая ў Рэчыцу прыйшла радасная вестка, што войскі 1-га Беларускага фронту пад камандаваннем Маршала Савецкага Саюза Г. К. Жукава пры садзейнічанні войскаў 1-га Украінскага фронту пад камандаваннем Маршала Савецкага Саюза І. С. Конева, які са снежня 1934 г. да сакавіка 1937 г. жыў у Рэчыцы, авалодалі сталіцай фашысцкай Германіі — Берлінам.

Рэчыца і раён чакалі паведамлення аб канчатковай перамозе над фашысцкай Германіяй.

9 мая 1945 г. хвалюючы дзень настаў. Над многімі будынкамі Рэчыцы і Васілевіч залуналі чырвоныя сцягі. Людзі смяяліся і плакалі. Нягоды як бы адсунуліся ўбок.

Пачыналася пасляваеннае жыццё.

А. П. Рабянок, П. П. Рабянок

За радком пастаноў

З пастановы № 15 Рэчыцкага гарадскога выканаўчага камітэта дэпутатаў працоўных ад 15 снежня 1943 г.

«О развертывании госторговли в г. Речица».

...Для обеспечения хлебом рабочих, служащих, занятых на производстве и учреждениях г. Речицы, и инвалидов Отечественной войны обязать Горторг подготовить хлебные карточки согласно существующего контингента и нормы выдачи хлеба к 25 декабря 1943 года. К этому времени выявить рабочих и служащих, связанных с сельским хозяйством, на предмет определения выдачи карточек иждивенцам согласно существующего положения.

Обязать Госторг произвести заготовку хлеба по нарядам с тем, чтобы обеспечить бесперебойное снабжение хлебом рабочих и служащих.

...Обязать председателя кустпромартелей, директора местной промышленности заключить договор не позже 25/XII.1943 г. с Госторгом на поставку вырабатываемых товаров широкого потребления, для продажи потребителю (мыло, готовая одежда, детская обувь, мебель, скобяной товар, кухонные вилки, ёмки, кочерги, дверные и оконные крючки, завесы, клямки, дверные ручки, топоры, лопаты, грабли, гончарную посуду, гребешки, расчески, гребни, смолу, деготь и др.).

Поручить Горплану разработать новый вид ассортимента и размера выпуска товаров широкого потребления данными предприятиями и артелями.

Поручить директору Госбанка добиться в областной конторе Госбанка спуска лимитов вышепоказанным организациям для более успешного развертывания работы промартелей и торговой системы.

Председатель горисполкома *(Юрченко)*
Секретарь горисполкома *(Костенок)*

Філіял Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл. у г. Рэчыца, ф. 342, воп. 1, спр. 2, л. 5–6.

З пратакола № 2 пасяджэння выканкама Рэчыцкага райсавета дэпутатаў працоўных ад 14 лютага 1944 г.

«О засыпке семенных фондов и ремонте сельхозинвентаря».

...Обязать всех председателей колхозов обеспечить засыпку семенных фондов к 20 февраля с. г. и прислать семена в контрольно-семенную станцию для проверки на всхожесть, а также приступить к ремонту с/хозинвентаря с таким расчетом, чтобы ремонт всего с/хозинвентаря полностью был закончен к 1 марта 1944 года.

...Обязать председателей колхозов, где имеются чесоточные лошади, организовать для них изоляторы, а райзо послать в эти колхозы ветработников для оказания помощи в лечении лошадей.

...Во второй половине февраля на заседании райисполкома заслушать председателей вышепереименованных колхозов о выполнении настоящего постановления.

Філіял Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл. у г. Рэчыца, ф. 348, воп. 1, спр. 1, л. 15.

Час цяжкі, пасляваенны

Аднаўленне разбуранага... Яно заставалася для Рэчыцы і раёна галоўнай задачай на працягу многіх гадоў. Ішло побач з цяжкаю працай, нішчымніцай, як не штомесячнымі зваротамі таго ці іншага калектыву да насельніцтва Рэчыцы і раёна працаваць яшчэ настойлівей, з пісьмамі-рапартамі «бацьку» Сталіну, з падпіскамі-прымусамі на розныя займы, якія найбольш актывізаваліся падчас значных падзей. Так было і пасля 9 мая 1945-га.

Райгазета «Зара камуны» паведамляла: «...увесь дзень 9-га мая калгасныя вёскі ліквавалі. На другі дзень калгаснікі дружна выйшлі на пасадку бульбы. Многія падпісчыкі на новую пазыку ўносяць грошы наяўнымі».

З дакументаў нарады партыйнага і савецкага актыву Рэчыцы і раёна, якая адбылася ў пачатку ліпеня 1945 г., бачна незайздроснае становішча прамысловасці горада і сельскай гаспадаркі раёна. Вытворчыя заданні паўгоддзя пераўзышлі нямногія. На 46 працэнтаў — тэкстыльна-трыкатажная арцель «Чырвоны Кастрычнік», на 36 — плодавінзавод, які заняў першае месца сярод прадпрыемстваў «Вінтрэста» харчовай прамысловасці БССР. Але не яны, арцель і вінзавод, вызначалі малюнак прамысловасці Рэчыцы. Буйныя прадпрыемствы не рада-

валі. Маруднымі тэмпамі ўзводзіўся домабудаўнічы камбінат. План капіталаўкладанняў паўгоддзя быў выкананы тут толькі на 12,5 працэнта. Пачаліся затрымкі ў аднаўленчых работах на заводах імя Кірава, імя Варашылава, імя Інтэрнацыянала.

З перавышэннем вытворчых заданняў працавалі прадпрыемствы раённага падпарадкавання.

Стабільна выпускалі прадукцыю Заспенскі крухмальны завод і завод «Дняпроўскі цагельнік». 11 жніўня гадавое заданне выканаў торфазавод «Маляное».

У другой палове жніўня гадавое заданне ажыццявіў калектыў торфазавода «Закрашынскі Мох», якому за своечасовую падрыхтоўку да сезона 1945 г. у маі быў уручаны Чырвоны сцяг Наркамбумпрама СССР.

1 кастрычніка аб выкананні гадавога задання рапартаваў калектыў тэкстыльнатрыкатажнай арцелі «Чырвоны Кастрычнік».

Датэрмінова ўправіліся з гадавымі заданнямі калектывы вінзавода, ганчарнага цэха гарпрамкамбіната, арцелі «Чырвоны баец», арцелі «Харчавік».

Увогуле прамысловыя прадпрыемствы і арцелі Рэчыцы вырабілі ў 1945 г. прадукцыі амаль на 4,5 мільёна рублёў больш, чым у папярэднім годзе.

Неймаверныя цяжкасці пераадольвала вёска.

Не хапала коней. Амаль паўсюдна на ворыве выкарыстоўваліся каровы. У час веснавой сяўбы ў гаспадарках Холмецкага сельсавета каровамі было ўзорана звыш 300 гектараў. У сельгасарцелі «Перамога» — звыш 100.

З раёна працягваўся адток моладзі на аднаўленне Данбаса, Ленінграда, Мінска, Гомеля, Віцебска. Таму на нарыхтоўцы кармоў, уборцы ўраджаю ды лесанарыхтоўках асноўны цяжар клаўся на плечы жанчын і старых.

78 працадзён выпрацаваў у 1945 г. Якаў Захаравіч Адамовіч з калгаса «Беларусь» Свірыдавіцкага сельсавета, якому было ўжо 110 гадоў. 32 ягоныя ўнукі і 15 праўнукаў з'яўляліся франтавікамі.

Выдатна працавала брыгада будаўнікоў калгаса імя Дзяржынскага Ровенска-Слабодскага сельсавета, якая за два месяцы збудавала 21 дом.

19 будаўнікоў калгаса «1-ае жніўня» Камсамольскага сельсавета ўзвялі да сярэдзіны лістапада 1945 г. 82 дамы. 52 дамы збудавалі за перыяд, што мінуў ад вызвалення Рэчыцы і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, цеслі сельгасарцелі «Шлях сацыялізму» Горвальскага сельсавета. Яны ж узвялі яшчэ 18 зрубаў, калгасныя кароўнік, канюшню і свіран.

У 25 дамоў перасяліліся з зямлянак у канцы 1945 г. жыхары вёскі Гарывада Будзёнаўскага сельсавета.

Да канца 1945 г. у раёне былі пабудаваны 2363 дамы. Раён меў 8800 галоў буйной рагатай жывёлы (па стану на 1.1.1944 г.— 48 кароў), 1530 коней, 600 свіней, 1500 авечак. Жывёла паступала ў сельгасарцелі не толькі з усходніх раёнаў краіны, куды была эвакуіравана ў 1941 г., а і з Германіі. Адзін з табуноў коней прыгнала лесаруб Рэчыцкага леспрамгаса Настасся Мікітаўна Янковіч, за што была адзначана Ганаровай граматай Народнага Камісарыята лясной прамысловасці СССР.

У канцы 1945 г. жыхары раёна мелі каля 9 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы. 390 кароў атрымалі ад дзяржавы. Як пазначана ў дакументах: бясплатна. Але дзяржава ад гэтага не пацярпела, бо тыя ж вяскоўцы абавязваліся здаваць у фонд абавязковых паставак малако, масла, мяса, яйкі...

У пачатку кастрычніка 1945 г. выйшла пастанова СНК СССР «Аб дадатковых ільготах і матэрыяльнай дапамозе сем'ям загінуўшых воінаў, інвалідам Айчыннай вайны, сем'ям ваеннаслужачых і дэмабілізаваных». Дзеці франтавікоў і партызанаў, загінуўшых у час Вялікай Айчыннай вайны, а таксама інвалідаў 1-ай і 2-ой груп вызваляліся ад платы за абучэнне ў 8—10-ых класах сярэдніх школ, вузах і тэхнікумах. Банкі мелі права выдаваць крэдыты на будаўніцтва інвалідам і сем'ям загінуўшых ад 5 да 10 тысяч рублёў з тэрмінам пагашэння іх на працягу 5—10 гадоў. Райгазета «Зара камуны» ў нумары за 7 кастрычніка пісала, што 32 дэмабілізаваныя франтавікі атрымалі крэдыты на 75 тысяч рублёў.

Увогуле ў 1945 г. з кожнага гектара пасяўной плошчы ў раёне было атрымана ў сярэднім па 7,1 цэнтнера азімага жыта, 6,5 — азімай пшаніцы, 6,9 — яравой пшаніцы, па 60 цэнтнераў бульбы.

1946-ы — першы год пасляваеннай пяцігодкі. Акрэсліваліся задачы на будучае. У 1946-ым у Рэчыцы планавалася: пабудаваць сталярныя, калёсныя і іншыя майстэрні, новы радзільны дом на 75 ложкаў, Дом дзіцяці, фабрычна-заводскую паліклініку,

яслі, бальніцу імя Семашкі на 200 ложкаў, памяшканне для школы медыцынскіх сясцёр, сярэднюю школу № 2, памяшканне інтэрната педвучылішча; аднавіць СШ імя Леніна, агароднінасховішча, склады, магазіны, млын з крупарушкай; распачаць будаўніцтва жылля для выкладчыкаў педвучылішча.

Раён гадавых абавязацельстваў не браў. Акрэсліваў задачы на пяцігодку ў цэлым. Рост трактарнага парка МТС планаваўся з 40 да 105 трактароў, камбайнаў — з 11 да 22. Пасяўныя плошчы меркавалася павялічыць з 34 540 да 38 974 гектараў, у тым ліку пад кармавыя культуры ад 189 да 6800 гектараў. Было запланавана мець у канцы 1950 г. 12 257 галоў буйной рагатай жывёлы, 3735 коней, 5500 свіней, 11 003 авечкі, 11 тысяч птушак. Трэба было пабудаваць для калгаснікаў 4632 дамы, 463 гаспадарчых памяшканні, 48 кузняў. У планах было ўзвядзенне і аднаўленне 16 цагельных заводаў, 39 школ, 7 клубаў, 12 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 2 бальніц.

10 лютага 1946 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет СССР. Пераможцай спаборніцтва з нагоды гэтай падзеі стала брыгада мантажнікаў домабудаўнічага камбіната, якую ўзначальваў Мікалай Галабародзька. Паўтарамесячнае заданне яна ажыццявіла на 300 працэнтаў.

Да 2 лютага квартальнае заданне па лесанарыхтоўках на 216 працэнтаў выканаў калгас імя Мянжынскага Ровенска-Слабодскага сельсавета. Па васілевіцкай зоне лепшым па лесанарыхтоўках быў калгас імя Сталіна.

14 красавіка ў кінатэатры імя Калініна адбыўся першы пасляваенны злёт стаханаўцаў Рэчыцы.

Дзень Перамогі будаўнікі завода імя Варашылава сустрэлі перавыкананнем паўгадавога задання на 110 працэнтаў.

20 мая калектыў Холмецкай МТС выканаў гадавое заданне.

У другой палове мая распачалося ўзвядзенне Рэчыцкага маслазавода. Меркавалася, што ў сваёй галіне ён будзе найбольш магутным прадпрыемствам рэспублікі.

Чарговы атрад моладзі Рэчыцы і раёна, на гэты раз у 44 чалавекі, быў накіраваны ў сярэдзіне чэрвеня на ўзвядзенне Беларускіх аўтамабільнага і трактарнага заводаў.

Другую гадавіну вызвалення Мінска найвышэйшымі працоўнымі дасягненнямі сустрэў калектыў арцелі «Харчавік». Цэх па вырабу марожанага месячную вытворчую праграму выканаў на 564 працэнты, павідлаварачны цэх — на 436 працэнтаў.

22 верасня арцель «Дняпроўскі цагельнік» выпрацавала 1 мільён цаглін, што азначала перавышэнне гадавога задання.

Галоўнай падзеяй кастрычніка стаў для Рэчыцы пуск завода імя Варашылава. 9 кастрычніка была атрымана першая пасляваенная партыя дубільнага экстракту. Месячнае заданне было ажыццёўлена на 137 працэнтаў. Амаль такі ж паказчык быў дасягнуты і ў лістападзе. Гэта дало заводу магчымасць увайсці ў лік перадавых прадпрыемстваў Рэчыцы.

У цэлым выкананне плана па выпуску ў 1946 г. танідаў склала па заводу імя Варашылава 120 працэнтаў. Дубільнага экстракту ўдалося выпусціць 181 тону пры заданні ў 150 тон.

...Надзвычай цяжкім стаў для Рэчыцы і раёна 1947 г. Была праведзена грашовая рэформа, адменена картачная сістэма на прамысловыя і харчовыя тавары. У сродках масавай інфармацыі, у тым ліку і ў райгазеце «Зара камуны», рэформа і адмена картак падаваліся як вялізнае дасягненне на шляху сацыялістычнага будаўніцтва. Ні слова не гаварылася пра тое, што рэформа, і асабліва адмена картак, была няўмольным патрабаваннем часу. З-за адсутнасці тавараў карткі не атаварваліся нават на буйных прадпрыемствах (завод імя Інтэрнацыянала).

Становішча ў вёсках было яшчэ больш цяжкім. Меліся сельгасарцелі, дзе на працадні за 1946 г. калгаснікі атрымалі літаральна грамы прадукцыі ці зусім нічога. Малако, мяса, масла, яйкі з уласных падвор'яў патрэбна было здаваць дзяржаве. З сакавіка ў многіх вёсках раёна людзі спазналі сапраўдную нішчымніцу. Знясіленыя ад недаядання, чакалі, калі з'явіцца шчаўе. Потым — першыя каласы. Да новага ўраджаю не дацягнулі самыя законапаслухмяныя нашы землякі. Якія не мелі лішніх сотак, якія своечасова прадукты аддалі дзяржаве. У газетах пра тое не пісалася...

Рэчыцкія прадпрыемствы саюзна-рэспубліканскага значэння вытворчую праграму 1947 г. выканалі ўвогуле на 102,3 працэнта. Завод імя Варашылава — на 110,7 працэнта, лесазавод імя Кірава і вінзавод — на 108,4 працэнта. З гадавым заданнем справіўся і завод імя Інтэрнацыянала. Але вытворчы план быў выкананы за кошт цэха

шырспажыву. Па выпуску ж асноўнай прадукцыі — цвікоў і шрубаў — прадпрыемства дапусціла вялікае адставанне ад задання. Фонд заработнай платы ў 1947 г. быў перавыдаткаваны на 48 працэнтаў. Завод меў страты больш за 1 мільён рублёў.

Паспяхова завяршылі 1947 г. арцелі прамкааперацыі. Вытворчую праграму выканалі на 122,8 працэнта, выпусцілі прадукцыі на 2 мільёны рублёў больш, чым у 1946 г.

Збожжавы клін раёна ў параўнанні з 1946 г. павялічыўся на 15 працэнтаў, бульбяны — на 20 працэнтаў. Пасяўная плошча пад збожжавымі культурамі пераўзышла даваенны ўзровень. Валавы збор збожжа і тэхнічных культур у параўнанні з 1946 г. павялічыўся ў 2,5 раза, бульбы — у 3 разы.

Раён датэрмінова выканаў дзяржаўныя заданні па хлебапастаўках і лесанарыхтоўках. Шмат было зроблена ў аднаўленні і прывядзенні ў парадак асушаных балот. Толькі на магістральных каналах удалося выканаць 20 607 кубаметраў земляных работ.

У пачатку 1948 г. адбыліся выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Затым выбарчыя лозунгі пачалі мяняцца на вытворчыя: «За месяц — дзве месячныя нормы» і інш. І нарэшце — «Пяцігодку — у чатыры гады!».

Ідэя выканання пяцігадовага плана за чатыры гады належала Ленінграду — гораду-герою, на аднаўленні якога працавалі сотні нашых землякоў.

У Рэчыцы лозунг «Пяцігодку — у чатыры гады!» раней, чым на іншых прадпрыемствах, прагучаў у калектыве завода імя Варашылава. Прадпрыемства значна перавыканала заданне папярэдняга года, заняло ганаровае трэцяе месца ва Усесаюзным спаборніцтве заводаў экстрактавай вытворчасці. Канец студзеня 1948 г. прынёс радасную вестку: па выніках работы ў снежні завод выйшаў пераможцам ва Усесаюзным спаборніцтве, яму быў прысуджаны Чырвоны сцяг Савета Міністраў СССР з уручэннем грашовай прэміі ў 25 тысяч рублёў. За першы месяц новага года прадпрыемства выпусціла звыш плана 30 тон сухога экстракту. Прадукцыя завода карысталася вялізным попытам. І, вядома ж, за прадпрыемствам уважліва сачылі «наверсе».

Пасяўныя плошчы раёна вясной 1948 г. павялічыліся ў параўнанні з мінулагоднімі на 3467 гектараў. У тым ліку і за кошт правядзення меліярацыйных работ. Асабліва хуткімі тэмпамі асушэнне і асваенне балот ішло ў калгасах «Трэці рашаючы» і «Чырвоны баец» Артукоўскага сельсавета, «Вызваленне БССР» Свірыдавіцкага сельсавета.

За паспяховае правядзенне веснавой сяўбы на абласную Дошку гонару былі занесены 8 гаспадарак Рэчыцкага раёна — калгасы «Новае жыццё», «Шлях Леніна», імя Дзяржынскага, імя Літвінава, «Першае жніўня», «Чырвоны Дняпро», імя XVIII партз'езда і «1-ае Мая».

За датэрміновае выкананне гадавога задання па лесанарыхтоўках раёну быў прысуджаны пераходны Чырвоны сцяг аблвыканкама і грашовая прэмія ў 10 тысяч рублёў.

Трэцяга лістапада гадавую вытворчую праграму выканаў завод імя Варашылава. Датэрміновым выкананнем гадавых заданняў сустрэлі чарговую гадавіну Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі калектывы завода імя Інтэрнацыянала, суднабудаўнічай верфі, гарпрамкамбіната, хімлясгаса, арцелі «Рассвет».

Па васілевіцкай зоне найбольшага поспеху дасягнуў калектыў дрэваапрацоўчай арцелі «Рассвет». Гадавое заданне па выпуску прадукцыі было пераўзыдзена на 63,9 працэнта.

133 працэнты ад гадавога задання — паказчык Васілевіцкага леспрамгаса. Чыгуначная станцыя Васілевічы ў спаборніцтве па ўпраўленню Беларускай чыгункі заняла першае месца.

У 1948 г. званне Героя Сацыялістычнай Працы было прысвоена звеннявой па вырошчванні жыта, кок-сагызу і канапель калгаса імя Сталіна Еўдакіі Арцёмаўне Кухаравай. Па выніках года ордэнам Леніна былі адзначаны: сакратар Рэчыцкага РК КП(б)Б Віктар Паўлавіч Палавінка, старшыня выканкама раённага Савета дэпутатаў працоўных Васіль Авяр'янавіч Кастрама, старшыня выканкама Заспенскага сельсавета Сцяпан Мацвеевіч Лапацін, інспектар школ Рэчыцкага гарана Ніна Гаўрылаўна Афанасьева, загадчык рана Адам Якаўлевіч Дарашэвіч, настаўнік вячэрняй школы рабочай моладзі Аляксандр Пракоф'евіч Паташук.

1 студзеня 1949 г. Рэчыца і раён сустрэлі святкаваннем 30-ай гадавіны БССР. На прамысловых прадпрыемствах і ў калгасах, ва ўстановах і школах адбыліся мітынгі, сходы, семінары. Колькі патрыятычных ло-

зунгаў, накіраваных на стымуляванне працоўных намаганняў, кідалася ў той час!

Але дарэмна шукаць ва ўсіх прапановах, выступленнях, зваротах слоў пра тое, як аплаціць рабочым і сялянам іхнюю стахановскую працу. Цаной вялізных намаганняў прамысловасць Рэчыцы і гаспадаркі раёна датэрмінова выканалі заданні 1949 г. Але не было ў людзей той бязмежнай узнёсласці і радасці, пра якія трубілі газеты, гаварылася на сходах і мітынгах, пісалася ў дакладах і навуковых працах. Жыхароў Рэчыцы і раёна турбавала галоўнае: як выжыць?

1945—1949 гады — перыяд працягу рэпрэсій у дачыненні да многіх нашых землякоў (гл. матэрыял «Беззаконне»).

А. П. Рабянок, П. П. Рабянок

З эканамічнай запіскі па г. Рэчыца

6 чэрвеня 1946 г.

В настоящее время в гор. Речица имеется 7 предприятий местной, республиканской и союзно-республиканской промышленности.

Завод «Интернационал»

До войны имел рабочих 414 человек, валовый выпуск продукции по заводу составлял 4 296 750 руб.

В настоящий период на заводе работает 150 человек, выпускается продукция на 106 000 руб., в ближайшие годы выпуск валовой продукции будет доведен до довоенного уровня.

Лесозавод им. Кирова

До войны на заводе работало 390 человек, выпуск валовой продукции составлял 3 080 200 руб. Сейчас на заводе работает 119 человек, выпускает валовой продукции на 437 600 руб. В последующие годы выпуск валовой продукции будет на 20 % выше довоенного.

Завод им. Ворошилова

На заводе до войны работало 212 человек, выпуск валовой продукции составлял 1 715 409 руб. Перспективный рост продукции по заводу перекрывает довоенный.

Завод в настоящее время восстанавливается после последствия немецкой оккупации, к концу 1946 г. завод будет выпускать продукцию (дубильный экстракт).

Хлебозавод

До войны на хлебозаводе работал 121 человек. Выпуск валовой продукции составлял 1 372 400 руб. В настоящее время на заводе работает 75 человек, выпуск продукции составляет 285 800 руб. К концу 1946 года выпуск продукции должен достигнуть довоенного.

Плодовинзавод

До войны работало на заводе 45 человек. Выпуск валовой продукции по заводу составлял 792 744 руб. В настоящий период времени на заводе работает 50 человек, выпуск валовой продукции составляет 725 000 руб.

Мельзавод № 2

На мельзаводе № 2 до войны работал 41 человек. Выпуск валовой продукции составлял 2 167 474 руб. В настоящее время пущена первая очередь мельзавода, где работает 30 человек, выпуск валовой продукции составляет 156 505 руб.

Домостроительный комбинат

На базе спичечной фабрики «Х Октябрь» и фанерного завода № 19 восстанавливается домостроительный комбинат, на котором будет работать 2000 человек, которые будут выпускать жилые дома 200 000 кв. м. жилплощади в год.

В городе работает особая строительная монтажная часть, в которой работает 660 человек. План капиталовложений по ОСМЧ-1 составляет 4 200 000 руб.

Кроме этого в городе имеется 8 артелей промкооперации и кооперации инвалидов и горпромкомбинат, которые выпускают в настоящее время продукцию в неизменных ценах на 7 721 тыс. руб., рабочих,

занятых в производстве артелей и горпромкомбината, 951 человек. Артели и горпромкомбинат выпускают товары народного потребления для местного рынка и в основном на базе местного сырья.

После освобождения города от немецко-фашистских захватчиков в 1944 году были восстановлены и пущены в эксплуатацию лесозавод им. Кирова, горпромкомбинат и артели «Красный Октябрь», «Колтруда», «Красный мебельщик», «Харчевик», «Красный боец», «Кооператор», завод «Интернационал», «Плодовинзавод», хлебокомбинат. Такие артели, как «Кустметалл» и «Объединение», пущены в эксплуатацию в 1945 году.

В новой 4-ой Сталинской пятилетке предусмотрено полностью восстановить до довоенного уровня предприятия и артели города, а выпуск продукции увеличить по сравнению с довоенным временем.

Председатель горплана — Половинко

З палітыка-эканамічнай характарыстыкі Рэчыцкага раёна на канец 1949 г.
(Мела грыф «Сакрэтна»)

...Район расположен в 43-х км на запад от гор. Гомеля... На севере граничит со Стрешинским, Уваровичским р-нами Гом. области, на востоке с Гомельским районом Гом. области, на юго-востоке с Лоевским районом Гом. области, на юге с Хойникским районом Полесской области, на западе с Василевичским районом Полесской области и Паричским районом Бобруйской области.

По прямой линии район занимает расстояние с севера на юг 80 км, с запада на восток 30 км, с севера на юг по всему району протекает р. Днепр.

По территории всего района проходит Белорусская ж. д. Гомель — Брест и две шоссейные дороги: Гомель — Калинковичи, Речица — Хойники.

Северная и западная часть района покрыта лесным массивом, который занимает 401,6 кв. км, пахотной земли 402,5 кв. км, сенокошения — 315 кв. км, выпасов — 97,5 кв. км, кустарники — 50 кв. км, болота — 19 кв. км, под водой — 14,6 кв. км. Осушено болот для пахоты и посевов 6,8 кв. км. Болотистый массив р-на имеет залежи торфа, которые частично перерабатываются.

...В Речицком районе всего населения насчитывается 72 266 чел., из них взрослого — 41 201 чел., детей до 16-летнего возраста — 31 065. Из общего кол. населения мужчин 30 126 чел., женщин 43 385 чел.

За время оккупации немцами по району истреблено 4395 чел., из них сожжено живьем 75 чел., замучено 42 чел., повешено 1 чел., угнано в немецкое рабство 1827 чел. Добровольно уехали с немцами 120 чел., возвратились из немецкого рабства 1796 чел. Прибыло из Польши в Речицкий район в порядке соглашения от 9/IX-44 года — 198 чел.

...На 1/1-49 года в районе имеется 1640 бескоровных хозяйств.

В 1947—1948 годах в Речицком районе имелось 6 пораженных участков инфекционной анемией, африканский сап и менингит. Указанные эпидемические заболевания ликвидированы, за исключением одного участка — колхоз «Украинец». Имеется 1 участок, пораженный чесоткой. В Заспенском с/совете имели место эпидемические заболевания: рожа, чума свиней, бруцеллез, некробруцеллез. В результате этих заболеваний за 1948 год пало следующее количество скота: лошадей — 339 голов, крупного рогатого скота — 615 голов, свиней — 220 голов, овец — 306 голов.

...После освобождения территории Речицкого района от немецких войск вновь построен домостроительный комбинат, идет строительство фанерного завода, и в ближайшее время будет начато строительство завода по выработке естественного каучука.

Для обслуживания рабочих промышленных предприятий, за период после освобождения района от немецких захватчиков, в районе вновь построено и восстановлено 11 901 кв. метр жилой площади.

...В настоящее время восстановлена вся телефонная и телеграфная связь, телефонизированы все 23 предприятия и 21 сельсовет, радиофицировано все городское население и 2 с/совета.

...Всего в Речицком районе имеется начальных школ — 48, неполных средних — 26, средних — 6 с количеством учащихся — 16 133 чел. Все школы обеспечены преподавательским составом полностью. Не охвачено детей школьного возраста по району 46 чел. В том числе детей в возрасте семилеток — 8 чел., восьмилеток — 6 чел., девяти — одиннадцати лет — 32 чел., из них 31 чел. по причине длительной болезни.

...В городе были совершенно разрушены 5 школ, один детдом, в остальных культурно-бытовых учреждениях имелись частичные разрушения. Все эти учреждения в настоящее время восстановлены и полностью функционируют.

По сельской местности разрушено 67 школ, один Дом соц. культуры, 13 клубов, 1 детдом. Разрушенные школы и Дом соц. культуры восстановлены полностью и функционируют. Восстановление разрушенных клубов не производилось.

З неймавернымі цяжкасцямі

З успамінаў А. А. Кадурына, былога галоўнага інжынера Рэчыцкага дубільна-экстрактавага завода імя Варашылава

...У пачатку 30-ых гадоў я вучыўся ў Кіеве. Скончыў інстытут і быў накіраваны працаваць у Рэчыцу, на экстрактавы завод імя Варашылава. Рабіў тут тры гады. Як след асвоіў тэхналогію вытворчасці, пазнаёміўся з людзьмі. Але абставіны склаліся так, што ў 1937 г. я пакінуў Рэчыцу і працаваў у Расіі.

У 1944 г. мне давялося браць удзел у нарадзе выдатнікаў сацыялістычнага спаборніцтва лёгкай прамысловасці СССР, якая праходзіла ў Маскве.

Неўзабаве пасля гэтай падзеі я зноў ехаў у Рэчыцу, на прадпрыемства, дзе працаваў раней, і 1 красавіка 1945 г. быў назначаны на пасаду галоўнага інжынера завода. Даведаўся: на аднаўленне прадпрыемства дзяржавай адпушчана 7,5 мільёна рублёў. Так, грошы ёсць, але на душы трывога. У першы ж дзень свайго прыезду ў Рэчыцу агледзеў завод. Відовішча цяжкое. Пры акупантах прадпрыемства бяздзейнічала. Сасновы лес вакол завода і ў рабочым пасёлку знішчаны. Дамы пасёлка амаль усе пустыя. Вокны без шкла, няма дзвярэй. Прадпрыемства на паперы лічыцца, а рабочых няма. Уся электраправодка на заводзе і ў пасёлку знята яшчэ пры немцах.

Лакамабіль у 25 конскіх сіл меўся, але пажарная інспекцыя забараніла пускаць яго, бо дах будыніны, дзе знаходзіўся лакамабіль, згарэў.

З першага дня паўсталі пытанні: як набраць людзей, як пусціць лакамабіль, як праверыць, замініравана тэрыторыя і прадпрыемства ці не?

Падумаў найперш вырашыць пытанне аб замініраванні. Даведаўся, што ў Рэчыцы ёсць аўчарка, якая лёгка адшуквае тол. Знайшоў гаспадара яе, дамовіўся, што за 250 рублёў ён правядзе абследаванне нашай тэрыторыі, і найперш — кацельні. Неўзабаве ён паведаміў: можаце працаваць спакойна.

У рабочым пасёлку звярнуў увагу на дом, які быў накрыты ліставым жалезам. Жалеза з дома знялі, накрылі будыніну дранкай, а лісты пусцілі на памяшканне, дзе знаходзіўся лакамабіль. Атрымалі дазвол на пуск лакамабіля ад пажарных.

Пачалі падвозіць ваду для яго адзіным заводскім конікам. Не, нічога не атрымліваецца. Падладзілі водаправод. Трэба шукаць помпу.



Установка лакамабіля на дубільна-экстрактавым заводзе імя Варашылава

Здолелі мы «выціснуць» у начальніка пажарнай аховы горада помпу магутнасцю ў 10—12 куб. метраў вады ў гадзіну. Аднаму богу вядома, як удалося зрабіць тое.

Ужо нешта ды маем: лакамабіль працуе. Думаем над пытаннем: дзе заводская паравая машына, што была вывезена ў 1941-ым перад прыходам немцаў? «Знайдзі пармашыну, што б гэта ні каштавала!» — такое заданне атрымаў П. Д. Нарушэўскі, прыняты на работу начальнікам аддзела тэхнічнага забеспячэння.

І што вы думаеце? Знайшоў-ткі Нарушэўскі нашую пармашыну. Ажно каля Ташкента. Але... Ляжала яна пад чыгуначным адхонам. На жаль, зусім непрыгодная для эксплуатацыі.

Дапамог трэст «Дубіцель», выдзеліў нам турбіну ЛМЗ на 350 кВт, якую можна было атрымаць у Ленінградзе. Нарушэўскі на выдатна справіўся з задачай па дастаўцы турбіны ў Рэчыцу.

Каб устанавіць турбіну, трэба выкінуць папярэдне фундамент пармашыны. Арганізавалі брыгаду з 6 чалавек. Працуюць яны, а аддача мізэрная. Як стаяў фундамент, так і стаіць. Зроблены бы з жалеза. А кожны ж дзень на ўліку. Выйсце знайшлі. Атрымалі дазвол ад НКУС на выдаленне фундамента з дапамогай узрыўчаткі. На наша шчасце, ля чыгуначнага моста знаходзілася каманда падрыўнікоў. Хлопцы з нашае брыгады рабілі шурфы, а камандзір падрыўнікоў штодня закладваў тол у іх, а потым падрываў.

Выдалілі ранейшы фундамент. Трэба новы. Дапамог выпадак. Зайшоў чалавек. Аказваецца, накіраваны ў Рэчыцу начальнікам мостапоезда. А жыць няма дзе. Дамовіліся, што мы яму кватэру, а ён дапаможа зрабіць фундамент для турбіны. Слова сваё спраўдзіў. Будматэрыялы нам вышсаў. Дапамог начальнік мостапоезда і спецыялістамі. Яны ўзвялі фундамент у вольны ад сваёй працы час. Мы ж як след аплацілі работу.

Паўстала задача ўстаноўкі драўляных дыфузораў ёмістасцю па 30 куб. метраў. Дыфузоры на прадпрыемстве патрэбна было мяняць яшчэ перад вайной. Ды і прастаялі пасля таго колькі!

Уверх па Дняпры, кіламетраў за 250 ад Рэчыцы, купілі 250 кубаметраў хвоі. Прыгналі драўніну плытамі. Трэба распілаваць. Чым? Зноў дапамог начальнік мостапоезда: даў у часовае карыстанне піларама лёгкага тыпу. Арганізавалі брыгаду. Распачалі распрацоўку драўніны.

Нешта робім. Зрухі ёсць. Але ў асноўнай масы нашых працаўнікоў песімізм. Маўляў, не, завод не хутка будзе пушчаны. Што зрабіць, каб неяк узняць настрой? Вырашылі даць электрасвятло. Сабралі электрыкаў, папрасілі іх знаходзіць, дзе толькі можна, дрот. А хто больш прынясе яго, таму і будуць выпісвацца рэкордныя нарады.

Праз тыдзень у каторых кватэрах святло гарэла.

На завод пачалі вяртацца людзі, што рабілі тут да вайны. Але мала, надта мала іх. Кіраўніцтва прадпрыемства ў выхадныя дні спяшалася на гарадскі рынак, бы на працу. Мэта адна: гаварыць з людзьмі ды агітаваць іх ісці працаваць да нас.

Выхад «у народ» даў плён. У канцы 1945 г. у нас быў поўны штат.

Вырабілі клёпку, высушылі яе на самаробнай прымітыўнай сушылцы, пачалі мяняць дыфузоры. Брыгаду зацікавілі акорднай аплатай. План замены дыфузора — месяц. А брыгада ўправілася з заменай за тры тыдні.

На мантаж турбіны з Масквы прыехалі інжынер і слесар. Прыступілі да работы. Я ж адвёз у Гомель чатырох рабочых, каб прайшлі абучэнне і атрымалі допуск на права эксплуатацыі турбіны.

Мантаж турбіны заканчваецца. Выраблі праверыць яе ў рабоце. І што ж? Аўтамат выбівае, а турбіна ідзе «ў разнос». Інжынер-мантажнік — спецыяліст вопытны. Рабіў мантаж турбінаў магутнасцю і па 5000 кВт. Нічога такога раней не назіраў. Літаральна суткамі не адыходзіў ад нашай турбіны. І заўважыў-ткі, што слесар, якога прывёз з Масквы, паравы вентыль паставіў... дагары нагамі. Бракароб быў неадкладна высланы з прадпрыемства.

Пасля пуску турбіны апрабавалі паравыя катлы. Падрыхтавалі для работы два рубільныя станкі. Запчастак для іх не было. Узялі аўтагенны апарат ды паехалі ў мясціны, дзе ішлі танкавыя баі. Знялі з падбітых машын усё тое, што можна было выкарыстаць пры мантажы нашага абсталявання.

З неймавернымі цяжкасцямі зманціравалі выпарную станцыю, паставілі помпы. Нават дробязныя дэталі шукалі як не па ўсёй краіне. Так, на заводзе было шмат медніцкай работы. А для выканання яе патрэбна звычайная бура. Накіроўвалі за ёй людзей нават у Маскву. Тыя ехалі, прывозілі буры па 100—200 грамаў. А гэта амаль нішто. І зноў дапамог шчаслівы выпадак. У Гомелі, у неліквідах, адшукаў 5 кілаграмаў борнай кіслаты. Яе і выкарысталі мы для атрымання буры.

Самі адлілі турбінкі для цэнтрабежных помпаў, вырабілі балванкі для штокаў, клапанаў і г. д.

У пачатку кастрычніка 1946 г. аднаўленчыя работы на прадпрыемстве былі ў асноўным скончаны. 5 кастрычніка адбыўся пробны пуск завода. 9 кастрычніка атрымана першая пасляваенная партыя дубільнага экстракту.

Цяжка было з харчаваннем. Вырашылі заняцца падсобнай гаспадаркай. Ужо ў хуткім часе ў заводскай сталоўцы можна было паабедаць даволі сытна.

Не забыліся на культуру. У час вайны ў нашым клубе фашысты зрабілі канюшню. Тэрмінова правялі рамонт, уборку памяшкання. Загучала ў клубе песня.

Не такая ўжо і вялікая падзея, але ўсё ж чарговая перамога. Значыць, жывём і працуем, выпускаем прадукцыю, так неабходную краіне...

Газета паведамляла...

Па старонках васілевіцкай раённай газеты «Сацыялістычная праца» за 1945 г.

(захоўваецца мова арыгінала)

4 лютага 1945 г.

Справы чыгуначнікаў

Чыгуначнікі станцыі Васілевічы спаборнічаюць у сваёй рабоце за тое, каб у зімні час не дапусціць ні адной затрымкі паяздоў для фронту. На ўзятыя абавязацельствы яны адказваюць справамі.

У ноч з 29 на 30 студзеня паднялася снежная пурга. Станавілася пагроза затрымкі праходу паяздоў. На дарогу выйшлі ўсе чыгуначнікі, акрамя зменных дзяжурных. Ім на дапамогу прыйшлі калгаснікі калгаса імені Сталіна, а таксама служачыя совецкіх арганізацый мястэчка. За кароткі час чыгунка была ачышчана ад снегу. Паязды пайшлі на захад, да лініі фронту без затрымкі.

В. Бачэўскі, Слобадаў

15 лютага 1945 г.

Падарункі франтавікам

Камсамольцы і несаюзная моладзь калгаса «Большавік» Узнажскага сельсовета ў гонар 27-ай гадавіны Чырвонай Арміі правялі збор падарункаў воінам-франтавікам.

Сабрана 40 пасылак, якія дастаўлены ў РК ЛКСМБ для адпраўкі на фронт.

І. Серба

3 ліпеня 1945 г.

Лікаванне

Вызвалены беларускі народ лікуе. Сёння вялікае, нацыянальнае свята. Колькі радасці!

Увечары 2 ліпеня ў сельвыканкомах і калгасах раёна адбыліся ўрачыстыя пасяджэнні, прысвечаныя гадавіне вызвалення сталіцы Беларусі Мінска і ўсёй тэрыторыі рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Мнагалюдна было ў раённым доме соцкультуры. Сюды сабраліся прадстаўнікі партыйных, совецкіх, грамадскіх арганізацый, а таксама калгаснікі калгаса імені Леніна.

Пасяджэнне закончылася выступленнямі гурткоў мастацкай самадзейнасці.

22 жніўня 1945 г.

Папаўняюцца калгасныя фермы

У раён прыбыла партыя ў 375 галоў трафейнай буйной рагатай жывёлы.

Яна размеркавана сярод калгасаў раёна для папаўнення жывёлагадоўчых ферм.

Ф. Латушкін

21 кастрычніка 1945 г.

Гораду Леніна

Усё больш нарастаюць тэмпы вывазкі бульбы ў лік абавязковых паставак дзяржаве.

На 19 кастрычніка на нарыхтоўчыя пункты паступіла 400 тон бульбы. 208 тон бульбы ўжо адгружана гораду Ленінграду.

5 снежня 1945 г.

Выхавальнікі дзетдома

З жніўня гэтага года ў в. Маканавічы Маканавіцкага сельсовета адкрыўся другі ў раёне дзетдом. Работнікі дзетдома сваімі сіламі адрамантавалі памяшканне, зрабілі яго ўтульным і прыгожым. Асабліва старанні ў гэтым праявілі Луцко Юля, Шаўлоўская Агаф'я, Лешчанка Анастасія і Грыцэнка Сяргей.

Зараз у дзетдоме налічваецца 70 дзяцей-сірот, бацькі якіх загінулі на франтах Айчыннай вайны, у партызанах і ад рук нямецкіх акупантаў. Пры дзетдоме працуе школа, дзе навучаецца 50 дзяцей.

П. М. Пырко

На заклік калектыву Ельскага леспрамгаса

З 20 па 25 снежня па леспрамгасу нарыхтавана 1400 кубаметраў лесу, вывезена 434 кубаметры і падвезена да трасы 542 кубаметры. План IV квартала сезоннікамі з калгасаў і пастаялым кадрам

леспрамгаса на 25 снежня выканан: па лесанарыхтоўках на 70,6 працэнты і па вывазках на 51,7 працэнты.

На зварот калектыву Ельскага леспрамгаса многія лесарубы і возчыкі павысілі вытворчасць сваёй працы. Былыя воіны Чырвонай Арміі Грыцэнка Васіль, Грыцэнка Якаў, Лешчанка Мікалай — з калгаса імені Свярдлова Маканавіцкага сельсавета дзённыя нормы выконваюць на 150—200 працэнтаў. Перавыконваюць дзённыя заданні і возчыкі. Гэты калгас на 28 снежня квартальны план па нарыхтоўках выканаў на 70 працэнтаў, па вывазках на 85 працэнтаў.

З добрымі паказчыкамі ў рабоце сустракаюць новы год многія рабочыя леспрамгаса. Трымя аўтамашынамі за 27 снежня вывезена 178 кубаметраў лесу. Шафёры Дзешчэня Зміцер і Бараноўскі Пятро за гэты дзень вывезлі 63 кбм. лесу, што складае 258 працэнтаў дзённай нормы.

І. Арцёменка, В. Цэйка

Па старонках рэчыцкай раённай газеты «Зара камуны» за 1948—1949 гг.

16 студзеня 1948 г.

Новы прадуктовы магазін

Днямі дырэкцыяй горхарчпромгандлю быў адчынен па Савецкай вуліцы новы прадуктовы магазін. Ён культурна абсталяван. У магазіне маецца разнастайны асартымент тавараў.

Новыя ларкі па прадажы мяса адкрыты на гарадскім рынку.

1 лютага 1948 г.

Механізацыя прамысловай арцелі

У бягучым годзе будуць праведзены далейшыя работы па механізацыі арцелі «Чырвоны Кастрычнік». Новыя станкі будуць устаноўлены ў трыкатажна-тэкстыльным цаху, што павялічыць выпуск тканін на 600 тысяч метраў у год.

Пры арцелі абсталяваны новая сушылка і фарбавальнае аддзяленне.

8 лютага 1948 г.

Здалі ў эксплуатацыю лакамабіль

На Бязуеўскім цагельным заводзе здан у эксплуатацыю лакамабіль. Ён прыводзіць у рух гантарэзку і цыркулярную пілу.

Выраблен першы гонт для патрэб завода.

Артэзіянскі калодзеж

На 1-й Набярэжнай вуліцы пачаты работы па бурэнню артэзіянскага калодзежа. Праектная глыбіня яго — 250 метраў. Калодзеж дасць у гадзіну каля 50 кубічных метраў чыстай артэзіянскай вады. Насельніцтва будзе забяспечвацца гэтай вадой праз гарадскую водаправодную сетку.

11 лютага 1948 г.

Электрычнасць і радыё ў соўгасе

У соўгасе «Рэчыца» праведзены работы па электрыфікацыі грамадскіх пабудоў і кватэр рабочых. Днямі тут здан у эксплуатацыю новы радыёвузел.

Зараз усе кватэры рабочых электрыфікаваны і радыёфікуюцца. Ужо ўстаноўлены і работаюць 20 радыёкропак.

15 лютага 1948 г.

Набылі чарапічныя прэсы

Арцель «Дняпроўскі цагельнік» асвоіла выраб чарапіцы. Набыта два ручных чарапічных прэсы.

28 лютага 1948 г.

За мільён штук цэглы

У гэтым годзе поўнасцю будзе здан у эксплуатацыю Бязуеўскі цагельны завод. Для абпалу цэглы зроблена гофманская печ, прапускной здольнасцю 70 тысяч цаглін у месяц.

На заводзе пачалася падрыхтоўка да сезону 1948 года. Калектыў завода ставіць сабе мэтай даць за сезон мільён штук цэглы.

У мірнай працы

Пушчаны ў ход новы лесапільны завод

На домабудаўнічым камбінаце здан у эксплуатацыю новы лесапільны завод. У строй уступіла магутная піларама, якая прыводзіцца ў рух электратокам ад сілавой станцыі камбіната. Днямі будзе пушчана ў ход другая піларама.

К канцу гэтага месяца завод, згодна плана, павінен даць новабудоўлі 2 тысячы кубаметраў піламатэрыялаў.

Б. Лунькоў

31 сакавіка 1948 г.

Тавары для вёскі

Райспажыўсаюз дзейсна рыхтуецца да абслугоўвання калгаснікаў у часе веснавых палявых работ. У сельскія магазіны завезена каля 12 тон калёснай мазі, больш за 600 штук адвалаў і лемяхоў, 70 станаў калёс, на 80 тысяч рублёў шорных вырабаў. У прадажу паступіла вялікая колькасць шыннага жалеза, вяровак і іншых тавараў.

У магазіны сельпа паступілі тавары шырокага спажывання на суму ў 250 тысяч рублёў. Завезены соль, запалкі, табак, абутак, мануфактура і галантарэя.

Для лепшага абслугоўвання калгаснікаў райспажыўсаюз арганізуе ў вёсках разносны і развазны гандаль.

6 чэрвеня 1948 г.

Гастролі ўкраінскага музыкальна-драматычнага тэатра

У Рэчыцу на гастролі прыехаў украінскі музыкальна-драматычны тэатр імя Кацюбінскага. У рэпертуары тэатра творы драматургаў: К. Сіманава — «Пад каштанамі Прагі» і «Русский вопрос», Л. Транёва — «Любоў Яравая», Н. Катляроўскага — «Наталка Палтаўка», Н. Гогаля — «Женитьба» і іншыя.

У Доме соцыялістычнай культуры, дзе работае тэатр, даны пад мастацкім кіраўніцтвам Б. Лучынскага першыя пастаноўкі спектакляў.

23 чэрвеня 1948 г.

Радыёфікацыя калгасных вёсак

Работнікі Рэчыцкага радыёвузла праводзяць зараз вялікую работу па радыёфікацыі калгасных вёсак: Азершчыны, Жмураўкі і Броннага. Трансляцыйныя лініі працягнуты ўжо на некалькі кіламетраў. У дамах многіх калгаснікаў устаноўлены радыёкропкі.

МТС папоўнілася новымі машынамі

З кожным годам расце тэхнічнае аснашчэнне Азершчынскай МТС. За апошні час яна папоўнілася новымі сельскагаспадарчымі машынамі.

Атрымана новая 24-радковая сеялка, дыскавая барана, 2 культыватары і 4 балотныя двухкорпусныя плугі.

У рамонтна-механічнай майстэрні МТС устанаўліваецца новы лакамабіль.

Будуюць калгасныя клубы

У калгасе «Чырвоны востраў» Чарнянскага сельсовета заканчваецца будаўніцтва новага клуба. Глядзельная зала разлічана на 200 чалавек.

Будаўніцтва новага клуба пачата ў калгасе «Украінец» Сямёнаўскага сельсовета.

На асушцы балота

Калгас «XVII Кастрычнік» Свірыдавіцкага сельсовета шырокім фронтам вядзе асушку балота. Усе калгаснікі, якія не заняты на другіх работах арцельнай вытворчасці, штодзённа выходзяць на меліяратыўныя работы. Актыўны ўдзел у асушцы балот прынялі нават школьнікі.

Многія калгаснікі на меліяратыўных работах выконваюць па 3—4 нормы.

18 ліпеня 1948 г.

Новыя школы ў сёлах

За час пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у сёлах нашага раёна адноўлена 4 сярэдніх, 20 няпоўнасярэдніх, 48 пачатковых школ. 12 школ пабудавана ўноў.

У бягучым годзе ў сёлах пачата будаўніцтва яшчэ 7 новых школ. Усе яны будуюцца пры актыўным удзеле калгаснікаў, комсамольцаў, навучаючыхся. Грамадскасць сяла пачала будаваць школы ў Аляксандраўцы і Салтанове. У Валадарскім сельсавеце будуецца новая школа сіламі комсамольцаў і моладзі.

30 ліпеня 1948 г.

Аўтобусны рух у горадзе

Кантора «Саюзтранс» атрымала днямі два новых 16-месных аўтобусы. Па лініі горад — фабрычна-заводскі раён — Совецкая вуліца — вакзал штодзённа курсіруюць тры аўтобусы.

10 кастрычніка 1948 г.

Грузы транспартыруюцца матавозам

На цвікавым заводзе «Інтэрнацыянал» раней падвозка матэрыялаў да асноўных цэхаў утваралася аўтамашынамі. Гэта дорага абыходзілася заводу. Зараз тут пракладзены рэйкавыя шляхі, і матэрыялы дастаўляюцца ў цэхі матавозам. Завод мае магчымасць зэканоміць на гэтым да 80 тысяч рублёў у год.

20 кастрычніка 1948 г.

У новыя дамы

З кожным годам расшыраецца рабочы пасёлак соўгаса «Рэчыца». У гэтым годзе закончана будаўніцтва 13 новых індывідуальных дамоў для рабочых і вялікі грамадскі будынак, дзе будзе размяшчацца кантора соўгаса. Сем'і рабочых Арсена Кавальчука, Габалеўскага, Аляксандра Катляра і другіх увайшлі ў новыя кватэры.

3 лістапада 1948 г.

Новы атрад ветфельчараў

29 кастрычніка бягучага года адбыўся чарговы выпуск у Рэчыцкай аднагадовай школе малодшых ветфельчараў. Краіна атрымала новы атрад спецыялістаў.

14 лістапада 1948 г.

Асвоілі выраб новых тканін

Рабочыя ткацкага цэха арцелі «Чырвоны Кастрычнік» нядаўна асвоілі выпуск парусінавай тканіны. Гэтай прадукцыі ўжо выпушчана больш 800 метраў. Цэхам таксама асвоен выраб двуніткі і суровых тканін.

28 лістапада 1948 г.

Будуецца новая бальніца

Да Вялікай Айчыннай вайны ў мястэчку Горваль была добрая бальніца. Нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі яе. Зараз у Горвалі пачата будаўніцтва новай бальніцы, якая будзе яшчэ лепшай, чым да вайны.

На будаўніцтве стараннай працай вызначаюцца тт. Семкін, Гожка, Канода, Бабіч, Кукара, Ушак і Козыр.

3 снежня 1948 г.

Вячэрняя школа для калгаснікаў

У мэтах павышэння агульнай адукацыі калгаснікаў у вёсцы Вышамір арганізавана вячэрняя школа. Заняткі ў ёй праходзяць рэгулярна, 4 разы ў тыдзень. Праводзіць іх настаўнік т. Кротаў. Школу зараз наведвае 20 чалавек калгаснікаў.

24 снежня 1948 г.

Новыя цэхі

Да 30-годдзя БССР у арцелі «Харчавік» адкрываюцца два новыя цэхі: адзін — па вырабу цукерак, другі — па вырабу ільняного масла.

Зараз калектыў арцелі выпякае ў вялікім асартыменце белабулачныя вырабы з выдзелкай «30 год БССР».

4 лютага 1949 г.

У мірнай працы

Механізацыя цэхаў

У тэкстыльна-трыкатажнай арцелі «Чырвоны Кастрычнік» у апошні час праведзены работы па механізацыі вытворчых цэхаў. Так, у кардачасальным цэху ўведзен у эксплуатацыю мыльна-трушчыльны агрэгат па перапрацоўцы кароткага ільнавалакна. Гэта дало магчымасць вызваліць 7 рабочых і палепшыць якасць прадукцыі. У ткацкім цэху ўстаноўлен спецыяльны станок, які ўтварае аддзелку гатовых тканін і дарожкі. Пуск станка дае арцелі магчымасць атрымаць у месяц каля 4 тысяч рублёў эканоміі.

30 сакавіка 1949 г.

Цагельныя заводы ў калгасах

У бягучым годзе ў калгасах нашага раёна запланавана будаўніцтва 6 новых цагельных заводаў. Цагельныя заводы, магутнасць кожнага з якіх складзе 100 тысяч штук абпаленай цэглы ў год, будуць пабудаваны ў калгасах «Чырвоны барэц» Артукоўскага сельсовета, «XX Кастрычнік» Горвальскага сельсовета, імя 18 партз'езда Баршчоўскага сельсовета і «Чырвоны востраў» Чарнянскага сельсовета. У калгасах «Перамога» і «Гігант» Холмецкага сельсовета намечана пабудаваць цагельныя заводы з чарапічнымі цэхамі.

На ўсебеларускую нараду

У сталіцу нашай рэспублікі — Мінск выехалі 18 чалавек перадавікоў сельскай гаспадаркі нашага раёна на ўсебеларускую нараду. Сярод іх такія знатныя людзі раёна, як звеннявая калгаса імя Фрунзе т. Іваненка, звеннявы калгаса імя Кірава т. Дубровскі, брыгадзір калгаса імя Дзяржынскага т. Дворнік, трактарыст Холмецкай МТС т. Прусак і другія.

1 красавіка 1949 г.

Новы цэх

У прамысловай арцелі «Чырвоны баец» адкрыт новы, добра ўпарадкаваны кандытарскі цэх. Выраблена першая прадукцыя — пернікі і цукеркі.

27 мая 1949 г.

Папаўненне грамадскіх птушкаферм

Для папаўнення птушкаферм з Гомельскай інкубатарнай станцыі ў бягучым годзе будзе атрымана 30 000 куранят і вуцянят. 12 000 з іх паступіла ўжо і размеркавана па калгасных фермах. Калгас «Совецкая Беларусь» Заспенскага сельсовета першы атрымаў для папаўнення сваёй птушкафермы 1 200 вуцянят.

24 чэрвеня 1949 г.

Авалодваюць прафесіямі

Гарадскі аддзел соцыяльнага забеспячэння праводзіць работу па навучанню інвалідаў Айчыннай вайны прафесіям. 20 інвалідаў накіраваны на вучобу ў ветэрынарную школу, землеўпарадчы тэхнікум, гандлёва-кааператыўную школу.

10 жніўня 1949 г.

Пабудавана новая амбулаторыя і гасцініца

На тэрыторыі Рэчыцкай суднабудаўнічай верфі нядаўна закончана будаўніцтва новай амбулаторыі і гасцініцы. Пры амбулаторыі абсталяваны зубаўрачэбны, тэрапеўтычны і іншыя кабінеты.

21 жніўня 1949 г.

Кіназдымкі ў калгасе «20 Кастрычнік»

Брыгада «кінахронікі» Белдзяржкіно, якая прыбыла ў наш раён, днямі правяла кіназдымкі ў калгасе «20 Кастрычнік» Валадарскага сельсовета. На кінаплёнку ёю зазнята брыгада т. Севярынца на малацьбе, падвозка снапоў, падача іх у барабан малатарні, правейванне і адвозка збожжа ў калгасны свіран, прыезд на малацільны ток агіткультбрыгады калгаса імя Літвінава Азершчынскага сельсовета на чале з заслужаным дзеячом мастацтваў БССР Таццянай Карнееўнай Лапацінай, канцэрт хора гэтага калгаса для калгаснікаў калгаса «20 Кастрычнік», сустрэча ўдзельнікаў агіткультбрыгады з кіраўнікамі калгаса «20 Кастрычнік» і актывам Валадарскага сельсовета і іншыя эпізоды з жыцця хлебаробаў.

2 кастрычніка 1949 г.

Асвойваюць выраб каўроў

У тэкстыльна-трыкатажнай арцелі «Чырвоны Кастрычнік» асвойваецца выраб насценных баваўняна-папяровых каўроў. Яны будуць мець прыгожы, рознакаляровы арнамент.

23 кастрычніка 1949 г.

Новае абсталяванне для маслазавода

На Рэчыцкі маслазавод для механізацыі працэсаў выпрацоўкі жывёльнага масла, сухога малака і іншых відаў малочнай прадукцыі пачало прыбываць навейшае айчыннае абсталяванне. Атрыман магутны сепаратар, масла-апарат бесперапыннага дзеяння, халадзільнікі, кампрэсары, сушылкі і іншае каштоўнае абсталяванне.

Па старонках васілевіцкай раённай газеты «Сацыялістычная праца» за 1949 г.

31 сакавіка 1949 г.

Загарэлася лампачка Ільіча

Члены сельгасарцелі «Чырвоная Дуброва» Каравацкага сельсовета ўрачыста адзначылі пуск калгаснай электрастанцыі. Лампачкі Ільіча ярка загарэліся ва многіх дамах калгаснікаў. Асветлены таксама гаспадарчыя пабудовы арцелі. Пры дапамозе электратока ў калгасе будуць выконвацца многія работы: малацьба, рэзка кармоў, распілоўка дошак і інш.

Ф. Блізнец

23 чэрвеня 1949 г.

Уступіў у дзеянне шпалазавод

У пачатку чэрвеня Васілевіцкі леспрамгас пусціў у эксплуатацыю шпалазавод. Завод ужо выпусціў першую партыю шпал.

Новыя школы

У вёсцы Каравацічы ў новым навучальным годзе адкрываецца сярэдняя школа. Гэта трэцяя сярэдняя школа ў раёне. У Навінках, Насавічах, Лісках, Дуброве, Гліннай Слабадзе, Першамайску і Маканавічах адкрываюцца сямігадовыя школы. Усяго ў раёне ў 1949—50 навучальным годзе будзе працаваць 22 сямігодкі.

31 ліпеня 1949 г.

Атрымана кіноперасоўка

Раённы аддзел кінофікацыі нядаўна атрымаў кіноперасоўку. Гэта — чацвёртая перасоўка ў нашым раёне.

А. Уласаў

20 лістапада 1949 г.

Будаўніцтва стадыёнаў і спартыўных пляцовак

Па закліку комсамольцаў і моладзі калгаса імя Сталіна ў раёне шырока разгарнулася будаўніцтва стадыёнаў і спартыўных пляцовак. За летні і асенні перыяд бягучага года ў калгасах пабудавана 6 стадыёнаў і 27 спартыўных пляцовак.

Трэці дзіцячы дом у раёне

У райцэнтры адкрываецца спецдзетдом, дзе будзе выхоўвацца звыш 150 дзяцей-сірот. Гэта трэці дзіцячы дом у нашым раёне.

А. Белы

За годам — год

У 50-ыя гады Рэчыца і раён увайшлі з пэўным запасам трываласці. Нарошчвалі тэмпы выпуску прадукцыі буйныя прамысловыя прадпрыемствы — дротава-цвіковы завод імя Інтэрнацыянала, дубільна-экстрактавы імя Варашылава, лесазавод імя Кірава. Ладзілася справа ў калектывах Рэчыцкай суднаверфі, арцелі «Чырвоны Кастрычнік», прыстані, станцыі Рэчыца. З месяца ў месяц перавыконваў даведзеныя заданні Заспенскі крухмальны завод.

Вытворчую праграму 1950 г. прамысловасць Рэчыцы і раёна ажыццявіла на 105,7 працэнта. За кошт эканоміі сыравіны, павышэння якасці прадукцыі і рацыянальнага выкарыстання тэхнікі рост звышпланавай прадукцыі склаў 11 мільёнаў 500 тысяч рублёў.

На заводзе імя Інтэрнацыянала, які першым у Рэчыцы падтрымаў ініцыятыву прадпрыемстваў Ленінграда і Масквы, накіраваную на датэрміновае выкананне заданняў першай пасляваеннай пяцігодкі, каля 100 рабочых перайшлі на шматстаночнае абслугоўванне. Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР і БРК прафсаюза чатыром брыгадам прадпрыемства прысвоіла званне брыгад выдатнай якасці.

За лік эканоміі сыравіны 20 тон звышпланавых танідаў вырабіў у 1950 г. калектыў завода імя Варашылава. Тут не было ні аднаго рабочага, які б не спраўляўся з вытворчым заданнем.

Заспенскі крухмальны завод у якасці звышпланавай прадукцыі даў за год 48 тон сухога крухмалу, арцель «Чырвоны Кастрычнік» — 500 метраў тканіны. Суднабудаўнічы цэх верфі выпусціў за год 6 звышпланавых баржаў.

Прадпрыемствы Рэчыцы маглі б мець больш высокія паказчыкі, але адчувалі недахоп электраэнергіі. Рэчыцкая электрастанцыя задання 1950 г. не выканала.

У 1950 г. звыш 100 сем'яў рэчыцкіх рабочых усяліліся ў новыя кватэры.

Пасяўныя плошчы раёна павялічыліся за год на 2549 гектараў. Пасевы яравой пшаніцы ўзраслі на 3,9 працэнта, азімага жыта — на 21,3, тэхнічных культур — на 45 працэнтаў.

Валавы збор збожжа быў вышэйшым, чым у папярэднім, 1949 годзе, але сярэдняя ўраджайнасць з гектара — ніжэйшай.

Многія сельгасарцелі атрымалі ў 1950 г. на асобных участках высокія ўраджаі збожжавых і тэхнічных культур. Брыгада Уладзіміра Скаромнага з узбуйненага калгаса імя Сталіна Вышамірскага сельсавета (узбуйненне гаспадарак адбывалася на працягу 1950—1952 гг.) на плошчы ў 72 гектары вырасціла па 13 цэнтнераў азімага жыта. Звеннявая Ніна Бондар з калгаса імя Малянкова — па 47,7 цэнтнера карэнняў кок-сагызу з кожнага гектара.

Высокі ўраджай ільну быў атрыманы ў сельгасарцелі «Украінец» Сямёнаўскага сельсавета. Тут было атрымана з гектара па 4,57 цэнтнера льнасемя. Брыгада Антона Седлера сабрала на кожным з 10 гектараў па 5,2 цэнтнера льнасемя.

Раён і ў 1950 г. датэрмінова ажыццявіў заданні па пастаўках дзяржаве збожжа, бульбы, садавіны, тэхнічных культур.

У калгасах раёна змагаліся за датэрміновае выкананне трохгадовага плана развіцця грамадскай жывёлагадоўлі. Усе калгасы мелі па 4 фермы прадуктыўнай жывёлы. У 1950 г. пагалоўе буйной рагатай жывёлы ў параўнанні з годам папярэднім павялічылася на 16,2 працэнта, авечак — на 37, коней — на 7,7 працэнта.

Аднак трохгадовы план па вырошчванню буйной рагатай жывёлы быў выкананы толькі на 83,3 працэнта, свіней — на 46,4 працэнта, авечак — на 93,3 працэнта і па развядзенню птушак — на 27,5 працэнта. Асноўнай перашкодай росту пагалоўя жывёлы і павышэння яе прадуктыўнасці было нездавальняючае становішча ў назапашванні кармоў. Значныя плошчы калгасных сенажацей заставаліся не ўбранымі. План накаплення грубых кармоў у 1950 г. быў выкананы ўсяго на 75 працэнтаў, сакавітых кармоў — на 49, канцэнтратаў — на 51 працэнт.

На пленуме РК КП(б)Б 28 чэрвеня 1951 г. адзначалася: у раёне каля 3 тысяч гектараў ворнай зямлі, 4800 гектараў сенакосных угоддзяў, звыш 1000 гектараў выпасаў.. Але яны зараслі кустамі, пакрыліся купінамі. У многіх месцах не закапаны акопы і траншэі. Значная плошча калгасных зямель пад неасушанымі балотамі.

Лепшай гаспадаркай раёна з'яўляўся калгас імя Сталіна Вышамірскага сельсавета. Гаспадарка была адзінай у раёне, якая ажыццявіла трохгадовы план развіцця грамадскай жывёлагадоўлі.

Па васілевіцкай зоне не было роўных калгасу імя Сталіна і саўгасу «Ведрыч».

У 1950 г. двум працаўнікам саўгаса —

даярцы Кацярыне Апанасаўне Мятлушка і кіраўніку трактарнай брыгады Сцяпану Дзмітрыевічу Фешчанку — было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. У 1949 г. К. А. Мятлушка надаіла ад кожнай каровы сваёй групы па 6401 кілаграму малака, што з'яўлялася не толькі рэкордам былога Васілевіцкага раёна, а і ўсяе рэспублікі.

Калгасы багацелі на тэхніку. Амаль ва ўсіх гаспадарках былі па дзве аўтамашыны, памольныя машыны, кормазапарнікі.

За адзін год калгас «Савецкая Беларусь» Заспенскага сельсавета набыў 8 малатарань, 7 сартыровак, 4 конныя сеялкі, ільнацёрку, сенакасілку, веялку.

Набывалі новую тэхніку машынна-трактарныя станцыі. У 1950 г. яны купілі 33 трактарныя сеялкі, 40 сенакасілак, 34 лушчыльнікі, 5 сіласарэзак, 11 культыватараў.

У другой палове 1951 г. сельскагаспадарчыя арцелі раёна набылі бульбасаджалкі і льноцерабілкі, тры лакамабілі ў 25 конскіх сіл кожны, 56 конных сеялак, 25 камбінаваных і простых сартыровак, 20 веялак, 25 конных сенакасілак, 26 конных грабель.

Паўсюдна асвойваліся новыя высокаўрадлівыя культуры. Ажыццяўляўся пераход на суцэльныя гатунковыя пасевы азімага жыта, аўса, пшаніцы, ячменю. Укаранялася чуміза і канатнік.

Ва ўсіх калгасах і дзяржгасах арганізоўваліся трохгадовыя агразаатэхнічныя курсы. Вяскоўцы вучыліся развіваць гаспадарку на навуковай аснове. Выкладчыкамі курсаў з'яўляліся лепшыя аграномы і заатэхнікі. Некалькі лекцый для працаўнікоў калгасаў імя Дзяржынскага Ровенска-Слабодскага сельсавета і імя Варашылава Жмураўскага сельсавета прачыталі вучоныя: правамоцны член Акадэміі навук БССР, прафесар Гарагляд, старшы навуковы супрацоўнік Акадэміі навук БССР кандыдат сельскагаспадарчых навук Забела і заатэхнік Міністэрства сельскай гаспадаркі рэспублікі Любоцкі.

Усё большы размах набывала будаўніцтва. За 1950 г. ва ўзбуйненых гаспадарках былі ўзведзены 11 канюшняў на 510 галоў, звыш 30 кароўнікаў і цялятнікаў на 2205 галоў, 22 свінафермы на 3019 галоў, 6 аўчарнікаў і 11 птушнікаў. У новыя дамы перасяліліся 220 сем'яў.

Шмат якія калгасы пабудавалі цагельныя заводы, якія давалі значныя прыбыткі. У 1951 г. завод арцелі імя Леніна Азершчынскага сельсавета вырабіў 110 тысяч цаглін, імя Чапаева Камсамольскага сельсавета — 72 тысячы цаглін.

Калгасы ўстанаўлівалі цыркуляркі, гантарэзкі, млыны, маслабойкі, ваўначоскі. Паўсюдна працавалі кузні.

Электрастанцыя калгаса імя Чапаева Камсамольскага сельсавета давала электрычнасць у 300 дамоў членаў арцелі. Заканчвалася будаўніцтва электрастанцыі у калгасе «Савецкая Беларусь» Заспенскага і «XVIII партз'езд» Баршчоўскага сельсавета. Былі радыёфікаваны вёскі Азершчына, Броннае, Жмураўка, Казазаеўка, Перасвятое, Салтанова.

Абсталёўваліся хаты-чытальні. Пры іх адчыняліся бібліятэкі, працавалі гурткі мастацкай самадзейнасці. У раёне працавалі 8 кінаперасовак (без уліку васілевіцкай зоны).

...Новы крок на шляху нарошчвання вытворчасці прадукцыі Рэчыца і раён зрабілі ў 5-ай пяцігодцы.

Планавыя заданні рэгулярна ажыццяўлялі заводы імя Варашылава і імя Інтэрнацыянала, завод масла і сухога малака, суднабудаўнічая верф.

У верасні 1951 г. домабудаўнічы камбінат быў перададзены Міністэрству папяровай і дрэваапрацоўчай прамысловасці і рэарганізаваны ў фанерна-мэблевы. У 1955 г. прадпрыемства выпусціла прадукцыі на 46 мільёнаў рублёў.

Адбудоўваліся калгасы і дзяржгасы раёна, набывалі новую тэхніку, уводзілі ў абарот тарфянікі. Але ўрадлівасць палёў заставалася нізкай, валавы збор сельгаспрадукцыі павялічваўся ў асноўным за кошт пашырэння сельскагаспадарчых угоддзяў.

Сапраўдным штуршком наперад была для Рэчыцы і раёна другая палова 50-ых гадоў.

У 1956 г. прамысловасць горада выпусціла прадукцыі амаль на 14 мільёнаў рублёў больш, чым у 1955 г. Узрасла вытворчая магутнасць прадпрыемстваў. Уступілі ў строй новыя цэхі: масавага пашыву — на швейнай фабрыцы, варкі смол — на фанерна-мэблевым камбінаце. Апроч гэтага на камбінаце былі расшыраны механічны і сталярна-зборачны цэхі, пушчаны дзве паравыя сушылкі і кацельнае аддзяленне.

Заканчваліся будаўнічыя работы на ўзвядзенні кераміка-трубнага завода. У

1957 г. планавалася: завяршыць будаўніцтва льнозавода, камбіната бытавога абслугоўвання, вытворчага цэха шавецкай арцелі «Аб'яднанне»; увесці ў дзеянне падстанцыі Васілевіцкай ДРЭС; забяспечыць далейшае расшырэнне вытворчасці новых відаў прадукцыі. На фанерна-мэблевым камбінаце рыхтаваўся да ўводу цэх струганай фанеры. Калектыў суднабудаўнічай верфі распачаў выпуск 150-тонных металічных баржаўпляцовак для перавозкі будаўнічых матэрыялаў, 60-тонных баржаў для малых рэк і брандвахтаў новай канструкцыі. Вучэбны корпус рыхтаваліся атрымаць навучэнцы землеўпарадкавальнага тэхнікума.

У горадзе былі адкрыты новыя магазіны — гатовага адзення і бакалейна-гастранамічны.

Падыходзілі да завяршэння работы па ўзвядзенні трохпавярховага 24-кватэрнага і двухпавярховага 8-кватэрнага дамоў, закладваўся падмурак пад 12-кватэрны дом. Шырокі размах набывала будаўніцтва жылля за сродкі прадпрыемстваў.

Толькі ў 1956 г. у Рэчыцы былі пракладзены каля 3 тысяч пагонных метраў водаправода, устаноўлены 13 калонак, забрукаваны каля 4700 квадратных метраў маставой, заасфальтавана 6786 метраў тратуараў і г. д.

Датэрміновым выкананнем заданняў па рэалізацыі дзяржаве збожжа, бульбы, ільнопрадукцыі, малака, мяса, яек завяршылі 1956 г. гаспадаркі раёна. Найбольш важкія вытворчыя здабыткі мелі калгасы «Савецкая Беларусь» Заспенскага сельсавета і імя Кірава Свірыдавіцкага сельсавета. Пётр Паўлавіч Шклярэнка і Сцяпан Яфрэмавіч Драгун, кіраўнікі гаспадарак, былі ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

У 1956 г. калгасы раёна набылі праз райспажыўсаюз 21 грузавую аўтамашыну маркі «ГАЗ-51», 4 легкавыя машыны «ГАЗ-69» і 4 легкавыя машыны марак «Пабеда» і «Масквіч».

За год у новыя дамы ўсяліліся 186 сем'яў калгаснікаў.

На 1400 кропак павялічылася радыётрансляцыйная сетка, у раёне ўзводзіліся 4 пачатковыя школы, памяшканне для Баршчоўскай СШ. Былі расшыраны памяшканні Салтаноўскай і Камсамольскай дзесяцігодак.

...25 снежня 1957 г. прамысловасць Рэчыцы і раёна выканала гадавы план па выпуску валавой прадукцыі на 100,1 працэнта. Былі пераўзыдзены заданні па росту прадукцыйнасці працы і зніжэнню сабекошту прадукцыі, датэрмінова ажыццёўлены планы будаўніча-мантажных работ, рознічнага тавараабароту дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю.

У 1957 г. пачаў выпуск прадукцыі Рэчыцкі кераміка-трубны завод. На першым часе маладое прадпрыемства сутыкнулася з пэўнымі цяжкасцямі. Але яны былі пераадолены шляхам удасканальвання тэхналогіі вытворчасці. Выпуск прадукцыі няўхільна павялічваўся, яна паспяхова рэалізоўвалася.

Вялізным попытам карысталася прадукцыя Рэчыцкай верфі. 150-тонныя металічныя баржы і брандвахты з жалезабетоннымі карпусамі адпраўляліся Дняпроўскаму рачному параходству і Крэмянчуггідрабуду.

...Падвядзенне вынікаў работы за 1958 г. супала са святкаваннем 40-годдзя БССР. Усё большы прапагандысцкі размах пачаў набываць лозунг «Сямігодку — датэрмінова!». Рэчыцкі раён браўся ў 1959 г. атрымаць на ўсёй плошчы пасеваў у сярэднім па 10 цэнтнераў збожжавых, па 110 — бульбы, ільнасемя і льновалакна — па 4 цэнтнеры з кожнага гектара. Ставілася задача і на 1965 г. — завяршальны ў сямігодцы. Раён павінен быў атрымаць з кожнага гектара пасяўной плошчы па 15 цэнтнераў збожжавых, па 150 цэнтнераў бульбы. На 100 гектараў сельгасугоддзяў меркавалася атрымаць 360 цэнтнераў малака, або ў 3 разы больш, чым у 1958 г., і па 80 цэнтнераў мяса — у 5 разоў больш, чым у 1958 г.

Але жыццё зноў пацвердзіла ісціну: цудаў у сельскай гаспадарцы не бывае. Лічбы, не падмацаваныя рэальнымі магчымасцямі, засталіся нявыкананымі.

У кастрычніку 1959 г. дротава-цвіковы завод імя Інтэрнацыянала быў перайменаваны ў метызны завод.

У 1959 г. адбылося ўзбуйненне Рэчыцкага раёна. У яго ўвайшлі Васілевічы і некалькі новых сельсаветаў — Васілевіцкі, Бабіцкі, Дубраўскі, Караваціцкі, Ліскаўскі.

У 1963 г. новую назву — гідролізнадражджавы — атрымаў дубільна-экстрактавы завод імя Варашылава. Гэта было звязана з будаўніцтвам цэха па вытворчасці бялковых кармавых дражджэй.

Па-сапраўднаму вялікай падзеяй стала для Рэчыцы і раёна адкрыццё ў жніўні 1964 г. радовішча нафты.

20 жніўня пры апрабаванні пластоў

міжсолевых адкладанняў у інтэрвале 1996—2026 метраў быў атрыманы прамысловы прыток «чорнага золата».

У пачатку 1965 г., згодна з пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР, распараджэннем Савета народнай гаспадаркі рэспублікі, быў створаны Рэчыцкі ўзбуйнены нафтапромысел.

29 красавіка кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў перарэзаў чырвоную стужку, адчыніў засаўку і націскам на кнопку запусціў у работу нафтавую помпу. Першыя тоны беларускай нафты ўліліся ў магістральны нафтаправод «Дружба».

Прамысловыя прадпрыемствы Рэчыцы паспяхова справіліся з асноўнымі заданнямі сямігадовага плана. Толькі за 1965 г. аб'ём дзяржаўных капіталаўкладанняў у цэлым па Рэчыцы павялічыўся ў 3,5 раза. Былі здадзены ў эксплуатацыю адзін 80-кватэрны дом гарсавета і 60-кватэрны — жыллёвага кааператыва, 8 ведамасных дамоў. 123 дамы жыхары Рэчыцы пабудавалі за ўласныя сродкі. Праз дзяржаўны гандаль гараджанам было рэалізавана тавараў на 21 мільён рублёў, або на 2,6 мільёна рублёў больш, чым у 1964 г.

Пэўныя здабыткі меў раён. Асабліва ў будаўніцтве. Паказчыкі ж урадлівасці далёка не адпавядалі тым лічбам, на якія раён нацэльваўся ў пачатку сямігодкі. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых у 1965 годзе склала толькі 10,8 цэнтнера з гектара.

...На працягу 8-ай пяцігодкі прадпрыемствы Рэчыцы ажыццявілі звыш 900 арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў, што дало 1682 тысячы рублёў эканоміі. Было ўстаноўлена 70 паточных і механізаваных ліній, 1242 адзінкі новага абсталявання і мадэрнізаваны 103 адзінкі дзеючага. Датэрмінова ажыццявілі вытворчыя заданні пяцігодкі метызны і гідролізна-дражджавы заводы, фанерна-мэблевы камбінат, хлебакамбінат, ткацкая фабрыка «Чырвоны Кастрычнік», завод керамічных каналізацыйных труб, прамкамбінат, плодаагароднінны завод.

Паскоранымі тэмпамі развівалася новая галіна гаспадаркі — нафтаздабываючая. Калі ў 1965 г. нафты было здабыта 43 тысячы тон, то ў завяршальным годзе пяцігодкі — 4300 тысяч тон.

З 30 верасня 1966 г. пачало работу тэхнічнае вучылішча нафтавікоў № 86.

З году ў год узрасталі тэмпы жыллёвага будаўніцтва. Толькі ў 1970 г. у Рэчыцы былі ўведзены ў эксплуатацыю 30 168 квадратных метраў жылля. Навасяллі справілі 594 сям'і.

У 1970 г. з кожнага гектара пасяўных плошчаў у раёне было вырашчана па 15 цэнтнераў збожжавых. У саўгасе «Ведрыч» гектар даў па 31,2 цэнтнера. Ураджай бульбы склаў 266 цэнтнераў з гектара. На сто гектараў сельгасугоддзяў было атрымана па 180 цэнтнераў мяса і па 800 цэнтнераў малака. Гаспадарка была адзначана Памятным сцягам ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа.

Вялікую дапамогу гаспадаркам раёна аказваў калектыў райаб'яднання «Сельгастэхніка». Пяцігадовы план па ўсіх тэхніка-эканамічных паказчыках аб'яднанне выканала на паўгода раней.

Поспех Рэчыцкага раённага аб'яднання «Сельгастэхніка» быў адзначаны прысуджэннем пераходнага Чырвонага сцяга «Саюзсельгастэхнікі» і ЦК прафсаюза.

...Замацаваць дасягнутае. Такая задача стаяла перад Рэчыцай і раёнам ў 9-ай пяцігодцы (1971—1975 гг.). І яна была ажыццёўлена.

Аб'ём прамысловай вытворчасці Рэчыцы вырас на 68,9 працэнта. Быў асвоены выпуск некалькіх дзесяткаў новых вырабаў. Увайшлі ў строй Беларускі газаперапрацоўчы і піваварны заводы, рэканструяваны і ўзведзены новыя цэхі на метызным, гідролізна-дражджавым заводах, у вытворчым дрэваапрацоўчым аб'яднанні «Рэчыцадрэў», на льнозаводзе, прамкамбінаце. За кошт дзяржаўных капітальных укладанняў пабудавана звыш 147 тысяч квадратных метраў жылля.

Датэрмінова ажыццяўлялі вытворчыя заданні нафтавікі.

Ураджай збожжавых у раёне наблізіўся да 20 цэнтнераў з гектара, бульбы — да 150 цэнтнераў. Колькасць буйной рагатай жывёлы ўзрасла на 30 працэнтаў, надой ад каровы — на 315 кілаграмаў малака.

Гаспадаркі раёна пабудавалі 36 кароўнікаў, 21 цялятнік, 15 свінарнікаў, 4 збожжасклады, 4 рамонтна-механізаваныя майстэрні, 9 збожжасушыльных комплексаў. Былі ўзведзены 3 клубы, 3 дамы быту, 8 лазняў. Звыш 700 сем'яў вяскоўцаў усяліліся ў новыя кватэры.

...10—12-ая пяцігодкі (1976—1990 гг.) для Рэчыцы і раёна адметны не толькі значнымі вытворчымі дасягненнямі, павышэн-

нем дабрабыту людзей, але і страшэннай бядой — аварыяй на Чарнобыльскай АЭС.

Прамысловасць Рэчыцы, як і раней, няўхільна павялічвала выпуск прадукцыі. Асвойваўся выраб новых тавараў. Наладзіў выпуск прадукцыі завод «Рытм». Хуткімі тэмпамі ішло вытворчае і жыллёвае будаўніцтва.

У 1986 г. горад атрымаў цудоўны Палац культуры і тэхнікі нафтавікоў. Велічная будыніна са шкла, жалеза і бетону, узведзеная ў цэнтры Рэчыцы, не толькі ўпрыгожыла горад, але і стала як бы цэнтрам грамадска-палітычнага і культурнага жыцця. Штогод тут праводзяцца каля 300 масавых мерапрыемстваў, удзельнікамі якіх з'яўляюцца дзесяткі тысяч рэчычан. У Палацы працуюць каля двух дзесяткаў гурткоў і секцый па інтарэсах. Іх наведваюць звыш 500 чалавек.

У пачатку 90-ых гадоў бачылася паспяховае вырашэнне жыллёвай праблемы. Будаўніцтва кватэр для сваіх працаўнікоў вялі доследна-прамысловы гідролізны завод, метызны завод, аб'яднанне «Рэчыцадрэў» і г. д.

Ураджайнасць збожжавых у гаспадарках раёна перасягнула мяжу ў 20 цэнтнераў з гектара, бульбы — 160 цэнтнераў. Калектыў племзавода «Ведрыч» паставіў перад сабой задачу атрымаць за год па 5 тысяч кілаграмаў малака ад каровы.

Непазнавальна змянілася аблічча вёсак. І ў першую чаргу такіх, як Ведрыч, Ровенская Слабада, Холмеч, Камсамольск, Вышамір, Баршчоўка, Левашы, Артукі і г. д.

Сотні працаўнікоў гаспадарак раёна мелі магчымасць штогод адпачываць у здраўніцах, санаторыях, дамах адпачынку.

Людзі з упэўненасцю глядзелі ў заўтрашні дзень.

Надзеі гэтыя ў многіх перакрэсліла аварыя на Чарнобыльскай АЭС. Злавесная хмара чарнобыльскага радыеактыўнага бруду прасунулася і над рэчыцкай зямлёй. Даследаванні паказваюць: практычна ўся тэрыторыя Рэчыцкага раёна забруджана радыенуклідамі. Звыш 62 працэнтаў насельніцтва пражывае ў зоне, якая дае права на адсяленне, 33 працэнты — у зоне з перыядычным радыяцыйным кантролем. Найбольшая доля радыенуклідаў прыпадае на цэзій-137 і стронцый-90.

Чарнобыльская бяда не прывяла Рэчыцу і раён да разгубленасці. Была ўведзена ў дзеянне праграма «Здароўе», накіраваная на паляпшэнне ўмоў жыцця і працы людзей. Пракладваўся асфальт, будаваліся водаправоды. Значная работа ажыццяўлялася ў справе наладжвання радыяцыйнага кантролю. З мэтай аздараўлення насельніцтва Рэчыца ўзводзіла буйны санаторый-прафілакторый у г. Нальчыку. Працаўнікі горада і раёна мелі магчымасць адпачыць у Крыме, Прыбалтыцы, Грузіі, на базах адпачынку нафтавікоў і г. д. Выдаткі за дастаўку людзей самалётамі на адпачынак у Грузію раён узяў цалкам на сябе.

Школьнікі Рэчыцы і раёна аздараўляліся на Чорным і Азоўскім моры, у Расіі, Малдавіі, на Украіне, у Прыбалтыцы.

За невялікі прамежак часу ў многіх населеных пунктах раёна былі пабудаваны вуліцы прыгожых, сучасных дамоў. Сотні сем'яў з найбольш забруджаных раёнаў Гомельшчыны знайшлі ў нас як бы другую радзіму.

Разбурэнне СССР разладзіла эканамічныя сувязі, прывяло да рэзкага падзення вытворчасці, цяжкасцей у збыце прадукцыі і набыцці неабходнага.

Значная доля падзення вытворчасці прыпадае на метызны, доследна-прамысловы гідролізны завод, завод «Рытм», арэнднае вытворча-дрэваапрацоўчае аб'яднанне «Рэчыцадрэў». Але ёсць і станоўчы прыклад. Няўхільна нарошчвае выпуск прадукцыі, якая карыстаецца вялікім попытам у краінах СНД, Рэчыцкі піваварны завод. Толькі ў 1995 г. рэчыцкае піва атрымала некалькі залатых і сярэбраных медалёў на міжнародных конкурсах.

Рэчыца не мае магчымасці ў поўным памеры ажыццяўляць жыллёвую праграму. Але будаўніцтва не спыняецца. Здадзена ў эксплуатацыю прыбудова з басейнам Цэнтра дзіцячай і юнацкай творчасці. Працягваецца работа на ўзвядзенні музычнай школы.

Парасткамі новага сталі прадпрыемствы з недзяржаўнай формай уласнасці. Іх у Рэчыцы звыш 150. Кааператыў «Гідратэхнік» займаецца берагаўмацаваннем Дняпра. Кааператыў «Беларусь» узводзіць рамонтна-механічныя майстэрні, падстанцыю, базу адпачынку арэнднага вытворча-дрэваапрацоўчага аб'яднання «Рэчыцадрэў», дамоў для перасяленцаў. Радыелагічную лабараторыю, павільёны для свідравін водазабора, памяшканне падатковай інспекцыі і шэраг іншых аб'ектаў будуе кааператыўнае прадпрыемства «Усход».

Адчуваючы паўсядзённыя цяжкасці, прэс цэнаў, Рэчыца і раён змушаны перагледзець і ушчыльняць праграмы, накіраваныя непасрэдна да чалавека. Давялося адмовіцца ад будаўніцтва санаторыяў і дамоў адпачынку па-за межамі рэспублікі. Але нават у гэтых умовах не дала збою праграма «Здароўе» ў дачыненні дзяцей. Школьнікі Рэчыцы і раёна рэгулярна аздараўляюцца ў чыстых ад радыяцыі раёнах СНД і рэспублікі, забяспечаны гарачым харчаваннем.

Ва ўмовах нестабільнасці эканомікі і сельскагаспадарчай вытворчасці супрацоўніцтва паміж Рэчыцай і гаспадаркамі раёна набывае новыя формы. Горад прыняў удзел у фінансаванні будаўніцтва ў раёне аб'ектаў мясаперапрацоўкі і садавінасховішча. З калгасам «Савецкая Беларусь», які мае свінагадоўчы комплекс на 24 тысячы галоў, і з саўгасам-садам «Іскра» заключаны дагаворы аб долевым удзеле ў маёмасці. Інакш кажучы, частка прадукцыі гаспадарак рэалізоўваецца ў Рэчыцы.

Ажыццёўлена вялікая работа па надзяленні рэчычан участкамі ў сістэме садова-агародніцкіх таварыстваў. З мэтай вырашэння гэтага пытання прадпрыемствы выйшлі на прамыя сувязі з гаспадаркамі раёна. Створаны каля 50 садова-агародніцкіх таварыстваў, пад якія адведзены звыш 200 гектараў зямлі.

Насельніцтва Рэчыцы мае магчымасць праз гаспадаркі раёна набываць насенне, пладова-ягадныя дрэўцы і кустарнікі, арганічныя ўгнаенні, парасят і г. д.

...Для прамысловасці Рэчыцы 1996 г. стаў адметным не толькі спадам вытворчасці, але і пэўным ростам. Пачынаючы з верасня мае месца яе дадатная дынаміка. Калі ў 1995 г. спад вытворчасці дапусціл 10 прадпрыемстваў з наяўных 14, то ў 1996 г. — толькі 4. Увогуле, рост аб'ёму прамысловай вытворчасці супраць запланаванага склаў 106,2 працэнта. Значны ўплыў на стабілізацыю эканамічнай сітуацыі горада аказалі заводы: піваварны выпуск прадукцыі ў параўнанні з 1995 г. павялічыў на 25,5 працэнта; масларобчы — на 10,3; «Рэчыцкая керамікa» — на 28,3; метызны — на 7,4; «Тэрмапласт» — на 20,7. Рост на ткацкім і дрэваапрацоўчым аб'яднаннях склаў адпаведна 15,1 і 9,3 працэнта, а на прадпрыемстве «Рэчыцанафтамаш» — 6,2. Без адставання 1996 г. завяршыў і калектыў гідролізнага завода.

Значна палепшылася становішча з рэалізацыяй гатовай прадукцыі. У параўнанні з годам папярэднім яе было рэалізавана больш чым у 1,5 раза. На 14,2 працэнта ўзрасла прадукцыйнасць працы.

Прадпрыемствы горада настойліва працавалі над асваеннем новых відаў прадукцыі. Няспынна абнаўлялі асартымент заводы «Рэчыцкая керамікa», «Тэрмапласт», вінаробчы, піваварны і метызны, дрэваапрацоўчае аб'яднанне. За год былі асвоены 28 вырабаў з керамікі, парнікі зборныя, два новыя віды піва, пяць відаў малочнай прадукцыі, 17 найменняў метызаў, 56 малюнкаў вырабаў ткацтва, звыш 30 відаў мэблі, плітка керамічная неглазураваная і г. д.

Нягледзячы на недахоп фінансавых сродкаў, шэраг прадпрыемстваў Рэчыцы ажыццяўлялі мадэрнізацыю дзеючага абсталявання і ўстаноўку новага. Дрэваапрацоўчае аб'яднанне выканала значны аб'ём работ па ўводу ў дзеянне новай мэблевай фабрыкі вытворчай плошчай 10 тысяч м^2, замяніла значную колькасць абсталявання, зманціравала новую энергазберагаючую аспірацыйна-фільтравальную ўстаноўку. На вінаробчым заводзе працягваліся работы па стварэнні ўчастка перапрацоўкі садавіны і ягад. Вялікі аб'ём работ па тэхнічнаму пераўзбраенню вытворчасці быў выкананы на камбінаце будаўнічых матэрыялаў. На метызным заводзе былі ўстаноўлены 13 новых станкоў і механізмаў, рэканструявана памяшканне нейтралізацыі, пабудаваны склад-модуль і тэрмічнае аддзяленне, зманціравана ўстаноўка для атрымання меднага купарвасу.

Прамысловасць горада няўхільна нарошчвала выпуск экспартнай прадукцыі. Найбольшага плёну дасягнулі калектывы метызнага, піваварнага, доследна-прамысловага гідролізнага заводаў, аб'яднання «Рэчыцадрэў». На экспарт у краіны СНД і далёкага замежжа ў 1996 г. было адпраўлена звыш 7 тысяч тон цвікоў і крапёжных вырабаў, 119 тон кармавых дражджэй, 862 м^3 фанеры, амаль 300 тысяч дэкалітраў піва, нафтапрамысловае абсталяванне на суму ў 5 мільёнаў 635 тысяч долараў.

Новы крок наперад прамысловасць Рэчыцы зрабіла ў 1997 г. У параўнанні з годам папярэднім рост аб'ёмаў выпуску прадукцыі склаў 107 працэнтаў, у тым ліку тавараў народнага спажывання — 106 працэнтаў. Разам з тым значна павялічыўся выпуск шэрага важнейшых відаў вырабаў. Аб'ём экспарту ўзрос больш чым на 15 працэнтаў.

Пазітыўныя зрухі ў павышэнні эфектыўнасці вытворчасці і адаптацыі яе да ры-

начных умоў дасягнуты і працаўнікамі Рэчыцкага раёна. Так, валавая вытворчасць збожжа ў параўнанні з папярэднім годам узрасла на 23 працэнты, ураджайнасць выросла на 4,7 цэнтнера з гектара. Найбольшага ж плёну дасягнуў калектыў саўгаса «Х гадоў Кастрычніка» (дырэктар В. В. Хлебін), дзе з кожнага гектара пасяўных плошчаў сабрана ў сярэднім па 40,9 цэнтнера збожжа. Гаспадарка стала не толькі пераможцам раённага спаборніцтва, але і заняла другое месца ў спаборніцтве рэспубліканскім.

Земляробы калгаса «Савецкая Беларусь» дамагліся высокага ўраджаю бульбы. Кожны гектар, заняты «другім хлебам», даў па 250 цэнтнераў клубняў. Выдатна працаваў і калектыў свінагадоўчага комплексу гаспадаркі. За год атрымана больш трох тысяч тон высакаякаснай свініны, або каля 40 працэнтаў мяса, што рэалізавана калгасамі і дзяржгасамі раёна ў 1997 г.

Пераможцам рэспубліканскага конкурсу за найбольш эфектыўную дапамогу працаўнікам вёскі, аб'яўленага газетай «Белорусская нива», стала адкрытае акцыянернае таварыства «Рэчыцкая сельгастэхніка» (дырэктар А. М. Мацкевіч). За кошт павелічэння выпуску новых дэталяў да збожжаўборачных камбайнаў рост таварнай прадукцыі да ўзроўню 1996 г. склаў тут 210 працэнтаў. Калектыў таварыства забяспечыў неабходнымі дэталямі не толькі гаспадаркі Рэчыцкага раёна, але і вобласці.

Важнай падзеяй у культурным жыцці Рэчыцы стала адкрыццё помніка знакамітаму рэчычаніну М. В. Доўнар-Запольскаму. У ліпені ў горадзе прайшла і міжнародная навуковая канферэнцыя «Жыццё і дзейнасць М. В. Доўнар-Запольскага», прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння выдатнага гісторыка і грамадскага дзеяча. Ініцыятарамі яе правядзення сталі Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны, Рэчыцкі гарвыканкам і часопіс «Палессе». Паспяховае правядзенне мерапрыемства стала магчымым дзякуючы фінансавай падтрымцы не толькі Рэчыцкага гарвыканкама, але і вытворчага аб'яднання «Беларусьнафта», прадпрыемства па транспартыроўцы нафты «Дружба».

Рэчыцкая зямля ганарыцца Героямі Савецкага Саюза — Андрэем Якаўлевічам Варанчуком, Анатолем Фёдаравічам Дзюбко, Анатолем Якаўлевічам Каваленкам, Уладзімірам Рыгоравічам Масальскім; поўнымі кавалерамі ордэна салдацкай Славы Аляксандрам Карпавічам Васільевым і Аляксандрам Якаўлевічам Кастрамой; Героямі Сацыялістычнай Працы — Уладзімірам Данілавічам Юрчанкам, Сцяпанам Дзмітрыевічам Фешчанкам, Кацярынай Апанасаўнай Мятлушка, Еўдакіяй Арцёмаўнай Кухаравай, Пятром Іванавічам Жагловым, Іванам Уласавічам Кулешам, Піліпам Сямёнавічам Горбачам, Іванам Рыгоравічам Пырко; перадавікамі вытворчасці, адзначанымі ордэнам Леніна, Дзяржаўнымі прэміямі, іншымі высокімі ўзнагародамі; заслужанымі настаўнікамі, урачамі, меліяратарамі, энергетыкамі; славутымі вучонымі і навукоўцамі, пісьменнікамі і мастакамі, артыстамі і спартсменамі, трэнерамі (даныя ў асобнай падборцы матэрыялаў).

П. І. Жаглоў

І. Р. Пырко

У самыя змрочныя часіны нашы землякі не развіталіся з песняй. Яна дапамагала ў барацьбе з ворагам, адбудоўваць знішчанае вайной, крочыць да лепшай долі. Так яно і зараз. Творчасць Азершчынскага народнага хору, рэчыцкіх народных і лепшых раённых самадзейных калектываў — яскравае сведчанне, што і цяперашнія нягоды будуць пераадолены і рэчыцкая зямля стане прыгажэйшай, чым дагэтуль.

Рэчычане і жыхары раёна ўшаноўваюць памяць аб мінулым. Заўсёды людна на добраўпарадкаваным рэчыцкім гарадзішчы. Восенню 1995 г. на месцы правядзення богаслужэння (красавік 1910 г.) у гонар Ефрасінні Полацкай, пры перавозцы мошчаў святой з Кіева на радзіму, узведзена велічная капліца, аўтар праекта якой — выдатны беларускі мастак, наш зямляк Эдуард Канстанцінавіч Агуновіч.

Не згасне памяць пра тых, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны,

у падполлі і ў партызанах, мірнае насельніцтва, пра хлопцаў-землякоў, якім наканавана было загінуць у Афганістане і Сірыі (даныя ў асобнай падборцы матэрыялаў). Матэрыялы пра іх у Рэчыцкім краязнаўчым музеі, музеі вёскі Ровенская Слабада, у шматлікіх школьных музеях горада і раёна. Дзеля ўшанавання іх, а разам з тым і ўсіх, хто жыў, змагаўся і пакутаваў на рэчыцкай зямлі, і пісалася кніга «Памяць».

Ул. Кунцэвіч, А. Рабянок, П. Рабянок

Іхні лёс — у лёсе Рэчыцы і раёна

ПАЛАВІНКА Віктар Паўлавіч нарадзіўся 19.1.1906 г. у г. Почап Бранскай вобл. Адзін з кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на Гомельшчыне ў час Вялікай Айчыннай вайны. Герой Сацыялістычнай Працы (1958). Член КПСС з 1937 г. У 1930—1942 гг. на гаспадарчай, камсамольскай, савецкай і партыйнай рабоце. У канцы чэрвеня 1942 г. Гомельскі абкам КП(б)Б (у Маскве) прыняў рашэнне аб стварэнні Рэчыцкага падпольнага партыйнага цэнтра. У састаў цэнтра быў уведзены і В. П. Палавінка.

У другой палове лістапада 1942 г. В. П. Палавінка склікаў аргбюро Рэчыцкага падпольнага райкама партыі, у час пасяджэння якога быў зацверджаны састаў падпольнага райкама КП(б)Б. Сакратаром быў абраны В. П. Палавінка. З верасня 1942 г. і па чэрвень 1943 г. ён таксама камісар Рэчыцкай партызанскай брыгады імя К. Я. Варашылава. У 1943—1952 гг. 1-ы сакратар Рэчыцкага райкама КП(б)Б. Добра ведаў раён і людзей, бо давялося не толькі змагацца тут з ворагам, а і працаваць. Спачатку па найму ў кулака Жалязінскага, а потым на запалкавай фабрыцы.

З 1953-га — 1-ы сакратар Гомельскага райкама партыі, з 1960-га ў Гомельскім абкаме КПБ. У 1963—1967 гг. — намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена за поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі. Кандыдат у члены ЦК КПБ у 1954—1956 гг., член ЦК КПБ у 1956—1961 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1951—1963 гг. Памёр 16.12.1977 г.

ПАЛЯКОЎ Іван Яўцеевіч нарадзіўся 25.11.1914 г. у Гомелі. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага патрыятычнага падполля і партызанскага руху на Гомельшчыне ў час Вялікай Айчыннай вайны. Дзяржаўны і партыйны дзеяч БССР. Герой Сацыялістычнай Працы (1973). Член КПСС з 1940 г. Скончыў ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1949). З лістапада 1942 г. у тыле ворага, сакратар Гомельскага падпольнага абкама ЛКСМБ, у жніўні — лістападзе 1943 г. камісар 1-ай Гомельскай партызанскай брыгады. З 1944 г. на камсамольскай і партыйнай рабоце. З 1953 г. 1-ы сакратар Рэчыцкага РК КПБ. У 1956 старшыня Гомельскага аблвыканкама. З 1957 г. 1-ы сакратар Гомельскага абкама КПБ. З снежня 1964 г. 1-ы сакратар Мінскага абкама КПБ. У 1977—1985 гг. Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, адначасова да 1985 г. намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Кандыдат у члены ЦК КПСС у 1961—1966 гг., член ЦК КПСС у 1966—1985 гг. Член ЦК КПБ з 1952 г., член Прэзідыума ЦК КПБ у 1965—1966 гг., член бюро ЦК КПБ у 1966—1985 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1958—1989 гг., Вярхоўнага Савета БССР у 1951—1959 гг.

Таварыш сакратар

З успамінаў Адама Васільевіча Кузмянкова, былога старшыні Рэчыцкага райвыканкама

Аб дзейнасці І. Я. Палякова на пасадзе першага сакратара Рэчыцкага райкама КПБ можна казаць шмат. Гэта быў па-сапраўднаму энергічны і ініцыятыўны кіраўнік, вораг фармалізму і пустаслоўю. Сваю работу ён распачаў з умацавання дысцыпліны. Да яго партыйныя актывы, пленумы райкама і г. д. пачыналіся са спазненнем на гадзіну, а то і дзве. Запрошаныя прыходзілі хто калі жадаў. Убачыўшы тое, Іван Яўцеевіч загадаў памочніку ўключыць у састаў прэзідыума актыву тых, каторыя звычайна спазняліся.

Усе дружна прагаласавалі за такую прапанову. Замест прэзідыума абраныя таварышы былі змушаны шукаць месца ў зале.

Пасля гэтага выпадку ўсе нарады, актывы і пленумы распачыналі работу ў строга вызначаны час.

Як памятаецца, Іван Яўцеевіч надта

ўмела працаваў з людзьмі. Без аніякай зняважі, без павышанага тону. Дзверы ягонага кабінета былі адкрыты для кожнага. Камуніста ці беспартыйнага. Кажу пра тое не дзеля прыгожага слова. Яго любілі, яго паважалі ўсе, хто хоць калі сустракаўся з ім. У гаспадаркі раёна наведваўся толькі дзеля вырашэння канкрэтнага пытання. Быў прынцыповым праціўнікам пасылкі ў калгасы рознага роду ўпаўнаважаных — папіхачоў.

Шмат, па-сапраўднаму шмат зрабіў Іван Яўцеевіч Палякоў для пад'ёму эканомікі раёна. Ва ўсіх гаспадарках былі прабураны артэзіянскія свідравіны, на фермах устаноўлены аўтапаілкі, ветрарухавікі, іншыя механізмы, якія палегчылі працу жывёлаводаў. Ён быў ініцыятарам і арганізатарам будаўніцтва калгасных цагельных заводаў. Гэта ў хуткім часе вырашыла пытанне будаўнічых матэрыялаў. Пільную ўвагу надаваў ён павышэнню даходаў гаспадарак за кошт вырошчвання льну. Раслі даходы калгасаў, больш паўнаважкім станавіўся і працадзень. Шмат каторыя гаспадаркі апроч грошай атрымлівалі за льнопрадукцыю пшаніцу, цукар, алей і г. д. Усё гэта людзі атрымлівалі на працадні. За кошт рэалізацыі льнопрадукцыі калгасы «Савецкая Беларусь», імя Кірава, «40 гадоў Кастрычніка» і каторыя іншыя сталі неўзабаве мільянерамі. У Рэчыцкі раён прыязджалі вучыцца гаспадараванню не толькі з Гомельшчыны, а і з іншых абласцей рэспублікі.

У 1956 г. Івана Яўцеевіча Палякова абралі старшынёй Гомельскага аблвыканкама. На пленуме Рэчыцкага райкама партыі калі прыйшоў момант галасаваць аб вызваленні яго ад абавязкаў першага сакратара РК КПБ, на вачах у многіх дэлегатаў пленума з'явіліся слёзы. І людзі не хавалі іх. Вось так развітвацца можна толькі з родным чалавекам...

ХЛУС Парфірый Мацвеевіч нарадзіўся ў 1900 г. у с. Лескапогі Ноўгарад-Северскага р-на Чарнігаўскай вобл. (Украіна). Васемнаццацігадовы юнак стаў байцом аднаго з атрадаў дывізіі Шчорса, дзе са зброяй у руках змагаўся з замежнымі інтэрвентамі. Давялося Парфірыю Мацвеевічу быць і журналістам 1-га запаснога палка.

У 1930 г. скончыў 1-ы Ленінградскі медыцынскі інстытут імя Паўлава. Працаваў загадчыкам раённага аддзела аховы здароўя, урачом-хірургам.

З чэрвеня 1939 па снежань 1945 г. П. М. Хлус — у радах Чырвонай Арміі. Ён не толькі займаў кіруючыя пасады, але і займаўся хірургічнай практыкай, выратаваў жыцці соцень параненых байцоў і афіцэраў.

У пасляваенны перыяд Парфірый Мацвеевіч зноў працуе ў Рэчыцы. З 1949 па 1968 г. ён — галоўны ўрач Рэчыцкага рэспубліканскага касцёватуберкулёзнага санаторыя.

П. М. Хлус — заслужаны ўрач БССР, ганаровы грамадзянін Рэчыцы. Яго імем названа адна з вуліц горада.

За заслугі перад Айчынай Парфірый Мацвеевіч узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, некалькімі медалямі, дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета рэспублікі.

Памёр 22 сакавіка 1983 г.

Вызначыліся працай

Героі Сацыялістычнай Працы

ГАЛКО Уладзімір Мікітавіч нарадзіўся ў 1923 г. у в. Чамярысы Рэчыцкага павета Гомельскай губерні.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1951 па 1965 г. працаваў дызелістам, буравым майстрам Беларускай канторы разведвальнага бурэння. З 1965 г. — буравы майстар Рэчыцкай нафтаразведвальнай экспедыцыі глыбокага бурэння свідравін трэста «Белнафтагазразведка». Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Славы III ступені, медалямі.

У. М. Галко

Званне Героя Сацыялістычнай Працы атрымаў у 1971 г.

ГОРБАЧ Піліп Сямёнавіч нарадзіўся ў 1929 г. у в. Будка Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.

Звыш 20 гадоў працаваў машыністам экскаватара Капаткевіцкай перасоўнай механізаванай калоны № 67. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі. Званне Героя Сацыялістычнай Працы атрымаў у 1966 г.

КУЛЕШ Іван Уласавіч нарадзіўся ў 1930 г. у в. Краснаполле Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл. З 1948 г. — трактарыст калгаса «Чырвоны Сцяг». Адзін з ініцыятараў комплекснай механізацыі вырошчвання бульбы, буракоў і кукурузы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы атрымаў у 1959 г.

Памёр у 1989 г.

КУХАРАВА Еўдакія Арцёмаўна нарадзілася ў 1912 г. у мястэчку Васілевічы Рэчыцкага павета Мінскай губерні.

З 1944 г. — звеннявая па вырошчванні жыта, кок-сагызу, канапель у калгасе, затым да 1967 г. — рабочая саўгаса «Маканавічы» (цяпер «Сцяг Перамогі»). Узнагароджана медалямі.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы атрымала ў 1948 г.

МЯТЛУШКА Кацярына Апанасаўна нарадзілася ў 1927 г. у в. Казловічы Калінкавіцкага р-на.

З 1943 г. — даярка, затым цялятніца саўгаса «Ведрыч». Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы атрымала ў 1950 г.

ПЫРКО Іван Рыгоравіч нарадзіўся ў 1930 г. у в. Глінная Слабада. З 1953 — трактарыст, з 1962 — бульдазерыст Калінкавіцкага будаўніча-мантажнага ўпраўлення трэста «Калінкавічыводбуд». Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1971 г.

ФЕШЧАНКА Сцяпан Дзмітрыевіч нарадзіўся ў 1909 г. у в. Бабічы Рэчыцкага павета.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946—1967 гг. — брыгадзір трактарнай брыгады, з 1967 г. — механізатар саўгаса «Ведрыч». Цяпер на пенсіі.

П. С. Горбач

І. У. Кулеш

Е. А. Кухарава

К. А. Мятлушка

С. Дз. Фешчанка

У. Д. Юрчанка

Званне Героя Сацыялістычнай Працы атрымаў у 1950 г.

ЮРЧАНКА Уладзімір Данілавіч нарадзіўся ў 1928 г. у в. Нахаў Калінкавіцкага р-на. З 1956 г. — кіраўнік паляводчай брыгады саўгаса «Ведрыч» (цяпер племза-

вод). Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. З 1981 г. з'яўляецца кіраўніком цэха раслінаводства племзавода.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы нададзена ў 1971 г.

Служэнне людзям

Працоўная біяграфія Ніны Гаўрылаўны Афанасьевай, заслужанай настаўніцы рэспублікі і кавалера ордэна Леніна, пачалася яшчэ ў пачатку стагоддзя.

У невялічкім гарадку Яранску былой Вяцкай губерні закончыла яна мясцовую жаночую гімназію і паехала настаўнічаць у вёску. Не паспела падысці да школы, як яе ўжо абступіла дапытлівая дзятва.

Настаўніца адразу ж стала ў вёсцы сваім чалавекам. З ёю раіліся, расказвалі свае сялянскія беды. Ніна ж са свайго боку давала парады, дапамагала чым магла.

Але неўзабаве здарылася непрыемнае. Нейкая хцівая душа напісала на яе данос: «ненадзейная». Яе выслалі ў аддалены раён на два гады, забараніўшы пры гэтым наведваць сталічныя гарады.

Нарэшце тэрмін высылкі скончыўся. Перад дзяўчынай паўстала пытанне: куды ісці цяпер? Мо зноў у школу? Пасля роздуму настаўніца прымае рашэнне — трэба вучыцца далей. Яна едзе ў Пецярбург з мэтай паступлення на вышэйшыя жаночыя курсы, становіцца студэнткай.

Неўзабаве пасля кастрычніцкіх падзей 1917-га Ніну разам з групай іншых маладых таленавітых настаўнікаў выклікаў да сябе А. В. Луначарскі.

Народны камісар асветы адразу ж распачаў гаворку пра тое бядотнае становішча, якое склалася ў краіне з настаўніцкімі кадрамі, і асабліва ў Сярэдняй Азіі.

Праз нейкія два тыдні пасля той размовы Ніна Гаўрылаўна расказвала туркменскім дзецям, у асноўным з сем'яў ашхабадскіх чыгуначнікаў, пра творы Льва Талстога, Горкага...

Атрымала ў хуткім часе некалькі лістоў, поўных паклёпу і пагроз. Ёй раілі: «Едзь назад!» Яна не паслухалася: падала заяву з просьбай прыняць у бальшавіцкую партыю.

Больш як 10 гадоў аддала Ніна Гаўрылаўна справе выхавання туркменскіх дзяцей. Прыкіпела да іх, як кажуць, сэрцам. Магчыма, і засталася б там назаўсёды, каб урачы не вынеслі свой суровы прысуд яе мужу: з сэрцам дрэнна, трэба мяняць месца жыхарства. Афанасьевы едуць у Беларусь.

У ціхім прыдняпроўскім гарадку Рэчыца Ніна Гаўрылаўна працуе спачатку настаўніцай, а праз два гады ўзначаліла гарана.

Дзверы ў маленькі кабінет-пакойчык Афанасьевай не зачыняліся з ранку да вечара. Настаўнікі ішлі сюды з ахвотаю, ведаючы, што загадчыца гарана зробіць для іх усё, што ў яе сілах, заўсёды падбадзёрыць, падтрымае, натхніць.

Вайна! Гэта страшэнная вестка напаткала Ніну Гаўрылаўну ў рабочым кабінеце за складаннем планаў на новы навучальны год. Хаця быў выхадны дзень.

...Недзе ўжо каля самай Рэчыцы ішлі гарачыя, кровапралітныя баі, а ў гэты час, трымаючы курс на ўсход, з горада выехаў апошні грузавік з дзецьмі аднаго з рэчыцкіх дзіцячых дамоў. У кузаве грузавіка сядзела і Ніна Гаўрылаўна Афанасьева.

Нялёгка было на новым месцы. Памяшканне пад дзіцячы дом знайшлося, хоць і не надта добрае. Падрамантавалі яго сіламі выхавацеляў і саміх дзяцей. А вось з хлебам, палівам і бялізнаю было горш. Афанасьевай раілі: «Патрабуйце. Гэта ваша права».

Патрабаваць можна, толькі ж гэты самы хлеб, паліва і бялізна патрэбны і на фронце. І Ніна Гаўрылаўна прымае цвёрдае рашэнне: «Як мага часцей трэба абыходзіцца ўласнымі сіламі».

Пасля заняткаў разам з дзецьмі яна ўскопвае пад бульбу агарод, збірае дровы, а калі ўжо ўсе разыдуцца спаць, пад цьмянае святло «газоўкі», амаль да рання, латае дзіцячую бялізну.

...Прыйшла радасная вестка: вызвалена большая частка Гомельшчыны. Праз тыдзень Наркамасветы БССР тэрмінова выклікаў Ніну Гаўрылаўну назад у Рэчыцу. І зноў праца, праца, праца... Яна ацэньваецца па самаму высокаму рахунку. Спачатку Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Ніна Гаўрылаўна Афанасьева ўзнагароджваецца медалём «За доблестный труд в Великой Отечественной войне». Затым з Мінска прыходзіць паведамленне аб прысваенні ёй ганаровага звання заслужанай настаўніцы БССР. Праходзіць некалькі гадоў, і ...новая высокая ўзнагарода — ордэн Леніна.

Імкліва бяжыць час. Яшчэ, здаецца, учора былі і сіла, і бадзёрасць, а ўжо

сёння валасы густа пасерабрыла сівізна, ды і сэрца патрабуе: пара на спакой.

Спакойнае жыццё. Што гэта такое?.. Ужо праз некалькі дзён пасля выхаду на пенсію Афанасьева звяртаецца ў гарадскі Савет пенсіянераў з просьбай замацаваць яе на грамадскіх пачатках за школай № 1.

І зноўку Ніна Гаўрылаўна ў гушчыні школьнага жыцця. Пад яе кіраўніцтвам арганізуюцца дыспуты, вечары, камсамольскія «агеньчыкі». Яна дзеліцца з маладымі настаўнікамі горада сваім багатым вопытам, дапамагае выпускнікам знайсці сваё месца ў жыцці. Работы, як кажуць, хоць адбаўляй.

А тут яшчэ прыходзяць з мясцовай прыстані, просяць: «Ніна Гаўрылаўна, дапамажыце падрыхтаваць лекцыю». Настаўніца ахвотна згаджаецца: «Не толькі дапамагу, але і сама прачытаю».

Так і не заўважыла Ніна Гаўрылаўна, як стала кіраўніком цэлай лектарскай групы.

Ад грамадскіх спраў адышла толькі тады, калі стала зусім дрэнна.

У апошні шлях яе праводзілі і настаўнікі, і вучні. А сярод іх заслужаныя ўрачы, акадэмікі...

І сёння Рэчыца памятае свайго па-сапраўднаму народнага настаўніка. Ніну Гаўрылаўну Афанасьеву, якая рабіла ўсё, каб служыць людзям.

П. Рабянок, Я. Тулупаў

Са званнем «Заслужаны...»

Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі — ШПАКАЎ Рыгор Купрыянавіч (1985, старшыня калгаса «50 гадоў Кастрычніка»).

Заслужаны меліяратар Беларусі — ДУБРО Браніслаў Іосіфавіч (1965, начальнік ПМК-73 меліярацыі).

Заслужаны энергетык Беларусі — ЦЫЦУРА Сяргей Міхайлавіч (1981, дырэктар Рэчыцкага прадпрыемства электрычных сетак), ганаровы грамадзянін г. Рэчыца (1997).

Заслужаныя работнікі культуры Беларусі: ВЕРАБ'ЁЎ Рыгор Майсеевіч (1975, рэдактар рэчыцкай аб'яднанай газеты «Дняпровец»); **ПЫРХ Віктар Антонавіч** (1985, старшыня калгаса імя Дзяржынскага).

Заслужаныя настаўнікі Беларусі: АТАМАНЧУК Генадзь Рыгоравіч (1982, настаўнік фізічнага выхавання, г. Рэчыца); **АФАНАСЬЕВА Ніна Гаўрылаўна** (1945, загадчык Рэчыцкага гарана); **АХРАМЕНКА Анатолія Васільеўна** (1972, настаўніца Васілевіцкай СШ); **БАЛТРУКЕВІЧ Тамара Аляксееўна** (1957, настаўніца Рэчыцкай СШ № 7); **БЕЛАЯ Вольга Васільеўна** (1968, настаўніца Рэчыцкай СШ № 7); **БОНДАРАВА Зінаіда Захараўна** (1964, настаўніца Дземяхоўскай сямігодкі); **БЫЧКОЎСКАЯ Яўгенія Іванаўна** (1968, настаўніца пачатковых класаў Васілевіцкай СШ); **ВАРАБ'ЁВА Клаўдзія Савельеўна** (1967, выкладчыца Рэчыцкага сельскагаспадарчага тэхнікума (зааветэрынарны); **ВОЛКАВА Лілія Мікітаўна** (1982, дырэктар Рэчыцкай вячэрняй СШ № 3); **ГАЙДАШ Анатоль Самойлавіч (Сямёнавіч)** (1957, настаўнік, Рэчыцкі р-н); **ГАЛАВАЧ Адам Рыгоравіч** (1978, загадчык Рэчыцкага рана); **ГАЎРЫЛАВА Еўдакія Пятроўна** (1968, настаўніца Рэчыцкай СШ № 3); **ГРАБЦЭВІЧ Іван Арцёмавіч** (1957, загадчык Рэчыцкага гарана); **ГРАЧАНКОВА Наталля Яўменаўна** (1973, настаўніца Глыбаўскай СШ); **ГУСІНЦАВА Наталля Піліпаўна** (1963, настаўніца Васілевіцкай СШ); **ДАРАШЭВІЧ Адам Якаўлевіч** (1947, дырэктар Горвальскай СШ, узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна); **ДУБІНА Алена Паўлаўна** (1966, выхавацель дзіцячых садкоў, г. Рэчыца); **ЗАРЭЦКІ Генадзь Адамавіч** (1997, дырэктар Бабіцкай дапаможнай школы-інтэрната); **ЗАХАРЭНКА Аляксандр Лявонцьевіч** (1968, дырэктар Васілевіцкай СШ); **ІШЧАНКА Людміла Апанасаўна** (1968, настаўніца Заспенскай СШ); **КАЛЕСНІК Раіса Пятроўна** (1977, настаўніца Левашоўскай васьмігадовай школы); **КУЦАПАЛАВА Ганна Ігнацьеўна** (1972, настаўніца Салтаноўскай СШ); **МАРЧАНКА Глафіра Міхайлаўна** (1966, настаўніца Горвальскай СШ); **МЕЛЬНІКАЎ Міхаіл Аляксандравіч** (1966, дырэктар Рэчыцкай СШ № 9); **НАЛЯГАЧ Аляксей Аляксеевіч** (1968, загадчык пачатковай школы в. Гарывада); **САМУСЕЛА Валянціна Міхайлаўна** (1998, дырэктар СШ № 6 г. Рэчыца); **СТАЛОВІЧ Георгій Канстанцінавіч** (1948, дырэктар Рэчыцкай СШ № 7); **ФІЛІПАВА Іда Васільеўна** (1975, настаўніца Жмураўскай СШ); **ШАЎЛОЎСКАЯ Лізавета Емяльянаўна** (1960, загадчыца пачатковай школы в. Арол); **ШУЛЬГОЎСКАЯ Дзіна Васільеўна** (1970, настаўніца Рэчыцкай школы-інтэрната для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі); **ШЫФРЫНА Ніна Аляксандраўна** (1967, загадчыца Чырвонадуброўскай пачатковай школы); **ЮДАШКІНА Антаніна Уладзіміраўна** (1967, настаўніца фізікі, працавала ў школах г. Рэчыцы і Рэчыцкага раёна); **ЯКІМЮК Марыя Іосіфаўна** (1965, загадчыца пачатковай школы в. Падалессе); **ЯРАЦ Яфімія Раманаўна** (1967, настаўніца Караваціцкай СШ).

Заслужаныя ўрачы Беларусі: КОМАЎ Павел Цімафеевіч (1948, загадчык хірургічнага аддзялення Рэчыцкай райбальніцы); **МІНАЙЛАВА Марыя Міхайлаўна** (1960, урач-рэнтгенолаг, г. Рэчыца); **САЙКОВА Ганна Аляксееўна** (1961, урач

неўрапатолаг, г. Рэчыца); **ХЛУС Парфірый Мацвеевіч** (1958, загадчык 1-ай паліклінікі г. Рэчыца).

Заслужаны работнік фізічнай культуры Беларусі — КАЖАДУБ Аляксандр Іванавіч (1996, старшыня спорткамітэта г. Рэчыца).

Заслужаныя трэнеры Беларусі: ЗАВАДСКІ Міхаіл Іванавіч (1968, кулявая стральба, г. Рэчыца); **МАРЫЕЎСКАЯ Зоя Пятроўна** (1992, лёгкая атлетыка, г. Рэчыца); **ШАСТАПАЛАЎ Мікалай Аляксандравіч** (1996, вольная барацьба, г. Рэчыца, трэнер **Сяргея СМАЛЯ,** чэмпіёна свету, сярэбранага прызёра Алімпійскіх гульняў у г. Барселона).

Загінулі ў Афганістане

АРЖАНОЎСКІ Аляксандр Ліферавіч нарадзіўся 30.12.1961 г. у в. Ведрыч. У 1976 г. скончыў 8 класаў Ведрыцкай сярэдняй школы, у 1978 г. — Гомельскае ПТВ № 30 рачнога флоту па спецыяльнасці слесар механазборачных работ. Працаваў у сейсмалагічнай партыі № 5 трэста «Захаднафтагеафізіка» рабочым, памочнікам бурыльшчыка, бурыльшчыкам. У сакавіку 1981 г. прызваны ў Савецкую Армію Рэчыцкім АГВК. Спачатку тры месяцы быў на вучобе ў Ташкенце, потым накіраваны ў Афганістан. Быў сапёрам. Сяржант А. Л. Аржаноўскі 15.6.1983 г. падарваўся на міне ў час вяртання з баявога задання. Пахаваны ў г. Васілевічы Рэчыцкага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ВАРОНІН Сяргей Аляксандравіч нарадзіўся 12.8.1960 г. у г. Рэчыца. У 1976 г. скончыў Рудакоўскае ПТВ, курсы шафёраў. Працаваў у ПМК № 59 экскаватаршчыкам. У лістападзе 1979 г. прызваны ў Савецкую Армію Рэчыцкім АГВК. Радавы С. А. Варонін загінуў 25.5.1981 г. пры выкананні службовага абавязку. Пахаваны ў г. Рэчыца. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ГАРМОНЕНКА Аляксандр Міхайлавіч нарадзіўся 7.2.1958 г. у в. Холмеч. У 1975 г. скончыў сярэднюю школу ў саўгасе імя Ільіча Карасускага раёна Кустанайскай вобласці. У 1975—1976 гг. вучыўся ў школе ДТСААФ у г. Кустанай. У 1976 г. прызваны ў Савецкую Армію Карасускім РВК. Пасля службы ў 1978—1979 гг. працаваў у саўгасе трактарыстам. У 1979 г. скончыў школу прапаршчыкаў. У 1985 г. накіраваны ў Афганістан. Прапаршчык А. М. Гармоненка загінуў 7.5.1987 г. пры выкананні службовага абавязку. Пахаваны ў в. Холмеч. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З успамінаў жонкі загінуўшага Ірыны Іванаўны Гармоненка

...Вельмі любіў паляванне і рыбалку. Рамантаваў усе маркі радыёпрыёмнікаў. Іграў амаль на ўсіх музычных інструментах. Прыгожа спяваў. Марыў пра сына, збіраўся дачку вучыць у музычнай школе. Вельмі развазлівы, спакойны ў любой сітуацыі; увесь час быў незадаволены сабой, шукаў любую магчымасць праверыць сябе.

ПІНЧУК Віктар Рыгоравіч нарадзіўся 24.11.1963 г. у в. Рабуса. У 1979 г. скончыў Перасвятоўскую васьмігадовую школу, у 1982 г. — Прыбарскае ПТВ № 30. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Х гадоў Кастрычніка». У кастрычніку 1982 г. прызваны

А. Л. Аржаноўскі

С. А. Варонін

А. М. Гармоненка

В. Р. Пінчук

ў Савецкую Армію Рэчыцкім АГВК. Служыў у Афганістане. Пры выкананні баявога задання радавы В. Р. Пінчук быў смяротна паранены і памёр 2.2.1984 г. Пахаваны ў в. Рабуса. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

СЫЧ Фёдар Гардзеевіч нарадзіўся 14.2.1962 г. у в. Цішкаўка. У 1977 г. скончыў Чырвонадуброўскую васьмігадовую школу, у 1979 г. — Караваціцкую сярэднюю школу. Працаваў на Гомельскім хімічным заводзе. У сакавіку 1982 г. быў прызваны ў Савецкую Армію Гомельскім ГВК. Служыў у Афганістане. Радавы Ф. Г. Сыч загінуў 3.12.1983 г. Пахаваны ў в. Цішкаўка. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У Чырвонадуброўскай школе аформлены стэнд, прысвечаны Ф. Г. Сычу.

...Варожы кулямёт не змаўкаў ні на мінуту. Прыйшлося залегчы. Фёдар наступаў у цэнтры аддзялення. Ён выбраў на гарачым каменні зручнае месца, прыпаў тварам да кулямета, як быццам зліўся з ім у адно, і страляў. І, калі душманскі кулямёт змоўк, лейтэнант Кузаўкоў падняў узвод у атаку.

Цяжкае дыханне сяброў, што бягуць побач, глухі тупат салдацкіх ботаў, шамаценне каменя, бязладная страляніна і... частыя ўдары сэрца. І яшчэ — душманы, якія ўцякаюць, — вось што запамяталася Фёдару ў гэтай першай баявой атацы. У стралковай ячэйцы, куды ён ускочыў, яшчэ дыхаў гарачынёй варожы кулямет. Побач расстраляная стужка. У куце — дзве новыя, некранутыя. А ўперадзе ў куце — некалькі цынкавых скрынак, мяшок з патронамі.

Побач на брустверы валяліся англійская вінтоўка «Бур», некалькі зялёных амерыканскіх гранат, пустая біклажка.

А бой працягваўся. Адстрэльваючыся на хаду, душманы кінуліся ў кішлак. І адтуль, схаваўшыся ў дамах, за нізкімі мураванымі платамі, зноў адкрылі страляніну. Асабліва моцны агонь вялі з крайняга дома. Свінцовыя струмені куль літаральна палівалі кожны метр камяністай зямлі. Быў цяжка паранены стралок Чараднік.

Узвод рассыпаўся па лагчыне.

— Узмацніць агонь па крайнім доме! — скамандаваў лейтэнант.

Фёдар скіраваў туды агонь свайго кулямета.

Раптам з акна паваліў густы дым. Стральба на імгненне заціхла. Байцы зноў кінуліся ў атаку...

Да невялікай пляцоўкі ў цэнтры кішлака сыходзіліся жыхары, многія — з узнятымі рукамі. А з палаючага крайняга дома дэхкане выцягнулі мёртвае абгарэлае цела.

— Ахмед-атар, — увесь час паўтаралі яны, паказваючы на труп.

Перакладу гэта не патрабуе, атар — вораг. Так афганцы называюць душманаў. Гэта быў верхавод банды. Ён тут арудаваў два месяцы.

Ф. Г. Сыч

Усе члены банды — дванаццаць душманаў — склалі зброю.

Іх было многа, такіх баёў, у шасцідзесяцігрэдусную спёку і халаднаватай афганскай ноччу, у цяснінах і ў кішлаках, на горных афганскіх дарогах. І ніхто з нашых хлопцаў не быў застрахаваны ад душманскіх куль. У адным з пісьмаў Фёдар пісаў маці: «Тут многа небяспекі і рызыкі. Але трэба быць напагатове. Мы не лезем на ражон, але ўсякае бывае». І ў другім: «У народзе гавораць: салдат спіць, а служба ідзе. Але ў нас спаць нельга, а то можна без галавы застацца».

А ўжо ў канцы службы сястры Людміле пісаў: «Люда, я пішу табе пісьмо, а вакол страляюць. Раней неяк страшна было. А цяпер нават увагі на звяртаеш».

Колькі ўбачыў ён за дваццаць месяцаў службы! Таварыш ратаваў таварыша, паспяваючы першы паслаць кулю ў душманскага снайпера, што цэліўся ў сябра. І ў раненых не было сумнення — іх ніколі і ні за што не пакінуць — вынесуць. Таму што пачуцці гэтыя выхаваны ў нашых хлопцаў з дзяцінства.

Там, у роднай Цішкаўцы, Фёдар не верыў у тое, што чалавек можа страляць у чалавека. Проста ён ніколі не задумваўся аб гэтым. А тое, што чытаў пра гэта ў кнігах, глядзеў у кіно, было для яго, як і іншых яго равеснікаў, якімсьці далёкім. Трэба было ўбачыць кроў таварышаў, каб паверыць у рэальнасць існавання ворагаў, якія глядзелі на яго праз прыцэлы аўтаматаў...

Пісьмы... Пісьмы маці, бацьку, сёстрам. Пісьмы сябрам. У іх — усё яго жыццё, яго мары і засмучэнні, радасці і імкненні, інтарэсы і жаданні. Яго армейская служба. Нарэшце, свет яго ўспрыманняў. І дома, на роднай зямлі, і на зямлі афганскай.

Пісьмаў не так ужо многа.

«Не так ужо часта мне выпадае час пісаць пісьма, — напісаў ён аднойчы родным. — Але вы не хвалюйцеся. У мяне ўсё ў парадку».

У пісьмах духоўны свет гэтага простага беларускага хлопца. Амаль у кожным з іх ён цікавіцца здароўем родных. («Мама, з'ездзі ў паліклініку і купі сабе акуляры»). Цікавіцца

жыццём сельскай моладзі, яе адпачынкам, інтарэсамі. Пытае, хто з іх ажаніўся. («Напішыце, колькі вяселляў згулялі за час маёй адсутнасці».) Нават засмуціўся аднойчы: «Часам становіцца неяк крыўдна. Думаеш, быццам спецыяльна. Я пайшоў у армію, і ўсе пачалі жаніцца і замуж выходзіць».

Калі наступіў час веснавых работ, Фёдар, хлебароб у душы, пытаўся ў бацькоў, як яны падрыхтаваліся да сезона. І пісаў: «Мама, як мне хацелася б паесці маладой бульбы. Такой, як калісьці гатавала ты, па-беларуску».

І другое: «Напэўна, вы ўжо п'яце бярозавы сок, а тут нават бяроз няма. Я таксама хацеў бы выпіць шклянку соку».

Але больш за ўсё ён пісаў аб кветках: «Зараз цвіце міндаль! Ведаеце, які пах!» «Мама, ты сабе не можаш уявіць, як прыгожа тут цвітуць ружы, як прыемна пахнуць. Яны цвітуць год, але асабліва прыгожа — зімой».

«Люда, я паклаў табе ў канверт пялёсткі руж. Уяві сабе, што я дару букет жывых руж у дзень твайго нараджэння».

А калі пабываў у палацы шаха: «Люда, ты нават не ўяўляеш, як тут прыгожа. Мяне асабліва ўразілі люстры. Яны — з хрусталю. Быццам рамонкі».

У пісьме ён пісаў аб будучай вучобе: «Гаворыць, тыя, хто служыў у Афганістане, маюць перавагу пры паступленні на вучобу».

І, вядома ж, сумаваў. «Вось ужо год, як я снегу не бачыў. Сумую па зіме, па снезе. Мне здаецца, што, калі я прыеду з арміі — буду баяцца холаду».

«Дамоў прыеду летам. Абавязкова з'едзім на рэчку дзянькі на тры-чатыры. Хочацца пабыць аднаму, пасядзець каля рэчкі вечарам».

Апошняе пісьмо ён напісаў сябру Аляксандру. Але адправіць яго не паспеў. Яно засталося ў альбоме. У ім ёсць адна дэталь — «хутка ідзём на заданне».

Той снежаньскі дзень пачаўся звычайна. Ранні пад'ём, зарадка, салдацкае снеданне. Выглянула з-за гор сонца, зімовае, халаднаватае, але яно абяцала хутка пацяплець. Чамусьці ўспомніўся дом. Здавалася, што не быў там цэлую вечнасць. Пляменнік Валодзя пайшоў ужо ў першы клас. Сястра Наташа паспела замуж выйсці. Малодшая сястра Людміла паступіла ў гандлёвы тэхнікум у Гомелі...

І раптам — баявая трывога. Фёдар са сваім нязменным кулямётам заняў прывычнае месца ў «бэтээры». І вось ужо баявая калона рухаецца па горнай дарозе.

Дарога крута павярнула ўправа, у глыбокую цясніну. Адтуль клубіліся густыя валы чорнага дыму, цягнула ўдушлівым пахам паленага мазуту, даносіліся аддаленыя выстралы. Фёдар зразумеў — душманы напалі на калону з гаручым, падпалілі яе. Калі «бэтээр» спыніўся перад палаючай калонай з цыстэрнамі, адтуль, з цясніны, аднавілася стральба. Аўтаматныя і кулямётныя чэргі, памножаныя горным рэхам, мітусіліся паміж скал, зліваючыся ў няспынны грукат.

Відаць, душманы акапаліся тут надоўга. Калі шквал агню зменшыўся, салдаты праз ніжні люк адзін за другім пакінулі баявую машыну, рассыпаліся ўздоўж камяністага насыпу для вядзення бою. Ужо вяло прыцэльны агонь па ворагу аддзяленне сяржанта Казака, якое размясцілася злева. Фёдар ускінуў свой РПК, шырокімі і ўпэўненымі крокамі рушыў да чорнага каменнага асколка ля абочыны. Яны занялі зручную пазіцыю метраў за сто ад дарогі. Побач з Фёдарам агонь па ворагу вёў сяржант Чарняк.

У галаве стаяў суцэльны гул, да кулямётнай стральбы прымяшаліся глухія гранатныя ўзрывы. Захлынуўся кулямёт, па якім страляў Сыч.

— Узвод, падрыхтавацца да атакі! — пачуўся злева голас лейтэнанта Кузаўкова.

Стральба заціхла. Узвод замёр у напружанні. Маўчалі і душманы.

«У атаку!..» — крыкнуў камандзір.

Фёдар лёгка ўскочыў з-за свайго ўкрыцця, зрабіў некалькі скачкоў. І раптам штосьці тупое, распаленае ўдарыла ў грудзі. Сутаргава схапіўшыся за сэрца правай рукой, стараючыся не выпусціць кулямёт, Фёдар марудна пачаў падаць на камяністую абочыну... Чыесьці моцныя, прапахлыя гарам рукі падхапілі яго.

— Што з табой, Федзя? — пачуў ён голас сяржанта Чарняка.

— Відаць, адваяваўся, — неяк стрымана адказаў салдат.

Узвод пайшоў уперад, там зноў узнавілася стральба. Яны засталіся ўдвух. Сяржант падцягнуў яго да застыўшага на дарозе «бэтээра», прытуліў да цёплай гумы кола.

Фёдару станавілася цяжка дыхаць. Ён лавіў паветра шырока адкрытым ротам. У вачах плылі нейкія бясколерныя кругі.

Камандзір расшпіліў куртку, разарваў майку. У левай частцы грудзей, крыху ніжэй сэрца, убачыў чырвоную пляму. Хутка перавязаў рану. Але кроў спыніць было немагчыма — куля прайшла наскрозь. Камандзір прыўзняў Фёдара. Вочы яго прасвятліліся. Ён прашаптаў:

— Як там нашы?.. Напішыце родным... Я так любіў іх...

Бой яшчэ грымеў дзесьці ўнізе.

А ён, кулямётчык Фёдар Сыч, памёр у камандзіра аддзялення Чарняка на руках.

Пахавалі Фёдара ў самым цэнтры роднай вёскі Цішкаўка. З усімі салдацкімі ўшанаваннямі. Дванаццаць разоў вясковае паветра разрывалі аўтаматныя чэргі салюта.

Свежасцю, урачыстасцю і веліччу адлівае на чорным граніце помніка ордэн Чырвонай Зоркі. І гараць ля яго падножжа ружы — любімыя кветкі Фёдара.

В. Ярамчук

ЧАРНЕЙКА Сяргей Сцяпанавіч нарадзіўся 28.8.1959 г. у г. Рэчыца. Скончыў сярэднюю школу № 3 у г. Рэчыца, вучыўся ў Гомельскім музычным вучылішчы. У маі

1978 г. прызваны ў Савецкую Армію Гомельскім ГВК. Служыў у Афганістане. Радавы С. С. Чарнейка загінуў 29.2.1980 г. пры выкананні службовага абавязку. Пахаваны ў г. Рэчыца. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Загінуў у Сірыі

БОРСУК Аляксандр Радзівонавіч нарадзіўся 16.3.1963 г. у г. Рэчыца. Скончыў сярэднюю школу № 5. У 1982 г. быў прызваны ў Савецкую Армію. Авалодаў там спецыяльнасцю сувязіста. Служыў у Сірыі. Загінуў 11.9.1983 г. ад асколачнага ранення ў грудзі. Пахаваны ў г. Рэчыца.

Народныя калектывы

Азершчынскі народны хор

Арганізатарам і першым творчым кіраўніком калектыву была Таццяна Карнееўна Лапаціна, заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі (1949). 20 жніўня 1936 г. самадзейны калектыў выступіў упершыню па рэчыцкім радыё. Поспех быў вялізны. Неўзабаве да жаночага сямейнага хору Лапаціных, які складаўся з 11 родных і стрыечных сясцёр Таццяны Карнееўны, далучыліся іншыя таленавітыя жыхары Азершчыны. Калектыў зноў выступіў па рэчыцкім радыё. Зроблена тое было па запрашэнню раённых арганізацый.

На сцэне азершчынцы ўпершыню выступалі на злёце стаханаўцаў у Рэчыцкім рабочым клубе.

Гэтымі першымі канцэртамі і пачалася творчая дзейнасць хору.

У 1937 г. калектыў быў запрошаны ў Мінск на 2-і рэспубліканскі агляд мастацкай самадзейнасці, дзе заняў першае месца. У якасці падарунка быў атрыманы баян.

У 1939 г. хор прымаў удзел у адкрыцці Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве. Адбылося тое ў жніўні. А неўзабаве азершчынцы далі канцэрты ў Народным сходзе ў Беластоку.

Праз год беларускія песні ў выкананні хору зноў гучалі ў Маскве, дзе праходзіла Першая дэкада беларускага мастацтва. 15 чэрвеня 1940 г. хор выступіў на заключным канцэрце дэкады ў Вялікім тэатры. На канцэрце прысутнічалі члены ўрада і І. В. Сталін. Калі хор скончыў выступленне, Сталін падняўся са свайго месца і пачаў апладыраваць. Назаўтра калектыў быў запрошаны ў Крэмль, дзе М. І. Калінін уручыў Т. К. Лапацінай ордэн «Знак Пашаны». Аб творчасці самадзейных артыстаў з в. Азершчына расказала сваім чытачам газета «Правда».

Творчую дзейнасць хору перапыніла Вялікая Айчынная вайна. Калі ж у лістападзе 1943 г. Рэчыцкі раён быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, то ўжо на другі дзень удзельнікі хору сабраліся на рэпетыцыю. Праз тыдзень быў дадзены канцэрт для воінаў-вызваліцеляў.

Рэпертуар калектыву ўвесь час папаўняўся новымі творамі. Шмат твораў былі створаны ўдзельнікамі хору.

За вялікі ўклад у развіццё самадзейнай творчасці ў 1949 г. Т. К. Лапацінай было нададзена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР».

У пачатку 50-ых гадоў у Азершчыну рэгулярна наведваліся беларускія кампазітары, каб паслухаць новыя творы калектыву, прапанаваць нешта сваё і г. д.

У 1957 г. у Маскве праходзіў 6-ы Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. Азершчынскі хор стаў удзельнікам гэтага форуму міру. Ён удала выступіў там і быў адзначаны бронзавым медалём.

Званне народнага калектыў атрымаў у 1962 г.

У 1991 г. — новая паездка ў Маскву, на гэты раз для ўдзелу ў фестывалі дзён газеты «Правда».

У калектыве каля 50 самадзейных артыстаў. Прыходзяць новыя людзі, мяняюцца кіраўнікі. Але, як і раней, ён застаецца пасапраўднаму народным, актыўным прапагандыстам песеннай культуры рэчыцкай зямлі.

П. П. Рабянок

Гучалі песні ў гонар вызваліцеляў

З успамінаў Зінаіды Міхайлаўны Згурскай, дачкі Таццяны Карнееўны Лапацінай

...18 лістапада 1943-га мы радасна стракалі сваіх вызваліцеляў. Беглі насустрач абдымалі і цалавалі нашых салдат.

У той дзень азершчынцы ехалі з лесу дадому. І ўжо назаўтра ў нашай хаце сабраўся калектыў хору. Людзі прыйшлі самі, іх ніхто не клікаў. Былі гэта толькі жанчыны і дзяўчаты. Мужчыны, былыя ўдзельнікі хору, вядома ж, ваявалі. І хаця недалёка грымела кананада, людзі запелі. Запелі ўпершыню пасля жудасных гадоў фашысцкай акупацыі. Спявалі і плакалі ад радасці.

А роўна праз тыдзень хор даў у вёсцы свой першы пасля вызвалення канцэрт. Ён праходзіў у памяшканні, дзе потым знаходзіўся сельсавет, бо калгасны Дом культуры акупанты ператварылі ў канюшню.

У невялікім тым памяшканні не мясціліся ўсе салдаты і афіцэры, якія жадалі трапіць на выступленне хору. Таму былі знарок расчынены ўсе вокны і дзверы, каб людзі, што стаялі на вуліцы, таксама слухалі канцэрт. Хор выконваў песні савецкіх кампазітараў, беларускія народныя песні і частушкі. Канцэрт той меў вялізны поспех.

Нездарма праз 30 гадоў пасля таго канцэрта генерал Васіль Кузьміч Нікіцін, які прыязджаў на святкаванне дня вызвалення Рэчыцы і раёна, не мінуў наведацца і ў нашу хату. Расказаў Таццяне Карнееўне, што быў на першым канцэрце хору пасля вызвалення Азершчыны. Прайшоў многімі франтавымі дарогамі, але нідзе не надаралася такога, каб у толькі што вызваленай вёсцы ім, франтавікам, быў дадзены такі выдатны па мастацкаму выкананню і цікавы па зместу канцэрт.

...Так, у тыя незабыўныя дні хор даваў шмат канцэртаў. Выступаў перад параненымі ў палатах шпіталяў, перад франтавікамі ў клубах, зямлянках, на адкрытых пляцоўках у лесе, дзе сцэнай быў раскрыты кузаў грузавой машыны. Былі дні, калі даводзілася выступаць разоў па пяць-шэсць. Але ўдзельнікі хору як бы і не адчувалі стомы.

Незадоўга да вайны за ўдзел у рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці калектыў хору атрымаў падарунак — баян. Іграў на ім Пятро Лапшак. Заўсёды жыццярадасны, са здаровым гумарам, ён быў душой калектыву, сакратаром камсамольскай арганізацыі вёскі. Фашысты схапілі яго ноччу, бязлітасна здзекаваліся. Потым прымусілі выкапаць для сябе магілу і расстралялі. Так абарвалася кароткае, але слаўнае жыццё нашага баяніста. А было яму тады ўсяго 19 гадоў.

Разам з Пятром Лапшаком быў расстраляны і сакратар Азершчынскага сельсавета Андрэй Марцінавіч Сярак. У яго засталіся пяцёра малых дзяцей.

Пасля вызвалення за музыку хору была Валянціна Козыр. Праўда, грала на старэнькім гармоніку, які застаўся ад бацькі. Той загінуў на фронце.

І вось мы, удзельнікі хору, напісалі пісьмо самому камандуючаму 1-ым Беларускім фронтам К. К. Ракасоўскаму. Апісалі сваю бяду з інструментам. І вось праз нейкі тыдзень калектыў атрымаў новенькі гласісты гармонік. Колькі было радасці! Доўгі час гэты гармонік з'яўляўся нашым спадарожнікам у дзесяткі населеных пунктаў Гомельшчыны, дзе толькі даводзілася выступаць. Зараз гармонік-ветэран у Мінску, у музеі Вялікай Айчыннай вайны.

Не забудзецца, які вялізны патрыятычны ўздым панаваў у калектыве ў самыя цяжкія дні. Удзельнікі хору сабралі 25 тысяч рублёў на танкавую калону «Адказ Рэчыцы», за што атрымалі тэлеграму-падзяку ад Сталіна.

Было радасна ўсведамляць, што і наша мастацтва дапамагае байцам і афіцэрам нашай арміі біць ворага, набліжаць дзень Вялікай Перамогі.

Той незабыўны канцэрт...

З успамінаў Р. Надзеева, удзельніка вызвалення г. Рэчыца і раёна

...Рэчыца была ўжо вызвалена ад фашыстаў. Мы размясціліся ў горадзе. І тут мяне выклікаў камандзір нашай 5-ай артылерыйскай дывізіі прарыву Снегуроў. У ягоным кабінеце знаходзілася жанчына сярэдняга ўзросту. Яна прыйшла з прапановай выступіць перад нашымі байцамі з канцэртам мастацкай самадзейнасці. Сказала, што ў калектыве хору каля ста жанчын. Яны спяваюць беларускія, украінскія і рускія песні. Але няма акампаніятара. Я ж быў баяністам. Вось і прапанаваў мне камандзір дывізіі выступіць разам з Азершчынскім хорам.

Добра памятаю той канцэрт. Праходзіў ён у нейкім памяшканні пры асвятленні газай. Месца ўсім жадаючым паслухаць хор не хапала. Байцы стаялі і на вуліцы.

Дзве гадзіны цягнуўся канцэрт. З памяшкання на вуліцу вырываліся новыя і новыя песні, луналі над толькі нядаўна вызваленай вёскай...

Рэчыцкі народны ансамбль «Дняпро»

У маі 1958 г. аркестравая група, харавы і танцавальны гурткі гарадскога Дома культуры паставілі оперу «Ведрыца», а затым паказалі яе на рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці, які быў прысвечаны 40-годдзю ўтварэння БССР. «Ведрыца» з'яднала тры мастацкія самадзейныя калектывы ў адзін. Яго назвалі ансамблем, далі імя — «Дняпро».

1961 г. для калектыву ансамбля адметны пастаноўкай аперэты Б. Аляксандрава «Вяселле ў Малінаўцы» (разам з тэатральным гуртком ГДК).

У 1963 г. ансамбль быў у Маскве, выступаў на ВДНГ. А ў хуткім часе яму было прысвоена ганаровае званне народнага.

У 1967 г. ансамбль «Дняпро» паставіў аперэту Ю. Мілюціна «Трэмбіта». Яна была паказана ў Мінску на рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці.

У 1976—1977 г. ансамбль браў удзел ва Усесаюзным фестывалі самадзейнай мастацкай творчасці і заваяваў званне лаўрэата. Быў адзначаны Дыпломам першай ступені і Вялікім залатым медалём.

У 1989 г. калектыў зноў выступаў з канцэртамі на ВДНГ у Маскве.

Народны ансамбль «Дняпро» з'яўляецца лаўрэатам трох Усесаюзных фестываляў самадзейнай творчасці працоўных, дыпламантам шматлікіх рэспубліканскіх і абласных аглядаў, конкурсаў мастацкай самадзейнасці.

У калектыве вядзецца шырокая работа па прапагандзе беларускай народнай музыкі і твораў беларускіх кампазітараў. У ягоным рэпертуары лепшыя творы Ю. Семянякі, І. Лучанка, Л. Захлеўнага, апрацоўкі народных песень Г. Цітовіча, К. Паплаўскага, М. Дрынеўскага, М. Сіраты, пастаноўкі беларускіх танцаў.

Калектыў ансамбля штогод дае каля 40 канцэртаў. Звыш 15 гадоў падтрымлівае творчыя сувязі з народным хорам горада Ямпаль Сумскай вобласці (Украіна).

Артысты ансамбля — простыя рабочыя, служачыя, школьнікі. Сярод іх нямала такіх, якія верныя калектыву шмат гадоў, — С. М. Сярдзюк, Д. А. Агафонаў, Л. П. Івашкова, А. М. Куцень, Н. П. Рогаўцава, В. П. Даўгалапцеў (салісты хору), В. В. Барысюк, А. І. Белазерскі, В. С. Сарафанаў (музыканты аркестравай групы), С. Кондрава, О. Новік, Э. Пінчук і г. д. У іх высокі аўтарытэт не толькі ў ансамблі, а і ў вытворчых калектывах, дзе працуюць. Таленавітымі выканаўцамі паказалі сябе і іхнія маладзейшыя таварышы — З. Данюк, А. Сцяпанаў, Т. Пляўкова, Т. Малчанава, Н. Ляпешка, Л. Караленка, Н. Алянцэвіч, І. Лаўрэнава, А. Тужык, Ю. Швяцоў, Д. Чыжык, А. Патапаў, Г. Пархомчык і інш.

Значны ўклад у станаўленне самабытнага калектыву ўнеслі: былы дырыжор аркестравай групы і мастацкі кіраўнік ансамбля, заслужаны работнік культуры рэспублікі Р. Д. Лазарэвіч, а таксама хормайстар Т. Д. Дубавец (цяпер мастацкі кіраўнік). Гэтыя людзі вялі ансамбль ад адной творчай перамогі да другой на працягу многіх гадоў. Шмат творчых задумак укаранёна ім малодшымі таварышамі — балетмайстрам Н. І. Абраменкам, канцэртмайстрам М. П. Матарасам і А. Н. Дубаўцом.

Рэчыцкі народны ансамбль песні і танца «Рэчыца»

Створаны ў 1949 г. пры Доме культуры домабудаўнічага камбіната (вытворчае аб'яднанне «Рэчыцадрэў»). У 1966 г. калектыву ансамбля прысвоена званне народнага. Поспех ансамбля ў многім звязаны з дзейнасцю Эдуарда Фядосавіча Сцяпанчанкі. Ён працаваў на прадпрыемстве слесарам, з'яўляўся ўдзельнікам танцавальнага гуртка. Быў накіраваны абласным саветам прафсаюзаў у вышэйшую прафсаюзную школу (г. Ленінград). З 1965 г. — кіраўнік і балетмайстар ансамбля. За поспехі ў развіцці народнай творчасці Э. Ф. Сцяпанчанка ўзнагароджаны многімі дыпломамі і граматамі, у тым ліку дзвюма граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Сярод артыстаў ансамбля цэлыя сем'і — Сяўбо, Бандарэнкі, Патаповічы, Кулакоўскія, Грыневічы і г. д.

Калектыў выязджаў з канцэртамі ў Кіеў, Мінск, Чарнігаў, Прылукі, у Польшчу.

З 1982 г. калектыў узначальвае П. Калеснікаў.

Рэчыцкі народны аркестр народных інструментаў

Створаны ў 1957 г. пры гарадскім Доме культуры. У 1959 г. выканаў музычнае суправаджэнне ў народнай оперы «Ведрыца» на рэспубліканскім фестывалі народнай

Народны аркестр народных інструментаў Рэчыцкага ГДК

творчасці ў Мінску, прысвечаным 40-годдзю БССР.

У 1960 г. калектыў падрыхтаваў самастойную праграму з 14 твораў, з якой выступаў на прадпрыемствах Рэчыцы, у гаспадарках раёна.

Значным творчым здабыткам стала для аркестра музычнае суправаджэнне ў аперэце «Вяселле ў Малінаўцы» (1961 г.)

У 1963 г. аркестр выступіў на ВДНГ у Маскве, быў узнагароджаны Дыпломам першай ступені.

У 1967 г. браў удзел у рэспубліканскім аглядзе народных талентаў у Мінску, прысвечаным 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Тады ж падрыхтаваў музычнае суправаджэнне да аперэты Ю. Мілюціна «Трэмбіта».

У 1969 г. выступаў з цікавай канцэртнай праграмай у Мінску, прысвечанай дням Гомельскай вобласці.

У 1970 г. аркестр бярэ ўдзел ва Усесаюзным тэлевізійным конкурсе, наладжаным да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, і становіцца лаўрэатам.

Заслужанай адзнакай дзейнасці аркестра з'явілася прысваенне яму ў 1974 г. звання народнага.

Вялікі поспех быў дасягнуты таленавітым калектывам у 1979 г. Аркестр стаў лаўрэатам першага Усесаюзнага фестываля самадзейнай народнай творчасці, прысвечанага 50-годдзю ўтварэння СССР, быў узнагароджаны дыпломам і Вялікім залатым медалём.

У 1985 г. аркестр зноў становіцца лаўрэатам Усесаюзнага агляду самадзейнай народнай творчасці. Ён прысвячаўся 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Праз год новы поспех. Рэчыцкі народны аркестр народных інструментаў становіцца лаўрэатам абласнога агляду-конкурсу, прысвечанага 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, а таксама лаўрэатам прэміі камсамола Гомельшчыны, быў узнагароджаны дыпломам першай ступені.

У 1990 г. калектыў браў удзел у трэцім Усесаюзным фестывалі народнай творчасці. Па выніках яго стаў лаўрэатам і дыпламантам першай ступені.

За высокае выканаўчае майстэрства, удзел у рэспубліканскіх аглядах і дэкадах мастацкай творчасці калектыў аркестра адзначаны шасцю дыпломамі першай ступені,

двума дыпломамі другой ступені, пяццю Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры рэспублікі, Ганаровымі граматамі рэспубліканскага, абласнога і гарадскога камітэтаў камсамола, Ганаровымі граматамі абласнога і гарадскога Саветаў народных дэпутатаў, грашовымі прэміямі.

Артысты аркестра — людзі рознага ўзросту і вопыту. Старэйшыя з іх — Анатоль Іванавіч Белазерскі, Валерый Уладзіміравіч Барысюк, Валерый Сяргеевіч Сарафанаў. Гэтыя людзі звыш 30 гадоў адданыя творчасці.

Арганізатарам і кіраўніком аркестра з 1957 па 1988 г. з'яўляўся заслужаны работнік культуры рэспублікі Рыгор Дзяменцьевіч Лазарэвіч. Зараз ён на заслужаным адпачынку. Але справу сваю Р. Д. Лазарэвіч перадаў у надзейныя рукі: з 1989 г. кіраўніком і дырыжорам аркестра народных інструментаў з'яўляецца выкладчык музычнай школы Анатоль Іванавіч Рудзь. Ён шмат гадоў быў удзельнікам аркестра, робіць усё, каб самабытны калектыў з годнасцю нёс высокае званне народнага.

На працягу свайго існавання Рэчыцкі народны аркестр народных інструментаў падрыхтаваў вялікую колькасць твораў беларускіх і савецкіх кампазітараў. Сярод іх: «Залатая восень» і «Танец» Я. Глебава, «Крутуха» Л. Захлеўнага, «Спеў дубраў» В. Іванова, «Вяселле» П. Падкавырава, «Верасы» і «Полька» Р. Пукста, галоп з аперэты «Калючая ружа» Ю. Семянякі, «Раманс» Дз. Шастаковіча, «Водгукі вальса» і «Тройка» з муз. ілюстрацыі Г. Свірыдава да аповесці «Мяцеліца» А. С. Пушкіна, арыёза Маці з кантаты «Нам патрэбен мір» А. Новікава і інш., творы рускай класікі — сцэна з балета «Лебядзінае возера» і вальс з балета «Спячая красуня» П. Чайкоўскага і інш.

Рэчыцкі народны духавы аркестр

Створаны пры гарадскім Доме культуры ў лістападзе 1945 г. Першым кіраўніком калектыву быў М. З. Верткін (1945, 1949—1952, 1960). На першым часе ў аркестры былі толькі 15 удзельнікаў.

У 1946 г. аркестр узначаліў В. Ф. Васіленка (1946—1949, 1965). Тады ж калектыў прыняў удзел у абласным аглядзе-конкурсе духавых аркестраў Гомельшчыны і заняў першае месца.

Калектыў рос як колькасна, так і творча. У 1976 годзе ён быў узнагароджаны за высокае выканаўчае майстэрства ў другім туры першага Усесаюзнага фестываля самадзейнай мастацкай творчасці дыпломам лаўрэата. Неўзабаве яму было прысвоена і высокае званне народнага.

У 1977 г. таленавіты калектыў браў удзел ва Усесаюзным святе духавой музыкі ў Мінску, дзе быў адным з лепшых.

У свой час кіраўнікамі аркестра з'яўляліся таксама: П. Мельнікаў (1952—1960), В. Лагачоў (1972—1977), А. Курбан (1978). З 1989 г. Рэчыцкі народны духавы аркестр узначальвае Вячаслаў Георгіевіч Сыч.

Зараз у калектыве 23 выканаўцы. Многія з іх маюць званні «Артыст народнага аркестра».

Апошняя ўзнагарода аркестра — дыплом трэцяй ступені за ўдзел і высокае выканаўчае майстэрства, паказанае ў рэспубліканскім аглядзе-конкурсе 1990 г.

Рэпертуар калектыву па-сапраўднаму разнастайны і цікавы. Гэта творы беларускіх і савецкіх кампазітараў, класіка: «Лявоніха» і «Юбілейны марш» Я. Глебава, «Радзіма мая дарагая» У. Алоўнікава, «Беларускі камсамольскі марш» Б. Пенчука на тэмы песень І. Лучанка, папуры «Беларуская старонка» М. Нарко на тэмы беларускіх народных мелодый, фантазія «Сябры-аднапалчане» М. Вахуцінскага на тэмы песень Вялікай Айчыннай вайны, марш Б. Акуджавы з кінафільма «Беларускі вакзал», «Дзень Перамогі» Д. Тухманава, фантазія «Слава Радзіме» С. Чарнецкага, «Патрыятычная песня» і хор «Слаўся» М. Глінкі, вальс з балета «Спячая красуня» і «Неапалітанскі танец» з балета «Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага, «Гімн вялікаму гораду» Р. Гліэра, «Персідскі марш» І. Штрауса, «Песня Сольвейг» з музыкі Э. Грыга да драмы «Пер Гюнт» Г. Ібсена і інш.

Калектыў Рэчыцкага народнага духавога аркестра вылучаецца імкненнем пашырэння мастацкіх магчымасцей за кошт выкарыстання народных музычных інструментаў (дудачка тыпу цуг-флейты, падоўжная флейта ў «Беларускай старонцы», свісцёлкі-«салавейкі» для выканання салаўіных трэляў у «Лявоніхе» і г. д.).

Рэчыцкі народны тэатр

Створаны ў 1949 г. пры гарадскім Доме культуры. Званне народнага атрымаў у 1959 г. Кіраўнікі: У. Тамашук (1949, 1961—1976), З. Гапоненка (1976—1983),

Т. Ліпская (з 1983). У рэпертуары народнага тэатра творы беларускай класікі, савецкіх драматургаў, рускай класікі: п'есы «Паўлінка» Я. Купалы, «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча, «Выбар» А. Дударава, «Маці сваіх дзяцей» А. Афінагенава, «Юнацтва бацькоў» Б. Гарбатава, «Дзень адпачынку» В. Катаева, «Валянцін і Валянціна» М. Рошчына, «Кашэчы дом» С. Маршака, «Цараўна-жаба» Н. Гернет, «Мінулася кату масленіца» А. Астроўскага, паэтычная кампазіцыя «Памяць» паводле твораў савецкіх паэтаў пра Вялікую Айчынную вайну, вадэвілі — «Дачка рускага акцёра» П. Грыгор'ева, «Аз і Ферт» П. Фёдарава і інш.

Калектыў выступаў у многіх гарадах рэспублікі.

Рэчыцкі народны хор ветэранаў вайны і працы

Створаны ў 1978 г. Гаўрыілам Пятровічам Чудаковым, таленавітым гарманістам, прыхільнікам народнай песні. Неўзабаве вакол яго аб'ядналіся такія ж, як і ён сам, аматары самадзейнай творчасці.

На першым часе хор праводзіў рэпетыцыі ў гарадскім Доме культуры, потым у музычнай школе, Доме піянераў. Развучваліся народныя і савецкія песні, творы ваеннай пары. Хор выступаў на прадпрыемствах, у школах. Першыя ўдзельнікі хору — Клаўдзія Уладзіміраўна Таразевіч, Любоў Мікалаеўна Няхай, Вера Анатольеўна Казлоўская, Надзея Кліменцьеўна Кавалеўская, Наталля Мікалаеўна Міругіна, Тамара Іванаўна Мацяшова, Валянціна Цяплушэнка, Людміла Савіных, Фёдар Лёгенькі.

У 1985 г. у хоры было 20 выканаўцаў. Пастаянным месцам рэпетыцый стаў гарадскі Дом культуры. З 1985 па 1987 г. мастацкім кіраўніком з'яўлялася Тамара Данілаўна Дубавец. У 1987 г. калектыў узначаліў спецыяліст з вышэйшай музычнай адукацыяй, дырэктар Рэчыцкай музычнай школы Адам Сцяпанавіч Радчанка. Хор папоўніўся новымі выканаўцамі. Гэта муж і жонка Міхаіл Фядосавіч і Дзіяна Васільеўна Балачковы, муж і жонка Карп Мікітавіч Савасценка і Надзея Апанасаўна Стукач, муж і жонка Міхаіл Аляксеевіч і Ніна Апанасаўна Уласенкі, салісты Іван Лукіч Цітарэнка, Ніна Георгіеўна Наважылава, Ніна Аляксандраўна Жалязінская, Генадзь Піліпавіч Ясенка, Міхаіл Пятровіч Навіцкі і г. д.

Званне народнага Рэчыцкаму хору ветэранаў вайны і працы было нададзена ў 1987 г.

У канцы 80-ых і пачатку 90-ых гадоў калектыў набыў шырокую вядомасць у горадзе і раёне. Ён пабываў з канцэртамі ў Мінску, Гомелі, Калінкавічах, Светлагорску, Хойніках, Ельску. З'яўляецца лаўрэатам абласнога агляду-конкурсу харавой песні.

Савет калектыву пад кіраўніцтвам М. Ф. Балачкова клапоціцца пра тое, каб у хор уліваліся новыя таленавітыя выканаўцы.

Землякі — дзеячы навукі і культуры

АГУНОВІЧ Эдуард Канстанцінавіч нарадзіўся 16.12.1938 г. у г. Рэчыца. Беларускі мастак-графік, старшыня рэспубліканскага графічнага савета. Заслужаны работнік культуры рэспублікі (1977). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1966). Удзельнік мастацкіх выставак з 1966 г. Працуе ў кніжнай і станковай графіцы, акварэлі, мастацкім афармленні выставак і музеяў. Аўтар праектаў мастацкага афармлення экспазіцый Дома-музея I з'езда РСДРП у Мінску (1966 і 1980), музея Ф. Э. Дзяржынскага ў г. п. Івянец (1968), музея савецка-польскай баявой сядружнасці ў в. Леніна Горацкага р-на (1968), філіяла Дзяржаўнага музея БССР у Заслаўі Мінскага р-на (1971), Літаратурнага музея Я. Купалы ў Мінску (1976) і яго філіяла ў в. Вязынка Маладзечанскага р-на (1972). Афарміў беларускія раздзелы на выстаўках СССР у Індыі (1976) і ГДР (1980). У афармленчых работах умела выражае складаныя пытанні сінтэзу мастацтваў, знаходзіць лаканічнае і пераканаўчае рашэнне сучаснага інтэр'ера. Работы ў кніжнай графіцы: афармленне і ілюстрацыі да паэмы «Тарас на Парнасе» (1967, афорт, дыплом на Усесаюзным конкурсе, прысвечаным 50-годдзю Кастрычніка), ілюстрацыі да паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка» (1968),

Э. К. Агуновіч

В. Р. Асіпенка

раманаў І. Шамякіна «Глыбокая плынь» (1967) і «Трывожнае шчасце» (1973), паэмы А. Астрэйкі «Прыгоды дзеда Міхеда» (1969). Э. К. Агуновіч аўтар станковых работ: серыі «Дзяцінства» (1977, літаграфія), «Маці» (1979), «Спрадвечнае» (1980), «Крык кнігаўкі» (1981, усё ў тэхніцы афорта). Афарміў у Беларускім тэатры імя Я. Купалы спектакль «Напісанае застаецца» А. Петрашкевіча (1979) і г. д.

Б. А. Крапак

АСІПЕНКА Віктар Рыгоравіч нарадзіўся 19.1.1950 г. у в. Якімаўка. Беларускі мастак. Член Саюза мастакоў РБ з 1997. Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута (1972). Працаваў настаўнікам выяўленчага мастацтва і чарчэння ў Рэчыцкай СШ № 9, мастаком-афарміцелем Рэчыцкага філіяла Гомельскага камбіната «Мастацтва» мастацкага фонду Беларусі. З 1991 зноў у калектыве СШ № 9. Стварыў тут класы з архітэктурна-мастацкім ухілам. Асноўнае месца ў творчасці В. Р. Асіпенкі займаюць краявіды Беларусі: «На Дняпры», «Шэры дзень», «Вечарэе», «Раніца туманная» (усе ў 1980—1990-ых гадах) і інш. Мастак браў удзел у рэспубліканскіх выставах. Удзельнік выстаў у Польшчы (1988) і Германіі (1994).

АТРОШЧАНКА Алег Аляксандравіч нарадзіўся 19.7.1940 г. у г. Рэчыца. Беларускі вучоны ў галіне лесазнаўства. Доктар сельскагаспадарчых навук (1987), прафесар (1989). Скончыў Беларускі тэхналагічны інстытут (1962), там і працуе. Аўтар навуковых прац па лясной таксацыі, імітацыйным мадэліраванні і геаінфармацыйных сістэмах у лясной гаспадарцы. Распрацаваў кірункі камп'ютэрызацыі, праграмнае забеспячэнне па стварэнні аўтаматызаванай сістэмы ўліку лясной гаспадаркі Беларусі.

БЕЙЛЬКІН Хайм Юдкавіч нарадзіўся 24.3.1931 г. у м. Васілевічы. Гісторык, доктар гістарычных навук (1990), прафесар (1993).

У 1948 г. з медалём скончыў Васілевіцкую СШ. Працаваў інструктарам раённага Дома культуры. У 1949 г. паступіў вучыцца на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які з адзнакай скончыў у 1954 г.

Са жніўня 1954 г. па красавік 1957 г. — выкладчык гісторыі рускай СШ у г. Петрыкаў. Адначасова працаваў (студзень 1956 — красавік 1957) загадчыкам Петрыкаўскага раённага педкабінета.

У 1957 г. пераехаў працаваць выкладчыкам гісторыі ў Васілевіцкую СШ. У 1959 г. паступіў вучыцца ў завочную аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР.

З верасня 1966 г. — завуч Васілевіцкай СШ. У студзені 1969 г. абараніў дысертацыю «Аграрны крызіс канца XIX ст. і яго вынікі ўплыў на сельскую гаспадарку Беларусі». Х. Ю. Бейлькіну была прысвоена навуковая ступень кандыдата гістарычных навук.

З верасня 1969 г. працаваў на кафедры грамадскіх навук Гомельскага філіяла Беларускага політэхнічнага інстытута. Спачатку асістэнтам, затым — старшым выкладчыкам, дацэнтам.

З 1978 г. і да апошняга часу працуе ў Гомельскім кааператыўным інстытуце. Спачатку дацэнтам, а з 1993 г. прафесарам кафедры філасофіі і гісторыі. Чытае курс гісторыі Рэспублікі Беларусь.

Х. Ю. Бейлькін — аўтар каля 90 навуковых і навукова-метадычных прац. Аснову яго даследаванняў складаюць аграрныя адносіны ў Беларусі ў час капіталізму. Гэтай тэме прысвечана каля 40 прац.

Значнае месца ў навуковай дзейнасці вучонага займаюць таксама пытанні краязнаўства — гісторыі гарадоў і вёсак Гомельшчыны.

БІРУКОЎ Марат Паўлавіч нарадзіўся 12.3.1938 г. у г. Рэчыца. Беларускі вучоны ў галіне тэорыі надзейнасці. Доктар тэхнічных навук (1991). Скончыў Беларускі тэхналагічны інстытут (1960). З 1972 у Інстытуце надзейнасці машын АН Беларусі, адначасова з 1994 прафесар Беларускага тэхна-

лагічнага універсітэта. Мае навуковыя працы па імавернасным прагназаванні надзейнасці машын і іх тэхналагічнай дыягностыцы на стадыі паскораных выпрабаванняў і эксплуатацыі.

БЛІШЧ Міхаіл Андрэевіч нарадзіўся 25.10 (7.11).1917 г. у в. Заспа Рэчыцкага павета Мінскай губерні. Беларускі мастак тэатра і жывапісец. Скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча (1938). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР (1938—1956). Сярод работ Блішча вылучаюцца дэкарацыі да опер «Алека» С. Рахманінава (1949), «Марынка» Р. Пукста (1955), балетаў «Доктар Айбаліт» І. Марозава (1951), «Жызель» А. Адана (1953), «Лаўрэнсія» А. Крэйна (1955), усе ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР; да драматычных пастановак «Пунсовая кветачка» І. Карнавухавай і Л. Браўсевіча (1952, тэатр імя Я. Купалы), «Гады вандраванняў» А. А. Арбузава (1954, Гомельскі абласны драматычны тэатр). Дэкарацыям М. А. Блішча ўласцівы рамантычная ўзнёсласць, паэтычнасць, кампазіцыйная выразнасць. Стварыў эскізы касцюмаў для танцавальных і харавых калектываў. Аўтар насценнай размалёўкі «Дэман» (1958) у Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР, карцін «Купальскі вечар» (1960), «Саўгас», «Аколіца» (1961), «Батлейка» (1962), «Мінская ЦЭЦ-3» (1963), «Полацкі нафтабуд» (1964).

М. А. Блішч памёр 9.5.1966 г.

БЯРКОЎСКІ Барыс Міхайлавіч нарадзіўся 7.4.1940 г. у г. Рэчыца. Беларускі фізік. Скончыў БДУ (1962). Доктар фізіка-матэматычных навук (1972). З 1962 у Інстытуце цепла- і масаабмену АН БССР, загадчык лабараторыі канвектыўных і хвалевых працэсаў (1972—1973). З 1973 працаваў у сакратарыяце ЮНЕСКО (Парыж). Аўтар прац па цепла- і масаабмену ў няньютанаўскіх вадкасцях, тэрмаканвектыўных з'яў.

ВЕРАМЕЙЧЫК Уладзімір Міхайлавіч нарадзіўся 1.11.1937 г. у в. Петрыцкае Брагінскага р-на. Беларускі паэт. Член Саюза пісьменнікаў. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1964). З 1955 на педагагічнай рабоце (з 1966 дырэктар Ведрыцкай сярэдняй школы Рэчыцкага р-на). Друкуецца з 1955 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Прыпяць» (1973), «Яснасць» (1978), «Люблю!» (1981), паэм «Родны дом» (1961), «Выклікаю вясну Перамогі» (1975), «Наша Чырвонка» (1981), «Ліхаўня» (1997). У вершах і паэмах услаўляе мужнасць нашых людзей у час Вялікай Айчыннай вайны, паказвае цяжкае пасляваеннае дзяцінства, сцвярджае высокае прызначэнне чалавека ў жыцці. У лірычных вершах паэта — матывы дружбы, кахання. Піша таксама байкі, сатырычныя вершы і апавяданні.

Г. А. Ермачэнкаў

ЕРМАЧЭНКАЎ Генадзь Аляксандравіч нарадзіўся 27.11.1948 г. у г. Рэчыца. Беларускі кампазітар, дацэнт дзяржканцерваторыі, лаўрэат прэміі ЛКСМБ за 1986 г. Музыкай пачаў займацца з 7 гадоў у самадзейным аркестры народных інструментаў Рэчыцкага ГДК. У 1968 скончыў Гомельскае музычнае вучылішча імя Н. Ф. Сакалоўскага па класу «народныя інструменты», а ў 1974 — Беларускую дзяржаўную кансерваторыю. У тым жа годзе паступіў у аспірантуру па класу дырыжыравання. Скончыў яе ў 1976, застаўся працаваць у кансерваторыі па класу дырыжыравання. Адначасова кіраваў у кансерваторыі аркестрам народных інструментаў.

У 38-гадовым узросце, будучы дацэнтам, Г. А. Ермачэнкаў яшчэ раз паступіў на вучобу ў Беларускую дзяржканцерваторыю ў клас кампазітара народнага артыста СССР Яўгена Аляксандравіча Глебава. Скончыў яго з адзнакай.

Г. А. Ермачэнкавым напісаны шмат твораў у самых розных музычных жанрах. Найбольш значныя з іх — араторыя для баса, тэнара, мецца-сапрана, змешанага хору, сімфанічнага аркестра «Явар і каліна» па аднайменнай легендзе У. Караткевіча; канцэрт для трубы з аркестрам, вакальна-харавы цыкл на вершы М. Багдановіча; канцэрт-рэквіем «Споведзь» для змешанага хору (памяці ахвяр Чарнобыля); кантаты «Радзі-

ма надзей і трывог» і «Дні мае залатыя» на вершы М. Башлакова; вакальна-сімфанічная паэма «Зямля дзядоў», паэма для цымбалаў «Гусляр» і г. д.

Г. А. Ермачэнкаў гастраляваў з канцэртамі ў Алжыры, Германіі, Францыі, Швейцарыі.

ЗАРАНОК Таццяна Піліпаўна нарадзілася 12(25).12.1917 г. у м. Васілевічы. Актрыса, народная артыстка рэспублікі (1967). З 1931 у Беларускім тэатры імя Я. Коласа (скончыла студыю тэатра ў 1933), у 1951—1974 гг. у Брэсцкім драматычным тэатры імя ЛКСМБ. Выканаўца вострахарактарных і камедыйных, лірыка-драматычных роляў. Высокае прафесійнае майстэрства ў спалучэнні з арганічным адчуваннем псіхалагічнай праўды паводзін персанажа, разуменне жанравых і стылявых асаблівасцей драматычных твораў, эмацыянальная напоўненасць унутранага жыцця створаных вобразаў характарызуюць Заранок як самабытную актрысу. Вобразы ў класічным і сучасным рэпертуары вылучаюцца грамадзянскай сталасцю артысткі. Найбольш значныя ролі ў беларускім рэпертуары: Таццяна («Над Бярозай-ракой» П. Глебкі), Паўліна («Пяюць жаваранкі» К. Крапівы), Люба («Алазанская даліна» К. Губарэвіча і І. Дорскага), Зінка («Заложнікі» А. Кучара), Даша («Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча), Ганна Чыхнюк («Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка). Сярод лепшых роляў: Н. К. Крупская («Фінал» П. Строгава, «Дзень цішыні» М. Шатрова, «Брэсцкі мір» К. Губарэвіча). З роляў класічнага і савецкага рэпертуару: Белацелава, Варвара, Аксюша, Людміла («Жаніцьба Бальзамінава», «Навальніца», «Лес» і «Позняе каханне» А. Астроўскага), Вольга («Тры сястры» А. Чэхава), Наташа, Глафіра («На дне», «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага), Фаншэта («Жаніцьба Фігара» П. Бамаршэ), Марціна («Лекар паняволі» Ж. Мальера), Юстына («Юстына» Х. Вуаліёкі), Фані («Хаціна дзядзькі Тома» паводле Г. Бічэр-Стоў), Тоня («Цудоўны сплаў» У. Кіршона), Дунька («Любоў Яравая» К. Транёва), Ларыса («Іркуцкая гісторыя» А. Арбузава) і інш.

Б. І. Бур'ян

ЗУБРЫЦКІ Іван Васільевіч нарадзіўся 5(17).2.1898 г. у г. Рэчыца, беларускі геадэзіст. Прафесар (1960). Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1929). З 1930 г. дацэнт кафедры геадэзіі БСГА, у 1942—1947 гг. працаваў у Новасібірскім інстытуце інжынераў геадэзіі, у 1947—1963 гг. загадчык кафедры геадэзіі БСГА. Распрацаваў і тэарэтычна абгрунтаваў метад чатырохвугольнікаў без дыяганалей для стварэння геадэзічных сетак, якія выкарыстоўваюцца пры землеўпарадкаванні і планіроўцы гарадоў.

С. І. Памялоў

КАПЕЛЯН Яфім Захаравіч нарадзіўся ў 1912 г. у г. Рэчыца. Народны артыст СССР (1973 г.). Працаваў рабочым на Пуцілаўскім заводзе ў г. Ленінград. У 1931 г. стаў студэнтам Ленінградскага Вялікага драматычнага тэатра. З 1935 г. акцёр гэтага ж тэатра. У час Вялікай Айчыннай вайны ў якасці апалчэнца браў удзел у абароне Ленінграда. За 40 гадоў сцэнічнай дзейнасці стварыў мноства цікавых вобразаў. Адзін з выканаўцаў галоўных роляў у кінафільмах «Мікалай Баўман», «Я, бабуля, Іліко і Іларыён», «Злачынства і пакаранне» і інш.

Я. З. Капелян памёр у 1975 г.

КАПШАЙ Уладзімір Міхайлавіч нарадзіўся 20.4.1940 г. у г. Рэчыца. Беларускі мастак. Скончыў Беларускі мастацка-тэатральны інстытут (1970). Удзельнік мастацкіх выставак з 1977 г. Працуе ў галіне афармленчага мастацтва. Асноўныя работы: мастацкае афармленне філіяла Літаратурнага музея Я. Купалы ў в. Вязынка Маладзечанскага р-на (1972, з Э. Агуновічам; 1982), музеяў савецка-польскай баявой садружнасці ў в. Леніна Горацкага р-на (1973), гісторыі войск Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі ў Мінску (1978), старажытнабеларускай культуры ІМЭФ АН БССР (1979), Беларускага раздзела на міжнароднай выстаўцы ў Брно (ЧССР, 1983, з В. Чуглазавым), праекты мастацкага афармлення музеяў М. К. Агінскага ў Залессі Смаргонскага р-на (1977), М. Багдановіча ў Мінску (1981, з С. Багласавым).

КОЎТУН (дзявочае НОВІК) Валянціна Міхайлаўна нарадзілася 6.4.1946 г. у в. Дземяхі. Беларуская паэтэса, празаік, літаратуразнавец. Кандыдат філалагічных навук (1979). Скончыла БДУ (1969). Працавала настаўніцай у Астравецкім раёне, у «Сельской газете», у выдавецтве «Юнацтва», часопісе «Полымя». З 1994 прэзідэнт міжнароднай незалежнай грамадскай арганізацыі «Усебеларускі жаночы фонд святой Ефрасінні

Полацкай». Друкуецца з 1966. У кнігах паэзіі «Каляровыя вёслы» (1971), «На ўзлёце дня» (1977), «На зломе маланкі» (1981), «Метраном» (1985; літаратурная прэмія імя А. Куляшова 1986), «Лісты да цябе» (1988) шчырая споведзь пра час і сваё пакаленне, пра людзей вёскі і праблемы грамадскага жыцця. Многія творы пабудаваны на фальклорных сюжэтах. Драматызаваныя паэмы «На зломе маланкі» (1979), «Суд Алаізы» (1985), раман «Крыж міласэрнасці» (1987; аднайменны мастацкі фільм, 1989—1990) прысвечаны беларускай пісьменніцы і грамадскай дзеячцы Цёткі (А. Пашкевіч). Вобраз Я. Купалы ў паэме «Выйду з песняй, як з паходняй...» (1992). Аўтар кніг для дзяцей. Выступае з артыкуламі і рэцэнзіямі па праблемах сучаснага літаратурнага жыцця і пытаннях фальклору ў сучаснай паэзіі. Займаецца перакладамі.

Любоў Гарэлік

КРАСОЎСКІ Мікалай Піліпавіч нарадзіўся 11.7.1933 г. у г. Рэчыца. Беларускі артыст балета і педагог. Заслужаны артыст рэспублікі (1972). Скончыў Беларускае (1951) і Ленінградскае (1953) харэаграфічныя вучылішчы. Працаваў у тэатрах оперы і балета Чэлябінска, Баку. У 1960—1974 гг. саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Арганізатар і кіраўнік Мінскага народнага эстрадна-харэаграфічнага ансамбля «Чараўніцы». Выкананне Красоўскім вызначалася вялікай экспрэсіяй. Выступіў на беларускай сцэне ў шэрагу значных партый у балетах сучаснага рэпертуару і класікі: Мікалай і Князь («Мара» і «Выбранніца» Я. Глебава), Прынц, Тыбальд («Золушка» і «Рамэо і Джульета» С. Пракоф'ева), Спартак («Спартак» А. Хачатурана), Прынц, Блакітная птушка («Лебядзінае возера» і «Спячая красуня» П. Чайкоўскага), Абдэрахман («Раймонда» А. Глазунова), Салор, Базыль («Баядэрка» і «Дон Кіхот» Л. Мінкуса). У 1953—1956 і з 1960 педагог Беларускага харэаграфічнага вучылішча. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў балета ў Маскве (1967).

ЛАЗАРЭВІЧ Рыгор Дзяменцьевіч нарадзіўся 3.5.1927 г. у в. Азершчына. Беларускі дзеяч самадзейнага мастацтва. Заслужаны работнік культуры рэспублікі (1975). Скончыў Гомельскае музычнае вучылішча (1949). У 1949—1957 гг. выкладчык музыкі ў Рэчыцкім педагагічным і Гродзенскім музычна-педагагічным вучылішчах. З 1957 г. — кіраўнік Рэчыцкага народнага аркестра народных інструментаў, які пад яго кіраўніцтвам дасягнуў значнага майстэрства. За час працы з аркестрам падрыхтаваў 10 праграм, стварыў шэраг апрацовак народных мелодый, твораў айчынных і замежных аўтараў. Аўтар інструментовак народнай оперы «Ведрыца», аперэт «Вяселле ў Малінаўцы» Б. Аляксандрава і «Трэмбіта» Ю. Мілюціна.

ЛАПАТА Георгій Паўлавіч нарадзіўся 23.8.1924 г. у в. Азершчына. Наватар вытворчасці. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1970). Кандыдат тэхнічных навук (1969). Скончыў Маскоўскі энергетычны інстытут (1952). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1959 на Мінскім заводзе электронных вылічальных машын імя Арджанікідзе — галоўны інжынер, начальнік СКБ, у 1966—1969 гг. начальнік праектнага бюро. З 1969 г. дырэктар Мінскага філіяла навукова-даследнага цэнтра электроннай вылічальнай тэхнікі. Дзяржаўная прэмія СССР прысуджана за ўдзел у стварэнні сям'і універсальных электронных вылічальных машын другога пакалення тыпу «Мінск» і асваенне іх серыйнай вытворчасці. Узнагароджаны некалькімі ордэнамі, сярод якіх — Кастрычніцкай Рэвалюцыі і «Знак Пашаны».

ЛАПАЦІНА Таццяна Карнееўна нарадзілася 3(15).8.1891 г. у в. Азершчына. Беларускі дзеяч самадзейнага мастацтва і кампазітар-аматар. Заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі (1949). Працавала ў калгасе. Загадвала сельскай бібліятэкай, навучала спевам у сярэдняй школе. На аснове сямейнага гурту Лапаціных арганізавала і ў 1936—1954 гг. узначальвала Азершчынскі народны хор, шырока вядомы ў рэспубліцы і за яе межамі як адзін з лепшых беларускіх самадзейных калектываў. Пры ўдзеле Лапацінай у хоры створаны песні «Наша сяло», «Кучаравая вішня», «Дождж ідзе», «Падзяка», «Прыязджайце да нас у калгас», «Дняпро», «За Азершчынай палі залатыя». Песня Лапацінай «Марфута» атрымала ўсесаюзную вядомасць.

Т. К. Лапаціна памерла 22.3.1980 г.

Г. І. Цітовіч

ЛАЎШУК Сцяпан Сцяпанавіч нарадзіўся 28.7.1944 г. у м. Васілевічы. Беларускі літаратуразнавец і крытык. Доктар філалагічных навук (1997). Скончыў БДУ

(1967). Працаваў рабочым на Урале і ў Васілевічах, настаўнікам, дырэктарам школы і камсамольскім работнікам на Лунінеччыне, з 1973 у Інстытуце літаратуры АН БССР. Друкуецца з 1972. Даследуе праблемы развіцця беларускай драматургіі. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1977, на рускай мове), «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (ч. 1—2, 1981—1982), кнігі «Беларуская літаратура і праблемы сучаснасці» (1978); складальнік кнігі «Беларуская дакастрычніцкая драматургія» (1978), зборніка «Творы У. Галубка» (1983); аўтар кніг «Кандрат Крапіва і беларуская драматургія» (1986), «На драматургічных скрыжаваннях» (1989).

І. П. Чыгрын

ЛІПСКІ Уладзімір Сцяпанавіч нарадзіўся 6.5.1940 г. у в. Шоўкавічы. Беларускі пісьменнік. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1966). Працаваў у нясвіжскай раённай газеце «Чырвоны сцяг» (1964—1967), з 1968 г. у апараце ЦК ЛКСМ Беларусі, у 1976—1978 гг. адказны сакратар праўлення СП БССР, з 1978 г. галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка». Друкуецца з 1970 г. Аўтар шматлікіх публіцыстычных кніг. Сярод іх: «Райкомаўскія будні» (1971), «Дзень за днём» (1973), «Знайдзі сябе» (1974), «Прыдзвінскі цуд» (1975) і г. д. Аўтар шматлікіх дакументальных аповесцей. Адна з першых — «Крутыя вёрсты» (1980) пра Героя Савецкага Саюза З. М. Тусналобаву-Марчанка. Аўтар апавяданняў і казак для дзяцей. Мае усесаюзныя выданні. З'яўляецца прэзідэнтам Рэспубліканскага дзіцячага фонду. Ініцыятар і арганізатар рэспубліканскага ітогавага свята гумару ў вёсках Вялікія і Малыя Аўцюкі (Калінкавіцкі р-н).

ЛІЎШЫЦ Мордух Насонавіч нарадзіўся 17.4.1918 г. у г. Рэчыца. Беларускі архітэктар. Заслужаны архітэктар рэспублікі (1969). Скончыў Ленінградскі інжынерна-будаўнічы інстытут (1941). З 1946 г. працуе ў праектных інстытутах Мінска (з 1969 г. галоўны архітэктар інстытута Белкамунпраект, у 1974—1978 гг.— інстытута Белжылпраект). Асноўны кірунак творчасці — архітэктура жылых і грамадскіх будынкаў. Найбольш значныя работы ў Мінску: жылыя дамы па вуліцы Я. Коласа (1951), Чырвонай (1953) і Камуністычнай (1954; абодва ў сааўтарстве), Ленінскім праспекце (1956), адміністрацыйныя карпусы Дзяржкамсельгастэхнікі БССР і Мінпрамбуда, Міністэрства мантажных і спецыяльных будаўнічых работ БССР (усе 1970), адміністрацыйны будынак па вуліцы Савецкай (1976; усіх кіраўнік аўтарскага калектыву), інстытут Белжылпраект (1981), планіроўка жылых кварталаў на Ленінскім праспекце, па вуліцах Чырвонай, Я. Коласа (1950-ыя гады); праект рэканструкцыі гістарычнага цэнтра Гродна (1971, кіраўнік аўтарскага калектыву), серыі тыпавых праектаў жылых дамоў, гандлёвых збудаванняў і іншых грамадскіх будынкаў (усе 1957—1969); планіроўка цэнтральнай плошчы (1960) у Барысаве і інш.

А. А. Воінаў

НАВУМЕНКА Іван Якаўлевіч нарадзіўся 16.2.1925 г. у м. Васілевічы. Беларускі пісьменнік і літаратуразнавец. Акадэмік Акадэміі навук рэспублікі (1980; член-карэспандэнт 1972), доктар філалагічных навук (1969), прафесар (1971). Заслужаны дзеяч навукі рэспублікі (1978). Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1950). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у рэдакцыях газет «Бальшавік Палесся» (1945—1951, Мазыр), «Звязда» (1951—1952). З 1954 г. на кафедры беларускай літаратуры БДУ, з 1973 г. дырэктар Інстытута літаратуры АН БССР, з 1982 г. віцэ-прэзідэнт АН БССР. Друкуецца з 1955 г. Першы зборнік апавяданняў «Семнаццатай вясной» (1957) у рамантычна прыўзнятых фарбах адлюстраваў духоўны свет і лёс юнакоў, што нарадзіліся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і выхоўваліся ў савецкі час, іх перадваеннае жыццё і цяжкія выпрабаванні, што выпалі на іх долю ў гады вайны. Гэта арганічная для пісьменніка тэма атрымала развіццё ў зборніках апавяданняў «Хлопцы-равеснікі» (1958), «Тапалі юнацтва» (1966, прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1967), адзначаных вернасцю праўдзе жыцця, глыбокім пранікненнем ва ўнутраны свет герояў, майстэрствам дэталі, мяккім лірызмам. Паралельна ствараліся аповесці «Снежань», «Мой сябар Пятрусь», «Пераломны ўзрост» (усе 1958), «Трымценне дубовага лісця» (1962), «Бульба» (1964), «У бары на світанні» (1971) і інш., у якіх праблема станаўлення характару чалавека, яго жыццёвых каштоўнасцей вырашалася аўтарам на матэрыяле вайны і ў абсягу сучаснасці. Адметныя рысы творчасці Навуменкі — лірычная пранікнёнасць пачуцця, даверлівасць інтанацыі,

псіхалагічная дакладнасць учынкаў герояў, праўдзівасць дэталей і мастацкіх абагульненняў. Раманы «Сасна пры дарозе» (1962), «Вецер у соснах» (1967), «Сорак трэці» (1973) падсумавалі папярэдні мастацкі вопыт аўтара па стварэнню шырокай, эпічна насычанай карціны жыцця і барацьбы савецкіх людзей у жорсткіх умовах нямецка-фашысцкай акупацыі. Трылогія ўражвае маштабнасцю думкі, вастрынёй пастаноўкі праблем гуманізму, шырокімі сацыяльна-філасофскімі абагульненнямі і па праву лічыцца адным з лепшых дасягненняў беларускага ваеннага рамана. Увагу мастака прыцягваюць праблемы, калізіі сучаснага жыцця, якое ўносіць шмат новага ў традыцыйныя адносіны чалавека з іншымі людзьмі, грамадствам, прыродай, гісторыяй. Аповесцям «Развітанне ў Кавальцах» (1974), «Апошняя восень» (1976), «Замець жаўталісця» (1976), «Інтэрнат на Нямізе» (1978), многім апавяданням уласціва глыбокае асэнсаванне рэчаіснасці з сацыяльнага і маральнага пункту гледжання, выяўленне духоўнага патэнцыялу асобы. Герой Навуменкі 70—80-ых гадоў глыбей разважае, усведамляе сэнс жыцця, складаныя ідэалагічныя, эканамічныя, экалагічныя праблемы сучаснага свету. Пра гэта сведчаць раманы «Смутак белых начэй» (1979), «Летуценнік» (1984) і п'еса «Птушкі між маланак» (1982). Яны, як і многія папярэднія творы, блізкія да жыццёвага вопыту аўтара. Пісьменнік сцвярджае героя актыўнага і дзейснага. Навуменка — аўтар цікавай аповесці для дзяцей «Вайна каля Цітавай копанкі» (1957). У манаграфіях «Янка Купала. Духоўны воблік героя» (1967) і «Якуб Колас. Духоўны воблік героя» (1968), адзначаных Дзяржаўнай прэміяй рэспублікі імя Я. Коласа (1972), працах па гісторыі беларускай літаратуры «З глыбінь жыцця» (1960) і «Пісьменнікі-дэмакраты» (1967) разглядае канцэпцыю чалавека і свету ў беларускай літаратуры. Творы Навуменкі перакладаліся на рускую, украінскую, латышскую, польскую, балгарскую, нямецкую, французскую і іншыя мовы. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (з 1985). Пэўны час з'яўляўся Старшынёй Вярхоўнага Савета БССР (з 1985). Народны пісьменнік РБ (1996).

У. В. Гніламёдаў

ПАНАМАРЭНКА Леанід Фёдаравіч нарадзіўся 26.1.1937 г. у в. Вятхінь. Беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Скончыў Ленінградскае вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча імя В. І. Мухінай (1957), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1968). У мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1962 г. Працуе ў галіне керамікі (тэракота, фарфор, шамот, маёлікa). Работам Панамарэнкі характэрны творчае засваенне традыцыйных форм народнага ганчарнага посуду, спалучэнне традыцыйных і сучасных спосабаў апрацоўкі матэрыялаў, стрыманая колерная гама з падкрэсленымі прыроднымі ўласцівасцямі матэрыялу. Сярод твораў: сервізы «Авальны» (1957), «Восень» (1962), «Вяночак» (1970), кампазіцыі «Мара» (1972), «Салют» (1975), кашпо «Полымя» (1972), дэкаратыўныя вазы «Змрок» і «Ноч» (1964—1984), «Мядовая» (1978), «Беларускі сувенір» (1979), дэкаратыўныя пласты «Санет», «Кветкі», «Бусел» (усе 1980), «Васількі», «Восень», «Блакітны матыў», «Светлячок» (усе 1982), «Зязюля», «Урадлівасць», «Кветка шчасця», «Вясна», «Лета» (усе 1984), «Кветкі», «Блакітны», «Дзяды» (1985) і інш.

Г. А. Фатыхава

ПАЎЛЯНОК Барыс Уладзіміравіч нарадзіўся 12.11.1923 г. у в. Ямпаль. Рускі пісьменнік. Скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1961). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў інжынерам на чыгунцы, у апараце ЦК ЛКСМБ і ЦК КПБ, у рэдакцыях газет, у Дзяржкіно БССР і СССР, у 1972—1985 гг. намеснік старшыні Дзяржкіно СССР, з 1985 г. галоўны рэдактар альманаха «Киносценарий». Друкуецца з 1956 г. Выступае як крытык, публіцыст. Аўтар зборніка апавяданняў «Самы неабходны чалавек» (1963), аповесці «Вярніся да юнацтва» (1977), рамана «Сяброў не выбіраюць» (1982, аднайменны фільм пастаўлены ў 1985), сцэнарыя мастацкага кінафільма «Чорная бяроза» (разам з М. Бярозкам і С. Паляковым, пастаўлены ў 1979), тэлефільма «Было ў бацькі тры сыны» (пастаўлены ў 1983) і г. д.

У. А. Жыжэнка

ПІНЧУК Аркадзь Фёдаравіч нарадзіўся 11 студзеня 1930 г. у м. Васілевічы ў сям'і рабочага. У 1951 г. скончыў Васілевіцкую СШ, паступіў у ваеннае вучылішча (г. Чарапавец), якое закончыў у 1953 г. Працаваў камандзірам узвода (1953—1958), карэспандэнтам акруговай газеты «Слава Родины» (1959—1968), начальнікам аддзела камсамольскага жыцця Прыкарпацкай ваен-

най акругі, карэспандэнтам газеты «Чырвоная звязда» (1971).

Літаратурнай дзейнасцю пачаў займацца з 1959 г. З'яўляецца аўтарам зборніка апавяданняў «Многа-мала» (1973), зборніка аповесцей «Потому что люблю» (1973), п'ес «Не все про любовь» (1968), «Самый счастливый человек» (1973), «Билет на лебединое озеро» (1973), «Лейтенанты» (1973), «Майор как майор» (1974) і інш. Друкаваўся ў часопісе «Маладосць». Член Саюза пісьменнікаў.

Піша па-руску.

СМАЛЯК Віктар Мікалаевіч нарадзіўся 20.4.1947 г. у г. Рэчыца. Беларускі мастак-плакатыст. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1978). Удзельнік мастацкіх выставак з 1978 г. Працуе ў жанрах тэатральнага, рэкламнага плаката. Творам уласцівы лаканізм выяўленчых сродкаў, выразнасць малюнка. Сярод работ: «З руін і попелу ўзняты горад-герой Мінск» і «Па алімпійскіх дарогах» (1980), «35 гадоў дагавору паміж СССР і ПНР» (1981), «СССР — радзіма касманаўтыкі» (1982), «Слава Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі» (1984), «Каб не прыйшлося пачынаць спачатку...» і трыпціх «За мірны космас» (1985), афішы спектакляў «Кветка шчасця» (1978) і «Альпійская балада» (1980) у Дзяржаўным тэатры оперы і балета рэспублікі і г. д.

В. Д. Сінякевіч

СЫС Анатоль Ціханавіч нарадзіўся ў в. Гарошкаў у 1959 г. Пасля заканчэння сярэдняй школы паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржуніверсітэта. З'яўляўся актыўным удзельнікам літаратурна-творчага гуртка «Крыніца». Працаваў карэспандэнтам раённых газет на Гомельшчыне.

Аўтар паэтычных зборнікаў «Агмень» (1988), «Пан Лес» (1989) і інш. Друкаваўся ў многіх беларускіх выданнях. Член Саюза пісьменнікаў. Жыве і працуе ў Мінску.

ТУЛУПАВА Нэлі Іванаўна нарадзілася 1.2.1938 г. у в. Капань. Беларуская паэтэса. Скончыла Гомельскае медыцынскае вучылішча (1955), Беларускі дзяржаўны універсітэт (1969). Працавала ў медыцынскіх установах Віцебшчыны, з 1960 г. дыктар Віцебскага абласнога тэлебачання, з 1963 г. загадчык аддзела Горацкага райкама ЛКСМБ, рэдактар шматтыражнай газеты «Советский студент» Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У 1974—1978 гг. загадчык літаратурнай часткі Белдзяржфілармоніі, з 1979 г. у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Апошнім часам працуе загадчыкам літаратурнага аддзела часопіса «Вожык». Друкуецца з 1955 г. Яе паэзія па-грамадзянску завостраная, гістарычна-канкрэтная, глыбока нацыянальная. У сваіх творах Тулупава ўслаўляе любоў да роднага кута, апявае ягоную прыгажосць (зборнікі «Станцыя надзей», 1971, «Дабрадзея», 1977, «Босая цішыня», 1980, «Гарывада», 1984, «Сонца ў хату», 1986, і інш.). Аўтар вершаваных гумарэсак, баек, казак, апавяданняў, тэкстаў песень. Піша для дзяцей. Мае ўсесаюзныя выданні. На беларускую мову перакладае ўкраінскую, грузінскую, літоўскую, латышскую, татарскую, узбекскую паэзію. Яе творы перакладзены на ўкраінскую, грузінскую, татарскую, узбекскую, польскую, балгарскую мовы.

ЯРАЦ Віктар Уладзіміравіч нарадзіўся 23.10.1948 г. у пас. Красны Мост. Беларускі паэт, літаратуразнавец. Кандыдат філалагічных навук (1976). Скончыў Гомельскі універсітэт (1970). Працаваў у рэдакцыях раённых газет, на абласным тэлебачанні ў Гомелі. З 1972 г. у Гомельскім універсітэце (з 1978 дацэнт). Друкуецца з 1966 г. Яго творы змешчаны ў калектыўных зборніках «Натхненне» (1967), «Універсітэт паэтычны» (1971) і інш. Аўтар зборніка вершаў «Уваходзіны» (1976) і інш. Асноўная тэма творчасці — родная зямля, яе людзі, пасталенне маладога сучасніка, харство прыроды. Даследуе праблемы развіцця беларускай паэзіі (артыкулы «Аб некаторых рытмічных асаблівасцях лірыкі Петруся Броўкі», 1975; «Структура ваенных балад А. Куляшова», 1979; «Адзінства думкі і рытму. Праблема структурнага абнаўлення і духоўны свет сучасніка» і «Фальклорныя традыцыі ў лірыцы Янкі Купалы і Якуба Коласа», 1981; «Творчыя пошукі вядучых беларускіх паэтаў пасляваеннага дзесяцігоддзя», 1983). Перакладае творы ўкраінскіх і балгарскіх пісьменнікаў.

В. І. Смыкоўская

ЯШКІН Валерый Канстанцінавіч нарадзіўся ў 1940 у г. Петразаводску (Расія) у сям'і ваеннаслужачага. У 1958 з сям'ёй прыехаў у Рэчыцкі р-н. Скончыў факультэт фізічнага выхавання Гомельскага педагагічнага інстытута імя В. П. Чкалава (1963),

Беларускую дзяржаўную кансерваторыю (1965). Працаваў музыкантам Рэчыцкага раённага Дома культуры, салістам-інструменталістам эстрады, рэжысёрам-пастаноўшчыкам эстрады, артыстам вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры», выкладчыкам кафедры рэжысуры клубных масавых прадстаўленняў Белдзяржфілармоніі, тэатразнаўцам Беларускага дзяржаўнага тэатральнамастацкага інстытута, рэжысёрам-пастаноўшчыкам эстраднага аркестра РСФСР і і «Саюзканцэрта», рэжысёрам-пастаноўшчыкам менеджэрскага бюро фонда «Дзяржканцэрт» (Расія). Кандыдат мастацтвазнаўства (1988), лаўрэат Першага Усесаюзнага конкурсу рэжысёраў эстрады і масавых прадстаўленняў (1991), заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі (1991). Аўтар манаграфій: «Вакальна-інструментальныя ансамблі», «Веды». М., 1980; «На шляху ад эстрады да тэатра», «Дзяржканцэрт». М., 1995. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1986).

В. К. Яшкін памёр у 1997. Пахаваны ў г. Масква.

Выяўленчае мастацтва

Шырокая плынь

Ураджэнец Рэчыцы Яўген Канстанцінавіч Іванешка — выпускнік Ленінградскага інстытута жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Я. Рэпіна. Ён член Саюза мастакоў, вядомы беларускі жывапісец. Адным з першых у рэспубліцы прыняты ў прафесійна-творчы Саюз мастакоў пры міжнароднай арганізацыі ЮНЕСКО.

Яўген Канстанцінавіч актыўна ўдзельнічаў у прадстаўнічых выставах з 1963 г., арганізаваў некалькі персанальных вернісажаў.

Кожнае палатно цікавага майстра пэндзля, якім з'яўляецца Я. К. Іванешка, як бы сагрэта сэрцам, вынашана душой, акрэслена глыбокім роздумам пра чалавека, ягонае месца ў жыцці.

Яўген Канстанцінавіч распрацоўвае тэматыку шырокага дыяпазону. Перш за ўсё, гэта палотны аб Вялікай Айчыннай вайне, пра боль нашага народа, ягоны гераізм. Так, у палатне «Старыя акопы» — сляды крывавай бойні, памяць пра тых, хто стаяў насмерць за любы край, родны дом, сваё поле...

З гэтым творам як бы пераклікаецца яшчэ адзін — «Трывожнае лета». У ім трагедыя беларускай зямлі ў час гітлераўскай навалы.

У трыпціху «Памяці бацькі» мастак абагульняе падзеі. Фота салдата, прабітая каска, руіны крапасных умацаванняў, надмагільная пліта з чырвонымі ружамі — горкі аповед аб ахвярах вайны. Але ж жыццё працягваецца. І ў трыпціху яго сімвалізуе квітнеючы бэз.

Значнае месца ў творчасці Яўгена Канстанцінавіча Іванешкі займае пейзажны жанр. Мастацкая спадчына жывапісца ўключыла шмат цікавых палотнаў, створаных пасля паездак на Дняпро, Сож, Прыпяць. З эцюднікам мастак прайшоў шматлікімі гасцінцамі, ляснымі сцяжынамі.

«Мой родны кут» — вялікі цыкл пейзажаў Іванешкі, створаны на працягу доўгіх гадоў у мясцінах каля Мілаграда, Глыбава, Горваля. Словам, там, дзе надзвычай маляўнічыя прыдняпроўскія мясціны рэчыцкай зямлі.

Я. К. Іванешка

Мастак, як правіла, выкарыстоўвае панарамную кампазіцыю, мяккія пераходы жывапісных мазкоў. Імкнецца праз філасофскае асэнсаванне паказаць родную прыроду ва ўсім яе харастве, у арганічным адзінстве з чалавекам. І гэткі падыход асабліва праяўляецца ў карціне «На радзіме маіх дзядоў». Светлым мажорам напоўнена гэтае палатно. Яно як радасная песня аб нашых барах і рэчках, лугах, вясковых ваколіцах.

Глыбокі філасофскі сэнс закладзены мастаком у трыпціхах «Старыя беларускія сялянскія рэчы», «Мая зямля», карцінах «Хлеб наш надзённы», «Край, дзе нарадзіўся». Тут ва ўсёй велічы родная Беларусь, з яе прасторамі і працавітымі людзьмі.

Яўген Канстанцінавіч Іванешка ў росквіце творчых сіл. З натхненнем працуе над новымі работамі, у якіх шырокая плынь жыцця.

А. Шныпаркоў

Аб Аляксандры Ісачове

...Мы познакомились с Александром в Речице. Он вел типичную жизнь провинциального подростка. Среднее образование получал в вечерней школе, где обучение проходит по принципу «чему-нибудь и как-нибудь», добавим, и «когда-нибудь».

Работа в ремонтно-строительном управлении каменщиком... По вечерам танцплощадка...

Но в начале 1973 г. он уезжает в Ленинград, устраивается там на работу в зеленхоз, получает лимитную прописку. И попадает в среду неформальной творческой молодежи.

Позднее он скажет, что эта среда «буквально захлестнула его своим бурным проявлением жизни».

(В Республиканской школе-интернате по музыке и изобразительному искусству в Минске, откуда он ушел после 8-го класса из-за конфликта с директором, Александр представлял свою будущность в качестве художника-дизайнера. Живопись станковая казалась ему пройденным этапом человеческой культуры. Полотна современников, которые он видел на официальных выставках, не вдохновляли на писание картин.)

Он окунается в атмосферу бурных обсуждений, споров, собраний, участвует в нескольких полуофициальных выставках. На одной из них Александр познакомился с ленинградским коллекционером Георгием Михайловым, человеком увлеченным, прекрасным организатором, устроившим в своей квартире постоянно действующую (в течение нескольких лет) экспозицию работ молодых художников, значение которой для их творчества трудно переоценить...

Если можно говорить о влиянии на творчество Александра чего-либо, то это было влияние всех модернистских направлений сразу. Были апробированы всякого рода «измы»: «Я как бы разбежался, разнесся по всем течениям...»

К самой первой полуофициальной выставке группы неофициальных художников на психологическом факультете ЛГУ Александр подготовил серию графических работ тушью в сюрреалистической манере, в духе, как он позднее сам определил, «черного юмора» и «эпатажа». По требованию декана факультета эти работы были сняты с экспозиции и показывались зрителям из-под полы в отдельной папочке. В конце концов их кто-то украл. Александр не раз впоследствии с юмором вспоминал эти свои «шедевры» и удивлялся, что кому-то это могло понравиться.

Конец первой ленинградской «эпопеи» для Александра был печальным: истощенный, измученный недоеданием, недосыпанием, ненормальной жизнью нескольких месяцев, он попадает в больницу. В декабре того же года возвращается домой. После бурных ленинградских перипетий Речица оказала благотворное воздействие: здесь наконец можно было спокойно обдумать все, что произошло за год, сделать окончательный выбор и приступить к работе.

С этого момента по-настоящему и начинается Исачев-художник.

Основными темами сюжетных полотен Александра в 70-е годы становятся библейские ветхо- и новозаветные мотивы («Благовещенье», «Что есть истина?», «Распятие», «Снятие с креста», «Пьета»...). Кроме них, он работает над портретом, натюрмортом, пейзажем, в большинстве своем тоже мифологизированными: «Моисей», «Апостол Петр», «Ной», «После потопа», «Моя земля», «Лунный пейзаж».

Александр работает в манере гладкого письма, самостоятельно разгадывая секреты нанесения на холст тончайших лессированных слоев. Учителями своими считает старых мастеров.

Одновременно с этим художник выполняет заказы для церквей. Александр написал несколько десятков икон для речицкой церк-

ви, сделал роспись храма в Мозыре, выполнил мелкие заказы для других церквей Гомельской области.

Обращение к культуре древнейших человеческих цивилизаций сопровождается серьезным изучением литературы философского, мифологического, религиозного, эстетического и даже лингвистического содержания. Труды Лосева и Аверинцева, научные публикации сотрудников ленинградского Института востоковедения, мифы и эпос различных народов, поэзия Индии, Китая и Японии — это далеко не полный перечень литературных интересов Александра. Он обладал прекрасной памятью и великолепной способностью усваивать материал даже на слух. Поэтому очень часто просил меня читать вслух, чтобы не отрываться от мольберта. Бывали случаи, когда мне приходилось читать ему по десять часов подряд.

Определив однажды для себя важными вневременные общечеловеческие истины, он и служил им, и занимался ими, и болел ими душой и телом. Любое конкретное проявление зла или добра в его мозгу сразу же обобщалось, находило свой прообраз в мифологемах мировой культуры и тем самым становилось художественным материалом, «пластилином», из которого он вылепливал свою модель взаимодействия и борьбы злого и доброго, прекрасного и безобразного.

Те реальные явления, которые другого человека могли психологически травмировать, для Александра превращались в предмет философского осмысления, кистью или словом — неважно.

Вот типичный пример того, как воспринималось им собственное бытие: «Я долго думал над мифом, повествующим о рождении Аполлона... Почему бог, олицетворяющий искусство и творческую потенцию, родился где-то в изгнании, на каком-то пустынном острове? Почему греки не окружили более достойными условиями рождение своего любимца? И понял: это — не случайно. Видимо, душе его необходимо было измучиться пустыней, истосковаться по прекрасному, по совершенству и гармонии до такой степени, чтобы оказаться способной родить все это из самое себя, превратиться в источник творческих сил.

У меня то же самое: рождение в глубинке Белоруссии, в какой-то деревеньке, большая часть жизни в небольшом провинциальном городке — условия, в которых, казалось бы, не из чего ни родиться, ни вырасти художнику... Так и должно было быть.

Творцу необходима пустыня для того, чтобы он мог начать творить свой собственный мир, родить его из своей души.

Я творец! Я бог! Я Аполлон собственного мира».

Никогда бы вы не услышали от него брюзжания по поводу нехватки денег, жалоб на то, что не может работать, так как нет подходящих условий, и т. д. Этих проблем для него просто не существовало. Это не значит, что их не было в нашей жизни. Сколько угодно! Гораздо больше, чем в любой другой семье. Но он просто психологически не способен был их брать в расчет. Он мог отдать по первой просьбе последние деньги и аргументировать это тем, что «с голоду не помрем».

Признание? О нем Александр в начале своего пути и не думал. Напротив, было совершенно четкое осознание того, что ни слава, ни деньги не станут его спутниками.

«Широкая известность в нешироких кругах» — так шутливо определял он свой успех на неофициальных выставках в Ленинграде. Сама собой пришла и уверенность в том, что его творчество рано или поздно получит широкое признание. При жизни ли, посмертно ли — для него было неважно.

Однажды (это было в 1981 г.) с его работами захотели познакомиться члены Гомельского отделения Союза художников БССР. Они посетили небольшую квартирную экспозицию его картин, где и вынесли резюме: «Работы эти выставлять нельзя из-за неподходящих тем».

Иногда он в поисках материального подкрепления нашего с двумя детьми существования предлагал свои услуги в оформлении какого-либо объекта в Речице (например, бар, молодежное кафе). Но и здесь он желал делать только то, что считал нужным сам. Препоны, которые вставали на его пути, не удивляли его, и к ним он относился однозначно: «Если не дадут делать то, что я хочу, то вообще не буду делать». Так и получалось. Не скажу, что это очень расстраивало, скорее просто раздражало.

Неприятности начались позднее, в период «усиленной борьбы за трудовую дисциплину». Вот тут-то вспомнили, вот тут-то стали требовать, даже угрожали наказать за «тунеядство». В этих случаях Александр категорически отказывался подписать бумагу, в которой стояла формулировка «от общественно полезного труда отказался».

«Я считаю свой труд полезным для общества», — заявил он.

Но все-таки пришлось искать «обходные пути», чтобы «меньше цеплялись». Подыскивать работу, при которой оставалось бы побольше свободного времени. Иногда удавалось найти такой вариант, иногда приходилось отрабатывать восьмичасовой рабочий день — то сезонником в парке культуры, то с так называемыми «шабашниками», то в Речицком РСУ маляром-штукатуром...

Но, пожалуй, время наиболее частых и ощутимых нервных срывов и депрессий приходится именно на тот период, когда стали усиленно замечать его «тунеядство». Период пристального внимания к нему со стороны властей окончился двумя, последовавшими почти сразу же друг за другом, попаданиями Саши в районную психиатрическую больницу.

«Не срывы же заполняют основную часть моей жизни, — говорил Саша, — не это же составляет главную мою сущность...»

В этом с ним нельзя было не согласиться.

Пусть помнят об этом те, кто берется за описание его судьбы и творчества. Не судите, да не судимы будете.

В конце концов не дрожащей же рукой выполнялась ювелирная прописка мельчайших деталей, наносились на холст тончайшие слои лессировочного письма. Нужно было вдохновенное время для того, чтобы создать около пятисот полотен и сотни графических листов!

И сделать это всего лишь за 14 лет, ни разу не покривив душой перед своим Богом — Творчеством.

Нет! О нем нужно не плакать, не сожалеть. Ему нужно завидовать!

Н. Ісачова, жонка мастака

З часопіса «Огонек», чэрвень 1989 г. (№ 24)

Мастак без абедзвюх рук

Шквалам агню сустрэлі гітлераўцы авангард 10-ай гвардзейскай стралковай дывізіі, якая пры падтрымцы 73-га танкавага палка штурмавала моцны апорны пункт праціўніка на гары Малы Кырыквайвіш у Запаляр'і. У першых радах атакуючых былі і сапёры. На правым флангу па адкрытым камяністым схіле паўзлі байцы аддзялення сяржанта Віктара Тарлецкага. Адну за другой абясшкоджвалі яны варожыя міны, каб тым, што пойдуць у наступленне пазней, было хоць крыху, ды бяспечней.

Да зыходу дня гвардзейцы авалодалі, здавалася, непрыступнай гарой, выйшлі ў раён пераправы праз раку Цітаўку — адну з найбольш стромкіх на Кольскім паўвостраве.

Левы бераг быў літаральна нашпігаваны мінамі. Але сапёры не ведалі спачынку.

Разам з падначаленымі спяшаўся і ён, сяржант Тарлецкі. Нашы танкі пачалі ўжо фарсіраваць Цітаўку, а некалькі мін яшчэ заставаліся ў праходзе.

Пальцы сяржанта абясшкодзілі адну міну, другую. Засталася трэцяя. Апошняя. Але галаўны танк «Т-34» ужо выйшаў на левы бераг, пакіраваў у бок міны. І тады Тарлецкі кінуўся ўперад. Ён, вядома, ведаў, як прымусіць міну спрацаваць імгненна.

Вогненны ўзрыў скалануў зямлю перад гусеніцамі танка...

Марудна, надзвычай марудна вярталіся да мужнага сяржанта сілы. Часам не хацелася жыць. Думалася: «Як без рук?..»

З дзяцінства прарочылі быць мастаком. На школьных выставах ягоныя малюнкі займалі першыя месцы. Не кідаў любімай справы і на вайне.

А цяпер што, усё? Больш не маляваць?

Ён, бязрукі сяржант В. В. Тарлецкі, не мог змірыцца з гэтым. Пачаў... зноў маляваць. Зубамі браў са шклянкі аловак, зацiскаў яго ацалелымі локцямі, выводзіў на паперы нейкія каракулі. Нярэдка валіўся ў знямозе на ложак, кляўся сабе, што больш не дакранецца да алоўка. А праз некалькі хвілін, астыўшы крыху, зноў садзіўся за работу.

І прыйшоў, нарэшце, дзень, калі літары, выведзеныя ім, сталі роўнымі і прыгожымі. Акрылены першым поспехам, узяў пэндзаль...

Вярнуўшыся ў Рэчыцу, В. В. Тарлецкі працаваў інспектарам гарвыканкама, на аўтабазе. А потым перайшоў на фабрыку мастацкіх вырабаў. Звыш 10 гадоў рабіў тут... мастаком.

У майстэрні мужнага чалавека я пазнаёміўся з серыяй работ, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне.

Вось гітлераўцы прывялі на расстрэл палонных партызан. Чорныя дулы аўтаматаў скіраваны ў грудзі патрыётаў. Але тыя і не думаюць схіляцца перад смерцю. У вачах нянавісць да чужынцаў.

Яшчэ адна карціна: танк пераадольвае калючую агароджу. За ім, разгарнуўшыся ланцугом, бягуць савецкія салдаты. Назва карціны — «Атака».

«Разгром». Гэта карціна здалася мне знаёмай. Цёмныя і строгія фарбы. Здаўленая сопкамі лашчына быццам засеяна разбітай тэхнікай. А над самай высокаю гарою — чырвонае палотнішча.

— Даліна Славы ў Запаляр'і? — спытаў я.

— Так, — адказаў Віктар Віктаравіч. — Тут мы наступалі.

Г. Лявіцкі

Яны выдалі кнігі

ВІШНЯК Пётр Сцяпанавіч (1916—1996). Нарадзіўся ў г. Рэчыца. З сям'і рыбака. У 1929 скончыў 4 класы. Пасля гэтага пайшоў працаваць. Вучобу працягваў у вячэрняй школе. За тры гады прайшоў праграму трох наступных класаў.

У 1940 скончыў Гомельскую гандлёва-кааператыўную школу, быў накіраваны працаваць у Заходнюю Беларусь. Працаваў інструктарам райспажыўсаюза і бухгалтарам сельскага спажывецкага таварыства на Беласточчыне.

Пасля таго як пачалася Вялікая Айчынная вайна, вярнуўся ў Рэчыцу. На фронт не быў прызваны па прычыне дрэннага зроку.

У 1956 праз Дзяржвыдавецтва БССР выдаў аповесць для дзяцей «Першае падарожжа». Напісаў яшчэ дзве аповесці — «Атрад імя Спартака» і «Па зарослых сцяжынках». Але гэтыя творы П. С. Вішняка не ўбачылі свет. Як мяркуе аўтар: па ідэалагічных меркаваннях. Ягоныя нядобразычліўцы напісалі ліст у партыйныя органы з парадай праявіць класавую пільнасць, бо, маўляў, Вішняк здаровы чалавек, а Айчыну са зброяй у руках не бараніў, то і не можа вучыць гераізму савецкіх дзяцей сваімі творамі.

П. С. Вішняк — аўтар шматлікіх вершаў і баек. На ягоныя словы кампазітар Коншын напісаў музыку. І загучала шырокавядомая песня «Речицкая лирическая».

Небо потемневшее вышитым ковром
Широко раскинулось над родным Днепром.
Звезды воду чистую не напьются, пьют,
В лодке парень с девушкой по реке плывут.

ПРИПЕВ:

Ой, не под рябиною летним вечерком
Хорошо с любимою на реке вдвоем.
Их несет течением быстрая река,
Прокатиться просится месяц свысока,
С луга ароматами веет ветерок,
И огнями светится тихий городок.

Песня задушевная спорит с соловьем.
И поет в ней девушка что-то о своем...
Как с желанным встретилась в парке над Днепром,
Как сердечко девичье светит огоньком...

ПРИПЕВ.

Сколько встреч загаданных будет впереди...
А прекрасней Речицы места не найти.
Днепр волной игривою моет берега,
Здесь любовь рождается крепко, навсегда!

ПРИПЕВ.

КАРАЛЕНКА Анатоль Захаравіч нарадзіўся ў 1936 у г. Баку. Школу і тэхнікум нафтавай прамысловасці скончыў у г. Нафтавыя Камні (Азербайджан). Працаваў аператарам па здабычы нафты. 25 гадоў жыве ў Рэчыцы і працуе майстрам ва ўпраўленні «Рэчыцанафта». Актыўна супрацоўнічае ў рэспубліканскім друку. Піша вершы, казкі. А. З. Караленка — адзін з аўтараў зборніка «Птушка шчасця» (1991 г., выдавецтва «Юнацтва») і кнігі «Нефтяная жемчужина Белоруссии» (1991 г., выдавецтва «Полымя»). У 1993 праз Беларускае выдавецкае таварыства «Хата» выдаў зборнік казак «Чорны Грыфон, альбо Вясёлка нафтавых промняў». Шмат каторыя з казак А. З. Караленкі былі надрукаваны на азербайджанскай мове.

РАБЯНОК Пятро Піліпавіч нарадзіўся 11.1.1949 г. у в. Баршчоўка. Працаваў настаўнікам, рабочым. Завочна скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Апавяданні і гумарэскі П. П. Рабянка друкаваліся ў рэспубліканскіх і саюзных выданнях. У 1990 г. праз рэспубліканскае выдавецтва «Мастацкая літаратура» выдаў аповесць «Дарога ў пяць гадоў» (калектыўны зборнік), у 1992 г. — зборнік публіцыстыкі «Хто напоўніць ветразь?» (выдавецтва «Мастацкая літаратура», серыя «Рэспубліка. Час. Людзі»).

З 1979 г. — супрацоўнік рэчыцкай газеты «Дняпровец». Кіраўнік творчай групы па напісанню гісторыка-дакументальнай хронікі г. Рэчыца і Рэчыцкага раёна — кнігі «Памяць», яе рэдактар-укладальнік.

РУДЗІШКІН Міхаіл Мікітавіч нарадзіўся ў 1913 г. на Лоеўшчыне. Скончыў Рэчыцкае педагагічнае вучылішча і Мазыр-

скі настаўніцкі інстытут. Працаваў у школах Лоеўскага і Рэчыцкага раёнаў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Жыве ў в. Дуброва. Апавяданні, вершы, байкі М. М. Рудзішкіна друкаваліся ў рэспубліканскіх выданнях. У 1990 г. праз рэспубліканскае выдавецтва «Юнацтва» выдаў кніжку для дзяцей «Вінавата люстэрка» (калектыўны зборнік), у 1994 г. — зборнік сатырычных вершаў і баек «Дзед Яўсей і радыяцыя» (дадатак да часопіса «Вожык»).

РЭПІЧ Фёдар Дзянісавіч нарадзіўся ў 1924 г. у в. Гогалеў (Калінкавіцкі раён). Жыў у Васілевічах. Вершы і байкі Ф. Дз. Рэпіча друкаваліся ў рэспубліканскіх выданнях. У 1992 г. праз Рэчыцкую друкарню выдаў зборнік гумару і паэзіі для дзяцей «Блудлівая каза». Спонсарскую дапамогу аўтару аказалі вытворчае аб'яднанне «Рэчыцадрэў» і доследна-прамысловы гідролізны завод.

Зборнік «Блудлівая каза» — першая кніжка, якая выдадзена непасрэдна ў Рэчыцы. Памёр у 1995 г.

СТРЫЖАК Віктар Іванавіч нарадзіўся ў 1955 г. у в. Заспа. Скончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Працаваў рабочым, настаўнікам, супрацоўнікам раённых газет. Вершы В. Стрыжака друкаваліся ў рэспубліканскіх выданнях. У 1995 г. выдаў зборнік вершаў «Рэха журбы» (выдавецтва «Мастацкая літаратура»).

Памёр у 1995 г.

ТУЛУПАЎ Іван Савельевіч (Янка ТУЛУПАЎ) нарадзіўся 31.11.1912 г. у в. Капань.

Вучыўся ў Капані, Рэчыцы. Пасля педрабфака быў накіраваны на літаратурныя курсы пры Магілёўскім педагагічным інстытуце. Педагагічную дзейнасць пачаў у 1931: выкладаў беларускую мову і літаратуру. У 1940 быў прызначаны загадчыкам Рэчыцкага райана.

З 24 чэрвеня 1941 г. па кастрычнік знаходзіўся ў дзеючай арміі. Адтуль накіраваны на дыверсійныя курсы. Тыл. Гомельскае падполле. Партызанскі атрад «Бывалыя»...

Пасля вайны скончыў Віцебскі педагагічны інстытут імя Кірава.

Першыя вершы напісаў у 1930 г. Ягоныя творы друкаваліся ў рэспубліканскіх выданнях. У 1985 рэспубліканскае выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціла зборнік паэзіі «У паходзе». Адзін з аўтараў гэтай кніжкі — І. С. Тулупаў.

Трагічна загінуў у 1995 г.

Спартыўная гордасць Рэчыцы

АТРОШЧАНКА Анжэла Пятроўна нарадзілася ў 1970 г. у г. Рэчыца. Майстар спорту міжнароднага класа (1991, лёгкая атлетыка). Скончыла Рэчыцкую СШ № 4. Лёгкай атлетыкай пачала займацца з 3 класа ў дзіцячай спартыўнай школе ДФСА «Прафсаюзаў» у трэнера Зоі Пятроўны Марыеўскай. Неаднаразовая чэмпіёнка СССР сярод юніёраў (шматбор'е), чэмпіёнка СНД (1991).

СМАЛЬ Сяргей Мікалаевіч нарадзіўся ў 1968 у г. Рэчыца. Заслужаны майстар спорту СССР (1991, вольная барацьба). Вучыўся ў Рэчыцкай СШ № 4. Вольнай барацьбой пачаў займацца з 1978 г. у Рэчыцы ў спартыўным таварыстве «Дынама». Першыя трэнеры — Аляксандр Мікалаевіч Смаль і Мікалай Аляксандравіч Шастапалаў. Неаднаразовы чэмпіён БССР і СССР, СНД. У 1988 г. выйграў Кубак свету (Канада). У 1990 г. на чэмпіянаце свету (Токіо) заняў 3-яе месца. Чэмпіён свету 1991 г. (Варна). Жыве ў г. Гомель. Трэніруецца ў заслужанага трэнера РБ Станіслава Анатольевіча Гарло.

Чорнае крыло Чарнобыля

...У друку яшчэ не праскочылі тыя куцыя некалькі радкоў, якія паведамлялі, што ў Чарнобылі «нешта» здарылася, а я ўжо ведаў: «нешта» — гэта сур'ёзна. Адкуль ведаў? Рэчыцкія бытавікі як не штотыдня выпраўляліся на Украіну з таварамі, каторыя не ішлі на Гомельшчыне. Але... У тую апошнюю красавіцкую суботу 1986-га былі змушаны павярнуць назад. І не так сабе: машыны з таварам за Брагінам былі апрацаваны нейкім растворам.

Дарэчы, два гады маёй далёкай вайсковай службы звязаны з ракетамі. Давялося пабыць і на дзяржаўным палігоне, дзе ўзро-

вень радыяцыі быў тады значна вышэйшым, чым на тэрыторыі Беларусі. (Зараз, відаць, інакш.) Памятаю ўласныя хваляванні: «Хаця б тут, на палігоне, доўга не трымалі: радыяцыя ж...» А тут «нешта» ў сотні кіламетраў ад Рэчыцы. «Але ж цэлая сотня кіламетраў...» — супакойвала думка.

Праз які тыдзень пасля аварыі дапамагаў бацькам садзіць бульбу. Ледзь толькі распачалі ўвіхацца на сотках, як з-за бору «выплылі» верталёты. Не тыя лёгкія, што ў нафтавікоў, а грувастка-цяжкія, афарбаваныя ў зялёнае.

— Навошта б гэта яны? — занепакоілася маці.

А родзічка, што прыехала ўчора з Брагіна і дапамагала зараз у рабоце, адно махнула рукой:

— Ат, стракозы гэтыя над Брагінам цяперака ад цямна да цямна. Як гэхнула ля Янава (чыгуначная станцыя непадалёку ад Чарнобыля, з якой брагінцы нярэдка выпраўляліся ў Кіеў), то і яны паналяцелі.

Расказала, як у Брагіне хацелі замераць радыяцыю: «То пабеглі па мястэчку, каб прыбор якісь знайсці, што рацыю тую кажа. Туды і сюды пабеглі. А прыбора таго і няма».

Верталёты зніклі за лесам. А суседка, заатэхнік саўгаса «Баршчоўка» Нэля Сцяпанаўна Стасенка, прынесла на соткі невясёлую вестку. Аказваецца, атрымала гаспадарка тэлефанаграму, што малако непрыгоднае для ўжывання. І ўсё, аніякіх тлумачэнняў.

Калі вярнуўся з Баршчоўкі ў Капань, цешча заклапочана паведаміла:

— Штось карова нашая захварэла. Малако бы з крывёю...

— І ў мяне тое ж, — здзівілася яе сястра Еўдакія Пятроўна Быстранкова.

Назаўтра ж я бачыў на ўласныя вочы, як звычайна бялюткі самаробны сялянскі тварог, пастаяўшы з паўгадзіны на стале, пачаў прыкметна ружавець. Тады і даўмецца не мог, што гэткі колер прадукту надае ... радыеактыўны ёд.

Хто скажа сёння, колькі таго згубнага ёду з'елі ў красавіку і маі 1986 года мае землякі, сам я, дзеці нашыя?..

...Пасля аварыі ў Чарнобылі прайшло дзён дзесяць. Над Рэчыцай і раёнам духмень, што й дых, здаецца, забівае. А па прасёлкавых дарогах калгаса імя Дзяржынскага паўзуць два аўтобусы з удзельнікамі семінара па азнаямленні з перадавым вопытам ... атрымання малака на танных зялёных кармах. Пыл з-пад колаў адразу ж уварваўся ў салоны «Ікарусаў». Згубны, радыеактыўны пыл. Яго ўдыхаем у сябе не толькі мы, удзельнікі семінара, а і тыя, каторыя арганізавалі непатрэбнае зараз мерапрыемства.

Было б тое знаццё, то за сотню крокаў абышоў бы аспідна-чырвоныя аўтобусы, калі яны яшчэ стаялі ў Рэчыцы і, пафыркваючы дызелямі, былі гатовыя скрануцца з месца, узяўшы кірунак на толькі што названы калгас. Упэўнены, зрабілі б тое і іншыя. Але хто ведаў? Ведалі ж, напэўна, іншыя, не маглі не ведаць... Павінны былі ведаць. Ды яны маўчалі, арганізоўвалі тое, пра што забыцца б хаця на паўгода.

Дапялі, урэшце, на цэнтральную сядзібу калгаса. А тут, аказваецца, ёсць прыбор для замеру радыеактыўнасці. Паднёс яго да адзення — стрэлка на дазіметры жвава папаўзла ўбок. Убок, што сведчыць аб небяспецы.

А тут і старшыня калгаса Пырх. Расказаў: у яго жывуць палкоўнікі. Раніцай едуць да Чарнобыля, а вечарам вяртаюцца назад.

— І што расказвалі? — пацікавіўся я.

— Кажуць, што хаця б дажджу не было, — паведаміў Віктар Антонавіч. — А то засыпле нас цэзіем ды стронцыем яшчэ больш...

Праз колькі хвілін сустрэўся са знаёмым мясцовым брыгадзірам. Ледзь павіталіся, а ён як скрозь зубны боль: «Чорт ведама што: галава, бы чугунная. І ногі падкошваюцца. У сям'і таксама ўсе скардзяцца...»

Доўга пагутарыць не давялося, бо кіраўнікі семінара зноў запрасілі — загадалі да аспідна-чырвоных «Ікарусаў». Была патрэба ехаць далей, каб вывучаць «вопыт» атрымання ... радыеактыўнага малака...

Пятро Рабянок. Хто напоўніць ветразь? Мн.: Мастацкая літаратура, 1992

Жыве ў душы трывога

Спецыялісты НДІ радыебіялогіі АН рэспублікі, а дакладней, дзвюх лабараторый інстытута на чале з кандыдатамі навук Багданавым А. П. і Міронавым В. П. разам з работнікамі раённых арганізацый летам і восенню 1990 г. адабралі і прааналізавалі каля дзвюх тысяч проб глебы, зрабілі дзесяткі тысяч замераў.

Напрыканцы года работа ў асноўным была завершана. Атрыманыя даныя аб

шчыльнасці забруджвання раёна цэзіем-137, стронцыем-90, плутоніем-239, -240 і іншымі радыенуклідамі былі ўзгоднены з рэспубліканскім цэнтрам радыяцыйнага кантролю і назіранняў за забруджваннем навакольнага асяроддзя Белгідрамета, перададзены яму для закладкі ў банк даных.

Што паказваюць вынікі даследаванняў? Практычна ўся тэрыторыя раёна з'яўляецца забруджанай. Звыш 62 % нашых людзей жывуць у населеных пунктах, размешчаных у зоне з правам на адсяленне. 33 % — у зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем. І толькі 0,1 % жыхароў раёна (75 чалавек трох населеных пунктаў) знаходзяцца ў адносна чыстай зоне.

Радыенукліды размеркаваны на мясцовасці надзвычай нераўнамерна. Значныя разыходжанні ў паказаннях шчыльнасці забруджвання назіраюцца не толькі ў межах сельсаветаў ці гаспадарак, але і амаль кожнага населенага пункта. Выключэнне складае толькі тэрыторыя Капараўскага сельсавета. Усе ягоныя населеныя пункты ўваходзяць у адну і тую ж зону — з правам на адсяленне.

У ходзе работ па адборы проб глебы на сельгасугоддзях у поймах Бярэзіны і Дняпра былі выяўлены шматлікія плямы рознай велічыні з магутнасцю дозы гама-выпраменьвання 200 і больш мкР (гадз.), максімальна — 1650 мкР (гадз.).

Высветлілася і такая асаблівасць забруджвання тэрыторыі раёна, як парушэнне агульнапрызнаных суадносін цэзію-137 і стронцыю-90 на «карысць» апошняга. На жаль, ёсць населеныя пункты, дзе шчыльнасць забруджвання глебы стронцыем-90 большая за шчыльнасць забруджвання цэзіем-137.

Аналіз паказаў: у раёне ёсць і чарнобыльскі плутоній. Асабліва шмат яго ў межах вёскі Борхаў Азершчынскага сельсавета і пасёлка Вазнясенск (Артукоўскі сельсавет).

Значныя паказчыкі і па шчыльнасці забруджвання глебы цэзіем-134, цэзіем-144, рутэніем-106. У асобных населеных пунктах яны перавышаюць 1 Кі/м^2.

Складанае становішча і па калію. Шчыльнасць забруджвання многіх населеных пунктаў каліем-40 перавышае шчыльнасць забруджвання цэзіем-137. Напрыклад, у вёсцы Артукі (цэнтр сельсавета): калій-40 — 3,51 Кі/м^2, цэзій-137 — 2,04 Кі/км^2.

Мяркую, калі можна было б прывесці радыетаксічнасць усіх наяўных у глебе раёна радыенуклідаў і ссумаваць іх, то не было б у раёне ніводнага населенага пункта, дзе шчыльнасць забруджвання складала б менш 10—15 Кі/км^2.

Аб чым жа гэта сведчыць? Бадай, аб наступным. Мы жывём на зраненай зямлі, шчодра пасыпанай чарнобыльскім згубным попелам. Іншай зямлі ў нас няма і не будзе. Трэба жыць, трэба працаваць, расціць дзяцей. Нашу бяду павінны як след усведамляць дзяржава і міжнароднае супольніцтва. Чарнобыль — не бяда лакальнага характару, яна — глабальнага характару. Час не церпіць. Заўтра можа быць позна. Злачынна позна.

В. Кавалёў, начальнік штаба грамадзянскай абароны Рэчыцкага раёна

Становішча не радуе

Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС мінула звыш 8 гадоў. За гэты час радыелагічнай лабараторыяй Рэчыцкага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі праведзена звыш 67 тысяч даследаванняў харчовых прадуктаў. Падстаў для аптымізму пакуль, на жаль, няма.

Амаль палова малака, даследаванага ў 1986 г., была непрыгоднай да ўжывання. Гэта з уласных падвор'яў жыхароў раёна. І хто можа даць дакладны адказ на пытанне: колькі ж такога малака выпілі вяскоўцы?

У першы год пасля чарнобыльскай аварыі 21 % малака давялося зняць з рэалізацыі ў дзяржаўным сектары.

На сёння становішча па малаку значна палепшылася. Але, як і раней, высокі працэнт забруджанага малака ў вёсках Глінная Слабада і Маканавічы (Васілевіцкі гарсавет), вёсцы Першамайск (Караваціцкі сельсавет), у вёсках Борхаў, Сеназавод, Чыжаўка, Якімаўка Баршчоўскага сельсавета і г. д.

Да 1991 г. палова проб на бабовыя культуры давала перавышэнне ўтрымання радыеактыўнага цэзію-137. Ды і ці толькі яго!

Штогод 10—15 % натуральнага мёду паказвалі перавышэнне дапушчальных узроўняў па ўтрыманні радыецэзію.

З году ў год назіраецца высокая канцэнтрацыя радыенуклідаў у лясных ягадах і грыбах. Так, узроўні забруджвання чорных ягад складаюць 2—3,5 тыс. Бк/кг пры дапушчальных узроўнях — 185 Бк/кг. Утрыманне радыецэзію ў грыбах — да 5700 Бк/кг.

Узрастае забруджанне рыбы ў закрытых вадаёмах. Сёлета, напрыклад, 30 % даследа-

ваных проб былі непрыгоднымі да ўжывання. У 1993 годзе гэты паказчык быў удвая ніжэйшым.

За 8 гадоў пасля чарнобыльскай аварыі ў раёне адкрыты 22 радыеметрычныя лабараторыі на прадпрыемствах, якія выпускаюць харчовыя прадукты. Строгі кантроль на рынках. Гэта ставіць перашкоду перад забруджанай прадукцыяй. Але ж нават названыя вышэй 67 тысяч даследаваных прадуктаў харчавання — не больш чым кропля ў моры. Нельга праверыць усё. І калі забруджаная прадукцыя ёсць, яна абавязкова будзе трапляць на стол жыхароў Рэчыцы і раёна.

Мы шмат увагі надавалі праверкам пітной вады з водаправодных сетак, артэзіянскіх свідравін, шахтных калодзежаў, з Дняпра. Па ўтрыманні радыецэзію вада не перавышае дапушчальныя кантрольныя ўзроўні. Але ж агульнавядома: згубнасць радыенуклідаў павышаюць нітраты. А іх, нітратаў, у калодзежнай вадзе з кожным годам больш і больш. Напрыклад, у 1989 г. 54,44 % даследаванняў калодзежнай вады паказалі на перавышэнне дапушчальных узроўняў па нітратах. Затое ў 1993 г. ужо 88,2 % даследаванняў калодзежнай вады далі перавышэнне ўтрымання нітратаў.

Павялічваецца і ўтрыманне нітратаў у сельскагаспадарчай прадукцыі, атрыманай у межах раёна. Перавышэнне ўзроўню нітратаў выяўляюць ад 12 да 43 % даследаваных проб.

М. Шаўчэнка, галоўны ўрач
Рэчыцкага санальнага цэнтра
гігіены і эпідэміялогіі

Даныя радыеактыўнага забруджвання населеных пунктаў Рэчыцкага раёна цэзіем-137, стронцыем-90, плутоніем-239, -240 (з улікам падворнага абследавання)

Назва сельсавета, гарсавета	Назва нас. пункта	Цэзій-137	Стронцый-90	Плутоній-239, -240
АЗЕРШЧЫНСКІ	в. Азершчына	1,16	0,417	0,0029
сельсавет	пас. Борхаў	0,83	0,416	0,0030
	в. Рудня	1,06	0,248	0,0047
	в. Унорыца	0,70	0,290	0,0079
АРТУКОЎСКІ	в. Артукі	1,30	0,387	0,0250
сельсавет	пас. Барбара	1,25	0,495	0,0098
	пас. Вазнясенск	1,60	0,196	0,0320
	в. Вятхінь	1,03	0,228	0,0042
	в. Краснаполле	1,10	0,166	0,0100
	пас. Кружок	1,64	0,333	0,0075
	пас. Ляхавец	1,71	0,295	0,0200
	в. Надзвін	1,61	0,273	0,0170
	в. Пракісель	0,97	0,180	
	пас. Рэлькі	1,26	0,290	0,0140
	в. Церабееўка	0,97	0,187	0,0061
БАБІЦКІ	в. Бабічы	1,47	0,389	0,0067
сельсавет	пас. Бабічы	1,45	0,310	0,0056
	в. Галоўкі	2,08	0,585	0,0120
БАРШЧОЎСКІ	в. Абрамаўка	0,94	0,323	
сельсавет	в. Аляксандраўка	1,35	0,280	0,0085
	пас. Бабры	2,10	0,265	0,0071
	в. Баршчоўка	1,23	0,126	0,0120
	в. Борхаў	1,77	0,153	0,0120
	в. Востраў	1,14	0,100	0,0089
	в. Гранаўка	1,49	0,323	0,0130
	в. Дунай	1,35	0,277	0,0084
	в. Заселле	1,12	0,240	0,0060
	в. Капань	1,14	0,364	0,0078
	пас. Кленавіца	1,19	0,162	0,0072
	пас. Ляскі	1,40	0,150	0,0088
	пас. Палессе	1,03	0,155	0,0021
	в. Свідаўка	1,04	0,322	0,0078

Назва сельсавета, гарсавета	Назва нас. пункта	Цэзій-137	Стронцый-90	Плутоній-239, 240
	в. Сітнякі	1,45	0,400	0,0150
	в. Сянная	1,48	0,226	0,0180
	пас. Уборкі	0,75	0,175	0,0051
	пас. Чырвоная Слабада	2,04	0,385	0,0210
	в. Чыжаўка	1,40	0,210	0,0140
	в. Якімаўка	1,50	0,274	0,0140
	ст. Якімаўка	2,25	0,330	
БЕЛАБАЛОЦІНСКІ сельсавет	в. Белае Балота	0,77	0,250	0,0270
	в. Гіроў	0,85	0,363	0,0110
	в. Глушэц	0,70	0,367	0,0049
	в. Пераход	1,17	0,225	0,0083
	в. Пескаполле	1,08	0,380	0,0075
	в. Рэпішча	0,83	0,240	0,0010
	в. Стоўпня-1	0,89	0,268	0,0066
	в. Стоўпня-2	0,86	0,136	0,0000
	в. Хацецкае	0,76	0,212	0,0070
	в. Чорнае	0,79	0,403	0,0110
	в. Чырвоны Кастрычнік	1,04	0,320	0,0180
ВАСІЛЕВІЦКІ гарсавет	г. Васілевічы	1,23	0,319	0,0078
	в. Ведрыч	0,82	0,362	0,0134
	в. Глінная Слабада	2,99	0,985	0,0270
	пас. Закрашынскі Мох	1,22	0,383	0,0090
	в. Зашчоб'е	2,14	0,512	0,0380
	в. Маканавічы	2,49	0,581	0,0100
	в. Рассвет	0,77	0,336	0,0110
ВЫШАМІРСКІ сельсавет	в. Вышамір	4,22	0,390	0,0069
	в. Ганчароўка	2,95	0,456	0,0070
	в. Дзятлаўка	4,66	0,601	0,0068
	в. Духанаўка	4,57	0,648	0,0084
	в. Кузьмінка	2,78	0,205	0,0058
	в. Лецяшын	4,66	0,467	0,0140
	в. Сямёнаўка	4,39	0,365	0,0050
ГЛЫБАЎСКІ сельсавет	в. Берагавая Слабада	0,67	0,300	0,0160
	в. Валадарск	0,76	0,153	0,0050
	в. Гарноўка	0,33	0,143	0,0010
	в. Глыбаў	0,78	0,358	0,0110
	в. Горваль	0,76	0,260	0,0140
	пас. Дабраволец	0,47	0,123	0,0100
	в. Маскалі	0,63	0,190	0,0040
	в. Мілаград	0,67	0,172	0,0080
	в. Падалессе	0,16	0,030	0,0020
	пас. Першае Мая	0,78	0,316	0,0040
	в. Свідэра	0,67	0,340	0,0090
	в. Старына	0,46	0,225	0,0060
	в. Стасеўка	0,51	0,175	0,0046
ДЗЕМЯХОЎСКІ сельсавет	пас. Антопаль	2,21	0,708	0,0080
	в. Будка-Шыбенка	0,79	0,307	0,0210
	в. Дземяхі	1,76	0,541	0,0078
	в. Дзяражня	2,00	0,440	0,0017
	пас. Днепрык	1,34	0,418	0,0094

Назва сельсавета, гарсавета	Назва нас. пункта	Цэзій-137	Стронцый-90	Плутоній-239, -240
	в. Коззе	1,80	0,476	0,0190
	в. Нова-Красная	0,76	0,394	0,0092
	пас. Прудзішча	2,06	0,408	0,0290
	в. Салтанова	1,37	0,396	0,0062
	в. Стара-Краснае	1,47	0,285	0,0047
	в. Чырвоная Кветка	0,69	0,235	0,0057
ДУБРОЎСКІ сельсавет	в. Бушаўка	1,05	0,287	0,0070
	в. Васількоў	0,92	0,365	0,0070
	в. Дуброва	1,20	0,197	0,0180
	в. Елізаравічы	1,28	0,808	0,0100
	в. Заходы	0,87	0,346	0,0110
	пас. Нова-Святое	0,87	0,920	0,0040
	в. Осаў	0,92	0,230	0,0097
	в. Рудзец	1,09	0,201	0,0110
ЖМУРАЎСКІ сельсавет	в. Броннае	2,00	0,386	0,0110
	в. Воўчая Гара	2,11	0,544	0,0215
	пас. Дняпровец	1,75	0,482	0,0020
	в. Жмураўка	1,38	0,149	0,0060
	пас. Іванаўка	1,76	0,653	0,0240
	в. Казазаеўка	1,37	0,190	0,0180
	пас. Кірава	1,59	0,713	0,0040
	в. Красназем'е	2,92	0,303	0,0180
	пас. Прыгараднае	1,39	0,720	0,0130
ЗАСПЕНСКІ сельсавет	в. Адамаўка	1,94	0,355	0,0060
	в. Велін	1,20	0,316	0,0050
	в. Гарошкаў	1,76	0,409	0,0084
	в. Заспа	2,09	0,335	0,0050
	пас. Іванішча	2,34	0,555	0,0160
	в. Левашы	1,24	0,284	0,0084
	пас. Луначарск	1,82	0,324	0,0070
	в. Май	1,75	0,250	0,0120
	в. Сцяпанаўка	2,43	0,444	0,0096
	в. Чырвоны Мост	2,02	0,330	0,0290
КАМСАМОЛЬСКІ сельсавет	пас. Аколіца	0,69	0,300	0,0250
	пас. Акцябр	0,87	0,835	0,0220
	в. Балашаўка	0,97	0,143	0,0038
	пас. Баранаўка	0,79	0,226	0,0030
	в. Гагалі	0,76	0,093	0,0020
	пас. Гарадок	1,02	0,206	0,0030
	пас. Дабужа	0,72	0,173	0,0010
	в. Камсамольск	0,64	0,195	0,0060
	в. Крапіўня	1,36	0,600	0,0085
	в. Першамайск	0,79	0,174	0,0065
	в. Сведскае	0,54	0,500	0,0115
	в. Узнаж	0,78	0,252	0,0110
	в. Чарнейкі	0,84	0,346	0,0070
	в. Шоўкавічы	0,79	0,145	0,0110
КАПАРАЎСКІ сельсавет	в. Багданаўка	2,40	0,258	0,0100
	в. Будка	2,92	0,403	0,0139
	в. Капараўка	3,17	0,248	0,0170
	в. Лазараўка	3,18	0,452	0,0230
	пас. Прудзішча	2,34	0,408	0,0290
КАРАВАЦІЦКІ сельсавет	в. Каравацічы	2,08	0,284	0,0044
	в. Перавалока	2,38	0,877	0,0084
	в. Першамайск	3,97	0,488	

Назва сельсавета, гарсавета	Назва нас. пункта	Цэзій-137	Стронцый-90	Плутоній-239, -240
	в. Цішкаўка	1,95	0,672	0,0200
	в. Чырвоная Дуброва	1,86	0,483	0,0115
ЛІСКАЎСКІ сельсавет	пас. Асавок	2,68	0,575	0,0054
	в. Крынкі	2,99	0,490	0,0057
	в. Ліскі	2,75	0,618	0,0021
	хут. Манькоў	0,95	0,253	0,0110
НОВАБАРСУЦКІ сельсавет	пас. Зара Свабоды	2,69	0,423	0,0070
	в. Лясное	3,25	0,484	0,0130
	в. Маладуша	2,81	0,389	0,0020
	в. Новы Барсук	2,97	0,544	0,0153
	в. Стары Барсук	3,13	0,552	0,0075
	в. Сяргееўка	3,16	0,440	0,0047
ПЕРАСВЯТОЎСКІ сельсавет	пас. Асавец	2,76	0,450	0,0290
	пас. Барэц	2,03	0,816	0,0200
	в. Бугрымаўка	2,12	0,203	0,0076
	в. Гарывада	1,66	0,506	0,0051
	пас. Жары	2,45		
	в. Корастань	1,48	0,260	0,0160
	в. Маўчаны	1,88	0,297	0,0160
	в. Падмосце	1,85	0,433	0,0021
	в. Перасвятое	1,46	0,252	0,0084
	в. Рабуса	1,64	0,212	0,0060
РОВЕНСКА-СЛАБОДСКІ сельсавет	в. Андрэеўка	2,08	0,430	0,0037
	в. Бязуеў	2,32	0,453	0,0090
	в. Бярозаўка	3,15	0,473	
	в. Грудское	2,32	0,451	0,0090
	в. Пасека	2,95	0,448	0,0062
	в. Раманаўка	3,34	0,498	0,0058
	в. Ровенская Слабада	1,97	0,436	0,0100
	в. Роўнае	2,32	0,536	0,0030
	в. Смагарын	2,23	0,445	0,0072
	пас. Стражынскі	2,42	0,890	0,0140
	пас. Храбры	2,61	0,518	0,0042
СВІРЫДАВІЦКІ сельсавет	пас. Арол	1,62	0,334	0,0110
	пас. Бяроза	2,90	0,480	0,0110
	пас. Васток	2,51	0,609	0,0054
	пас. Вішнёўка	2,32	0,895	0,0200
	пас. Волга	5,19	0,805	0,0089
	пас. Востраў	2,60	0,432	0,0220
	пас. Вясёлы	1,36	0,324	0,0076
	пас. Гарадзішча	1,92	0,202	0,0050
	в. Гасцівель	1,96	0,360	0,0096
	пас. Залессе	1,94	0,272	0,0120
	в. Казанаўка	1,53	0,367	0,0106
	пас. Калінін	1,82	0,270	0,0075
	пас. Краснаселле	1,90	0,316	
	пас. Лабкі	1,55	0,230	0,0120
	пас. Падроўнае	1,93	0,458	0,0120
	в. Свірыдавічы	1,44	0,378	0,0043
	пас. Сокал	3,08	0,708	0,0170
	в. Ямпаль	1,61	0,478	0,0004
	в. Яноўка	2,02	0,512	0,0160
ХОЛМЕЦКІ сельсавет	в. Дварэц	0,52	0,263	0,0110
	в. Завужаль	0,66	0,276	0,0070
	в. Калочын	0,84	0,312	0,0040
	в. Холмеч	0,70	0,367	0,0056

Шануем гісторыю

Рэчыцкі краязнаўчы музей

Заснаваны ў 1952. Адкрыты 5.11.1954. Мае 3 экспазіцыйныя залы (плошча экспазіцыі 325 м^2), звыш 15 тысяч экспанатаў асноўнага фонду. Аддзелы: гісторыі дасавецкага перыяду, гісторыі савецкага грамадства, прыроды. У экспазіцыі археалагічная калекцыя з помнікаў мілаградскай культуры, абразкі XII—XVII стст. У этнаграфічнай калекцыі прылады працы і побыту сялян XIX — пачатку XX ст. (кросны, бароны, граблі, косы, вілы, цапы, церніцы, траплы, ступа, дзяжа, бойка, жлукта, ліпаўка, ручнікі-набожнікі, посцілкі і інш.), нацыянальнае адзенне (жаночыя кашулі, аздобленыя вышыўкай, андаракі, фартухі, камізэлька), матэрыялы пра рэвалюцыйны рух у краі, грамадзянскую і Вялікую Айчынную войны, развіццё народнай гаспадаркі і культуры ў пасляваенны час.

І. А. Шафір

Ровенска-Слабодскі гісторыка-мемарыяльны музей «Памяць»

Заснаваны ў снежні 1985 г. па ініцыятыве тагачаснага старшыні калгаса імя Дзяржынскага заслужанага работніка культуры Беларусі Віктара Антонавіча Пырха. Зборам матэрыялаў займаўся настаўнік гісторыі і грамадазнаўства Ровенска-Слабодскай СШ, дырэктар музея Мікалай Рыгоравіч Бур'як. Мастацкае афармленне выканана Сцяпанам Фёдаравічам Вішняком. Выканаўца фотаработ — Мікалай Міхайлавіч Рудэнка. Агульная плошча экспазіцыі 340 м^2. Аддзелы: гісторыя вёскі Ровенская Слабада і калгаса імя Дзяржынскага; ратны і працоўны подзвіг жыхароў Ровенска-Слабодскага сельсавета; злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў на Гомельшчыне і Беларусі; беларуская этнаграфія. У фондах звыш 7 тысяч экспанатаў (асноўнага — 3475, дапаможнага — 3619). Значнае месца ў экспазіцыі музея займаюць фотадакументы, пісьмы землякоў з франтоў Вялікай Айчыннай вайны, архіўныя дакументы па гісторыі в. Ровенская Слабада, Ровенска-Слабодскага сельсавета і калгаса імя Дзяржынскага. Фінансавую падтрымку музею аказваюць Рэчыцкі райвыканкам і калгас імя Дзяржынскага (старшыня Рыгор Іванавіч Авілкін).

Музей рэгулярна наладжвае экскурсіі для школьнікаў Гомеля, Рэчыцы, раёна. Сярод наведвальнікаў музея — дэлегацыі Германіі, Італіі і г. д.

Населеныя пункты, якія не існуюць

АДВЕРНІЦА (АТВЕРНІЦА), вёска. Уваходзіла ў Капанскі с/с. Перастала існаваць у канцы 1950-ых гадоў. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Дунай (Баршчоўскі с/с).

АМЕЛЬКАЎШЧЫНА, хутар. Уваходзіў у Маладушскі с/с. У 1928 г. было 6 жыхароў. Перастаў існаваць у канцы 1930-ых гадоў.

АМЕРЫКА, пасёлак. Уваходзіў ва Унорыцкі с/с. У 1928 г. было 40 жыхароў.

АНІСАЎКА, пасёлак. Уваходзіў у Маладушскі с/с. У 1928 г. было 139 жыхароў.

АСАВОК, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

АСТРОЎСКІ, хутар. Уваходзіў у Перасвятоўскі с/с. У 1928 г. было 5 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

БАРАВОЕ, хутар. Уваходзіў у Маладушскі с/с. У 1928 г. было 19 жыхароў.

БАРАДЗІШЧА, пасёлак. Уваходзіў у Чарнянскі с/с. У 1928 г. было 55 жыхароў. Перастаў існаваць у канцы 1930-ых гадоў.

БАРОК, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. У 1928 г. было 418 жыхароў.

БАРЭЦ, пасёлак. Уваходзіў у Азершчынскі с/с. Ліквідаваны ў 1981 г.

БЕРАЖЫСТАЕ, пасёлак. Уваходзіў у Вышамірскі с/с. Ліквідаваны ў 1983 г.

БЛІШЧЫ, хутар. Уваходзіў у Андрэеўскі с/с. У 1928 г. было 62 жыхары.

БОРСУК, хутар. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с. У 1928 г. было 8 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

БУДЗІШЧА, хутар. Уваходзіў у Кабылеўскі с/с. У 1928 г. было 8 жыхароў.

БУДЗІШЧА, хутар. Уваходзіў у Маладушскі с/с. У 1928 г. было 40 жыхароў.

БУДЗІШЧЫ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 18 жыхароў.

БУДКІ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 17 жыхароў.

БУДНІК, хутар. Уваходзіў у Новабарсуцкі с/с. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

БЯРОЗА, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1939—1940 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Артукі.

ВАЛАСАЧ, хутар. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. было 13 жыхароў. Перастаў існаваць у канцы 1930-ых гадоў.

ВАСІЛЕЎШЧЫНА, хутар. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. было 27 жыхароў. Перастаў існаваць у канцы 1930-ых гадоў.

ВАСХОД, пасёлак. Уваходзіў у Дубраўскі с/с. У 1928 г. было 7 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

ВЕТКА, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1939—1940 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Артукі.

ВОСТРАЎ, хутар. Уваходзіў у Бязуеўскі с/с. У 1928 г. было 28 жыхароў.

ВОСТРАЎ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 18 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ВЫБЕДЗЬ, пасёлак. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. было 19 жыхароў. Перастаў існаваць у канцы 1930-ых гадоў.

ВЯЗВІНСКІ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 18 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ВЯЛІКОДНІШЧА, хутар. Уваходзіў у Андрэеўскі с/с. У 1928 г. было 19 жыхароў.

ВЯРБІЦКАГА, хутар. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с. У 1928 г. было 8 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ВЯСЁЛЫ, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. У 1928 г. было 99 жыхароў.

ВЯСНА, пасёлак. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с. Зняты з уліку 6.4.1981 г. у сувязі з выбыццём насельніцтва.

ГАДЫНІН, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 55 жыхароў. Перастаў існаваць у канцы 1930-ых гадоў.

ГАЙ, пасёлак. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

ГАЛЫ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 7 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

ГАРАДЗЕЦК, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 22 жыхары. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ГАРАДЗІШЧА, пасёлак. Уваходзіў у Баршчоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1956 г.

ГАРАДЗЯНКА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 38 жыхароў.

ГАРАДОК, пасёлак. Уваходзіў у Азершчынскі с/с. Перастаў існаваць у 1962 г.

ГАРАДОК, пасёлак. Уваходзіў у Баршчоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1956 г.

ГАРАДОК, пасёлак. Уваходзіў у Заспенскі с/с. У 1928 г. было 368 жыхароў.

ГАРАДОК, пасёлак. Уваходзіў у Холмецкі с/с. У 1928 г. было 119 жыхароў.

ГАРАХАВОЕ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 19 жыхароў. Перастаў існаваць у канцы 1930-ых гадоў.

ГАРДЫЯНКА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

ГЛЕБУХАЎ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 6 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ГЛЫБОКА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 27 жыхароў.

ГРАБЯНЁЎ (ГРАБЯНЁВА), вёска. Уваходзіла ў Маладушскі с/с. Перастала існаваць у 1976 г.

ГРАДА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было звыш 20 жыхароў. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

ГРУШАЎКА, пасёлак. Уваходзіў у Вышамірскі с/с. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Сямёнаўка.

ДАБРАВОЛЕЦ, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1939—1940 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Артукі.

ДВАРЫЦКАЕ, хутар. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. было 6 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

ДВАРЫЦЫ, хутар. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. было 5 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

ДВАРЭЦКІ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 7 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

ДВОРЫШЧА, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1945—1946 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Краснаполле.

ДВОРЫШЧА, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 8 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

ДУБАВЕЦ, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1939—1940 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Краснаполле.

ДУБАВОЕ, хутар. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. было 7 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

ДУБІНА, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1939—1940 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Артукі.

ДУБОЎСКІЯ, хутары. Уваходзілі ў Андрэеўскі с/с. У 1928 г. былі 163 жыхары.

ДУБРОВА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі гарпассавет. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

ДУБРОВА, пасёлак. Уваходзіў у Вышамірскі с/с.

ДУБРОЎКІ, хутар. Уваходзіў у Кабылеўскі (Першамайскі) с/с. У 1928 г. было 20 жыхароў.

ЕЎНЯ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 47 жыхароў.

ЖНІЛІШЧА, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 28 жыхароў. Перастаў існаваць у канцы 1930-ых гадоў.

ЗАВАРОТНЫ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 7 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

ЗАВОДНАЕ, пасёлак. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с.

ЗАВЯЛЕННЕ, хутар. Уваходзіў у Маладушскі с/с. У 1928 г. было звыш 20 жыхароў.

ЗАКРАШЫН, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 7 жыхароў.

ЗАЛАЎКІ, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1939—1940 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Артукі.

ЗАЛЕССКІ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 6 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

ЗАПЕЧЧА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі гарпассавет. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

ЗАРА, пасёлак. Уваходзіў у Холмецкі с/с. У 1928 г. былі 144 жыхары. Перастаў існаваць у 1939—1940 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Завужаль.

ЗАСКОР'Е, вёска. Уваходзіла ў Вышамірскі с/с. У 1928 г. было 107 жыхароў. Перастала існаваць у канцы 1930-ых гадоў. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Духанаўка. Згодна іншых даных — в. Заскор'е была спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1943 г.

ЗОРКА, пасёлак. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с. Перастаў існаваць у 1989 г.

ЗЯЛЁНЫ МАЙ (ДЗЮРДЗЕЎ), пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1939—1940 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Вятхінь.

ІВАНІШЧА, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1939—1940 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Артукі.

ІГАР, пасёлак. Уваходзіў у Бязуеўскі с/с. У 1928 г. было 56 жыхароў.

ІСКРА, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1939—1940 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Пракісель і Церабееўка.

КАДАНАЎ, хутар. Уваходзіў у Вышамірскі с/с. У 1928 г. было 37 жыхароў.

КАЛАНІН, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 43 жыхары.

КАПАШЫН, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі гарпассавет. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

КАПЦЫ, пасёлак. Уваходзіў у Борхаўскі с/с. Ліквідаваны ў 1980 г. у сувязі з выбыццём насельніцтва.

КІШЫНЕЦ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 5 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

КЛЮЧЭЕЎ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі гарпассавет. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

КЛЯНОЦКІ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 9 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

КОЗЗЕ, хутар. Уваходзіў у Вышамірскі с/с. У 1928 г. былі 3 жыхары. Перастаў існаваць у пачатку 1930-ых гадоў.

КОЛАВА РУКА, пасёлак. Уваходзіў у Маладушскі с/с. У 1928 г. было 95 жыхароў.

КОНЧЭСЬ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 30 жыхароў. Перастаў існаваць у канцы 1930-ых гадоў.

КОРЧ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 29 жыхароў.

КРАПІЎНЯ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. быў 41 жыхар. Перастаў існаваць у канцы 1930-ых гадоў.

КРАСНАГОР'Е, пасёлак. Уваходзіў у

Свірыдавіцкі с/с. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1940-ых гадоў.

КРАСНАЕ ЗНАМЯ, пасёлак. Уваходзіў у Новабарсуцкі с/с. У 1928 г. былі 72 жыхары.

КРАСНЫ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 10 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

КРАСНЫ БАРЭЦ, пасёлак. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с. У 1928 г. было 77 жыхароў.

КРАСНЫЯ АРЛЫ, пасёлак. Уваходзіў у Караваціцкі с/с. У 1928 г. было 29 жыхароў.

КРАСНЫ БОР, пасёлак. Уваходзіў у Заспенскі с/с. Перастаў існаваць у 1962 г.

КРОТАВА ПАЛЯНА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі гарпассавет. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

ЛАНДАРБЕТ, пасёлак. Уваходзіў у Салтаноўскі с/с. У 1928 г. было 35 жыхароў.

ЛАЎСКІ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 6 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

ЛЕТАШ, хутар. Уваходзіў у Кабылеўскі (Першамайскі) с/с. У 1928 г. было 28 жыхароў.

ЛУЖАНКА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 5 жыхароў. Перастаў існаваць у сярэдзіне 1930-ых гадоў.

ЛЫСЕЦ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. у ім было 58 жыхароў.

ЛЯДЫ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. быў 161 жыхар.

ЛЯСНАЯ СТАРОЖКА, хутар. Уваходзіў у Маладушскі с/с. У 1928 г. было 6 жыхароў.

ЛЯСНАЯ СТРАЖА, хутар. Уваходзіў у Азершчынскі с/с. У 1928 г. у ім было 6 жыхароў.

ЛЯСНАЯ СТРАЖА, хутар. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. у ім было 7 жыхароў.

ЛЯСНАЯ СТРАЖА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. былі 4 жыхары.

ЛЯСНАЯ СТРАЖА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 12 жыхароў.

ЛЯСНАЯ СТРАЖА, хутар. Уваходзіў у Капанскі с/с. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ЛЯСНАЯ СТРАЖА, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 11 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ЛЯСОК, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у другой палове 1940-ых гадоў. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Вятхінь.

МЯДЗВЕДКА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 6 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

НАВІНКА, хутар. Уваходзіў у Перасвятоўскі с/с. У 1928 г. было 7 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

НАВІНКІ, хутар. Уваходзіў у Кабалеўскі (Першамайскі) с/с. У 1928 г. быў 21 жыхар.

НЕХАРАНЬ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі гарпассавет. У 1928 г. было 19 жыхароў. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

НЕХАРАНЬ, хутар. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. было 7 жыхароў. Перастаў існаваць у канцы 1930 — пачатку 1940-ых гадоў.

НОВА-АЛЯКСАНДРАЎКА, пасёлак. Уваходзіў у Заспенскі с/с. У 1928 г. было 14 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

НОВЫ ІПАЛІТ (НОВАПАЛІТАЎ), пасёлак. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с. У 1928 г. былі 64 жыхары. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

НОВЫ САД, пасёлак. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. У 1928 г. было 65 жыхароў. Перастаў існаваць у 1939—1940 гг. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Казанаўка (Свірыдавіцкі с/с).

НОВЫ СВЕТ, пасёлак. Уваходзіў у Дземяхоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1987 г.

НОВЫЯ ЖАРЫ, пасёлак. Уваходзіў у Перасвятоўскі с/с. У 1928 г. былі 43 жыхары.

ПАБЯДЗІЦЕЛЬ, пасёлак. Уваходзіў у Капараўскі с/с. У 1928 г. было 11 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ПАГАРЭЛЕЦ, пасёлак. Уваходзіў у Азершчынскі с/с. У 1928 г. былі 92 жыхары. Перастаў існаваць у 1962 г.

ПАГАРЭЛЬЦЫ, пасёлак. Уваходзіў у Чарнянскі с/с. У 1928 г. былі 43 жыхары.

ПАДКАПАННЕ, пасёлак. Уваходзіў у Баршчоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ПАДКОЗЗЕ, хутар. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. было 28 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ПАДНІЎКІ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 8 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ПАЛЯШЫНА, хутар. Уваходзіў у Ба-

біцкі с/с. У 1928 г. былі 4 жыхары. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ПАРНЯ ЖАЛЯЗКОМА, хутар. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. было 12 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ПАРХОМЕНКА, хутар. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с. У 1928 г. было 11 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ПАСУЖ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 27 жыхароў. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

ПАЎКАЗАРМА, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 13 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ПЕТРЫКАЎ, пасёлак. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с. У 1928 г. было 35 жыхароў. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

ПЕРАДЗВІНСКІ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 18 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ПЕЧКІ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі гарпассавет. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

ПРАХОД, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с, а затым гарпассавет. У 1928 г. было 18 жыхароў. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

ПРЫСТАНЬ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 29 жыхароў.

РАГЧАЛАЎ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с, а затым гарпассавет. У 1928 г. было 57 жыхароў. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

РАПЕКА, хутар. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с. У 1928 г. было 12 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

РУБАНІКІ, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с, а затым гарпассавет. У 1928 г. было 5 жыхароў. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

РЫМШАЎКА, пасёлак. Уваходзіў у Дземяхоўскі с/с. Перастаў самастойна існаваць у 1962 г. (быў далучаны да в. Салтанова).

САБІЧАЎ, хутар. Уваходзіў у Падалескі с/с. У 1928 г. былі 83 жыхары. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

САД, пасёлак. Уваходзіў у Ровенска-Слабодскі с/с. У 1928 г. было 55 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

СВАРОБНАЕ, хутар. Уваходзіў у Кабылеўскі (Першамайскі с/с). У 1928 г. было 30 жыхароў.

СЕЛІШЧА-1, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 6 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

СЕЛІШЧА-2, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 6 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

СКРЫВЯЛКА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі гарпассавет. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

СЛАНОЎ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. быў 31 жыхар. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

СМАЛАКУРНЫ ЗАВОД, хутар. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. былі 2 жыхары. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

СТАРАЯ УНЕЧА, хутар. Уваходзіў у Бязуеўскі с/с. У 1928 г. было 13 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

УБОРКІ, хутар. Уваходзіў у Левашоўскі с/с. У 1928 г. было 18 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

УЛАСЮК, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 6 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ХОЛМСКАГА, хутар. Уваходзіў у Капараўскі с/с. У 1928 г. было 6 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ХУТАРЫШЧА, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. было 29 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ЦЯШОЎ, пасёлак. Уваходзіў у Свірыдавіцкі с/с. Перастаў існаваць у пасляваены перыяд.

ЧОРНАЕ, хутар. Уваходзіў у Бабіцкі с/с. У 1928 г. былі 32 жыхары. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ЧОРНАЯ ЗЯМЛЯ, пасёлак. Уваходзіў у Свірыдавіцкі і Заспенскі с/с. У 1928 г. было 69 жыхароў. Ліквідаваны ў 1977.

ШМАТЫ, хутар. Уваходзіў у Чарнянскі с/с. У 1928 г. былі 43 жыхары. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ШЭВАЛГА, хутар. Уваходзіў у Перасвятоўскі с/с. У 1928 г. было 18 жыхароў. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ЮЖНЫ, пасёлак. (ПАЎДНЁВЫ) КОЛАС. Уваходзіў у Артукоўскі с/с. Перастаў існаваць у 1969 г. Жыхары перасяліліся ў асноўным у в. Надзвін.

ЯЗВЫ, хутар. Уваходзіў у Крынкаўскі с/с. У 1928 г. быў 21 жыхар. Перастаў існаваць у 1930-ых гадах.

ЯПРОЎКА, хутар. Уваходзіў у Васілевіцкі с/с. У 1928 г. было 169 жыхароў.

ЯСНАЯ ПАЛЯНА, пасёлак. Уваходзіў у Капараўскі с/с. Перастаў існаваць у пасляваенны перыяд.

Населеныя пункты Рэчыцкага раёна

Горад РЭЧЫЦА
Горад ВАСІЛЕВІЧЫ
Гарпасёлак ЗАРЭЧЧА

АЗЕРШЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Азершчына, Унорыца; пасёлкі Борхаў, Рудня.

АРТУКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Артукі, Вятхінь, Краснаполле, Надзвін, Пракісель, Церабееўка; пасёлкі Барбара, Вазнясенск, Кружок, Ляхавец, Рэлькі.

БАБІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Бабічы, Галоўкі; хутар Бабічы.

БАРШЧОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Аляксандраўка, Абрамаўка, Баршчоўка, Борхаў, Востраў, Гранаўка, Дунай, Заселле, Капань, Свідаўка, Сітнякі, Сянная, Чыжаўка, Якімаўка; пасёлкі Кленавіца, Лясскі, Палессе, Уборкі, Чырвоная Слабада, станцыя Якімаўка; хутар Бабры.

БЕЛАБАЛОЦІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Белае Балота, Гіроў, Глушэц, Пераход, Пескаполле, Рэпішча, Стоўпня-1, Стоўпня-2, Хацецкае, Чорнае, Чырвоны Кастрычнік.

ВАСІЛЕВІЦКІ ГАРСАВЕТ: вёскі Ведрыч, Глінная Слабада, Закрашынскі Мох, Зашчоб'е, Маканавічы, Рассвет.

ВЫШАМІРСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Вышамір, Ганчароўка (Ганчароў Падзел), Дзятлаўка, Духанаўка, Кузьмінка, Лецяшын, Сямёнаўка.

ГЛЫБАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Берагавая Слабада, Валадарск, Гарноўка, Глыбаў, Горваль, Маскалі, Мілаград, Падалессе, Свідэра, Старына, Стасеўка; пасёлак Дабраволец, Першае Мая.

ДЗЕМЯХОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Будка Шыбенка, Дземяхі, Дзяражня, Коззе, Нова-Красная, Салтанова, Стара-Краснае; пасёлкі Антопаль, Днепрык, Прудзішча, Чырвоная Кветка.

ДУБРОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Бушаўка, Васількоў, Осаў, Дуброва, Елізаравічы, Заходы, Нова-Святое, Рудзец.

ЖМУРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Броннае, Воўчая Гара, Дняпровец, Жмураўка, Іванаўка, Казазаеўка, Кірава, Красназем'е, Прыгараднае.

ЗАСПЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Адамаўка, Велін, Гарошкаў, Заспа, Левашы, Луначарск, Май, Сцяпанаўка, Чырвоны Мост; пасёлак Іванішча.

КАМСАМОЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Балашаўка, Гагалі, Камсамольск, Крапіўня, Першамайск, Сведскае, Узнаж, Чарнейкі, Шоўкавічы; пасёлкі Аколіца, Акцябр, Баранаўка, Гарадок, Дабужа.

КАПАРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Багданаўка, Будка, Капараўка, Лазараўка; пасёлак Прудзішча.

КАРАВАЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Каравацічы, Перавалока, Першамайск, Цішкаўка, Чырвоная Дуброва.

ЛІСКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Асавок, Крынкі, Ліскі; хутар Манькоў.

НОВАБАРСУЦКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Лясное, Маладуша, Новы Барсук, Стары Барсук, Сяргееўка; пасёлак Зара Свабоды.

ПЕРАСВЯТОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Асавец, Бугрымаўка, Гарывада, Корасцень, Маўчаны, Падмосце, Перасвятое, Рабуса; пасёлак Барэц.

РОВЕНСКА-СЛАБОДСКІ СЕЛЬСАВЕТ: Андрэеўка, Бязуеў, Бярозаўка, Грудское, Пасека, Раманаўка, Ровенская Слабада, Роўнае, Смагарын; пасёлкі Стражынскі, Храбры.

СВІРЫДАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ: пасёлкі Арол, Гасцівель, Залессе, Казанаўка, Краснаселле, Свірыдавічы, Ямпаль, Яноўка; пасёлкі Бяроза, Васток, Вішнёўка, Волга, Востраў, Вясёлы, Гарадзішча, Калінін, Лабкі, Падроўнае, Сокал.

ХОЛМЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Дварэц, Завужаль, Калочын, Холмеч.

МАТЭРЫЯЛЬНАЯ І ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА РЭЧЫЦКАЙ ЗЯМЛІ

Этнаграфія

Этнаграфія — гістарычная навука, якая даследуе побыт і культуру народаў, іхняе паходжанне (этнагенез), рассяленне, лінгвістычны арэал (вобласць пашырэння), культурна - гістарычныя сувязі і г. д. Асноўны метад — непасрэдныя назіранні. Шырока выкарыстоўваюцца пісьмовыя крыніцы, рэчавыя помнікі, сацыялагічныя даследаванні. Этнаграфія мае цесную сувязь з грамадзянскай гісторыяй, геаграфіяй, антрапалогіяй, мовазнаўствам, фальклярыстыкай, прыродазнаўчымі навукамі.

Этнаграфія Рэчыцкай зямлі — састаўная частка этнаграфіі Беларусі, якая вылучылася ў самастойную навуку ў сярэдзіне XIX ст. Вядома, назапашванне этнаграфічнага матэрыялу мае глыбокія карані — ад часу, калі нашу мясцовасць засялілі першыя людзі. Першыя ж пісьмовыя звесткі пра плямёны, якія жылі на тэрыторыі Беларусі, і, вядома ж, на Рэчыцкай зямлі, знаходзяцца ў летапісах і іншых гістарычных помніках перыяду Кіеўскай Русі.

Паняцце «Рэчыцкае Палессе» мела шырокі ўжытак як у мінулым стагоддзі, так і да нядаўняга мінулага (40-ыя гг.). Асабліва — у працах беларускіх і польскіх вучоных К. Машынскага і Ч. Пяткевіча.

Ужываючы гэты тэрмін, яны мелі на ўвазе не толькі тэрыторыю сучаснага Рэчыцкага раёна, але і Брагінскага, Лоеўскага, Нараўлянскага, Хойніцкага, часткі Калінкавіцкага і Светлагорскага раёнаў. Словам, усю тую мясцовасць, якая і складала Рэчыцкі павет.

На сёння, думаецца, замест тэрміна «Рэчыцкае Палессе» больш удалым з'яўляецца тэрмін «Рэчыцкая зямля». Справа ў тым, што навуковыя даследаванні, названыя вышэй, К. Машынскі і Ч. Пяткевіч праводзілі ў асноўным на мясцовасці, здавён населенай дрыгавічамі (назва паходзіць, па ўсёй верагоднасці, ад слова «дрыгва»). Але ж у Рэчыцкі раён уваходзіць і частка левабярэжжа Дняпра (два сельсаветы — Белабалоцінскі і Баршчоўскі), на якой пасялілася некалі ўсходнеславянская этнічная супольнасць пад назвай р а д з і м і ч ы. У іх жа, у параўнанні з дрыгавічамі, больш шырокае распаўсюджванне мела здабыча жалезнай руды. Па-першае, тэрыторыя радзімічаў была багатай на балотныя руды. Па-другое, яны, як відаць, мелі добрыя навыкі здабычы такой руды. Многія паселішчы радзімічаў маюць назвы, у аснове якіх слова р у д а ці спосаб здабычы яе. Так, напэўна, і з назвай вёскі Капань (Баршчоўскі сельсавет), якая на левым беразе Дняпра, усяго ў некалькіх кіламетрах ад Рэчыцы. Здавён жыхары вёскі знаходзілі ў час апрацоўкі глебы рэшткі балотнай руды, якая некалі пабыла ў агні і пазбаўлена жалеза.

Матэрыяльная культура. Як і паўсюдна, на характар і асаблівасці матэрыяльнай культуры насельнікаў нашай мясцовасці асноўны ўплыў рабілі фізіка-геаграфічныя і прыродна-кліматычныя ўмовы (зона мяшаных лясоў, умерана кантынентальны клімат). Яны патрабавалі цёплага жытла і адзення.

Асноўны занятак — земляробства. Аснова яго — паляводства. Галоўнымі сельскагаспадарчымі культурамі былі збожжавыя: жыта, авёс, ячмень. Прытым жыта давала большую палову ад збору збожжа. Высяваліся таксама пшаніца, грэчка, проса, лён і каноплі. Шырока практыкавалася трохполле. Інакш кажучы, ворная зямля дзялілася на тры палі: азімае, яравое, папар. Такая сістэма землекарыстання асаблі-ва распаўсюдзілася з XVI ст. Але сям-

там захоўваліся і больш прымітыўныя сістэмы апрацоўкі зямлі — лядная, абложная і 2-полле.

З XVIII ст. асноўныя сельскагаспадарчыя культуры нашай мясцовасці пацясняе бульба.

Падсобная галіна земляробства — агародніцтва і садоўніцтва. На жаль, да нядаўняга часу яны былі ў загане. Так, добрыя сады былі хіба што ў панскіх маёнтках. Як ні дзіўна, але каторыя з іх пладаносяць і да сёння (вв. Баршчоўка, Заспа). Вяскоўцы ж у асноўным спадзяваліся на дзікія лясныя яблыні, захоўвалі іхнія плады на гарышчах хат да глыбокай зімы.

Па згадках старажылаў вёскі Баршчоўка, яшчэ да пачатку 20-ых гадоў бягучага стагоддзя асноўную колькасць капусты, морквы, агуркоў, цыбулі, часнаку і фасолі мясцовыя жыхары куплялі на Чарнігаўшчыне ці ў тых украінцаў, што развозілі свой тавар па беларускіх вёсках. Мясцовыя сяляне лічылі менш стратным для сябе купіць агародніну, чым займацца ёю самім. Нярэдка тым жа ўкраінцам прадаваліся лён і каноплі.

Вялізнае значэнне мела жывёлагадоўля. Разводзілі кароў, коней, свіней, авечак, курэй. Меней — гусей і качак. Тыя ж коні і валы выкарыстоўваліся пры апрацоўцы зямлі. Участкі з лёгкай глебай аралі коньмі. На долю ж валоў прыходзіліся палі з цяжкай глебай, а таксама задзярнелай. Нярэдка валы выкарыстоўваліся парамі. Для іх мелася так званая палеская, ці літоўская, саха. На абложных землях дапаможнай прыладай ворыва быў разак. Для акучвання бульбы прымянялася звычайна драўляная сошка.

Збажыну жалі сярпамі. Было што і касілі, прыладкаваўшы на кассё спецыяльнае прыстасаванне, якое як бы «збірала» сцябліны і «клала» акуратна ў пракосы. Збожжавыя сушылі на полі ў бабках, расставіўшы ўкруг адзін да другога снапы і прыкрыўшы зверху растапыраным снапом.

Малацьба вялася цапамі на таках у гумнах. Перад абмалотам збажына падсушвалася ў ёўнях. Нярэдка такая справа, як абмалот, пакідалася на познюю восень ці нават на пачатак зімы.

Зерне ў асноўным малолася з дапамогай ветракоў ці вадзяных млыноў. Было, што і дома — у жорнах. Але такая работа вымагала нямала фізічнае сілы і часу, а галоўнае — была малапрадуктыўнай.

У другой палове XIX ст. набываюць пашырэнне плугі, малатарні, веялкі, сячкарні. Найперш яны з'явіліся ў маёнтках, а потым і ў дварах найбольш заможных вяскоўцаў.

Дапаможным заняткам нашых продкаў былі рыбалоўства, паляванне і бортніцтва. Асабліва шмат прылад выкарыстоўвалася для лоўлі рыбы. Згодна прынцыпу дзеяння яны падзяляліся на невады, сеткі, стаўныя і рухомыя пасткі, кручковыя снасці і ўдарныя прылады. Невады — падвалокі, мутнікі, брэдні. Сеткі — аднасценка, трыгубіца. Сеткавая снасць на драўляным каркасе — крыга. Стаўныя пасткі — буч, венцер, мярэжа, нерат, каробка (кош), скрыпка, паплаў, катцы. Рухомыя пасткі — таптуха, кломля, настаўка, волак, сак, хапун, нярэжка. Кручковыя снасці — вуды, перамёты, «стараженя». Снасці ўдарныя — восці, «дубіны», «чакухі». Нязначнае пашырэнне мелі і так званыя «гукавыя» снасці. Напрыклад, аўтару гэтага артыкула недзе ў пачатку 60-ых гадоў давялося быць сведкам лоўлі рыбы з дапамогай гуку. Рыбак сядзеў у чоўне і час ад часу блёхаў па вадзе прыладай накшталт лыжкі. «Лыжка» давала гук самкі сома, і самы падплывалі да рыбака.

Састаўная частка паўнанатуральнай сялянскай гаспадаркі — дамашнія промыслы і рамёствы. Нашы продкі ткалі на кроснах ільняныя і, радзей, шарсцяныя тканіны. Шырокае распаўсюджанне набылі шыццё адзення і абутку, выраб мэблі і посуду, прыладаў працы і г. д. Сталярства, цяслярства, бондарства, кавальства і ганчарства былі падуладнымі далёка не кожнаму, а як бы

перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Нярэдка майстар меў свой «почырк». Зрубленая ім будыніна ці складзеная печ мела своеасаблівыя адмеціны. Тую ж печ іншы майстра мог разабраць, каб паглядзець, як яна рабілася, але, скарыстаўшы чужы «сакрэт», рэдка мог дасягнуць таго, што ўдавалася чалавеку, у каторага жадаў падвучыцца. Разам з тым жаданне падвучыцца цішком лічылася за грэх.

Было, што скупому гаспадару майстар закладваў у зруб ці печ «сакрэт», які прымушаў сцяну скрыпець ці пастарэчы стагнаць, а печ пры моцным ветры на двары выць па-воўчы.

На Рэчыцкай зямлі, як і паўсюдна на Беларусі, паселішчы ўяўлялі ў асноўным вёскі і хутары. Характэрная вулічная планіроўка — лінейная, а дзе мясцовасць узгоркавая — скучаная. Вуліцы ў асноўным — двухрадныя. Асноўная будыніна сялянскай сядзібы — хата. Гаспадарчыя пабудовы — хлеў, клець, склеп, ёўня, гумно, стобка (выстобка).

Хаты зрубныя, пастаўленыя на дубовыя штандары ці камяні. Падлога найчасцей драўляная ці толькі зрэдку дзе земляная або з гліны. Страха звычайна саламяная ці з чароту, двухсхільная. У хатах абавязкова закладвалася столь. Зрэдку хата ўпрыгожвалася разьбяной ліштвой, шаляваннем франтона. У сярэдзіне хаты — стол, лавы, услон, палаці (палок), куфар. Печ — у куце пры ўваходзе ў хату з сенцаў.

Каторыя буйныя населеныя пункты называліся мястэчкамі. Імі, як правіла, былі паселішчы, што мелі зручнае месцапалажэнне — ля ракі, на бойкім шляху, як бы ў цэнтры пэўнай колькасці вёсак. У Рэчыцкім павеце буйнейшымі мястэчкамі з'яўляліся Брагін, Камарын, Лоеў, Нароўля, Хойнікі. Усе яны, апроч Камарына, з'яўляюцца зараз цэнтрамі раёнаў. У межах жа сучаснага Рэчыцкага раёна статус мястэчак мелі Васілевічы, Горваль і Холмеч. Менавіта ў мястэчках праводзіліся шматлюдныя і багатыя кірмашы. У Холмеч, напрыклад, для продажу сплаўляліся па Дняпры нават будыніны. Пры гэтым часткі зруба рупіліся прыгнаць на кірмаш як мага хутчэй, каб дрэва, што пабыло ў вадзе, не «пакруцілася».

Мястэчка мела некалькі вуліц. А там, дзе яны як бы сыходзіліся, і адбываліся найчасцей кірмашы.

Характэрная асаблівасць мястэчак — значная колькасць яўрэйскага насельніцтва. Разам з тым у мястэчку жылі і найбольш славутыя майстры. Па-першае, ім не было патрэбы цягнуцца ў далёкую дарогу са сваім таварам. Па-другое, большая колькасць людзей магла зрабіць ім заказ і г. д.

Традыцыйнае адзенне нашых продкаў мела агульныя ўсходнеславянскія элементы. Асноўны матэрыял — палатно. З яго шылі для мужчын кашулі, нагавіцы, камізэлькі, паясы. Для жанчын — кашулі, спадніцы, безрукаўкі, фартухі. Мужчынскія кашулі і паясы, а таксама жаночае адзенне нярэдка вышываліся ці ўпрыгожваліся стужкамі, зборкамі і г. д. Адзенне ў асноўным было белым, у сваім натуральным выглядзе. Але часам яно і фарбавалася — дубовай карой, карой з каліны ці вольхі.

У халодны час надзяваліся суконныя світы і кажухі з аўчыны.

Найбольш пашыраны сялянскі абутак — лапці (пасталы). Больш заможныя мелі чаравікі ці боты.

Узімку многія абуваліся ў валёнкі. Прытым валёнкі, выкарабленыя, скажам, у Камарыне, чалавек са спрактыкаваным вокам лёгка адрозніваў ад тых валёнкаў, якія рупіліся прадаць горвальскія майстры.

Разнастайнасць назіралася ў галаўных уборах. Мужчыны насілі саламяныя і суконныя брылі, валеныя магеркі, палатняныя ці суконныя картузы, зімой — футравыя аблавухі. Галаўныя ўборы жанчын — наміткі, каптуры, хусткі; дзяўчат — хусткі і скіндачкі з абручыкамі.

Вядома, адзенне местачковай і рэ-

чыцкай «арыстакратыі» рознілася ад таго, што насіў просты люд. На выраб яго ішло не палатно, а найчасцей аксаміт, шоўк, парча. Заможныя ўпрыгожвалі сваю апранатку залатой і сярэбранай вышыўкай, футрам, каштоўнымі камянямі. З канца ж XVIII ст. гарнітур арыстакратаў паступова пачаў набліжацца да касцюма гараджаніна.

Характар земляробства (у асноўным збожжавае) абумовіў і характар ежы. На стале вяскоўцаў меліся хлеб, блінцы, аладкі, праснакі. У такія дні яны былі ў асноўным з жытняе ці ячменнае мукі, у святочныя — з грэчкі (блінцы, аладкі). Шырокі ўжытак мелі заціркa, поліўкі, саладуха, жур, кулага, узвар. Шмат страў рыхтаваліся з бульбы і агародніны. Дранікі, бабку, тоўчанку і іншыя стравы з бульбы на святы дапаўнялі верашчака, каўбасы, халоднае, рыба смажаная і рыбная юшка.

Традыцыйныя напіткі — сыта, медавуха, бярозавік, кляновік, ягадныя квасы.

Запас харчовых прадуктаў захоўваўся ў асноўным у ганчарных і бандарных вырабах, у посудзе, што быў выразаны ці выдзеўбаны з дрэва. Нашы продкі ўмелі круглы год захоўваць не толькі агародніну, але і сала, мяса, каўбасу, яйкі, сыр. Апошні, напрыклад, заліваліся маслам ці топленым салам. Лічылася, што на доўгае захоўванне прадукты варта закладваць толькі ў спрыяльныя для гэтага дні, пры пэўным стане месяца (месячыка), у пэўны час сутак. Каб прадукты захоўваліся, чыталіся малітвы, замовы.

Духоўная культура. Асаблівае месца займалі ў ёй каляндарныя і сямейныя абрады. Шмат у іх было ад язычніцтва. Як лічыцца, менавіта беларусы найбольш шырока скарыстоўвалі і паўней захавалі элементы язычніцтва, чым іншыя ўсходнія славяне — рускія і ўкраінцы.

Гадавы цыкл каляндарных абрадаў пачынаўся калядамі з абавязковай і традыцыйнай абрадавай вячэрай (куццёй). Найчасцей куццю нёс на покуць гаспадар. Але нярэдка гэта дазвалялася рабіць хвораму, якому зычылі пазбаўлення ад хваробы. Калі ж куццю несла дзіця, то яму раілі сакатаць (каб куры неслі шмат яечак), бэкаць (каб добра пладзіліся авечкі) і г. д. Вялікім няшчасцем лічылася тое, што куццю па нейкай прычыне да покуці не данеслі. Скажам, разбілі. У гэтым разе чарапкі ад посуду, у якім была куцця, павінны былі захоўвацца ажно да паскі (Вялікадня).

Калядаванне і шчадраванне — старажытныя і паэтычныя абрады. Тое ж самае можна сказаць і пра гуканне вясны, Юр'я, Вялікдзень, Радаўніцу, Купалле, Дзяды. Тая ж Радаўніца мае свой заўсёдна адметны дзень — аўторак на другім тыдні ад Вялікадня. У гэтае свята людзі ішлі на могілкі, каб пасядзець ля магіл сваіх родных і блізкіх. Лічылася, што памерлыя радыя іхняму прыходу і будуць спрыяць да наступнай Радаўніцы ў гаспадарчых справах. На магілы ставіўся кілішак з пітвом, крышылася паска, закопвалася свянцонае яйка. Гэта, меркавалася, спажывуць памерлыя. Але ў каторых вёсках абавязковым лічылася наведванне могілак не на Радаўніцу, а перад Вялікаднём.

Пераважная большасць нашых продкаў — хрысціяне. Разам з тым яны верылі і ў язычніцкіх багоў і божышчаў, галоўным з якіх лічылі Перуна. Верылі ў духаў злых і добрых. Духамі прыроды лічыліся лясун, вадзянік, палявік, жыцень, русалка; хатнімі — дамавік, хлеўнік, ёўнік; злымі — чорт, злыдні, мара, цётухна. Меркавалася, што і добрыя духі могуць нарабіць нямала шкоды, калі іх не задобрываць. Напрыклад, у ёўні трэба было хоць колькі, ды пакідаць збожжа, каб ёўнік меў нешта з'есці.

Найбольш багаты сямейны абрад — вяселле. Ён уключаў у сябе сватанне, агледзіны, заручыны, суборную суботу, выпечку караваю, само вяселле з шэрагам абавязковых рытуалаў, пярэзвы.

Нямала магічных дзеянняў дапасоў-

валіся радзін. Тое ж самае і ў дачыненні да абраду пахавальнага. Па-першае, памёршага трэба было з пэўнымі рытуальна-магічнымі дзеяннямі выправіць «дамоў». Па-другое, належала адзначыць памінальныя дні — траціны, шасціны, дзевяціны, сарачыны, паўгодкі і ўгодкі.

У багацце духоўнай культуры Рэчыцкай зямлі ўваходзяць і мноства фальклорных жанраў: казкі, паданні, замовы, прыказкі, прымаўкі, выслоўі і г. д. Сёе-тое з запісанага ў свой час у Рэчыцкім павеце і раёне — у гэтай кніжцы.

* * *

Вядома, няма магчымасці ў рамках аднаго, прытым абмежаванага, артыкула даць поўны малюнак этнаграфіі Рэчыцкай зямлі. Таму не лішне нагадаць, што цікаўны чытач шмат карыснага, звязанага з матэрыяльнай і духоўнай культурай нашых продкаў, можа здабыць для сябе, калі разгорне работы такіх знаўцаў нашага краю, як згаданыя на пачатку артыкула беларускія і польскія вучоныя К. Машынскі і Ч. Пяткевіч. Сапраўднай гордасцю беларускай навукі з'яўляецца і наш зямляк, рэчычанін Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі, які ўвабраў у сябе рэдкі талент гісторыка, этнографа, фалькларыста.

Радуе, што ўсё тое, каторае складае духоўнасць народа, у Рэчыцы і раёне не адышло ў нябыт. Яно жыве ў народных вераваннях і святах, у нашых абрадах. А калі захаваем мінулае, то будзем мець і будучыню. Насуперак матэрыяльным цяжкасцям, таму радыеактыўнаму чарнобыльскаму попелу, што добра-ткі пратрусіўся і над нашым краем.

П. Рабянок

З навукова-творчай спадчыны М. В. Доўнар-Запольскага

Нататкі па беларускай этнаграфіі

Веснавыя песні пачынаюць спяваць недзе ў сярэдзіне сакавіка і канчаюць на Тройцу, так званую Сёмуху. Спяваюць толькі жанчыны ў час працы...

Велікодныя песні. Хадзіць з велікоднымі песнямі прынята цяпер не ўсюды, звычаі мінулых часоў адыходзяць. У Мінскім павеце такое яшчэ практыкуецца, г. зн. ходзяць па-валачобнаму, ад чаго і назва «валачобнікі». У Слуцкім павеце іх звычайна называюць кукольнікамі, але абедзьве гэтыя назвы пашыраны і ў іншых кутках губерні. Валачобнікі спачатку спяваюць духоўныя песні, звычайна польскія канты, потым спяваюць песні гаспадару, гаспадыні, дзеткам. Па словах сялян, папярэднія пакаленні вельмі шанавалі валачобнікаў, сям'я гадзінамі слухала іх песні і плаціла вялікія грошы, а цяпер калі дзе і спяваюць, дык толькі пад вокнамі, плацяць мала. Валачобнікамі бываюць мужчыны і жанчыны. Усё або частку свайго заробку яны аддавалі на царкву. Па ўспамінах, валачобнікамі раней маглі быць не ўсе, а толькі тыя ў прыходзе, хто найбольш клапаціўся аб узбагачэнні царквы. Занятак лічыўся ганаровым. Мяркуючы па ўсім, валачобнікі складалі вузкае кола, таварыства, брацтва; іх песні, самыя, відаць, цікавыя, — сакрэт для этнографаў. Старыя расказваюць пра гэтыя брацтвы з неахвотай, маладыя нічога не ведаюць. Адны хваляць іх за падтрымку цэркваў, другія гавораць, што грошы ішлі на гарэлку. Гэта пытанне вельмі цікавае і загадкавае.

Св. Юрый. ...На Юр'я мужчыны з жанчынамі, хлопцы з дзяўчатамі ідуць на засеянае азімым хлебам поле з гарэлкаю і закускаю. На выбраным месцы закопваюць прынесеныя велікодныя косці і тут жа з песнямі пачынаюць піць гарэлку і закусваць. Гэта свята называецца Расою. Пасля выпіўкі забіраюць рэшткі, ідуць да карчмы і працягваюць гуляць да позняй ночы. Хлопцы і дзяўчаты танцуюць.

Ёсць павер'е, што, хто на Юр'я выйдзе рана ў поле, той убачыць святога на белым кані, які едзе па полі. Калі ж хто на Юр'я выганіць рана жывёлу ў поле і паспее папасвіць да ўзыходу сонца на маладым жыце, той усё лета не будзе скардзіцца, што не хапае малака.

Вясною ў маі або ў пачатку чэрвеня — час дакладна не адзначаецца — пад вечар, «як толькі пачне сутыняцца», збіраюцца жанчыны і дзяўчаты ў адну якую-небудзь хату. Збіраюцца толькі тыя жанчыны, якія «не дараслі гадоў ці перараслі», г. зн. падлеткі-дзяўчаты і сталыя жанчыны. Кожная з іх нясе з сабою прасніцу, верацяно і касмык кудзелі. Сабраўшыся ў хату, яны адразу ўключаюцца ў працу, папярэдне перахрысціўшыся. Адны з іх, пераважна дзяўчаты, спяшаюцца прасці, другія стараюцца хутчэй снаваць. Аснову кладуць на своеасаблівыя драўляныя грабяні і, калі ўсё падрыхтавана, уносяць неразабраныя кросны. Усе спяшаюцца як найхутчэй іх наладзіць і ткаць. У гэты час спяваюць прызначаныя для гэтага моманту песні. ...Пачынаецца самая спешная праца. Усе стараюцца, каб да світанку выткаць палатно, па даўжыні роўнае шырыні вуліцы. Як толькі палатно выткана, усе разбягаюцца па хатах, каб паведаміць сваім родным (блізкім) і суседзям. Справа ў тым, што ведаюць аб гэтым палатне толькі ўдзельнікі і яшчэ, магчыма, некалькі чалавек; для большасці ж усё гэта невядома. Ад таямнічасці нібы залежала дзейнасць гэтага сродку.

Жанчыны і мужчыны, хто як паспеў, схопліваюцца і бягуць на вуліцу, гонячы перад сабою жывёлу. Некалькі старых жанчын у гэты час выносяць палатно на канец вёскі і рассцілаюць яго ўпоперак вуліцы. Уся жывёла вёскі павінна прайсці праз гэтае палатно. Жанчыны, якія разаслалі яго, увесь час назіраюць, каб ніводная жанчына не пераступіла праз яго, таму што гэта строга забаронена. Звычайна чакаюць, каб абавязкова ўся жывёла вёскі прайшла гэты пераход, па вераваннях сялян, вельмі карысны для здароўя жывёлы, і грэх было б перашкодзіць каму ці не паведаміць аб перагоне. Пераганяюць толькі рагатую жывёлу. Усю яе затым зганяюць у гурт, жанчыны акружаюць яе; прыносяць палатно і недапрадзеныя рэшткі кудзелі і ўсё гэта спальваюць. Увесь абрад трэба каб быў выкананы абавязкова да ўзыходу сонца.

Купала. Дзень гэты лічыцца свяшчэнным, поўным таямнічасці. Вера ў цвіценне папараці і сустрэчу са скарбам вельмі моцная. Скарб трапляецца ў выглядзе якога-небудзь страшыдлы; трэба толькі не спалохацца і змагчы ўзяць яго. Ведзьмы і ўсялякія «нячыстыя духі» робяць свае справы ў гэту ноч. Ведзьмы на гэты дзень усяляюцца ў жаб, і таму ўсе стараюцца як найбольш забіваць гэтых істот у гэты дзень. Асаблівую шкоду наносяць ведзьмы малаку. Каб прадухіліць яго крадзёж або псаванне, утыкаюць у дзверы дамоў і вароты хлявоў крапіву, зялёныя бярозавыя галінкі і спецыяльную траву пад назвай «купала». Святкаванне Купалы каля агню вечарам адыходзіць, але гадоў дзесяць — пятнаццаць яно было паўсюдным, не выключаючы і гарадоў. Хлопцы і дзяўчаты запасаюцца гарэлкай і закускай і выходзяць на перакрыжаванне дарог. Тут раскладаюць вялікі агонь з асінавых дроў (асіна — дрэва нешчаслівае, на ім павесіўся Юда-здраднік). У кацялку ставяць на агонь варыцца цадзілку, праз якую працэджваюць малако. Уся кампанія садзіцца навокал вартаваць ведзьму, таму што яна абавязкова захоча ўкрасці цадзілку. Ведзьма прыходзіць або ў сваім выглядзе, або ў выглядзе жывёлы — сабакі, кошкі. Ведзьме, якая прыйшла красці цадзілку, адсякаюць пальцы на руках. Вядома некалькі выпадкаў знявечання ні ў чым не павінных жанчын. Вартаванне заканчваецца выпіўкай, закускай, скаканнем праз агонь...

На Купалу сонца «купаецца», а на Івана «сушыцца». Гэта бачыць могуць толькі шчаслівыя людзі перад узыходам сонца.

Зажынкі і дажынкі пачынаюцца, паводле народных уяўленняў, у шчаслівыя дні: панядзелак, аўторак, чацвер і суботу. Зажынаючы жыта, сялянка першую жменю зжатых каласоў кладзе ўбок, асобна, і вечарам прыносіць дамоў. У ранейшыя часы разам з гэтым жытам прыносіўся яшчэ і вянок з каласоў і палявых кветак; цяпер гэты звычай знік. Гаспадар дома, памаліўшыся перад абразамі з запаленаю свечкаю, пасля вячэры ўрачыста кладзе прынесены пучок жыта за ікону. Шостага або пятнацатага жніўня яго асвячаюць у царкве. Асвячонае жыта селянін потым змешвае з насенным зернем для будучага ўраджаю.

Дажынкі ў апошні час адыходзяць. Асобныя сяляне рэдка гуляюць дажынкі. Толькі гуртавыя, талочныя дажынкі спраўляюцца: плятуць з жыта і кветак вянок, нясуць з песнямі дамоў, адбываецца частаванне...

Зажынкі і дажынкі спраўляюцца толькі пры жніве жыта.

Гульня «Яшчар». ...На лаўцы, пастаўленай пасярод хаты, садзіцца хлопец — Яшчар. Вакол яго становяцца дзяўчаты, узяўшыся

за рукі. Яны пачынаюць кружыцца і прыпяваюць:

Сядзі, сядзі, — гэй, наш, наш!
На залатым крэслі, — гэй, наш, наш!
Вазьмі сабе панну, — гэй, наш, наш!
Каторую любіш, — гэй, наш, наш!

Затым сам Яшчар (яго падтрымлівае ўвесь хор) адказвае:

Ой, люблю Каську, — гэй, наш, наш!
Што ў русай касіцы, — гэй, наш, наш!
У залатой прасціцы, — гэй, наш, наш!
У шаўковым паясочку, — гэй, наш, наш!
У руцвяным вяночку, — гэй, наш, наш!

Названая дзяўчына падыходзіць да хлопца і аддае яму што-небудзь са сваіх рэчаў. Хлопец саступае месца наступнаму, той ізноў робіць выбар і г. д., пакуль усе не выберуць сабе пару.

Пасля заканчэння выбару хлопец, які быў першым Яшчарам, садзіцца каля сцяны. Дзяўчаты становяцца ў рад каля супрацьлеглай сцяны і, узяўшыся за рукі, ідуць да Яшчара з песняй:

Ой, Яшчару, паночку,
Прашу аддаць вяночку
Краснай Марысьцы,
Што ў русай касіцы,
У залаценькай прасніцы,
У шаўковым паясочку,
Да ў руцвяным вяночку.
Да яна ночаньку не спала,
Да вяночак завівала,
Па край моры хадзіла,
Да красачкі збірала,
Да ў садочку саджала,
Прыгаршчмі палівала:
— Расціце, красачкі, тонкія высокі,
На лісцейка шырокі,
На карэння глыбокі.

Яшчар пасля заканчэння песні аддае тую рэч, што браў, яе ўладальніцы і саступае месца наступнаму і г. д., пакуль хлопцы не вернуць усе ўзятыя рэчы.

У Мазырскім і Рэчыцкім паветах гэта гульня амаль нічым не адрозніваецца.

Танец «Падушачка». Дзяўчаты становяцца ў круг, адна ўваходзіць у яго і спявае:

Падушачка, падушачка, мая пухавая!
Малодачка, малодачка, мая маладая!
Каго люблю, каго люблю, таго й пацалую,
Падушачку пухавую таму й падарую!
Быў-жыў, да няма, да паехаў да лігіна,
Бедна мая галованька — адна спаці легла!
Быў-жыў, да няма, да паехаў на рэчку,
Каб ведала, што ўтапіўся, паставіла б свечку.
Ой, жаль жа мне, што не вернецца,
Падушачка пухавая перавернецца!

Астатнія падцягваюць (падпяваюць) і плаўна танцуюць кругавую, то раскалыхваючыся верхняю часткаю тулава, то прытупваючы на месцы. Пасля заканчэння песні дзяўчына, якая спявала, бярэ адну з дзяўчат, астатнія разбіраюцца таксама парамі і пачынаюць танцаваць «Круцёлку». Потым дзяўчына, што танцавала з запявалаю, уваходзіць у кола — і зноў паўтараецца тая ж гульня.

Гульня вядома па ўсёй Беларусі. Народная музыка захоўвае спецыяльныя матывы для гэтай гульні, якія таксама называюцца «Падушачкаю». Рухі танцуючых спачатку мерныя і плаўныя, але, пераходзячы на «Круцёлку», танец становіцца бурным. Наогул увесь танец у пэўным сэнсе мае характар оргіястычны і, відаць, блізкі да гульні «Падушачка» на Дану.

«Калодачка». Пасярод хаты ставяць калодку або засланку (дошку, якою засланяюць печ). На яе садзіцца дзяўчына, астатнія стаяць вакол яе і спяваюць:

На гары мак, мак,
А ў падолі так, так!
Бедная мая галовачка,
Залатая макавачка!
Ці паспеў мак?

Дзяўчына, што сядзіць на дошцы-калодачцы, калі праспяваюць песню першы раз, гаворыць: «пасеяла!», другі раз праспяваюць — гаворыць: «узышоў!», трэці раз — «цвіце!», чацвёрты раз — «паспеў!». Як скажа: «паспеў!» — усе кідаюцца да яе і пачынаюць шчыпаць.

Вячоркі, гульні, погляды на цнатлівасць дзяўчат. Умовы сялянскага жыцця не вельмі перашкаджаюць знаёмству і сустрэчам хлопцаў і дзяўчат. Перш за ўсё яны сустракаюцца на вясковых святах, пры выкананні купальскіх, троіцкіх і іншых абрадаў, у час летніх карагодаў, гульняў; зімою — на вячорках.

У вялікія святы, калі збіраецца ўся моладзь з навакольля або ўсёй вёскі, арганізоўваюць танцы, карагоды з песнямі. Карагодных летніх песень вельмі шмат, і змест іх разнастайны.

Зімовыя зборы моладзі некалькі адрозніваюцца. Яны перш за ўсё падзяляюцца на ігрышчы і вячоркі; апошнія адпавядаюць велікарускім «посиделкам» і маларускім «вечарніцам».

Ігрышчы — гэта вялікія зборы мола-

дзі, якія бываюць звычайна ў вялікія святы, на Каляды, Масленіцу і інш. На ігрышчы запрашаюць музыку са скрыпкай або гармонікам, а часам і яшчэ аднаго з бубнам. Грошы за музыку, як і на ўсе іншыя расходы, даюць (збіраюць) хлопцы. Месцам для збору служыць хата якога-небудзь гаспадара або (у апошні час найчасцей) карчма. У вёсках, куды яшчэ не пранікла «цывілізацыя», танцуюць «Лявоніху», «Бычка», «Падушачку» і інш., а ў прыгарадных сёлах сустрэнеце і «Каедрэля», і «Вальца». Хлопцы частуюць паміж танцамі дзяўчат мядком, цукеркамі, а па закуцці (у кутках) і шчыпкамі. Сюды ж збіраюцца і старэйшыя: паглядзець, пабалакаць. У вугле дзеці і падлеткі пераймаюць дарослых: танцуюць, частуюць адзін аднаго і інш.

Зусім іншы характар маюць вячоркі. У пачатку зімы, дакладней восенню, дзяўчаты дамаўляюцца з якім-небудзь гаспадаром аб дазволе ім збірацца ў яго. Выбіраюць хату чым большую, а гаспадара як найпамяркоўнейшага, каб не перашкаджаў моладзі. Платы за хату ні гаспадар, ні гаспадыня не бяруць, але за гэта пры ўсякім выпадку моладзь частуе іх. Часам, калі не знаходзяць пастаяннай хаты, пераходзяць кожны вечар ад гаспадара да гаспадара.

Вёсачкі ў Беларусі невялікія, і таму для гульні заўсёды хапае адной хаты. Калі цесна або не паладзяць, падзяляюцца на «куткі» і атрымліваецца некалькі як бы клубаў.

Вечар пачынаецца вельмі паважна. Дзяўчаты прыходзяць з кужалем і прадуць, паціху спяваючы. Часам бабуля расказвае ім казкі. Але вось гуртам увальваюцца хлопцы. Пачынаюцца жарты, размовы і да т. п. Хлопцы падсаджваюцца да дзяўчат, не абыходзіцца без абдымкаў, пацалункаў, шчыпкоў. Наогул вядомая вольнасць у адносінах на вячорках не толькі дазваляецца, але нават патрабуецца звычаем, і дзяўчыну могуць выключыць з вячорак, калі праз меру сур'ёзна супраціўляецца звычайным жартам. Зрэшты, не трэба думаць, што жарты гэтыя і вольнасць заходзяць вельмі далёка або становяцца не зусім прыстойнымі. Адзін з мясцовых назіральнікаў — Ермаковіч — паведаміў з Мінскага павета факты, якія, зрэшты, нам даводзілася назіраць і ў Рэчыцкім, і ў Мазырскім паветах. На вячорках не існуе розніцы паміж багатым і бедным хлопцам, прыгожым і брыдкім. Усе аднолькава роўныя. Самы бедны і самы непрыгожы можа падсесці каля прыгожай і багатай дзяўчыны, жартаваць з ёю незалежна ад таго, падабаецца ён ці не. На вячорках падсаджваюцца да дзяўчат і жартуюць з імі не толькі хлопцы, з якімі яны «кахаюцца», але хто каму трапляецца. Дзяўчына не павінна зневажаць хлопца аплявухай, грубым словам і інш., яна не можа таксама забараніць хлопцу сесці каля яе.

Кепскіх вынікаў на вячорках не бывае. Сяляне глядзяць на наведванне іх дзецьмі вячорак як на абрад, устаноўлены дзядамі і таму неабходны. Седзячы вечарам у сялянскай хаце, можна заўважыць, як адразу пасля вячэры і нават да вячэры маці дасць дачцэ ў рукі кудзелю, кавалак хлеба і сала і адправіць на вячоркі. Хаджэнне дзяўчыны на вячоркі лічыцца адным са звычаёвых патрабаванняў, такім строгім, што парушыць яго асмельваюцца толькі ў прыгарадных вёсках. Маці будзе моцна засмучана, калі яе дачка не захоча наведваць вячорак.

Нашы вячоркі, як вялікарускія «посиделки», бяседы, маларускія «вечарніцы», у сваім абрадавым значэнні ёсць водгаласак і перажыванні гэтага першабытнага гетэрызму. Пасля таго, што сказала навука па гэтым пытанні, наўрад ці можа быць сумненне ў этналагічным значэнні і беларускіх вячорак.

У практычным паўсядзённым жыцці вячоркі маюць не менш важнае значэнне. Блізкія адносіны маладых людзей абодвух полаў перашкаджалі развіццю погляду на жанчыну як на істоту ніжэйшую, падпарадкаваную мужчыне. На вячорках і ігрышчах яны не толькі роўныя, але дзяўчатам аддаецца перавага ва ўсіх адносінах. Хлопец адносіцца да дзяўчыны як да роўні; пасля жаніцьбы ён захоўвае гэтыя адносіны і да сваёй жонкі. На самай справе жанчына ў беларускай сям'і займае вельмі высокае становішча.

Але няправільна было б лічыць, што збліжэнне маладых людзей абодвух полаў заўсёды вядзе да іх шлюбу. У апошні час, вядома, парадкі змяняюцца: хлопец патрабуе, каб бацькі слалі сватоў да той дзяўчыны, з якою ён «кахаецца». У малой сям'і, дзе кожны работнік вельмі дарагі, дзе пачуцці бацькоў да дзяцей маюць большую прастору ў сваім развіцці, маладыя людзі дасягаюць сваёй мэты. Але ў вялікіх сем'ях, дзе агульны парадак вышэй пачуццяў, дзе

падпарадкаванне асобнага сем'яніна гаспадару мацней, — там яшчэ і цяпер хлопца жэняць, а дзяўчыну аддаюць замуж, мала звяртаючы ўвагі на іх жаданні. Абрадавае значэнне вячорак дзейнічае і ў гэтым выпадку: у больш глухіх сёлах, дзе захавалася яшчэ многа вялікіх сямей, сямейных абшчын, вячоркі, як і ўсе абрады, строга выконваюцца. Але менавіта ж тут шлюб поўнасцю залежыць ад старэйшых членаў сям'і. Наадварот, у прыгарадных вёсках, дзе ўзніклі ўжо новыя ўмовы жыцця, дзе вячоркі страцілі абрадавае значэнне, тут увесь шлюб адбываецца па жаданні маладых людзей.

Живая старина. СПб: 1893. Вып. 2. С. 283—296; *Довнар-Запольский М.* Заметки по белорусской этнографии (Са скарачэннямі).

Пер. з рус. В. І. Скідана

Легенды і паданні

Адкуль зямля пайшла

Святая зямелька корміць нас і ўсякага звера; носіць на сваіх плячах, ніколі не наракаючы, не стогнучы, а як Бог пашле смерць, то яна прыгорне і не гідзіцца, калі нас чэрві точаць.

Маці-зямля ўсё прымае, а найбольш усякае нечысці, да шчэ і дзякуе за ета, а калі хочаш ведаць, як яна дзякуе, то навязі гною да й пасей жыта, дак і будзеш знаць. Нашы дзяды і бацькі не дарма казалі: тым, што зямля родзіць, падзяліся з ёю, нацца, еш сам хлеб, а салому аддай роднай зямельцы...

Няма нікога і нічога багачэй за зямлю: сколькі яна родзіць хлеба, сколькі дае жалеза да ўсяго іншага? З яе капаюць усякую гліну на печы, на гаршкі да на пабелку, а мала ж то ўсюды закопана грошай? Хто ж, урэшце, дае чыстую, здаровую ваду? Дае святая маці-зямля...

Адкуль сяляне і паны

Бог вылепіў пана з пшанічнага цеста, а мужыка з гліны, да, паклаўшы, штоб сохлі, пашоў абедаць, а пад той час, дзе ён узяўся, прышоў сабака, просты мужыцкі падворотнік, панюхаў мужыка... шкрабануў усімі лапамі, ды, дабраўшыся да пана, чыста яго з'еў. Толькі стаў аблізвацца, калі вось прыходзіць Бог, ды як пабачыць, што зрабілася, то, ухапіўшы сабаку за хвост, давай трусіць, а з сабакі сыплюцца паны і бягуць куды від, а дзе каторы астановіцца, так Бог яго і называе. Астанавіўся пад бярозаю — пан Беразоўскі, пад дубам — пан Дубінскі, пад ольхаю — пан Альховіч, пад гарою — пан Падгурскі, а як каторы ачнуўся за балотам або за ракою, то пан Заблоцкі і пан Зарэцкі...

Бог першага чалавека вылепіў з гліны, да, расставіўшы пад плотам, штоб сох, сам кудысь пайшоў; тагды прыбег чорт да з тае гліны, што асталася, вылепіў такога самюсенькага другога чалавека, да й кажа сам да сябе:

— Як жа я пазнаю, калі Бог ажывіць абодвух, каторы яго, а каторы мой? Трэба неяк свайго пазначыць.

Зірнуў ён кругом, ці няма якое ламакі, ды не знайшоў нічога, а тут чуе, што Бог падходзіць, дый барджэй плюнуў сваёй ляплёнцы ў лоб дый пабег. Бог прышоў ажыўляць ды бачыць, што стаяць дзве ляплёнкі, як адна, нача дзве краплі вады.

— Хіба ж, — кажа, — я дзве вылепіў? Здаецца, адну... А мо і дзве? Не прыпомню.

Узяў дый ажывіў абедзве, а як яны заварушыліся, то з Божае выйшаў хадзяінпахар, а з чорта вае — нейкае благароддзе ў казённай шапцы, з кругленькаю бляшкаю, акурат на тым месцы, дзе чорт плюнуў. Тагды хадзяіну Бог сказаў:

— Ідзі да гасподы!

А благароддзю, узяўшы за шыварат, даў каленам... Нача выгнаў, не даўшы ніякага спосабу.

Пра скарб закляты

Аднаго разу ў нядзелю я, паабедаўшы, прылёг на прызбе трохі аддыхаць да й моцна заснуў. Ось сніцца мне, што нейкі старац кажа, штоб я ўзяў штых да ішоў на капец паміж шляхам і Карпавым альсам. Я прышоў быццам туды да ўсадзіў штых у зямлю, а ён, схаваўшыся да палавіны, стукнуўся аб нешта цвёрдае. Прачнуўшыся, ухапіў штых да не то пайшоў, да проста пабег на той капец, каторага, здаецца, з роду не бачыў, а пра тое трапіў, як бы хтось за руку вёў пяць вёрстаў ад нашага сяла. Засунуў штых

так глыбока, як і ў ва сне, — стукнуў аб штось цвёрдае. Штыхнуўшы кругом разоў з дваццатак, абмеркаваў, што тут закопана кована скрыня ў доўжкі вялікі шаг, а ўшыркі ступеней два без мала. Вярнуўся дадому, да змеркам, прыйшоўшы з сынам, мы сталі капаць да дакапаліся да вялікага каменя. Раскапаўшы яму з аднаго боку спускавата, з вялікаю патугаю выкацілі яго наверх, а на том мейсцы, дзе ён ляжаў, штыхавалі, да нічога не найшлі. Той камень — то былі грошы заклятыя, бо як праз цікавасць на другі дзень прыйшоў паглядзець, то яго і звання на том месцы не было — як у ваду кануў.

Зап. у в. Гарошкава Рэчыцкага п. Мінскай губ. ад Давіда Бурака.

Ш т ы х — тут: прэнт, завостраны кол або штыкеціна; а л ь с — алешнік або забалочанае месца з алешнікам; с т у п е н ь — ступня, народная мера даўжыні.

У Рэчыцкім павеце былі дзве вёскі Гарошкава. Адна — на тэрыторыі сучаснага Рэчыцкага раёна, другая — Хойніцкага. Хутчэй за ўсё паданне было запісана ў Гарошкаве, што пад Хойнікамі.

Пра скарб у калодзезі

Там, дзе ад шляху пайшла паваротка на Зялёную Параслю, у правую руку, як ісці ад Рэчыцы к Хвайнікам, у калодзезі е вялікі браварны казан, поўны грошай, накрыты млінавым каменем. Сколькі раз людзі хацелі выкапаць тыя грошы, да як толькі дакапаюцца да таго каменя, каторым пакрыты кацёл, так зараз з Рэчыцы і ляцяць казакі з голымі шаблямі. Людзі паўцякаюць, то і казакі шчэзнуць, а далей і месца зараўняецца, як бы нічога ніколі.

Ч. Пяткевіч. Духоўная культура Рэчыцкага Палесся. Варшава. 1938.

Х в а й н і к і — Хойнікі, райцэнтр.

Адкуль Брагінь

Пра Дзедаў Остраў расказваюць старыя, што на ім жыў разбойнік Сівуха з шасцю сынамі. Ён разбойнічаў на Брагіньшчыне і Хвайніччыне. Каля мястэчка Брагін ён напаў на другога разбойніка, Бандарэнку, які пачаставаў Сівуху і вызваў яго на адзінаборства. Пераможаны Сівухай, ён быў уніжан перад сваёй шайкай, за што пазней, у адсутнасці яго сыноў, абабраў Сівуху і, звязаўшы яго, ліў яму ў рот гарачае сала, ад чаго ў яго ўсе зубы выпалі.

Гавораць, што яны былі дваюрадныя браты, і пазней Сівуха адпомсціў Бандарэнку, разбіў яго войска каля мястэчка Брагіня, а самога Бандарэнку забіў, кінуў яго труп у балота, прыгаварваючы: Бра-гінь, гэта значыць, брат, прападай. Ад таго і названа мястэчка Брагінь. Нашчадкамі Сівухі і Бандарэнкі заселена ўся Ровенская Слабада.

Каталог літоўскіх народных паданняў. Вільнюс, 1973.

Зап. у 1872 г. у Ровенска-Слабодскай вол. Рэчыцкага п.

Б р а г і н — г. п., райцэнтр Гомельскай вобл.; Х в а н і ч ч ы н а — Хойніччына (Хойніцкі р. Гомельскай вобл.); Р о в е н с к а я С л а б а д а — вёска ў Рэчыцкім р.; Д з е д а ў О с т р а ў — урочышча.

Пра Адверніцу

Сяльцо такое было. Якраз ля Дняпра. А як з'явілася? Прышоў нейкі чалавек, дый паставіў на вышэйшым месцы крыж. Перахрысціўся, а потым і кажа: «Адвярні, Госпадзі, ад паселішча майго ўсё нядобрае ды злое». Агараў хату нейкую. За ім — другія. Ужо й сяльцо. Называецца Адверніца.

Жывуць людзі. Усё як быццам і нічога сабе. Вот толькі зямля няважная: пясок усё. Ды і вясною, як ні праз год, залівае ад Дняпра.

Вот і падумалася некаму: адвярнуўся ад сяльца Бог. Перабраўся ў іншае месца. За ім паціху і астатнія. Большасць, напэўна, у Дунай ссяліліся. А дзе Адверніца была — там зараз хвойнік скрозь...

Зап. П. Рабянок у 1990 г. ад П. Л. Рабянка, жыхара в. Баршчоўка, 1914 г. нар.

Адкуль Борхаў

Як пра назву ў нас кажуць? Старажытным часам так было: ідуць нейкія чужынцы, а хтось з вяскоўцаў, перастрэўшы іх, хутчэй да хат ды й у крык: «У бор хавайцеся!..» Вось ад гэтага, як расказваюць, і Борхаў. Была проста вёска, а потым — Борхаў.

Зап. П. Рабянок у 1992 г. ад жыхара в. Борхаў Баршчоўскага сельсавета І. В. Шастапалава, 60 гадоў.

Адкуль Заселле

Гэта й зусім проста. Найперш быў Борхаў. А потым хтось задумаў ссяліцца ў ін-

шае месца. Ахвотнікаў такіх знайшлося шмат. Вот вёску і зваць пачалі — Заселле. Значыць — за сялом каторая, за Борхавам.

Зап. П. Рабянок у 1990 г. ад П. Л. Рабянка, 1914 г. нар.

Адкуль Конская Спіна

Мясціна тая за Гранаўкай, за Застарэччам. З яе Заспа відаць.

Ранейшым часам зімы былі не тое, што зараз. Было, што снегу папанавальвае пад стрэхі. А вясною — паводкі. А жывёліну трэба пасвіць. Укруг вада, а на месцы тым вышэйшым, на грудку, зеляніна прабіваецца. А коней, вядома, не абдурыш. Ім травы свежай з'есці хочацца. Возьмуць дый паплывуць ці проста брыдуць. Зірнеш: адны спіны ды грывы відны. То і мясцінку тую назвалі — Конская Спіна.

Мы там і ў вайну ад немцаў хаваліся. У 43-ім. Калі яны ўжо паліць пачалі. Адтуль і нашых убачылі. У нашай Гранаўцы, ці, як казалі, Баравой, шчэ немцы былі, а ў Заспе ўжо нашыя.

Зап. П. Рабянок у 1993 г. ад Т. М. Кошалевай, жыхаркі в. Аляксандраўка, 1909 г. нар.

Святая Грыва

Ёсць паданне, што на ёй тварыліся ідальскія трэбы. Там і цяпер ёсць узвышша, куды на Івана Купалу збіраліся дзяўчаты і мужчыны, запальвалі кастры, спявалі песні і скакалі цераз агонь.

Каталог літоўскіх народных паданняў. Вільнюс, 1973. Зап. у 1872 г. у Ровенска-Слабодскай вол. Рэчыцкага п.

Жарты, анекдоты, гумарэскі

Свечка з кабыліну нагу

— Як бы кабыла знайшлася, — казаў паляшук, — то б паставіў святому Юрыю здоровую свечку, бальшую, з кабыліну нагу...

— А што б цябе, — крыкнуў, абярнуўшыся па-за сабой к палянцы, дзе кабыла грызла траву, — ваўкі з'елі, падла ты! Чуць-чуць чорт знае за што не зглумію воску больш, як ты варта.

Ч. Пяткевіч. Духоўная культура Рэчыцкага Палесся. Варшава. 1938. Запісана ў канцы XIX ст.

Пра папа

Сустрэліся дзве набожныя жанчыны.

— Наш бацюшка, — кажа адна, — чалавек вельмі набожны. Перад тым як кульнуць чарачку, заўсёды перахрысціцца і скажа: «Дай Божа, каб не апошнюю...»

П. Рабянок. Часопіс «Вожык». 1970. № 15. С. 7. Запісана ў в. Баршчоўка.

Што такое рай

Рай — гэта такі садок вішнёвы, дзе на зялёнай траўцы пад грушаю ляжыць мужык у белай сарочцы, у белых штанах, чэравам даверху, а каля яго рэчкаю плыве смятана. На грушы вісяць варэнікі да адзін за другім падаюць паачарэдна, перш у смятану, а адтуль да роту мужыка, каторы, добра наеўшыся, спіць колькі хоча.

Бог памёр

Ішло два чалавекі: адзін з ярмаркі да гасподы, а другі з гасподы на ярмарку да й сустрэліся.

— А што там у месце чутно?

— Ой, ліха чуваць, вось што: стары Бог памёр.

— Ох, мне на ліха! А хто ж цяпер будзе багаваць?

— Кажуць, што Мацер Божая.

— Ну, то трэба ж ісці дадому да й сабе паміраць, бо ўсё адно жыцця не будзе, як бабскі лад завядзецца.

«Шанаванне» абразоў

— Чаму ж у цябе, кумка-галубка, — гаворыць, прыйшоўшы ў госці, суседка, — так мала багоў!

— Э, кумачка, е яшчэ адзін Мікола, два нейкіясь другія і адна святая маладзіца, здаецца, святая Параксімка, чы мо святая Варка. І рамачкі ўжо пароблены, да няма шкла. Хацела было так павешаць, да пабаялася, штоб мухі не а...

— Няма лепш, як абраз на дошцы, —

гаворыць другі госць, — як ужо пасядаюць на такія абразы мухі... дык узяў да й выцер мокраю анучкаю, і чыста, пакуль зноў не а...

Гультай

— Быў калісь у нашым сяле вельмі ляны чалавек, гультай, каторага за тое дражнілі дуб'ём. Раз, калі ён ляжаў на печы не то сумны, не то задумаўшыся, загарэлася хата, а сусед прыбег да й крыкнуў:

— Дубей, твая хата гарыць!

— Ну, — адказвае, — і як ты не ляніўся гаварыць?

Бачыў, як пан еў

— Абаранкі, — кажа хлопец, — з параным малаком вельмі смачныя.

— Хіба ж ты еў?

— Я сам не еў, але дзядзька казаў, што бачыў, як пан еў.

Аж у вусе зазвінела

Два суседы, выпіўшы чэраз меру, пасварыліся, да адзін аднаго як трэсне па вуху, дак яму аж зазвінела.

— Ты, — кажа, абярнуўшыся да седзячага моўчкі чужога чалавека, — бачыў, як ён мяне ўдарыў па мордзе?

— Не, — кажа, — не бачыў.

— Дак паслухай, як у мяне звініць у вусе.

— Не чую, — кажа, паслухаўшы.

— Значыцца, ты і не бачыў і не чуў.

— А ўжэ ж?

— Дык на ж табе — і пабач, і пачуй! — да трэсь яго па вуху, аж зазвінела.

— А цяпер скажаш праўду?

— Трасца ж тваёй матары ліхая! — крыкнуў чажастаронны чалавек, пакрыўджаны ні за што ні пра што, — так трэснуў, што аж звініць у вусе.

Ч. Пяткевіч. Духоўная культура Рэчыцкага Палесся. Варшава. 1938. Зап. у канцы XIX ст.

Народны тэатр

Тэкст батлейкавага прадстаўлення ў Рэчыцы і іншых бліжэйшых гарадах і мястэчках

Прыйшоў у дом гаспадара перад пачаткам прадстаўлення адзін з больш спрытных і практычных хлопцаў — удзельнікаў хаджэння з вяртэпам — садзіцца ззаду яго і аб'яўляе, што пачынаецца прадстаўленне з Новага запавету аб нараджэнні Спасіцеля. Прадстаўленне адбываецца на верхнім ярусе вяртэпа. Спачатку з'яўляюцца два мужыкі (пастухі віфлеемскія), кланяюцца нованароджанаму дзіцяці ў пояс і звяртаюцца да гледачоў:

П а с т у х і. Мы — пастухі віфлеемскія, находзіліся сію ноч на стражы, паслі свой скот; удруг пры бальшой цемнаце асіяў нас неабыкнавенны свет. Мы іспугаліся, но ангел Гасподзен сказаў нам: «Не пугайцесь! Гэта радзіўся Цар Славы; вы ідзіце і пакланіцеся яму — ён у Віфлееме». Убачылі множаства анёлаў, паюшчых «Слава ў вышніх Богу...» *(Гэта царкоўная песня выконваецца хорам пры батлейцы.)*

Пасля заканчэння спеваў пастухі выходзяць. З'яўляюцца вешчуны, пэрсідскія цары, кланяюцца нованароджанаму дзіцяці і прыносяць падарункі. Затым яны звяртаюцца да народа.

В е ш ч у н ы. Мы валхвы, цары персідскія — з далёкіх стран, не пажалелі сваіх царскіх трудоў і прышлі пакланіцца нованароджанаму младзенцу; мы гэта ўзналі па звяздзе на вастоке, каторая нам сапутствавала. *(Пры гэтых словах спяваецца царкоўная песня «Валхвы, цары персідскія, пазнаша яве на зямлі раждзёнага цара нябеснага...»)*

Вешчуны кланяюцца і выходзяць. Пасля гэтага пачынаецца прадстаўленне ў ніжнім ярусе батлейкі аб Ірадзе. Сюды ж з верхняга яруса пераносіцца свечка. Спакваля з-за заслоны з'яўляецца адзін з цароў і садзіцца на трон. У гэты час да яго падбягае воін.

В о і н. Што прыкажаце, ваша вялічаства?

Цар загадвае паклікаць граданачальніка. Воін адразу ж выходзіць. Уваходзіць граданачальнік.

Ц а р. Што слышна ў нас?

Г р а д а н а ч а л ь н і к. Нічога асобеннага, ваша вялічаства.

Ц а р. Как жа нічога! Нарадзіўся новы цар, і я, апасаючыся, штобы ён не завалодаў маім царствам, павеляваю ўбіць усіх нованароджаных младзенцаў мужскога полу.

Праз дзве-тры хвіліны ўваходзіць воін і паведамляе, што дзяцей усіх забілі: толькі плача адна Рахіль і просіць аб памілаванні адзінага яшчэ жывога сына. Воін ідзе за заслону і прадстаўляе жанчыну, якая плача і просіць злітавацца.

Р а х і л ь. Ваша вялічаства, я паручаю вам свайго сына, вазьміце яго ў свае палаты,

не васпітывайце, толькі ліш бы ён быў жыў.

Ц а р. Да, былі случаі, знаем ужо: і фараон кагда-та васпітываў Маісея, а ён потым лішыў яго царства. *(Рахіль выходзіць з жалобнай песняй.)*

Х о р *(спявае)*
О, Ірадзе ты пракляты!
О, Ірадзе ты пракляты!
Не пашчадзіў ты ў Віфлееме
Ні адзінага дзіцяці;
Ты хацеў убіць Марыінага сына,
На што цябе сатана спакусіў.
Но Божая сіла
Да сяго не дапусціла;
Ты убіць Хрыста рашыўся,
А Іосіф з Марыяю
У Егіпет удаліўся.
О, Ірадзе ты пракляты!
О, Ірадзе ты пракляты!
Ты яшчэ на свет Божы не радзіўся,
У тваім сэрцы сатана пасяліўся.
О, Ірадзе ты пракляты!
О, Ірадзе ты пракляты!

Ірад сыходзіць з трона; уваходзіць яўрэй Бэрка ў старым сваім нацыянальным адзенні, разглядае палацы Ірада, звяртаецца да гледачоў.

Б э р к а. Ві знаеце, гаспада, сто тут цар зыў, а ціпер уз я купіў гэтыя палацы, а сам цар узэ памьёр; гэто яго Бог скараў, сто ён насых цэлых цатырнаццаць тысяц дзетацак перабіў. Я думаю ў гэтым палацы адкрыць тракцір: от тут бацонацак пастаўляю, а тут крэсельцо. *(Садзіцца на трон і пачынае танцаваць ад радасці.)*

З'яўляецца мужык і звяртаецца да гледачоў:

М у ж ы к. Вы не знаеце, гаспада, майго гора. Я ж як наеўся куцці, так не магу і пайсці: от я ўжэ ішоў у волась і к хвершалу, аж едзе валасны пісар, пытаецца ў мяне: «Куды ты едзеш, Змітро?» — «У волась і к фершалу: баліць, паночак, вельмі мой жыватоčак. Я ж учора як наеўся куцці, дак не магу і пайці». А пісар кажа: «Хвэршала цяперака няма; ты лепей ідзі і к Бэрку і выпі гарэлкі чвэртку, укінуўшы дроб канхворы, так не будзеш хворы. *(Нарэшце мужык звяртаецца да яўрэя.)* А, здароў, Бэрка, ну але ж у цябе і палацы, і чаго ж тут у цябе няма! Аднаго толькі бацькі з мацераю тут нямашака! Дай жа мне гарэлкі чарку выпіць!

Б э р к а. Давай зэ гросы!

М у ж ы к. Да я ж не ўзяў з сабою з дому.

Б э р к а. Цагос ты ісоў, на веру думаес? Ісцэ я толькі пацын раблю, а ён узэ... музык, трасца яго матары, прысоў і дай яму на веру: прынёс бі цаго мерацку!

М у ж ы к. Пагадзі ж ты, пракляты жыдовін, я ж табе нашлю, я табе ізраблю, што цябе чорт ухваціць! *(Выходзіць.)*

Б э р к а. Так п'яніца ўсё страсцае: я табе нашлю! Дзе ві бацылі, гаспада, той цорт, дзе ён есь на свеці, хто гэта даказэ?

У гэтую мінуту з'яўляецца чорт, вельмі страшны з выгляду, на ім адзенне з тхаровага меху, твар чорны, з хвастом, на галаве рогі. Чорт хапае Бэрку і нясе з сабой.

Б э р к а *(крычыць)*. Гвалт! *(Гледачы смяюцца.)*

У канцы гэтага прыходзіць яўрэйка, жонка Бэркі.

Я ў р э й к а *(звяртаецца да гледачоў)*. Цы не бацылі мая Бэра?

Б а т л е й ш ч ы к. Яго ж чорт ухваціў.

П. В. Шейн. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 3. СПб.: 1902. С. 141—144.

У заўвагах П. Шэйн адзначае, што гэты тэкст яму паведаміў настаўнік народнага вучылішча Н. Г. Яцко. Перад тэкстам этнограф прыводзіць апісанне батлейкі, дзе гаворыцца: «Вяртэп робіцца з габляваных дошак у выглядзе чатырохвугольнай скрынкі — паўтара або два аршыны ў вышыню і адзін у шырыню. Гэта скрынка якраз пасярэдзіне раздзяляецца перагародкай на два ярусы — верхні і ніжні».

Батлейка — старажытны тэатр лялек. З'явілася на Беларусі, у тым ліку і ў Рэчыцы, у XVI ст. як тэатр рэлігійна-містэрыяльны. Першапачатковы яе рэпертуар складаўся пераважна з паасобных біблейскіх сюжэтаў, інсцэнізацыя якіх была падрыхтавана ў значнай ступені містэрыяльнымі спектаклямі жывых акцёраў. Першапачаткова батлейка ўзнікла ў Заходняй Еўропе. Пазней трапіла на тэрыторыю Польшчы, затым — Беларусі і Украіны.

Прапагандай перанятага ад езуітаў тэатра займаліся на першым часе ў асноўным шкаляры-семінарысты, студэнты духоўных школ. У канцы XVII — пачатку XVIII ст. батлейка трапляе ў рукі местачковых рамеснікаў, а пазней і працоўных сялян. З гэтага часу пачынаецца абміршчэнне яе рэпертуару, які актыўна папаўняецца народна-камедыйнымі, свецкімі сцэнамі. Гэты перыяд Е. Раманаў ахарактарызаваў як «бліскучую пару ўжывання вяртэпаў».

Тэатр батлейкавага тыпу, які ў большасці выпадкаў меў выгляд хаткі ці царквы, сваімі вытокамі ўзыходзіць да глыбокай старажытнасці. Розныя тыпы батлейкавага тэатра мелі свае сістэмы лялек. Акрамя пло-

скіх, выразаных з бляхі ці кардону, ценявых фігурак, марыянетак, пальчатачных лялек шырока выкарыстоўваліся і лялькі так званага шпянёвага тыпу. Асаджаныя на драўляным альбо металічным шпяні, яны ўяўлялі сабой найбольш распаўсюджаны варыянт лялек народнай батлейкі, якіх лялечнік вадзіў па шчылінах у падлозе верхняй і ніжняй сцэны.

(Звесткі ўзяты з артыкула *М. А. Каладзінскага* «Беларускі народны тэатр». Народны тэатр. Мн., 1983.)

Замовы

Ад залому

Ішоў Ісус Хрыстос із нябёс цяраз трое варот, з залатым крастом, з залатым мечам. Я залатым крастом хазяйства аграждаю і здароў'ем надзяляю, а Ісус Хрыстос залатым мечам завіток вырывае і етыя слава залатым мечам назад адсылае і яго на той свет заганяе.

Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб.: 1893. Т. 2. С. 528–529. *Зап. ад Н. Р. Яцко.*

Замова ў дарогу

Прачыста святая, твая ручка залатая. З медзянага пальчыка спусці, а мне дарожку прайсці пусці.

Архіў кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны. *Зап. студэнт Л. І. Бордак у в. Галоўкі ад К. С. Галоўка, 75 г.*

Як згубіцца ў лесе жывёла

Прашу Госпада Бога і Юр'я святога зацінаці, засякаці (успамянуць від і масць згубленай жывёлы) ад габа-габіхі, дыладыліхі, свідра-свідрыхі. Жалезным замком замыкаю, жалезным замётам закідаю ўдзень, уночы і ўпоўначы зубы, губы, скіліцы, віліцы і ўсё. Яго, Госпадзі Божа, спасі, святы Юры, засячы. Амін.

Машынскі К. Духоўная культура славян. Варшава. 1934. С. 146. № 95. *Падаў Ч. Пяткевіч. Дзеянні пры замаўленні прасякнуты матывамі, характэрнымі для казачнага эпасу. «Пры заходзе сонца ўбіць востры нож у дрэва, якое расце найбліжэй к дому, і замаўляць. Пасля ісці дадому, не азіраючыся. Калі жывёле пагражае небяспека, то пасля гэтых слоў павернецца дадому, а калі не, то не сойдзе з таго месца, дзе застала. Калі ж жывёла не вярнулася, а нож паржавеў, гэта азначае, што да замаўлення яе задушыў воўк».*

Каб не гублялася цялё

Першым разам, лепшым часам Госпаду Богу памалюся, святой Прачыстай Божай Маці пакланюся. Святая Маці Божая, стань у дапамогу.

У святую цэркву ішла Божая Маці, несла залатыя ключы ў прыполі. Замкі размыкніцеся, косці з касцямі разыйдзіцеся, а маладыя пакажыцеся. Як страла ляціць прама, так штоб і цялё маё ішло прама. Я з словам, Гасподзь Бог з помаччу.

Зап. П. Рабянок ад бацькі П. Л. Рабянка, 1914 г. н.

Ад змяі

— Змія корпія, змія квірыта! На што сваіх дзяцей распусьціла? Пайду я к Ісусу Хрысту. Хрыстос возьмець остры меч, пойдзець тваіх рубіць і сеч.

— Чалавеча Божы! Не йдзі к Ісусу Хрысту! Я сваіх дзяцей уйму і ім жало замару.

Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб.: 1893. Т. 2. С. 547. № 48. *Зап. Н. Г. Яцко. Загадкавыя змеі – змяя корпія (ці не скажонае скарпіён?) і змяя квірыта. Можна меркаваць пра кніжнае паходжанне замовы.*

Ад крывацёку

Ішла Саламання Хрыста бабіць, несла ў прыполі ячмень сеяць. Пакуль еты ячмень з-пад серабра і золата ўзойдзе, так етая кроў не пойдзе.

Ад звіху

Ехаў цар Давыд на белай кабылцы з Богам ваяваць. Стой, цар Давыд, не едзь з Богам ваяваць, а будзь сведам араць! А ты, звіх, не будзь ліх, касцей не ламі, сэрца не тужы, жывата не сушы.

Ад зубнога болю

На небі — месяц малады, у лесі — дуб таўсты, а ў полі — камень сяды; як етым тром царам умесці не бываць, мёду-віна не піваць, так і маім зубам не шумаваць.

Ад зубнога болю

Маладзік малады, у цябе рог залаты; чарвяк точыць мае зубы, а ты патачы чарвяку губы.

Машынскі К. Духоўная культура славян. Варшава. 1934. *Зап. Ч. Пяткевіч.*

Замаўлянне скулы

У полі стаяла ігруша, а пад ігрушай стаяла тры дзявіцы: Арына, Марына й Кацярына. Яны не ўтыкалі, не ўшывалі, толькі скулу-рожу, і скулу-залатуху, і мізіперніцу ўгаваралі. А з чаго ж ты паднялася? Ці ты з яснага сонца, ці ты з буйнага ветру, ці з паганых вачэй, ці з паганых муслей? Я ж вас угавараю і ссылаю на вялікія рэкі, дзе волны гуляюць. Там скулу разганяюць на цякучы раўчака, на цёмныя ляса. Дзе пеўняў і голас не заходзіць, там вам упіваць і гуляць. А гэтаму Іваньку век і зроду скуле не бываць.

М і з і п е р н і ц а — скаж. мяжыперсніца — хвароба, галоўная адзнака якой — сып.

Ад перапуду

Якая маць нарадзіла, такая і адхадзіла. Адна лён часала, другая збірала, а трэйця прыстрэк-іспуг угаварала.

Ад зляку

Мінуўся зляк пужлівы, баязлівы, начной, слядной, жаноцкі, хлапоцкі, мужчынскі, матчын, бацькаў, каціны, сабачы, таварацкі. У шчырым бару рос дуб. У тым дубі дзвянаццаць какатоў, на тых какатах дзвянаццаць малайцоў. Як тых дзвянаццаць малайцоў не ўзяць, не дастаць, так етаму рабёнку прыстрэку, іспугу не бываць ні пад поўна, ні маладзіком, ні сходна, ні на веку вяком.

Архіў кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржуніверсітэта імя. Ф. Скарыны. Сш. 12. *Зап. студ. Л. І. Бордак у в. Галоўкі ад Ф. С. Белай, 50 г.*

Ад крыксаў і плаксаў

Стаіць Прачыста мацер Божыя на покуці, а ідал на парозі, а слуга (ангел-хаўраніцель) на старожы. Прачыстуй мацеры Божай малітвы, а ідалу — крыксы і плаксы і начніцы, а дзіцяці на прысыпання, штоб спала, прыедала і целу прыбувала.

Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб.: 1893. Т. 2. С. 536. № 23.

Зап. Н. Г. Яцко. Па сведчанні збіральніка, такая дзіцячая хвароба, як лічаць маці, калі яны забудуць перахрысціць дзіця перад сном, яго калыску, дзверы і вокны, у выніку чаго д'ябал забіраецца ў дзіцяці. Калі не дапамагае простае хрышчэнне азначанага, тады звяртаюцца да знахара, і ён замовай выганяе д'ябла.

Ад падучай хваробы (ад «чорнай хваробы»)

Госпаду Богу памалюся. Прачыстай Мамцы пакланюся, усёй нябеснай сіле: прыпадобнічкам, прыпадобніцам, божым праведным угоднікам, вячэрняй зарніцы — божай памачніцы. Памажыце ж мне Госпада Бога прасіці.

Ціхоны-пераходы, вас упрашаюць, умаляюць, ссылаюць на вас дванаццаць братцаў старшых да семдзесят сем младшых. Ідзіце цераз чыстае поле, цераз сіняе мора, пападайце ў ціхую цішыню, на сухія асінкі. Туды птахі не залётуюць, звяры не забягаюць, совы не кугакаюць. От там жа вам, ціхоны-пераходы, пеці і гуляці і ў гнілых калодах прападаці. У белым целе больш не бываці, па касцях не хадзіці, крыві не паліць і сна не будзіць.

Архіў кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны. Сш. 71. Л. 1. № 1. *Зап. студ. В. Э. Жалязінская ў 1982 г. у г. Рэчыцы ад Г. А. Жалязінскай, 72 г.*

Супраць колькі

Ішоў Бог дарогаю і сустрэў колюку.

— Куды ты ідзеш?

— Іду калоць і пароць.

— Ідзі ў цёмны лес, там стаіць чорны вол, ідзі, калі і пары, а етага чалавека (імя) не калі і не пары.

Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб.: 1893. Т. 2. С. 543. № 42. *Зап. Н. Г. Яцко.*

К о л ь к а, тое, што і колікі, — рэзкі, востры боль, рэзь у жываце або ў баку.

На сон (каб прысніўся суджаны)

Месяц, месяц малады,
У цябе рог залаты,
Ты ўвесь свет абыйдзі,
А мне пару найдзі,
З кім мне век векаваць,
Каб ва сне павідаць.

Перад сном

Лажусь пад панядзельнік,
Прысніс зялёны ельнік,
У зялёным ельніку я
І любоў мая.

Архіў кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржуніверсітэта імя. Ф. Скарыны. Сш. 5. *Зап. студ. Л. М. Сідарэйка ў г. Рэчыцы ад К. Г. Пісарэнка, 72 г.*

На добры сон

Лажуся я спаць, даю Госпаду Богу знаць. Кіеў у гарах, святая Божая маць Прачыста ў галавах, янгалкі па баках. Янгалы, мае храніцелі, сахраніце маю душу з поўначы да поўначы, з свету да свету, з веку да веку. Стойця пры мне — што вам, тоя й мне.

Архіў кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржуніверсітэта імя. Ф. Скарыны. Сш. 12. *Зап. студ. Л. І. Бордак у в. Галоўкі ад С. П. Галоўка, 65 г.*

Жыццё і навуковая спадчына Часлава Пяткевіча

Лёс Часлава Пяткевіча як вучонага незвычайны. Яго шлях у навуку пачаўся тады, калі ён дажываў сёмы дзесятак. Прычым на гэты шлях яго вывеў чалавек, які лічыў Пяткевіча сваім хросным бацькам у навуцы, — вядомы вучоны Казімір Машынскі. Ён прыцягнуў ужо старога па ўзросту сябра да напісання навуковых прац і нікольні не памыліўся: багацейшыя веды Пяткевіча пра ўсё, што было звязана з жыццём і культурай палескага народа, увасобіліся ў яго працах, якія і сёння, праз дзесяцігоддзі, уражваюць сваёй змястоўнасцю, фактаграфічнай насычанасцю і з'яўляюцца надзвычай каштоўнымі дакументамі з гэтага цікавейшага кутка беларускай зямлі.

Часлаў Пяткевіч нарадзіўся 20 ліпеня 1856 г. у вёсцы Бабчын Хойніцкай воласці Рэчыцкага павета. Маці — Паўліна (родам з Крыжаноўскіх) — была здольнай, таленавітай жанчынай. Усе пяцёра сыноў атрымалі хатнюю адукацыю менавіта дзякуючы яе намаганням. Бацька — Генрых (дарэчы, брат паэта Антонія Пяткевіча — Адама Плуга) — служыў старшым ляснічым у Прушыне, дзе меў смалакурню. У гэтай лясістай мясцовасці прайшло дзяцінства Часлава. За ўдзел у студэнцкім паўстанні бацька быў асуджаны на двухгадовае турэмнае зняволенне, у выніку чаго маёмасны стан сям'і значна пагоршыўся. У падлеткавым узросце разам са старэйшым братам Адольфам Часлаў зведаў цяжкую фізічную працу, авалодаў амаль усімі рамёствамі жыхароў навакольных вёсак. Усе магчымыя веды ён атрымліваў самавукам. Адчуваючы ў сябе схільнасць да тэхнікі, Ч. Пяткевіч працаваў у розных смалакурнях і броварах, раскіданых па палескім краі. У 1887 г. юнак пакінуў Палессе, пошукі працы кідалі яго ў самыя розныя мясціны: на Падолле, потым у Семежава пад Слуцкам, на Смаленшчыну. У 1904 г. Ч. Пяткевіч выехаў на Украіну, дзе прыняў кіраўніцтва маёнткам Абрамоўскіх у Стафаніне Васількоўскага павета, недалёка ад Кіева, і маёнткам свайго пляменніка Юзафа. Працаваў аканомам Пяткевіч на працягу амаль двух дзесяцігоддзяў, з невялікімі перапынкамі, калі ў 1912—14 гг. служыў у Лодзі на пасадзе тэхніка па бяспецы. Тут, у Стафаніне, у 1911 г. і адбылася сустрэча немаладога ўжо Часлава Пяткевіча з пачынаючым прыватным настаўнікам Казімірам Машынскім, які ў той час марыў заняцца даследаваннямі ў галіне народнай культуры. Пяткевіч быў сапраўднай знаходкай для маладога краязнаўца, бо мог даць адказ на любое пытанне пра свой родны край — Рэчыцкае Палессе, мала яшчэ вядомае тагачаснай навуцы. Калі выйшла манаграфія Машынскага «Усходняе Палессе» (1928 г.), то на першай старонцы значылася, што праца прысвечана Чаславу Пяткевічу, выказвалася падзяка і падрабязна паведамлялася пра яго ўдзел у падрыхтоўцы кнігі.

Перыяд актыўнай навуковай дзейнасці пачаўся для Ч. Пяткевіча з 1923 г., калі ён разам з братам Зыгмунтам і яго сям'ёй пераехаў у Варшаву. Падтрыманы Машынскім, з 1924 г. пачаў працаваць у Аддзеле этналогіі Інстытута антрапалагічных і этнала-

гічных навук Варшаўскага навуковага таварыства, дзе ў поўнай меры раскрыўся яго схаваны дагэтуль дар этнографа, даследчыка і мастака.

Першыя кнігі Машынскага і Пяткевіча выйшлі амаль адначасова — у 1928 г. Аднак манаграфія пра матэрыяльную культуру Рэчыцкага Палесся была не першай навуковай працай Ч. Пяткевіча: ёй папярэднічала некалькі артыкулаў, змешчаных у часопісе «Зямля», некаторыя з іх потым ляглі ў аснову асобных раздзелаў яго манаграфій.

Дэбютаваў Ч. Пяткевіч у часопісе ў 1925 г. артыкулам «Да пытання гісторыі шкларобства на Валынскім Палессі». Назіранні за тапанімічнымі назвамі вёсак (Рудня, Руда, Руднянка) дазволілі аўтару меркаваць пра існаванне на Беларускім, Кіеўскім і Валынскім Палессі ў мінулыя часы жалезнага промыслу. Шматлікія вандроўкі па тэрыторыі роднага краю далі матэрыял для артыкула «Дарогі на Рэчыцкім Палессі ў другой палове XIX стагоддзя» (1926 г.).

У наступных публікацыях у часопісе «Зямля» Часлаў Пяткевіч працягваў знаёміць чытачоў з палескай тэматыкай.

Першая грунтоўная манаграфія Ч. Пяткевіча «Рэчыцкае Палессе» з'явілася абагульняючай працай па матэрыяльнай культуры гэтага рэгіёна. Уступ да кнігі напісаў К. Машынскі, шматлікія малюнкі зрабіў сам аўтар. Намаляваныя прадметы, падкрэсліваў Машынскі, Пяткевіч «неаднойчы трымаў у руках, а значную частку сам выраблял». Чатырнаццаць раздзелаў кнігі асвятляюць літаральна ўсе заняткі і рамёствы палешукоў.

Кніга «Рэчыцкае Палессе» сведчыла не толькі аб прыходзе ў навуку цікавага сур'ёзнага працаўніка, але і стала пэўным этапам у развіцці даследаванняў пра Палессе.

Але задумы Ч. Пяткевіча не спыняліся на гэтым, маштабы іх былі куды большыя. Веды даследчыка не абмяжоўваліся культурай. Духоўны свет палескага селяніна, не раскрыты яшчэ ў навуковай літаратуры, вабіў этнографа, і Ч. Пяткевіч, пакуль яшчэ ставала сіл, пачаў распрацоўку новай тэмы. У час працы ў Аддзеле этналогіі Варшаўскага навуковага таварыства Пяткевічу былі прызначаны стыпендыі з Міністэрстваў веравызнання і народнай асветы, якія матэрыяльна падтрымалі яго і дазволілі цалкам прысвяціць сябе навуцы без лішніх клопатаў пра сродкі для існавання.

Пяткевіч узяў на сябе абавязкі па падрыхтоўцы пасмяротнага выдання 4-га тома «Люду беларускага» Міхаіла Федароўскага (1935).

Дасканалае веданне матэрыялу, спрыяльныя ўмовы для працы дазволілі Пяткевічу вельмі шмат зрабіць на схіле гадоў. Ён збіраўся падрыхтаваць да друку і песенны збор Федароўскага, аднак смерць перашкодзіла яго намерам.

У апошнія гады даследчык апублікаваў некалькі артыкулаў пра народныя ўяўленні, пра характар правядзення некаторых свят на Палессі, пра асаблівасці сялянскага побыту. Пераважная большасць гэтых артыкулаў стала потым старонкамі другой манаграфіі Ч. Пяткевіча.

Нават і сёння, калі фальклорна-этнаграфічная спадчына нашага народа сабрана і выглядае прадстаўніча, многія матэрыялы Ч. Пяткевіча не проста захоўваюць сваю каштоўнасць, а ў нейкай меры застаюцца унікальнымі, непаўторнымі.

Апошні прыжыццёвы артыкул Ч. Пяткевіча «Земляробчыя боствы ў вераваннях беларусаў» быў прысвечаны персанажам міфалогіі і стаўлення да іх сялян.

Наступная (яна ж і апошняя) праца Ч. Пяткевіча — манаграфія «Духоўная культура Рэчыцкага Палесся» — выйшла пасля смерці аўтара. У пачатку яе даецца невялікі пералік — усяго 12 пазіцый — публікацый, падрыхтаваных за няпоўнае дзесяцігоддзе навуковай дзейнасці аўтара (з 1925 да 1933 г.). У прадмове Станіслаў Панятоўскі, пад кіраўніцтвам якога працаваў апошнія гады жыцця Пяткевіч, назваў даследчыка Палескага краю «незвычайнай постаццю ў свеце навуковых працаўнікоў». Адзначыў ён і чалавечыя якасці Пяткевіча: «Шляхетны характар, да ўсіх зычлівы ўдзел, непадробныя дабрыня і вялікая сціпласць схілялі да яго людзей, перад ім раскрываліся душы палешукоў. З удзячнасцю ўспрымаў усякую дапамогу».

Як і папярэдняя манаграфія, другая кніга ахоплівае шырокае кола тэм, размеркаваных аўтарам па дваццаці раздзелах. Фальклорная стыхія палешука, да асэнсавання якой ішоў Пяткевіч, выяўлялася нават у тэмах, на першы погляд далёкіх ад вуснай паэзіі. Трапнае народнае выказванне давала нечаканую характарыстыку самым розным паняццям, прадметам, дзеянням.

Ці не найбольшае значэнне для фальклорыстыкі і фразеалогіі мае заключны раз-

дзел манаграфіі «Духоўная культура Рэчыцкага Палесся», які ахоплівае 1933 нумары фальклорных твораў малых жанраў. Праводзячы класіфікацыю гэтых матэрыялаў, аўтар вылучыў кожную жанравую разнавіднасць пад асобнымі літарамі, і ўсе групы давялося абазначыць амаль усім алфавітам! Класіфікацыя парэміяграфічных жанраў Палесся, створаная Ч. Пяткевічам, наўрад ці мела да таго часу аналагі ў фальклорыстыцы любога народа. Нават далёка не кожны спецыяліст-збіральнік здолеў бы выявіць такую масу паджанравых адгалінаванняў, убачыць адметнасць кожнай групы.

Найбольшая колькасць запісаў прыпадае, зразумела, на прыказкі і дасціпныя выразы (1250 нумароў), якія размешчаны ў алфавітным парадку заключаных у іх апорных слоў (часам вылучаецца не адно, а два апорныя словы, і некаторыя прыказкі можна сустрэць у розных месцах).

Часлаў Пяткевіч памёр 10 кастрычніка 1936 г. Не ўсе яго працы мелі шчаслівы лёс. «Духоўная культура Рэчыцкага Палесся» хоць і пасмяротна, але была выдадзена і такім чынам засталася захаваная для гісторыі. Рукапіс жа 3-й часткі яго зборaў па Рэчыцкім Палессі, у якой асвятляліся пытанні грамадскай культуры, знаходзіўся пэўны час у касе імя Юзафа Мяноўскага ў Варшаве. Сёння сляды гэтай працы страчаны. Мяркуецца, што яна беззваротна загінула ў агні 2-ой сусветнай вайны.

Пяткевіч не пісаў для сваіх кніг заключэнняў, не рабіў у іх абагульняючых вывадаў — надта позна прыйшоў у навуку, каб фарміравацца як тэарэтык. Але тая бяспрыкладная па вычарпальнасці інфармацыя ў галіне народнага побыту і культуры Палесся, якая была сабрана ў яго манаграфіях і артыкулах, забяспечыла яму трывалую пасмяротную славу і ўдзячнасць нашчадкаў.

У. А. Васілевіч

Прыказкі і прымаўкі

Зямля святая ўсё прымае.

З вялікае хмары малы дождж.

Не пі, не еш і з хаты не лезь.

Злодзей хоць вуглы пакіне, а агонь і тое забярэ.

Не вер, бо то звер, калі не ўкусіць, то спужае.

Не кліч воўка з лесу, бо ліха не спіць.

Стары воўк знаець толк.

Зімою хлеб можна з'есці і з свіннёю.

Мокры май — жыта, як гай.

Улетку вады мерка — гразі жменька; з асенняе жменькі вады — гразі мерка.

Дзень наш (мой), век наш (мой).

Хто ў пятніцу вельмі вясёлы, той у нядзелю адплача.

Хто ў пятроўку сена не косіць, той зімою ў сабак просіць.

Без сахі і бараны сам цар хлеба не есць.

На полі родзіць, калі сам хазяін па полі ходзіць.

Глядзі за тым, з чаго ясі хлеб.

Аддай зямлі тое, што яна родзіць.

Не ўважай на ўраджай, а жыта сей.

У дарогу сабірайся, а жыта сей.

Ранняя сяўба хоць і не ўзродзіць, то прынамсі з насення не зводзіць.

Хто косіць у нягоду, той у пагоду зграбе.

Колас ад коласа не чуе голаса.

Няма зерня без мякіны.

Карова, што многа раве, мала малака дае.

Дай аброку, а тады бі па боку.

Калі добры конь, то яго больш яшчэ паганяюць.

Валі на бурага — буры павязе.

Было рамясло, ды хмелем парасло.

Проціў невада рыбку не ловяць.

У стральца дым густы, ды абед пусты.

Калі ідзеш на мядзведзя — сцялі пасцель, а калі на дзікага кабана — пасылай за папом.

Той папаў, ля каго звер упаў.

Каб не клін і не мох, цесля бы здох.

Кравец за іголку, баба за калатоўку.

Шавец робіць плячыма, а бондар грудзьмі.

Работай, нябожа, то і Бог паможа.

Хто позна ходзіць, той сам сабе шкодзіць.

Сонца нізка, шабас блізка.

Сабака скора дзеці робіць, ды сляпыя родзяцца.

Як хто есць, так і робіць.

Матэрыяльны быт

Хто на чым сядзіць, тэй таго і глядзіць.

Як не дагледзіш ачыма, то даплаціш грашыма.

Якія мы самі, такія і нашы сані.

Мужык у лесе не злодзей — дома не хазяін.

Бог даў цяля, ды не даў хлява.
З аднае курыцы хазяйства не развядзеш.
Давядзецца сляпой курцы зярнятка найці.
Узяў чорт (воўк) кароўку, няхай бярэць і вяроўку.
Жолаб да каня не ходзіць.
Добра сабацы й мука.
Свая хатка як родная матка.
Кожны пан у сваёй хаце.
Нашаму Харытону няма нідзе прытону.
У старой печы чэрці паляць.
З аднаго дупла і холаду і цяпла.
Новае сітца на колічку навісіцца.
Хоць воўна, абы кішка поўна.
З'ясі і кісялёвых выжымак, як будзеш галодны.
Крупіна за крупінай ганяецца з дубінай.
Хто спіць, той есці не просіць.
Вары ваду — вада вадою будзе.
З аднаго яйца яечні не будзе.
Пей песні, хоць трэсні, толькі есці не прасі.
Хлеб і соль — то ўся праўда.
Хлеб, соль і вада — маладзецкая яда.
Хлеба не пераживеш, не пераясі і вады не перап'еш.
Шукаючы пірага, хлеб загубіў.
Хто хлеб у кайстры носіць, той есці не просіць.
Няма смачней рыбы, як лінінка, і мяса смачней, як свінінка.
Што надта, то і свінні не ядуць.
Хто, пад'еўшы, не аддыша, таго Бог за свінню запіша.
На голага і сабакі брэшуць.
Усе мае зборы — лапці да аборы.
Свая сярмяжка не цяжка.
Адзеўся, як пан, а дурны, як баран.
Памалу едзеш — далей заедзеш.
Хто аб'ездкамі едзець або нацянькі, той блудзіць і траціць дзянькі.
Хто пытае, той не блудзіць.
Які чорт ехаў, такі й паганяў.
З чужога вазка і сярод гразі злазяць.

Грамадскае жыццё

На чужыне паклонішся і баране.
Усё паны да паны, а свінней няма каму пасці.
Панска ласка да парога.
Паны як паны, ды падпанкі жыць не даюць.
Лепш у вялікага пана за клямку дзяржацца, як з малым панком за сталом сядзець.
Сем сёл, адзін вол, а дзесяць прыганятых.
У свінушніку жыве, ды хоча кашляць па-панску.
Без хама не было б пана.
Пан панам, а мужык мужыком на векі вяком.
Не нам судзіць папа — на тое ёсцека чорт.
З аднаго вала сем шкур не дзяруць.
Не плаціць багаты, але вінаваты.
На воўка памоўка, а мядзведзь цішком.
Сумы і турмы ніколі не заракайся.
Не пастаяўшы ля парога, не сядзеш за сталом.
У гасцях каша, а дома кулеш, да за кашу лепш.
Добры госць, ды ў сераду трапіўся.
Як дома пад'ясі, то й у гасцях накормяць.
Госць мала гасцюе, а многа бачыць.
Дзе чуюць, там начуюць.
Беднасць сораму не знае.
Не радзіў сем лет мак, то жылі і так.
Запас бяды не чыніць і есці не просіць — старац зубоў не мае, а сухары пра тое носіць.
Старац старца не любіць, а хазяін абыдвух.
Пакуль з багатага пух, то з беднага дух.
Сабака кудлаты — яму цёпла, мужык багаты — яму добра.
Усё б загроб, ды багацтва пугаю не загоніш.
Стань свінаватым, то будзеш багатым.
Багатаму і скрыпка сама грае, а мая і смыкам не хоча.
Шчасце за гарамі, а бяда за плячамі.
Дзяды не зналі бяды, а ўнукі даждаліся мукі.
Было ліха, да й пагоршала.
Хто паша, той пляша, а хто таргуе, той гаруе.
Хто часта коні мяняе, у таго хамут гуляе.
Купіў бы сяло, да грошы гало.
Не журыся, што ў мяне грошай няма, дасць Бог, што і ў цябе не будзе.
Бог ведае, чы будуць у нашага Кузьмы грошы.
Збірай, збірай грошы, а чорт на іх дзірку найдзе.
Заплаціць тагды, як цыган згубіць, а ён найдзе.

Сям'я, сямейны быт

Як мяне, мамачка, хлопцы любяць: як выйду на вуліцу, то за кулакамі свету не бачу.

Паначы ўсе дзеўкі чарнабрэўкі.

Не ўсім Даніла, камусь пападзецца і Гаўрыла.

Жаніўся тагды, калі ўсе людзі сена касілі.

Бабы не пераможаш, і табакі не ператрэш.

Дзе чорт не дойдзе (не зробіць), туды бабу пашле.

Тагды матка была міла, калі нашы рукі і ногі мыла.

Адзін бацька гадуе пяць сыноў і не жалкуе, а пяці сынам важка пагадаваць аднаго бацьку.

Сын мой, да розум у яго свой.

Кандрат не вінават, да вінавата хата, што ўпусціла Кандрата.

Куды, воўча, ідзеш? — Па сірочае.

Жывучы ля пекла, і чорта з чарціхаю ў кумы папросіш.

Духоўнае жыццё

Зачыні чорту дзверы, так ён у вакно.

Пакуль да Бога, то святыя дух выймуць.

Не паможа бабе і кадзіла, калі бабу схапіла (сказіла).

Калі звоняць, то, мабыць, празнік.

Не кручаны — не рамень, не учаны — не чалавек.

Славен бубен за гарамі.

Чалавек, ягоныя якасці, мараль

Старасць не радасць, а горб не карысць.

Стары і гарбаты ачуняюць у магіле.

Мужык як баран: астрыжы, то ён зноў адрасце.

Дайгралася Матрунка ліхое немачы.

Кашаль — хвароба не ліхая, але хату не ўціхае.

Кароста не напасць, толькі ўночы спаць не дасць.

Дурнога і ў цэркві б'юць.

За дурным шчасце бяжыць.

Добрыя вочы дыму не баяцца.

Усе бабры дабры, адна выдра ліхая.

Ад чорта крыж маеш, а ад ліхога чалавека нічога.

Не ўмела сабачча лапа ляжаць на стале, дак ляжы пад сталом.

І дзела не рабі і ад дзела не ідзі.

Няўмеламу рукі не баляць.

Хоць укараціў, да ў двое скруціў.

Ціхая вада берагі рве.

Скоры сам набяжыць, а на ціхага Бог нанясе.

Хто сам за сябе не дбае, той трасцу мае.

Ад зямлі адарваўся і да неба не дастаўся.

На каню едзе і каня шукае.

Брахнёй свет пройдзеш, назад не вернешся.

Ад хлусні не мруць, толькі другі раз веры не даюць.

З паклону галава не баліць нікому.

Хто многа жадае, той нічога не мае.

У цэркві не быў, а шклянога бога бачыў.

П'янаму і Бог з дарогі ўступае.

Не біты — не чалавек, не кручаны — не рамень.

У чэпчыку радзіўся, а ў матузку згіне.

І сабакі не брахалі, а маю сякеру ўкралі.

Хто сала краў, таму ў вочы дым ідзе.

Чорт бы дзятла знаў, калі б не яго доўгі нос.

І коні ўкрадзеныя найдуцца, як злодзеі паб'юцца.

Хто маўчыць, двох наўчыць.

Хто з язычком, тэй з піражком.

Галава, за што ты валяешся? — За язык.

Агульныя разважанні

Век веку падасць да й яшчэ на тры дні будзе.

Круці не круці, трэба ўмярці.

Не ўмірае той, хто худ, але той, каму суд.

Няма такога зла, штоб з яго камусь не вышла дабра.

Зла не кліч — яно само прыйдзе.

Праўда, як алей: што ні рабі, то яна наверх выйдзе.

Чужое дабро бярэць за рабро.

За чужое лыка аддасі свой раменьчык.

Добра пець лалом за чужым сталом.

Навучанні і назіранні

Еш пірог з грыбамі ды дзяржы язык за зубамі.

Хто топіцца, той і за гострую касу схопіцца.

З пяску ні пугі, ні вяроўкі не саўеш.

Вол рагамі, а свінні нагамі.

Падняў высока, ды нічым не падпёр.

Ч. Пяткевіч. Духоўная культура Рэчыцкага Палесся. Варшава. 1938.

Выслоўі

Аж спіна колам стала.

— Баба, еш хлеб. — Не маю зубоў. — Баба, на табе мяса. — Буду грызці.

Будзе кій, ды не такі.

Бывала, што і варона кукавала, а цяпер і зязюля не каркае.

Гола, боса і праставалоса.

Гэтага будзе толькі на адзін зуб.

Дажыўся, што і сабакі нечым выгнаць.

Даў, што з носа ўпала.

Дзержыцца за панску клямку.

Дзіва, што ў дзеда барада сіва.

Ехаў нейкі разявака ды заехаў аглобляю мне ў рот.

Заехаць па мухаедах.

Заплютаўся сабака ў гарохавіны.

Зарабіў на нюх табакі.

Захацелася кабылі малака.

І рэшата хмелю не здолею падняць.

Капейка свярбіць.

Каша наша, а боршч ваш.

Масла пагасла, а сала патала.

Мы і самі з вусамі, толькі адно нос не аброс.

Не хацелі есці манны, няхай з'ядуць трасцы.

Некалі носа ўцерці.

Нешта ў лесе здохла — мабыць, мядзведзь.

Ні вока не бачыла, ні вуха не чула.

Нястрыжана — голена, не кіем, да палкаю.

Ось дзеўка, хоць вады напіцца.

Папаў куляй у пляцень.

Пашоў сабак дражніць.

Перахрысціўся леваю рукою.

Пляце кашалі з лапцямі.

Проці ліха на ўзгорку, дзе пень на калоду брэша.

Розум увесь паеў.

Сабачы век зжыў.

Спалохаўся, аж сарочка палатном стала.

Спіць, хоць ты яму зубы павырывай.

Стой да глядзі, хоць плюнь да ідзі.

Сюдою чорт сваё дзіця вазіў.

Тагды тое будзе, калі свіння з поля дадому прыйдзе, а не прыбяжыць.

Там доўга не папарышся.

Туды дарога шырокая, а адтуль вузенькая.

Ты мяне мяшком, а я цябе абушком.

Убіла б баба лося, штоб удалося.

Ужо і саломіны не пераломіць.

Ухапіў шылам патакі.

Хату хоць калочкам падапры.

Хіба ж я дурней папа?

Чаго ўперад бацькі прэшся на шыбеніцу?

Чорт мераў, да шнура парваў.

Шырока едзеш вузкаю сцежкаю.

Я ўжо не з аднае печы хлеб еў.

Як бы еты мароз не на ўсіх, да на аднаго чалавека, то б чыста змерз.

Штоб я калі дзе што-небудзь якое, а то я ніколі, нідзе, нічога, ніякага.

Еш, дурню, бо то з макам.

Пан кладзе пячаць, а мужык ведае (глядзіць) адкуль пачаць.

Першая чарка калом, а другая сакалом.

Дай, Божа, мяшаць свінням, да сваім.

Дай, Божа, у добры час сказаць, у благі прамаўчаць.

Бліскае (свеціцца) як воўк за гарою.

Водзіць як чорт п'янага па балоце.

Гавораць як у бубен б'юць.

Гаворыць як у скрыпку грае.

Дзяцей як бобу (гароху).

Наеўся як пальцам дастаць.

Спіць як маку наеўшыся (як пасля маку).

Ч. Пяткевіч. Духоўная культура Рэчыцкага Палесся. Варшава, 1938.

Ля рубля й капейцы зацішней.

Пустую грушу дармо і трэсці.

Паляцелі б і свінні, ды Бог крылаў не даў.

Добрай масці конік, ды воз не цягне.

Не хвалі цяліцу, бо ганіць будзеш кароваю.

Прыкусіць мо б каўбасою, што летась з'едзена?..

Звяглівы сабачка на выспятках расце.

Зап. П. П. Рабянок ад П. Л. Рабянка, жыхара в. Баршчоўка, 1914 г. н.

З ГІСТОРЫІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ

АЗЕРШЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Азершчына... бо сярод азярын (в. Азершчына)

Старажылы сведчаць: у далёкія часы вёска Азершчына ўяўляла сабой маляўнічыя мясціны. Атулялі яе азярыны, густа парослыя маладымі дрэвамі.

Праўда, зямля тутэйшая не надта ўрадлівая. Тым не менш, вёска стала прытулкам для многіх сялян, якія шукалі паратунку ад памешчыкаў. Калі ж чыноўнікі як след зацікавіліся Азершчынай, то гэта была ўжо немалая вёска. На сялян наклалі падатак, і Азершчына атрымала афіцыйны статус.

Каля вёскі знаходзіцца поле, якое называецца Меськім. Хутчэй за ўсё, ад украінскага слова «місто», што значыць горад. Менавіта на гэтым полі палкаводзец польскага кароля Штэфана Баторыя князь Вішнявецкі ў сярэдзіне XVII ст. зажадаў перарэзаць шлях казацкаму атраду Максіма Крыванаса, паплечніка Багдана Хмяльніцкага. Але баявое шчасце ўсміхнулася казакам. Дарэчы, аб гэтым эпізодзе мясцовай гісторыі як бы расказвае карціна «Максім Крывонос праследуе князя Вішнявецкага», якая знаходзіцца ў Гомельскім абласным краязнаўчым музеі.

Ёсць звесткі, што каля Азершчыны, на паўвостраве, атуленым з трох бакоў рэчкай Ведрычам, магутным Дняпром і возерам, у 1709 г. супыняліся лагерам шведы пад камандаваннем генерала Левенгаўпта, якія спяшаліся на дапамогу каралю Карлу XII.

Адбыўся бой паміж шведскім атрадам і войскамі Пятра I. Аб ім сведчаць шматлікія пахаванні, выяўленыя ў 1956 г. пры планіроўцы стапеляў для будаўніцтва металічных баржаў. У пахаваннях знойдзены шпагі, алавяныя гузікі, каскі і іншыя прылады вайсковай амуніцыі як шведскай, так і рускай прыналежнасці.

Захавалася паданне, што шведы, спяшаючыся, спіхнулі карэту з вайсковай казной у глыбокі калодзеж дый засыпалі яго зямлёй. Што да скарба, то ў 1905 г. хвалі Дняпра нібыта вымылі з берага нейкую скрыню. Яе знайшоў бакеншчык, а потым знік разам з багатай знаходкай.

Малаўрадлівая зямля не магла пракарміць усіх насельнікаў Азершчыны. Пэўныя цяжкасці меліся і ў развіцці індывідуальнай жывёлагадоўлі, бо мясцін для выпасу жывёлы азершчынцы фактычна не мелі. Сенажаці ля Дняпра належалі аднаму з мясцовых святароў. А вось гаспадаром поймы Ведрыча быў нехта па прозвішчу Станкевіч.

Менавіта таму вяскоўцы былі змушаны наймацца на работу па тралёўцы лесу. Яны гналі па Дняпры плыты як не да Чорнага мора. Дамоў вярталіся нярэдка праз паўгода.

У 1880 г. у Азершчыне адкрылася школа на два класы. Спачатку ў ёй вучыліся толькі хлапчукі. Але ў 1901 г. за парты селі і дзяўчынкі. Сама ж школка атрымала статус царкоўнапрыходскай.

Першы настаўнік — Кузьма Фёдаравіч Мядзвежанка. У свой час ён скончыў настаўніцкую семінарыю і чалавекам быў даволі адукаваным.

Першым, хто атрымаў з азершчынцаў сярэднюю адукацыю, быў Павел Аляксандравіч Лапата. Потым ён скончыў інстытут, стаў вядомым вучоным.

Некалькі жыхароў вёскі бралі актыўны ўдзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайне. Дарэчы, у Азершчыне знаходзіўся чырвонагвардзейскі атрад, які выбіў кайзераўцаў з Рэчыцы.

Першы старшыня Азершчынскага сельскага Савета — Яфім Іванавіч Крэс, першы сакратар — Іван Яфімавіч Кузмянок.

Адметным для вёскі стаў 1929 г., бо менавіта тады пачалося будаўніцтва тут суднаверфі. Пад прадпрыемства адышла тэрыторыя мясцовай прыстані.

Рабочыя ўзвялі памяшканні канторы і сталоўкі. Неўзабаве змантіравалі піларраму. Пасля гэтага пачаўся выпуск баржаў. Кожная будавалася за два з палавінай месяцы.

Як нагадваюць старажылы Азершчыны, і ў прыватнасці Васіль Рыгоравіч Кузмянок, у розныя гады суднаверф уваходзіла ў склад Днепра-Дзвінскага параходства, «Белсуднатрэста», «Глаўксуднаверфепрама» і г. д.

Пачатак калектывізацыі ў Азершчыне прыпадае на 1931 г. Прайшла яна без канфліктаў, бо фактычна ўсе мясцовыя жыхары ўскладвалі надзеі на калектыўныя формы гаспадарання.

Мясцовы калгас атрымаў назву імя Літвінава. На чале яго стаў Іван Васільевіч Сярак.

Увогуле, Азершчына лічылася вёскай надзвычай беднай. Тут толькі 3—4 сям'і мелі коней. Відаць, таму пад раскулачванне трапіў толькі адзін мясцовы селянін — Лявон Логіс. У віну яму было залічана тое, што набыў у свой час паравы млын. Вось і палічылі адпаведныя органы, што Логісы «шкодныя» для грамадства. Маёмасць сям'і была канфіскавана, але Логісы засталіся жыць у вёсцы.

Некалькі пазней маёмасць была канфіскавана яшчэ ў двух вяскоўцаў. Яны не пажадалі ўступіць у мясцовы калгас, атрымалі ад уладаў «цвёрдыя заданні» і, вядома, выканаць іх не здолелі.

Сталінскія рэпрэсіі па-сапраўднаму балюча закранулі Івана Лявонцевіча Лунькова і Станіслава Францавіча Чарнякоўскага, якія былі прысланы працаваць у Азершчынскую школу. Настаўнікаў арыштавалі і саслалі. Дарэчы, абодва былі рэабілітаваны. Іван Лявонцевіч — у 1948 г., а Станіслаў Францавіч — у 1957 г. Лунькоў вярнуўся з месцаў зняволення, жыў у Борхаве, дзе і памёр. А вось лёс С. Ф. Чарнякоўскага невядомы і па сёння.

20 жніўня 1936 г. упершыню па рэчыцкаму радыё прагучала выступленне, тады яшчэ нікому не вядомага, Азершчынскага хору. Стваральнікам і кіраўніком яго з'яўлялася Таццяна Карнееўна Лапаціна.

Ужо на наступны год хор прыняў удзел у рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці, а ў 1939 г. выступіў на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі краіны. У гэтым жа годзе калектыў хору быў накіраваны ў толькі што вызваленыя раёны Заходняй Беларусі, прыняў удзел у святочным канцэрце, што быў наладжаны ў гонар Народнага сходу ў горадзе Беластоку. Таццяна Карнееўна атрымала ордэн «Знак Пашаны». Пазней ёй было нададзена высокае званне заслужанага дзеяча культуры БССР.

У 1938 г. у вёсцы была створана машынатрактарная станцыя. Першы дырэктар яе — Забалоцец.

Станцыя мела 32 трактары, 4 камбайны, 5 малацілак і 6 аўтамашын. Калектыў МТС абслугоўваў калгасы вёсак Азершчына, Святое, Дземяхі, Коззе, Стара-Краснае, Нова-Краснае, Горваль, Берагавая Слабада і Глыбаў.

На франтах Вялікай Айчыннай вайны змагаліся з фашыстамі сотні жыхароў Азершчыны. 204 з іх не вярнуліся дамоў. Выконваючы заданні партызан, загінулі Іван Міхайлавіч Кузмянок, Васіль Фядосавіч Лапата, Таццяна Восіпаўна Янковіч, Гаўрыла Аляксандравіч Кузмянок, Пётр Піліпавіч Лапшак і Іван Самойлавіч Сярак.

Азершчына была вызвалена ад ворага 17 лістапада 1943 г. У той жа дзень перад байцамі і камандзірамі Чырвонай Арміі выступіў мясцовы народны хор.

Гады акупацыі прывялі да разбурэння Азершчыны. Фашысты разбілі суднаверф, абрабавалі калгас. Таму вяскоўцам давялося нямала папрацаваць, каб залячыць нанесеныя вайной раны. Зноў была адбудавана суднаверф. У справу эканамічнага і сацыяльнага развіцця вёскі значны ўклад і калектыву мясцовых меліяратараў.

Азершчына сёння — хутчэй за ўсё пасёлак гарадскога тыпу. Тут суднабудаўнічасуднарамонтны завод, ПМК-73, прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча, цэнтральная сядзіба саўгаса «Азершчына».

У вёсцы выдатная сярэдняя школа. Будзе ўзведзена яшчэ адна. Працуе ў Азершчыне і музычная школа. Хлопчыкі і дзяўчынкі ахвотна займаюцца і ў конна-спартыўнай школе.

Камісія па напісанні кнігі «Памяць» пры Азершчынскім сельскім Савеце народных дэпутатаў

БАРШЧОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

З вытокаў легенды (в. Капань)

Напэўна, назаўсёды застанецца загадкай тое, калі ж узнікла вёска Капань. Але бясспрэчна наступнае: у яе глыбокія гістарычныя карані. Пра тое сведчыць старажытнае гарадзішча і селішча, што прымыкала да яго.

Яшчэ на памяці людзей сталага веку той час, калі ўкруг вёскі раскашавалі балоты. На курганах жа, якія высіліся над багнаю, людзі знаходзілі напрасаваныя адыходы, вельмі падобныя на жалеза. Тлумачэнне таму наступнае: тэрыторыя сучаснай Капані

ўваходзіла некалі ў абшары Радзмічаў. А менавіта яны з'яўляліся сапраўднымі майстрамі па вырабу з балотнае руды жалеза. Напэўна ж, яна, балотная руда, здабывалася і ў наваколлі нашае вёскі. Затым з яе выраблялася жалеза. Ад слова «капаць», мусіць, і пайшла назва вёскі — Капань.

Амаль стогадовы Ісак Гаўрылавіч Пугачоў памятае, як некалі быў знойдзены ў тване плыт, які, хутчэй за ўсё, праляжаў на дне балота не адно стагоддзе.

Напрыканцы 60-ых гадоў жыў Мітрафан Яўхімавіч Маеўскі. Меў амаль сто гадоў. Памятаў тыя часіны, калі ў вёсцы было толькі чатырнаццаць хацін. Тады вёску абступаў дрымучы лес, балоты. У бок Дняпра — азёры, багатыя на рыбу, ды крыніцы.

Капанню валодалі паны Будзіноўскі і Валкавіцкі. Калі ў 1917 г. да вёскі дайшлі чуткі пра вялікія падзеі ў Петраградзе і Маскве, капанцы забралі ды падзялілі паміж сабою панскую маёмасць. Але неўзабаве прыйшлі кайзераўцы. Яны прымусілі людзей расплачвацца крывёю.

Шмат хто з жыхароў вёскі браў удзел у грамадзянскай вайне. Пад сцягам Шчорса змагаліся з кайзераўцамі Іван Гаўрылавіч і Васіль Гаўрылавіч Пугачовы.

Праз суровыя выпрабаванні прайшла Капань у 1920 г., калі Рэчыцу захапілі белапалякі. Яны імкнуліся прарвацца на Гомель. Але здолелі прабіцца толькі да станцыі Якімаўка. У Капані ж быў цяжкі бой. Белапалякаў сустрэлі тут курсанты школы чырвоных камандзіраў. Страты былі вялікімі з абодвух бакоў. Загінуўшых курсантаў капанцы пахавалі на вясковых могілках.

Скончылася замежнае нашэсце. У вёсцы наладжвалася мірнае жыццё. Адкрылася школа. Першай настаўніцай была Надзея Сцяпанаўна Літавор. Сама яна родам з Пінска, з сям'і каваля чыгуначнай майстэрні. Атрымала педагагічную асвету. Першы свой урок дала ў Капані. Затым працавала ў вёсцы Аляксандраўка, у Гомелі.

Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ў Капані было каля 170 двароў. Меліся сямігадовая школа, медпункт, лазня, клуб, крама. Большасць вяскоўцаў працавалі ў калгасе «XI з'езд Саветаў», у луггасе «Рэчыца», на чыгунцы. Шмат хто рабіў на нарыхтоўцы сена. Непадалёку ад вёскі ў населеным пункце Сеназавод яго прасавалі і адпраўлялі цягнікамі для патрэб конніцы Чырвонай Арміі і маскоўскай міліцыі. Старажылы нагадваюць, што да якасці работы на сеназаводзе ставіліся надзвычай строга. Кожны цюк сена меў адпаведную бірку, якая з'яўлялася як бы знакам якасці. Былі нават сартавальшчыкі. Яны пільна сачылі за тым, каб ніводная падазроная расліна не патрапіла пад прэс.

Вёска мела шырокія перспектывы. Меркавалася будаваць тут сярэднюю школу. Але планам не суджана было збыцца. Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Некалькі дзесяткаў вяскоўцаў не вярнуліся з франтоў дамоў. Шмат каго закатавалі карнікі.

Зараз Капань — дачная зона. Яе як бы ўзялі ўкруг рэчыцкія і гомельскія садаводчыя кааператывы. У вёсцы пачатковая школа, клуб, бібліятэка, крама, пошта, медпункт.

П. Рабянок, Я. Тулупаў

БЕЛАБАЛОЦІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

На старажытнай зямлі (в. Чорнае)

...Шуміць наўкол лес. Блішчыць роўнядзь азёраў. На ўзвышшы, акружаным з усіх бакоў вадою, размясцілася старажытнае славянскае паселішча Гарадок. Ягоныя жыхары пакінулі пасля сябе рэшткі матэрыяльнай культуры, якія нагадваюць нам аб далёкім жыцці продкаў. Гэта каля 200 абломкаў ляпнога посуду (кераміка з расчосамі і глянцаваная), гліняны гузік з 5 выступамі і адтулінай пасярэдзіне (рытуальнага прызначэння), бронзавая трапецападобная падвеска. Усё гэта адносіцца да мілаградскай і зарубінецкай культур.

Яшчэ нядаўна жылі людзі, якія памяталі прыгонніцтва і рэкрутчыну. Ефрасіння Васільеўна Захарчанка згадвала, як яе бабулю Еўгу памешчык памяняў на сабак. Аддаў суседняму пану двух сабак, а ў таго забраў дзвюх пяцігадовых дзяўчынак, стрыечных сясцёр.

Неяк жа зазлавала пані Завіхневічыха, дый загадала пакараць сваю служанку На-

таллю Яўмененку. Яе збілі розгамі. А на наступны дзень няшчасная памерла.

Ева Андрэеўна Старыкава памятала, які лёс спаткаў яе дзеда Ісака. З Чорнага ў войска павінен быў ісці рэкрут. Але родзічы ягоныя здолелі сабраць пэўную суму грошай і адкупілі хлопца. Замест яго на царскую службу выправіўся Ісак Старыкаў. Дамоў ён не вярнуўся.

На легендарным крэйсеры «Вараг» служыў чарнянец Андрэй Мітрафанавіч Паўлаў. Пасля гібелі карабля яму пашанцавала застацца ў жывых. За храбрасць і гераізм быў адзначаны ордэнам і крыжам, двума медалямі. Дарэчы, пасля вызвалення вёскі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў у лістападзе 1943 г. А. М. Паўлаў браў актыўны ўдзел у аднаўленні калгаса, за што ўзнагароджаны медалём «За доблесную працу у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў».

...1913 г. Вёска выступіла супраць памешчыка Завіхневіча. Перамаглі сяляне.

Лістапад 1917 г. У вёсцы ўстаноўлена савецкая ўлада. Першымі старшынямі мясцовага выканкама былі Сямён Рыгоравіч Язікаў і Лука Іванавіч Гузаў.

Актыўнымі ўдзельнікамі грамадзянскай вайны з'яўляліся С. П. Яўмененка, Р. А. Халецкі, М. Манойлін. Яны змагаліся з кайзераўцамі і фарміраваннямі Пятлюры.

1919 г. Ва Уваравічах ствараецца першая камуна. А ў нашай вёсцы — першае аддзяленне гэтай камуны. Пабудовы камуны знаходзіліся ў былым памешчыцкім маёнтку.

1931 г. У вёсцы арганізоўваецца калгас. Яго назвалі «Чырвоны востраў». На першым часе яго ўзначальваў Герасім Мікалаевіч Пыраеў.

Грымнула Вялікая Айчынная вайна. Каля 300 ураджэнцаў вёскі змагаліся з гітлераўцамі на франтах, шмат хто ў партызанскіх атрадах. Амаль палова з іх загінулі. 14 жыхароў вёскі былі расстраляны, спалены ці закатаваны карнікамі.

У 1975 г. у цэнтры вёскі, каля клуба, быў насыпаны Курган Славы на ўшанаванне памяці 340 жыхароў сельсавета, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны (у сярэдзіне 80-х гадоў цэнтр сельсавета з Чорнага быў пераведзены ў вёску Белае Балота).

Чорнае — радзіма Міхайлы Грамыкі (Міхаіла Аляксандравіча). Ён нарадзіўся тут 31.10.1885.

На жаль, вёска Чорнае ў многім страціла сваё ранейшае значэнне. Яшчэ ў канцы 60-ых гадоў тут была сярэдняя школа, у якой вучыліся 200 вучняў. Зараз школка пачатковая. Ёсць клуб, бібліятэка. Але моладзі мала. Верыцца, што з'ява гэта часовая, і ў старажытнай вёскі будзе шчаслівы лёс.

Н. Бысянкова

ВАСІЛЕВІЦКІ ГАРСАВЕТ

На шляху княгіні Вольгі... (дакастрычніцкі перыяд г. Васілевічы)

Час заснавання Васілевіч невядомы. Археалагічныя даныя сведчаць, што людзі жылі тут і ў глыбокай старажытнасці. Непадалёку ад Васілевіч знойдзены клінападобная сякера з абухом і сякера абуховага тыпу. Знаходкі сведчаць пра тое, што тэрыторыя Васілевіч была заселена ў эпоху бронзы (II — I тысячагоддзя да н. э.). Археолагі лічаць наяўнасць пасялення тыпу гарадзішча паблізу Васілевіч, характэрнага для жалезнага веку і эпохі ранняга феадалізму.

Аб старажытным паходжанні Васілевіч сведчаць такія факты. Сярод мясцовых жыхароў у канцы XIX ст. бытавала паданне аб тым, што калодзежы, названыя «зоўжынамі», або «іоўжынамі», былі выкапаны па загаду княгіні Вольгі ў час яе паходу на драўлян. У другой палове XIX ст. на адным з курганоў паблізу Васілевіч была знойдзена надмагільная пліта, надпіс на якой быў зроблены стараславянскімі літарамі.

Першыя выяўленыя ў архівах звесткі аб Васілевічах датуюцца 1560 г. Яны ўтрымліваюцца ў рэестры рэвізіі так званай гаспадарскай Рэчыцкай воласці, які дайшоў да нас з позняй копіі. Згодна з ім, у Васілевічах налічвалася 17 гаспадарак (дамоў) і 7 участкаў (так званых службаў), якія з'яўляліся адзінкай абкладання. У сярэднім на кожны ўчастак прыпадалі 2—3 гаспадаркі.

У склад Расіі Васілевічы ўвайшлі пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.).

У першай палове XIX ст. Васілевічы ўяўлялі сабой вялікае сяло, якое належала дзяржаве. Яны не ведалі памешчыкаў. Асноўным заняткам жыхароў, якія ў пераважнай большасці з'яўляліся сялянамі, былі земляробства і лясны промысел.

У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Рэспублікі Беларусь у Мінску захаваўся інвентар казённага маёнтка Васілевічы 1858 г., які ахопліваў не толькі Васілевічы, але і бліжэйшыя навакольныя вёскі. Дарэчы, інвентары ўяўлялі сабой гаспадарчыя кнігі, у якіх давалася падрабязнае апісанне маёнтка, яго даходаў, памераў зямельных надзелаў і павіннасцей сялян.

Дык вось, агульная плошча казённага маёнтка Васілевічы складала 61,4 тысячы дзесяцін, з якіх 10,5 тысячы — прыдатныя для земляробства землі, 27,1 тысячы — няўдобіцы і 23,8 тысячы дзесяцін былі заняты лесам.

З ліку прыдатных зямель каля 8 тысяч дзесяцін знаходзіліся ў карыстанні сялян, 2,3 тысячы — складаў так званы запасны фонд. Астатнія прыдатныя землі знаходзіліся ва ўласнай запашцы і ў асоб несялянскага паходжання. Сярод сялян карыстальнікамі поўных надзелаў у маёнтку было 290 двароў, паўнадзелаў — 84 двары.

Такім чынам, напярэдадні рэформы 1861 г. сярод сялян Васілевіч была няроўнасць. Тыя, што былі ўладальнікамі паўнадзелаў, уяўлялі сабой малазабяспечаную групу сялян, а агароднікі і бабылі — сялян, якія разарыліся. Усяго ў маёнтку меліся 2053 рэвізскія душы мужчынскага полу, якія надзяляліся зямлёй.

У эканамічным росце Васілевіцкай воласці ў парэформенны перыяд найбольшае значэнне адыгралі дзве абставіны. Па-першае, у 70-ых гадах XIX ст. экспедыцыя генерала І. І. Жылінскага правяла так званую каналізацыю (асушэнне) балот вакол сяла, што павялічыла фонд прыдатнай зямлі, дало магчымасць правесці карацейшыя прасёлкавыя дарогі. На асушаных землях, як, напрыклад, у 1885 г., сабіраліся высокія ўраджаі агародніны (капусты, морквы і г д.). Па-другое, у 80-ых гадах XIX ст. пачалося будаўніцтва Палескіх чыгунак. У 1886 г. была ўведзена ў строй дзеючых і лінія Лунінец — Гомель, якая праходзіла праз Васілевічы.

У 1897 г., згодна з Усерасійскім перапісам насельніцтва, у Васілевічах налічвалася 298 двароў, пражывалі 873 мужчыны і 851 жанчына, а ўсяго — 1724 чалавекі. У 1908 г. колькасць насельніцтва складала 2406 чалавек, або павялічылася больш чым на трэць.

І пасля рэформы 1861 г. асноўнымі заняткамі жыхароў Васілевіч заставаліся сельская і лясная гаспадарка. Хаця сяло з усіх бакоў было акружана лясамі, сяляне адчувалі сур'ёзныя цяжкасці з дровамі, лесаматэрыяламі. У архіўных фондах нямала спраў, звязаных з так званай самавольнай парубкай лесу ў Васілевіцкай казённай дачы. Так, у сярэдзіне 70-ых гадоў XIX ст. да адказу за ссечанае дубовае дрэва быў прыцягнуты Сцяпан Малахавіч Белы. Праследваліся сяляне і за самавольную пасьбу жывёлы на лугах дзяржаўнага маёнтка.

Прадпрыемствы прамысловага тыпу з'явіліся ў Васілевічах у пачатку XX ст. У 1904—1913 гг. працаваў дрэваапрацоўчы завод, які выраблял чаўнакі, бабіны, паганялкі для прадзільных і ткацкіх фабрык Расіі на 120 тысяч рублёў у год. Завод меў паравы рухавік у 120 конскіх сіл. Калектыў прадпрыемства складалі 120 чалавек. На міжнароднай выставе ў Бруселі, якая адбылася ў 1905 г., прадукцыя васілевіцкага дрэваапрацоўчага завода была адзначана Вялікім Залатым медалём, на выставе ў Бесарабіі (1912 г.) — Малым Залатым медалём.

У мястэчку працаваў паравы млын, які належаў Х. Берштэйну і Х. Бухману.

У 1912 г. было ўзбуджана хадайніцтва аб адкрыцці ў Васілевічах фабрыкі для вырабу шпуляў. Пасведчанне на яе адкрыццё атрымаў І. Ф. Уткін. Здарылася тое ў 1914 г. Фабрыка належала гандлёваму дому «Браты Н. і І. Уткіны», які знаходзіўся ва Уладзімірскай губерні.

Гандаль у Васілевічах меў у асноўным дробязны характар. У 1897 г. было 5 гандлёвых кропак. У 1902 г. ва ўсёй воласці працавалі 10 крам, абарот якіх вагаўся ад 100 да 1000 рублёў. Уладальнікі гэтых крамак ледзь-ледзь зводзілі канцы з канцамі. Прыбытак, калі такі меўся, вымяраўся ў некалькі рублях або дзесятках.

Мясцовы гандаль вёўся таксама на кірмашы, які адбываўся штогод 7 снежня і працягваўся толькі адзін дзень.

У 1897 г. у Васілевічах былі два піцейныя дамы.

Цэнтрам духоўнага жыцця з'яўлялася царква, дазвол на ўзвядзенне якой быў атры-

маны ў 1806 г. Святамікалаеўская царква, пабудаваная на сродкі прыхаджан, адчыніла свае дзверы перад вернікамі ў 1825 г. Яна ўяўляла сабой драўляную будыніну на каменным фундаменце. У прыход царквы ўваходзілі, апроч жыхароў Васілевіч, сяляне вёсак Навінкі, Залатая Дуброва, Галоўкі, Бабічы, Кабылеў. У 1879 г. сярод прыхаджан было 1578 мужчын і 1644 жанчыны, у 1901 г. — адпаведна 2681 і 2672.

Настаяцелем Святамікалаеўскай царквы на працягу многіх дзесяцігоддзяў быў Леў Сямёнавіч Турцэвіч, які скончыў Мінскую духоўную семінарыю. Прозвішча гэтага чалавека, як святара, у Васілевічах сустракаецца нават у пачатку XX ст., хаця першую пропаведзь ён прачытаў тут яшчэ ў 1865 г.

Быў у Васілевічах і яўрэйскі малітоўны дом.

Да пачатку 1917 г. працавалі дзве навучальныя ўстановы, якія давалі пачатковую адукацыю. Так, яшчэ ў 1866 г. у Васілевічах было адкрыта народнае вучылішча. Казна адпусціла тады на наём памяшкання 47 рублёў, на аплату настаўніку — 150 рублёў і на вучэбныя прыналежнасці 27 рублёў. Каштарыс расходаў складаў на год 224 рублі.

9 лютага 1868 г. былыя дзяржаўныя сяляне Васілевіцкай воласці сабраліся на сход і вырашылі сабраць для патрэб народнага вучылішча, апроч ранейшых 6 капеек серабром у год, што браліся з мужчынскай душы, яшчэ па 10 капеек. Гэта дазволіла сабраць яшчэ 99 рублёў 60 капеек.

У расказаным вышэй акце сяляне праявілі разуменне важнасці адукацыі.

У 1874 г. народнае вучылішча ўжо знаходзілася ў грамадскім памяшканні. Настаўнікам рабіў Якаў Сцяпанавіч Кеда, выхаванец Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі.

У пачатку XX ст. у навучанні дзятвы Васілевіч адбыліся станоўчыя зрухі. Так, на 1 студзеня 1908 г. у народным вучылішчы займаліся 60 дзяцей, у царкоўнапрыходскай школе — 75. Прыкладна 65 працэнтаў дзяцей былі ахоплены пачатковым навучаннем.

У 1908 г. у Расіі меркавалася ўвесці ўсеагульную пачатковую адукацыю. У Васілевічах з 208 хлопчыкаў і дзяўчынак 8—11 гадоў, якія павінны былі атрымліваць пачатковую адукацыю, 108 — належала займацца ў народным вучылішчы, а 100 — у царкоўнапрыходскай школе. Але планы гэтыя ажыццёўлены не былі.

Частка выпускнікоў васілевіцкіх школ у зімовы перыяд накіроўваліся ў навакольныя вёскі, дзе абучалі дзяцей навыкам чытання і чатыром дзеянням арыфметыкі.

Славутасцю Васілевіч з'яўлялася метэаралагічная станцыя для вывучэння кліматычных умоў Палесся. Яна адкрылася ў 1878 г. і была адной з першых станцый на тэрыторыі Беларусі.

Х. Бейлькін, доктар гістарычных навук

Племзавод «Ведрыч» (вёскі Ведрыч і Рассвет)

У 1920 г. Васілевічы былі спалены белапалякамі. І тады пяць сямей мястэчка выправіліся на невялікую пясчаную градуду сярод балота, за 6 кіламетраў ад Васілевіч, пабудавалі там сабе жытло. Так утварыўся хутар, які і даў пачатак вёсцы Ведрыч.

Адзін з першых насельнікаў хутара — Савелій Цімафеевіч Навуменка нагадваў: «Латка зямлі, гожая для апрацоўкі, была невялікай. А наўкол балоты. Трэба было брацца за асушэнне. Дзяржава дапамагала. Ужо ў 1928 г. на хутары быў узведзены інтэрнат. Затым — сталоўка, якая ўвечары ператвараласяся ў клуб. Наехалі ў Ведрыч новыя людзі. У асноўным — моладзь. Большасць работ па праклады адводных каналаў рабілі ўручную. Гектар за гектарам, і адбіраліся ў балота ўрадлівыя землі».

1 снежня 1930 г. пастановай Савета Міністраў БССР быў утвораны саўгас «Ведрыч». Гаспадарка спецыялізавалася на вырошчванні канапель. Але высокіх ураджаяў гэтай культуры атрымаць не ўдалося. Справа ў тым, што каналы былі неглыбокімі, праклады валіся рэдка. Таму глеба падсыхала марудна, а гэта стрымлівала пачатак сяўбы. Менавіта таму саўгас «Ведрыч» у 1932 г. быў ператвораны ў лугавую гаспадарку. Ягонай галоўнай задачай стала нарыхтоўка сена для патрэб Чырвонай Арміі.

Гаспадарка адбудоўвалася. Былі ўзведзены некалькі жылых дамоў, склады, яшчэ адзін інтэрнат, пякарня, дзіцячы сад. Затым — лазня, магазін, кантора.

У 1932 г. «Ведрыч» набыў 20 трактароў. Мясцовыя рацыяналізатары пашырылі на

іх колы, пачалі прымяняць тэхніку на меліярацыйных работах.

Нялёгка ўстанавіць прозвішчы першых кіраўнікоў гаспадаркі, але старажылы згадваюць: першым дырэктарам саўгаса быў Місюля. У 1932 г. яго змяніў Гоф. З 1934 г. дырэктарам быў прызначаны Навум Любамірскі, з 1938 — Васіль Шарай.

«Ведрыч» рос, адбудоўваўся. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны было завершана будаўніцтва адкрытай асушальнай сеткі. На фермах гаспадаркі знаходзіліся звыш ста кароў. Гадаваліся свінні, авечкі, коні. Саўгас меў 30 трактароў, некалькі аўтамашын. Былі ўзведзены гаражы, механічная майстэрня. Каля 60 сем'яў жылі ў камунальных кватэрах, звыш 40 — у прыватных.

Але ж неабходнай колькасці людзей для правядзення меліярацыйных і сельскагаспадарчых работ усё ж не хапала. Таму ў перыяды ўборкі ўраджаю і нарыхтоўкі кармоў прыцягвалася значная колькасць сялян з суседніх вёсак, Калінкавіцкага, і нават Петрыкаўскага раёнаў.

Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Толькі ў першыя дні яе ў дзеючую армію выправіліся 90 ведрычан. Многія працаўнікі «Ведрыча» змагаліся з ворагам у партызанскіх атрадах.

59 жыхароў Ведрыча загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Фактычна ж, супраць акупантаў узнялася ўся вёска. Аб тым сведчыць наступнае.

Пасля акупацыі фашысты вырашылі скарыстаць урадлівыя асушаныя землі. Прыслалі ў Ведрыч з Германіі упраўляючага. Потым прыгналі коней і кароў, адабраных у жыхароў навакольных вёсак. Былі дастаўлены нават тры трактары.

Неўзабаве быў створаны невялікі нямецкі гарнізон.

Гітлераўцы разлічвалі з дапамогай ведрычан на шырокую аснову паставіць развіццё жывёлагадоўлі для забеспячэння сваіх франтавых часцей прадуктамі харчавання.

Але акупанты пралічыліся. Ведрычане ўсяляк перашкаджалі ім ажыццявіць намечанае. А калі ферма вырасла да ста кароў, вяскоўцы з дапамогай партызан разграмілі нямецкі гарнізон, спалілі жывёлагадоўчыя памяшканні, майстэрні, пякарню, знішчылі трактары, а ўсіх кароў і коней перагналі ў партызанскую зону.

Пасля гэтага немцам так і не ўдалося аднавіць жывёлагадоўчую ферму. Бачачы марнасць сваіх намаганняў, яны скіравалі гнеў на мірнае насельніцтва. Некалькі сем'яў ведрычан былі імі расстраляны.

...У другой палове лістапада 1943 г. вёска Ведрыч была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адразу ж тут былі размешчаны армейскія курсы малодшых лейтэнантаў. Іх фарміравалі з байцоў і сяржантаў, якія найбольш вызначыліся ў баях. Так, сярод курсантаў было 18 Герояў Савецкага Саюза.

Курсанты па магчымасці аказвалі дапамогу жыхарам вёскі ў наладжванні мірнага жыцця.

На захадзе грымелі баі. Дарослыя мужчыны са зброяй у руках грамілі ворага. Жанчыны ж і падлеткі ўзводзілі грамадскія пабудовы, ураблялі зямлю-карміцельку. На першым часе людзі цягалі на сабе і плугі і бароны.

Дапамагала дзяржава. Ужо ў 1944 г. рашэннем ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР было створана Ведрыцкае міжгаспадарчае ўпраўленне асушальных сістэм. Перад ягоным калектывам ставілася задача прывесці да ладу разбураную асушальную сетку на тарфяніках.

Пачала паступаць тэхніка. З усходніх раёнаў краіны дастаўляліся жывёла, трактары, сельгасмашыны, насенне. Гэта дало магчымасць ужо ў 1945 г. засеяць амаль даваенную плошчу, вырасціць высокі ўраджай збожжа, бульбы, траў.

У саўгасе шырокае прымяненне знайшоў звеннявы метад вырошчвання сельскагаспадарчых культур. Адно з такіх звенняў узначальвала Марыя Рыгораўна Рабянок. У яе звяне былі 10 жанчын. Мелі ўчастак у 15 гектараў. Уручную падкормлівалі расліны, вялі праполку, браліся нават за штучнае апыленне.

Старанная праца давала добры плён. Ураджаі раслі. У 1948 г. звяно Марыі Рыгораўны сабрала на 14 гектарах па 29,5 цэнтнера жыта. За гэты паказчык звеннявая была ўзнагароджана ордэнам Леніна.

У наступным, 1949 г. звяно М. Р. Рабянок на 15 гектарах вырасціла па 42 цэнтнеры збожжа. Узнагародай за такі паказчык стаў для звеннявой другі ордэн Леніна.

У 1950 г. высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы была ўдастоена Кацярына Апанасаўна Мятлушка. Ад кожнай з замацаваных за ёй 8 кароў даярка атрымала ў 1949 г. па 6401 кілаграму малака.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы

атрымаў і кіраўнік трактарнай брыгады Сцяпан Дзмітравіч Фешчанка.

Добрая ўрадлівасць асушаных зямель, высокія эканамічныя паказчыкі саўгаса «Ведрыч» прыцягнулі ўвагу жыхароў не толькі суседніх вёсак.

У Ведрыч ехалі людзі як не з усёй вобласці. У вёсцы стала як бы цесна. Вось тады і з'явіліся за некалькі кіламетраў ад Ведрыча, на другой пясчанай градзе, першыя зямлянкі, а ў 1947 г. — першыя дамы. Першым навасёлам стаў Парфен Марцінкоў.

Хутару, а неўзабаве вёсцы далі назву «Рассвет». Яна хутка адбудоўвалася. Тут была створана яшчэ адна малочнатаварная ферма гаспадаркі.

У пачатку 50-ых гадоў у «Ведрычы» былі ўзведзены жывёлагадоўчыя памяшканні, механічныя майстэрні, склады. Гаспадарка ўпэўнена рухалася наперад. Калі раней тут мелі месца рэкорды на невялікіх плошчах і з малой колькасцю жывёлы, то ў восьмай і дзевятай пяцігодках высокія вытворчыя паказчыкі сталі масавымі.

Па выніках восьмай пяцігодкі званне Героя Сацыялістычнай Працы было прысвоена яшчэ аднаму працаўніку «Ведрыча» — Уладзіміру Данілавічу Юрчанку, брыгадзіру комплекснай брыгады вёскі Рассвет.

Гаспадарка мела магчымасць значныя сродкі накіроўваць на сацыяльна-культурнае будаўніцтва. Так, у восьмай пяцігодцы была пабудавана дарога з цвёрдым пакрыццём ад Васілевіч да Ведрыча, гравійная дарога — да вёскі Рассвет. У дзевятай пяцігодцы узведзены Дом культуры, гандлёвы цэнтр, будынак для сярэдняй школы і г. д. Разам з жыллёвымі памяшканнямі яны далі магчымасць афарміцца цэнтру Ведрыча як пасёлку гарадскога тыпу.

Гонарам гаспадаркі з'яўляецца і дзіцячы сад-яслі, які мае нават плавальны басейн.

Старанная праца ведрычан неаднаразова адзначалася камітэтам ВДНГ СССР. У снежні 1968 г. саўгас узнагароджаны Памятным сцягам ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ. У студзені 1971 г. — ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. А ў маі таго ж 1971 г. гаспадарцы была ўручана і Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР.

У 1973 г. саўгас стаў племзаводам. Першараднай задачай гаспадаркі стала вырошчванне племяннога маладняку буйной рагатай жывёлы.

Вядома ж, гонар славутай гаспадаркі здабыты рупнымі рукамі ягоных працаўнікоў. На племзаводзе тры Героі Сацыялістычнай Працы, звыш 20 чалавек адзначаны ордэнамі Леніна. А ўсяго каля 150 працаўнікоў «Ведрыча» ўзнагароджваліся ордэнамі і медалямі.

У 1979 г. кіраўнік механізаванага звяна племзавода Анатоль Маркавіч Дземідзенка вырасціў на кожным са 122 гектараў па 326 цэнтнераў бульбы. А потым за 30 рабочых дзён бульбаўборачным камбайнам Е-665 накапаў 4037 тон клубняў, што з'явілася ўсесаюзным рэкордам.

Поспехі «Ведрыча» ў многім звязаны са Станіславам Цімафеевічам Петачэнкам. Ён узначаліў гаспадарку ў 1963 г. Працаваў да тае пары, пакуль дазваляла здароўе. Самаадданая праца дырэктара адзначана ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Некалькі гадоў племзавод узначальваў былы галоўны заатэхнік гаспадаркі, кандыдат сельскагаспадарчых навук Леанід Іванавіч Глытаў. Апошнія 7 гадоў дырэктарам працуе Мікалай Цімафеевіч Арэшка.

Жыхары Ведрыча вераць: заўтрашні дзень будзе для іх шчаслівейшы сённяшняга. А каб гэтак было, яны і працуюць, нараджаюць дзяцей — жывуць на старажытнай і шчодрай зямлі, якая ўмее дзячыць працавітым.

Зашчоб'е... бо за Шчобам? (З гісторыі в. Зашчоб'е)

Жыў тут украінец. І біў сваю жонку. Людзям дзіва: збіраюцца, глядзяць. Ён б'е, а яна пытае:

— За шчо б'еш?

І сталі потым у жарт гаварыць:

— Дзе быў?

— У Зашчоб'і.

— Б'е мужык жонку?

— Б'е.

— За што б'е?

— Выпіць не дае.

Вот і пайшло Зашчоб'е і Зашчоб'е.

Запісаў В. І. Скідан ад Нікіфара Васільевіча Галоўкі, 1912 г. н. («Легенды і паданні», Мн.: 1983).

Паданне расказвае так. Жыў за Хойнікамі некі пан. І быў у яго брат. Удумалі неяк браты зямлю дзяліць. Аднаму зямля да ўрочышча Шчоб (в. Вялікі Бор), а другому — за Шчобам. Вось таму і Зашчоб'е.

...Сюды, у Зашчоб'е, перасяліліся напачатку 18 сялянскіх двароў. Прозвішчы першых перасяленцаў — Цэйка, Дасько, Давыдзенка, Панкраценка.

Хутчэй за ўсё, вёска ўзнікла ў пачатку мінулага стагоддзя.

Буйных падзей у яе гісторыі, можна сказаць, не было. Вядома, што наш зямляк Майсей Дасько браў удзел у руска-японскай вайне (1904—1905 гг.).

За цара-бацюхну выправіўся на першую сусветную вайну Сафрон Майсеевіч Галоўка. Патрапіў у палон. Жыў у Нямеччыне 7 гадоў. Чатыры разы ўцякаў, ды кожны раз яго лавілі. У палон патрапіў на пачатку вайны, а дамоў вярнуўся ў 1921 г.

Старажылы Зашчоб'я добра памятаюць тое, як пасля рэвалюцыі ў наш палескі край нахлынулі кайзераўцы. Рабавалі людзей, пакідалі ў вёсцы сваіх, каб падлячыліся пасля хваробы ці ранення.

Немцы разагналі і сельскі Савет нашай вёскі, які быў утвораны ў канцы 1917-га. Але як толькі немцаў турнулі назад, Савет аднавіўся. Знаходзіўся ён там, дзе цяпер вуліца Сялянская. Старшынёй Савета быў Васіль Зянька, потым — Сафрон Майсеевіч Галоўка. Парабіў Сафрон у нас два гады і абралі яго ў Васілевічах за старшыню валаснога Савета.

Памятае сёй-той, як у Зашчоб'е прыязджалі тры камандзіры Чырвонай Арміі. Збіралі для войска хлеб.

Пасля рэвалюцыі людзі атрымалі зямлю. На так званую поўную сям'ю (шэсць дарослых душ) зямлі выпадала па сем гектараў, ды яшчэ два гектары сенакосу на балоце.

Багатых у Зашчоб'і не было. Толькі асобныя гаспадаркі мелі 2—3 кані.

Існавала ў нашай вёсцы добраахвотнае таварыства па меліярацыі. Кожны член таварыства павінен быў адрабіць за год на балоце (карчаванне лазы, паглыбленне канаў і г. д.) 10 дзён. За гэта і атрымліваў дадатковы сенакос. У таварыства ўваходзілі недзе чалавек 25.

Зімой 1929 г. зашчоб'еўцы сабраліся на сход. Паслухалі людзей з раёна, якія раілі арганізавацца ў калгас. Першымі калгаснікамі былі Васіль Васільевіч Дасько, Гаўрыла Дасько, Дзмітрый Дасько, Пракоп Козыр, Васіль Цэйка, Кірыла Якаўлевіч і Пётр Якаўлевіч Цэйкі. Яны і яшчэ каторыя з зашчоб'еўцаў сабралі ў адно гумно свой сельскагаспадарчы інвентар, цягло. Назвалі калгас «Іскра Ільіча», выбралі старшыню. Гэта быў чалавек не тутэйшы, а родам з Украіны.

Яго змяніў Рэбікаў. Таго ў сваю чаргу Валошка. Потым за старшыню калгаса быў Пальчык.

На першым часе калгаснікі Зашчоб'я маглі спадзявацца пры апрацоўцы зямлі толькі на коней ды валоў. Становішча змянілася, калі ў 1934 г. у Васілевічах была арганізавана МТС. Тады і нашы землякі ўбачылі першы ў сваім жыцці трактар.

У 1936 г. пачалося будаўніцтва шашы Гомель-Калінкавічы непасрэдна ля вёскі. І тады члены арцелі «Іскра Ільіча» падрадзіліся вазіць да шашы пясок і іншыя будаўнічыя матэрыялы.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, пераважная большасць нашых землякоў выправіліся на фронт. Тыя ж, што засталіся, арганізавалі эвакуацыю ў глыб краіны ўсёй калгаснай жывёлы.

Дзень вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прыйшоў у Зашчоб'е 21 лістапада 1943 г. Амаль адразу ж аднавіўся калгас. Рабілі ў ім у асноўным жанчыны ды падлеткі.

Стала крыху лягчэй, калі з вайны пачалі вяртацца мужчыны, каторым пашанцавала ацалець у страшэнных выпрабаваннях, калі гаспадарка адчула, урэшце, нейкую дапамогу з боку дзяржавы.

5 чэрвеня 1963 г. калгас «Іскра Ільіча» ўвайшоў у саўгас «Маканавічы».

В. Цэйка, жыхар в. Зашчоб'е

ДЗЕМЯХОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Гарадок, якога няма

Калі ісці ад Дземяхоў ці Коззя да Ведрыча, то на тым беразе рэчкі, мо метраў за дзвесце, гарыстая мясціна. Абвалована валам з усіх бакоў. І пасярэдзіне бытта вал. Завецца яна Гарадком.

Шчэ як бацька мой Рыгор Нічыпаравіч Катлабай жывым быў, то расказваў: дзятвой, моў, ганялі туды гавяду — кароў ды цялят. Разоў з колькі знаходзілі старынныя лыжкі ды відэльцы. Схаваныя былі яны пад дубамі, што ледзь ахапіць трэм чалавекам. Такія от былі дубы. Калі ж бацька маленькім пастушкаваў, то ад дубоў тых тырчэлі з зямлі адно пні. Значыць, спілаваліся дрэвіны, што і ніхто не памятаў, калі тое было.

А вот пагалоска дайшла такая. Пры старых царах яшчэ, сотні мо чатыры гадкоў таму, прыбіліся ў нашыя мясціны людзі здалёку. Уцякалі яны ад царскае няміласці. У Бога верылі не так як усе. Стараверы, значыць.

Куды ні ўцякаюць, а войска царскае ўслед.

А потым, моў, нехта з царскае радні і закінуў за іх слова. «Хай, — кажа, — не ўроссып бадзяюцца, а мясціны пэўныя ажываюць. А калі зробяць гэтак, то і не трэба іх чапаць».

Паслухаў цар раду, ды і згадзіўся. От стараверы і пачалі селішчы свае валамі акружаць ды агароджваць. А каб не так боязка было, то далей ад Масковіі ішлі.

Зрабілі, як бачна, гарадок такі і ў нас. Колькі тут жылі — ніхто не ведае. На месцы селішча іхняга засталіся адно пагоркі ды валы.

А мясціна і дасюль Гарадком завецца. Як хто ідзе куды за рэчку Ведрыч, то і кажа: «Пайду на Гарадок».

Зап. у 1993 г. П. П. Рабянок ад жыхара в. Дземяхі Івана Рыгоравіча Катлабая, 1906 г. н.

ДУБРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Адкуль ёсць і пайшла... (З гісторыі в. Васількоў)

З дзяцінства турбавалі думкі: «Калі ж з'явілася ты, мая родная вёска? Кім былі твае першыя насельнікі, чым займаліся?» Жадалася прасачыць лёс уласных дзядоў і прадзедаў.

Адказ на гэтыя і многія іншыя пытанні далі дакументы архіваў, успаміны старажылаў Васількова.

Ёсць усе падставы для таго, каб з упэўненасцю сцвярджаць: мая родная вёска існавала ўжо ў пачатку XVI ст. Паходжанне яе назвы звязана, хутчэй за ўсё, з першапасяленцам, якога звалі Васілём ці Васільком.

Каторы час насельнікі вёскі адчувалі моцны ўціск польскіх магнатаў. Надзеі на лепшае не спраўдзіліся і пасля падзелу Рэчы Паспалітай, які адбыўся ў 1772 г. Маёнтак Горваль, у які ўваходзіла і вёска Васількоў, быў на правым беразе ракі Бярэзіны, таму застаўся пад уладай Польшчы.

Але ў 1793 г. тэрыторыя ўсяго сучаснага Рэчыцкага раёна ўвайшла ў склад Расіі. І тады ж насельніцтва ўсёй Мінскай губерні тэрмінам на два гады было вызвалена ад выплаты падаткаў. Потым на працягу дзесяці гадоў падаткі браліся ў значна меншым памеры, чым увогуле ў Расіі. Гэта выклікала пэўны ўздым Мінскай губерні, куды ўваходзіў і наш край.

З дакументаў, якія захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве ў Маскве, бачна: у 1800 г. у маёй роднай вёсцы было 17 двароў з насельніцтвам у 97 душ — з якіх 48 мужчын і 49 жанчын.

Васількоўцы належалі графіні Алене Патоцкай, потым — графу Вікенцію Патоцкаму, які маёнтак Горваль прадаў памешчыку Фёдару Энгелю. Ад Энгеля па духоўнаму запавету ад 10 жніўня 1835 г. маёнтак Горваль атрымала памешчыца Марыя Раманаўна Халадоўская (дзявочае прозвішча — Фурман). Яна валадарыла ў маёнтку больш чым 40 гадоў. У 1882 г. маёнтак набыў граф Георгі Фёдаравіч Менгдэн. Усяго праз шэсць гадоў у маёнтка новы гаспадар — граф Зубаў.

У архіўным фондзе «Минский губернс-

кий комитет для рассмотрения и составления инвентарей помещичьих имений» (НА Рэспублікі Беларусь. Ф. 142. Ап. 1. Сп. 1409) ёсць і інвентар маёнтка Горваль. Па гэтым інвентары ў вёсцы Васількоў у 1844 г. было 26 двароў, 59 мужчын і 56 жанчын, з якіх працаздольнымі былі 25 мужчын і столькі ж жанчын. Васількоўцы мелі 13 волакаў зямлі (адна волака — 21,36 га). Гэта зямля была сядзібная, ворыўная і сенакосная.

Большасць сялянскіх двароў мелі па 0,25—0,5 волакаў. Былі і такія сем'і, што зямлі не мелі наогул.

З нагаданага вышэй інвентара маёнтка Горваль вынікае: у вёсцы Васількоў быў адзін конь, 28 валоў, 20 падцёлкаў, 51 авечка, 19 свіней і 6 кароў. Інакш кажучы, галеча страшэнная.

Уся зямля была панскай уласнасцю. За яе патрэбна было плаціць і рабіць на паншчыне.

З архіўных дакументаў бачна: ад вёскі Васількоў у маёнтак Горваль браліся штогод: 22 курыцы, 220 яек, 66 фунтаў сушаных баравікоў, 21 воз сена і 22 маткі нітак.

А вось галоўныя павіннасці на паншчыне: прыгон ад кожнай душы — 2 дні на тыдзень з падводамі, столькі ж дзён без падвод, але з уласнымі прыладамі працы. Апроч гэтага кожны павінен быў адпрацаваць на працягу года дадаткова па 6 дзён. У асноўным — у час сенакосу і жніва.

Васількоўцы, як і іншыя прыгонныя, што ўваходзілі ў маёнтак Горваль, рамантавалі палац і гаспадарчыя будынкі, перавозілі ўласным цяглом панскае дабро. Яны валілі ў лесе асіны, вытралёўвалі драўніну на сухое, дзе пілавалі яе ды палілі. Попел ішоў на ўгнаенне. Выраблялася і драўнінны вугаль.

Драўніну, прызначаную для атрымання вугалю, вяскоўцы абкладвалі дзёрнам і падпальвалі. А потым днём і ноччу сачылі, каб праз дзёран не прарывалася полымя, бо гэта адмоўна ўплывала на якасць вугалю.

Прыгонныя гналі дзёгаць, збіралі смалу. «Дзягцярня», «смалакур», «чорнае ворыва» — і цяпер сведкі даўно мінулых гадоў.

Атрыманыя попел, вугаль, дзёгаць і смалу васількоўцы адвозілі на прыстань Бярэзіны, што знаходзілася ў вёсцы Гагалі.

З ліку моцных і ўладалюбівых сялян набіраліся войты. Яны сачылі, як прыгонныя працуюць на паншчыне. Час ад часу наведваліся і ў Васількова, каб «пачаставаць» розкамі ці шомпаламі тых, што па нейкай прычыне мінулі выхад на паншчыну.

Вось які выпадак з часоў прыгонніцтва паспела яшчэ расказаць Аляксандра Іванаўна Батура, і які здарыўся з яе прабабуляй.

... Цэлы тыдзень рабілі прыгонныя жанчыны з Васількова ў маёнтку Горваль. Яны малацілі гарох. А потым, як збіраліся дамоў, узялі крыху таго гароху.

Напаўдарозе іх здагналі войты. Пачалі ўсіх абшукваць. У каго ж знайшлі зярняты — збілі шомпаламі. Але і гэта падалося недастатковым. Няшчасных пасадзілі на воз ды адвезлі назад у маёнтак. Там «вінаватыя» атрымалі яшчэ па 25 розак. Іх білі галінаю ігрушы.

Прабабка А. І. Батуры хварэла пасля гэтага амаль два месяцы. На паншчыну ў гэты час хадзіла яе старэйшая дачка. Два тыдні дзяўчынцы давялося пасвіць гусей. А потым яе прызначылі паіць цялят. Але тыя не надта прыбывалі ў вазе. Войты пагражалі дзяўчынцы «ігрушай». Злодзеі ж неўзабаве адшукаліся. Гэта былі вужы, якія, учуўшы сыроватку, выпаўзалі з-пад бярвенняў ды ласаваліся ёю. Цэлы капец вужоў набілі тады...

...Васількоўцы зайздросцілі жыхарам вёскі Крынкі, бо тыя жылі на землях казённых і не ведалі паншчыны. Не жадалі крынецкія дзяўчаты ісці замуж за хлопцаў з Васількова, каб не стаць прыгоннымі. А хлопцаў, вядома ж, пан не адпускаў: не хацеў «губляць» дармавую працоўную сілу.

...Большасць жыхароў Васількова мелі прозвішча Гуз. Каторыя — Кастрама, Чапак, Казачэнка. Была адна сям'я з прозвішчам Батура. Гаспадар яе — Ілля Сцяпанавіч Батура — быў недзе 1796 г. нараджэння. Ён дажыў да адмены прыгоннага права і ў 1863 г. выкупіў у памешчыцы М. Р. Халадоўскай надзел зямлі.

Дарэчы, у свой час М. Р. Халадоўская, рупячыся аб даходах, вырашыла ссяліць «сваіх» сялян у буйныя населеныя пункты. Васількоў-Слабодскім, жыхары Валадарска (цяпер вёска Валадарск). Кажуць, што і зараз мясцінку, дзе знаходзіўся пераселены Васількоў-Слабодка, жыхары Валадарска называюць Слабодскім полем.

...19 лютага 1861 г. імператар Аляксандр II падпісаў Маніфест аб адмене прыгоннага права. Але «вызваленне» сялян у межах імперыі адбывалася не ў адзін час. Для Беларусі гэта быў 1863 г.

Першая Рэчыцкая паверачная камісія

па складанню выкупных актаў па маёнтку Горваль устанавіла, што з 12 вёсак маёнтка ў наяўнасці ...няма і паловы. Камісія вырашыла: усе жадаючыя могуць выкупіць надзелы зямлі ва ўласнасць там, дзе жылі раней.

Выкупны акт камісія аб'явіла сялянам і М. Р. Халадоўскай 10 ліпеня 1864 г. Сяляне выказалі задавальненне, памешчыца ж сваю нязгоду. Каля 20 гадоў яна пісала скаргі ў высокія дзяржаўныя інстанцыі. Сцвярджала, што яе былыя прыгонныя атрымалі лепшыя землі і, галоўнае, па зніжаных цэнах. Урэшце дабілася даплаты з сялян маёнтка ў 16 513 рублёў (НА Рэспублікі Беларусь. Ф. 242. С. 842. Арк. 419 і 426).

Адсутнасць Устаўнай граматы не дае магчымасці дакументальна пацвердзіць прозвішчы перасяленцаў-васількоўцаў, але старажылы прыгадалі іх: Ахрэм Чысты, Міна Гуз, Цярэшка Гуз, Аляксей Стасевіч Гуз, Цярэшка Стасевіч Гуз, Хведар Стасевіч Гуз, Уёў Гуз, Рыгор Гуз, Пятро Гуз, Якаў Гуз, Мікалай Гуз, Васілёк Батура, Піліп Сцяпанавіч Батура, Васілёк Капшай, Нічыпар Смалян ды Ціхан Ушак.

Дарэчы, Васілёк Капшай — ляснік з вёскі Гавенавічы (Валадарск). М. Р. Халадоўская даручыла яму клапаціцца аб панскім лесе.

Адзін надзел у Васількове складаў у сярэднім крыху больш 20 гектараў зямлі. Свае хаціны вяскоўцы адбудоўвалі ўздоўж рэчкі, якраз па сучаснай вуліцы ад клуба ў бок крамы.

Яшчэ адна вуліца заснавалася цераз рэчку па дарозе на Крынкі.

Прытуленыя адна да другой будыніны з саламянымі дахамі ды шырынёй вуліцы ў 10—12 метраў і ўяўлялі тыповую глухую вёску.

Паблізу зямлі на ўсіх не хапала, таму вяскоўцы распрацоўвалі ляды. Старажылы ведаюць, дзе знаходзяцца Чыстага, Цярэшкава і Васілёвы ляды. Ранейшым часам гэта былі выдатныя мясціны для збору грыбоў і ягад. На жаль, знішчэнне лесу ў апошнія гады прывяло да таго, што ні грыба, ні ягады ў гэтых мясцінах ужо не знойдзеш. Замест хвоі мясцовасць пакрылася чарналессем.

...Цікава тое, як ажыццяўлялася кіраванне вёскай.

На агульным сходзе сялян выбіраўся староста. Гэта быў чалавек, які карыстаўся ўсеагульнай павагай. На працягу трох гадоў ён судзіў, караў і мілаваў, сачыў за парадкам, дзяліў зямлю, разбіраў спрэчкі і г. д. Калі добрасумленна ставіўся да ўскладзеных на яго абавязкаў, то найчасцей выбіраўся і на паўторны тэрмін. Дарэчы, у воласці старасту атрымліваў спецыяльны медаль з царскім партрэтам. І калі ў старасты быў такі медаль на грудзях, то ніхто не меў права аспрэчваць ягоныя рашэнні, бо лічылася, што аспрэчваючы — журыш цара. А за гэта цяжка каралі.

За старастам быў грамадскі фонд збожжа. Сховішчам для яго была будыніна на высокіх штандарах, рубленая з бярвёнаў. Сюды, у будынак без вокнаў, які называўся «маказын», вяскоўцы прыносілі збожжа. Вагаў не было, але староста дакладна вёў улік узносу ад кожнага двара. Збожжа ён мераў гарцам і меркай. Гарнец раўняўся 8 фунтам, або 3,2 кілаграма. Мерка ж складала адзін пуд.

Староста загадваў на посцілцы насыпаць гарнец або мерку з «верхам», а потым дошчачкай зразаў лішак, сунучы яго зверху па краі. Ніхто ўжо не мог казаць, што нехта насыпаў збожжа поўна з гарою, а нехта хітраваў.

Будыніна, аб якой ідзе гаворка, разбурылася не так даўно, а надпіс на ёй — «Нехай жыве!» — з дзяцінства застаўся ў маёй памяці.

Была ў вёсцы і капліца — маленькая цэркаўка, куды васількоўцы хадзілі маліцца. Час ад часу сюды наведваўся і бацюшка.

Побач з капліцай знаходзілася пачатковая царкоўнапрыходская школа. За навучанне ў ёй патрэбна было плаціць, але падручнікі, папера і прылады былі бясплатнымі. Вядома, не ўсе дзеці маглі наведваць школу: на навучанне браліся хлопчыкі і дзяўчынкі з тых сем'яў, якія лічыліся «надзейнымі», а яшчэ — маглі заплаціць за навучанне.

Частым настаўнікам быў бацюшка. Калі ён наведваўся, то цікавіўся перш за ўсё законам Божым. Вучняў, каторыя добра ведалі малітвы, бацюшка частаваў цукеркамі. А тых, што запіналіся, ставіў у покут на грэчку ці соль. Прытым — голымі каленямі. Былі і іншыя пакаранні.

Непадалёк ад вёскі стаяла карчма-лаўка, у якой прадаваліся селядцы, алей, баранкі, мука, хлеб, гарэлка. Лаўка размяшчалася ў казённым будынку, дзе жылі і гандлявалі яўрэі Герчык, Юзік і Іцка. Іхнія ж жон-

кі шылі адзенне. Такім чынам, будыніна ў нечым нагадвала сумесь гандлёвай кропкі з домам быту.

Штогод перад касавіцай у вёску прыязджаў пан на таргі сенакосам. І тады дзеці гуртам беглі, каб адкрыць царыну. Царына — нешта накшталт шлагбаума. І ёй ва ўсіх баках вёскі перакрывалася вуліца, каб ноччу жывёла не магла ўцячы ў поле, каб не заязджалі непажаданыя госці, каб была агароджа ад злых духаў.

Пан, калі быў задаволены, кідаў перад дзятвой жменю капеек. І тады ўсчыналася бойка за панскую «шчодрасць».

На таргі збіраліся не толькі васількоўцы, а і жыхары суседніх вёсак — Будкі-Шыбенкі, Крынак, Елізаравіч і г. д.

Сенакос прадаваўся па правілах аўкцыёна. Папярэджаны аб якасці травы, пан называў сваю цану. Калі на сенакос было шмат жадаючых, то цана ўзнімалася. Таму і не кожны меў магчымасць набыць сенакос. Не выпадкова, што пасля таргоў пакрыўджаныя нярэдка ўсчыналі бойку, выказваючы незадавальненне тым, што нехта перахапіў ад іх сенакос.

Думкі аб лепшай долі ніколі не пакідалі васількоўцаў. Рэвалюцыйныя падзеі 1905—1907 гг. адгукнуліся і ў вёсцы. Буйных выступленняў не было, але словы «воля прыходзіць» увасобіліся ў дзеянні людзей. Вяскоўцы пачалі валіць і прадаваць панскі лес, перасталі плаціць падаткі. Гэта прывяло да таго, што ўжо ў 1905 г. адбылося некалькі судовых спраў за самавольную парубку лесу. На значны тэрмін у турму ніхто не патрапіў, затое штрафы заплацілі многія.

Рэвалюцыйныя думкі пранікалі ў Васількова праз чалавека з бунтарскімі поглядамі Пархвена Дземчанку, гаспадара Хадоры Малахаўны Батура, якія жылі ў Рэчыцы.

Была спроба ўтварэння першай рэвалюцыйнай ячэйкі. Пархвен Дземчанка наладзіў сувязі з Адамам Пракопавічам Гузам і Цярэшкам Пракопавічам Гузам. Паступова ў ячэйку ўвайшлі Якім Марцінавіч Грыб, Зоцік Васільевіч Гуз, Піліп Максімавіч Батура, Іван Прахоравіч Смалян, Барыс Ралкавіч Сапончык і ягоная жонка Вера Сапончык. Актыўным распаўсюджвальнікам лістовак з рэвалюцыйным тэкстам быў Якім Марцінавіч Грыб.

На больш буйныя сходы васількоўцы сыходзіліся на так званую Мар'іну Горку, што пад вёскай Чкалаў, непадалёку ад былога лесапільнага завода Арайковіча. Туды прыходзілі прадстаўнікі іншых навакольных вёсак, каторыя з рэчычан. Ад Васількова ж на сходы неаднойчы хадзілі Якім Марцінавіч Грыб, Зоцік Васільевіч Грыб, Піліп Максімавіч Батура, Іван Прахоравіч Смалян, Барыс Ралкавіч Сапончык.

Вестка аб рэвалюцыі дайшла і да Васількова. Вяскоўцы з прыхільнасцю сустрэлі яе. Але знайшоўся чалавек, якога вестка гэтая прывяла ў шаленства. Ляснік-аб'ездчык Есіп Асіповіч адкрыў па людзях агонь з кулямёта. Праўда, нікога не забіў. Але лёс самога Асіповіча трагічны: рэвалюцыянеры з Дзюрдзева арыштавалі яго разам з жонкай, а потым прысудзілі да расстрэлу. І прысуд гэты быў выкананы.

Нямала пакут прынесла вёсцы грамадзянская вайна. Наша мясцовасць была занята немцамі, а потым і палякамі.

Ворагі забралі ў васількоўцаў коней, валоў, свіней і птушку. Прымусілі ўсю жыўнасць загнаць за дзесяткі кіламетраў у прызначанае месца.

Але нядоўга гаспадарылі захопнікі на нашай зямлі. 17 верасня 1918 г. сялянскі партызанскі атрад вызваліў ад акупантаў Горваль. У гэты ж дзень кайзераўцы былі выгнаны і з Васількова-Слабодкі.

Панскія землі былі падзелены паміж сялянамі. Выдзялялася яна па едаках. Больш яе прыпадала на шматдзетныя сем'і і дзе мелася больш сыноў. Справа ў тым, што кожны бацька павінен быў даць сыну ўчастак зямлі, выдзеліць жывёлу. Словам, зрабіць усё, каб маладая сям'я магла стаць на ногі.

Шмат поту і сіл патрэбна было, каб апрацоўваць участкі, што знаходзіліся ў розных месцах. Усе рабілі ў полі нярэдка літаральна ад цямна да цямна. Было, што маці бралі туды і дзяцей. Надаралася, немаўлят выкрадалі ваўкі.

Вяскоўцы імкнуліся павялічыць колькасць ворнай зямлі. Зрабіць гэта можна было шляхам распрацоўкі ляда. Зрабіў тое ў свой час і Васіль Малахавіч Батура. А калі сек бярэзнік, то падышоў былы панскі ўпраўляючы з Горваля Аляксандр Косым.

— Васіль, — звярнуўся Косым да Батуры, — бярозкі валяй, да розкі хавай.

У ягоным голасе былі мала прыхаваныя пагроза і іронія.

— Цяпер крочыць свята і ў нашу ха-

ту, — адказаў, трымаючы ў руках сякеру, селянін.

— Глядзі, каб пасля свята не прыйшлі буднія дні, — пагразіў Косым.

...Варта нагадаць: актыўнымі ўдзельнікамі грамадзянскай вайны былі васількоўцы Хведар Мінавіч Гуз, Ісак Паўлавіч Гуз, Адам Антонавіч Гуз.

...Вясной 1929 г. у Васількове быў утвораны калгас. Яго назвалі «XII Кастрычнік». Калгас меў толькі 25 гектараў ворнай зямлі. Хто ж быў у ліку першых, каторыя ўступілі ў калектыўную гаспадарку? Гэта Тарас Пятровіч Гуз, Карп Антонавіч Гуз, Есіп Васільевіч Гуз, Стась Васільевіч Гуз, Антон Стасевіч Гуз, Мікалай Цімафеевіч Белы, Кірыла Пятровіч Гуз, Іван Ціцін, Якаў Драгун, Нічыпар Смалян і г. д. Фактычна ў калектыўную гаспадарку яны аддалі як не ўсе прылады працы, іншую маёмасць. Напрыклад, Карп Антонавіч Гуз ахвяраваў калгасу хлеў для жывёлы, а Стась Васільевіч Гуз — пуню.

Першым старшынёй калгаса «XII Кастрычнік» абіраўся Тарас Пятровіч Гуз.

Ураджаі ў першыя гады існавання калгаса складалі па збожжавых 4—7 цэнтнераў з гектара. Але паступова зямля пачала даваць больш і больш. Павялічвалася колькасць распрацаваных угоддзяў, рос калектыўны статак. Узводзіліся неабходныя памяшканні. Але пажар, які здарыўся ў 1932 г., знішчыў значную колькасць калгаснага дабра. Згарэлі хлявы, але жывёла ўратавалася, бо знаходзілася на пашы.

1933 г. прынёс новыя выпрабаванні. Неўраджай і голад ахапілі як не ўсю краіну. Недахоп харчавання адчувалі і васількоўцы.

Сталінскія рэпрэсіі 30-ых гадоў надоўга ў турму нікога з васількоўцаў «не ўладкавалі», але «паскорвалі» ўступленні ў калгас. Аднаасобнікі абкладваліся вялізнымі падаткамі, а гэта «заахвочвала» да ўступлення ў калектыўную гаспадарку. У гады калектывізацыі з Васількова ніхто сілком не высылаўся. Галоўная прычына таго ў тым, што мясцовыя землі малаўрадлівыя, і заможных у вёсцы не знайшлося.

Паступова мясцовы калгас станавіўся, як кажуць, на ногі. Людзі марылі аб добрым жыцці. Але спадзяванні гэтыя перакрэсліла Вялікая Айчынная вайна.

Усе васількоўцы, здатныя да вайсковай службы, пайшлі ў Чырвоную Армію. А вось Міхаіл Васільевіч Гуз і яшчэ каторыя з вяскоўцаў выправіліся ў партызаны. У лесе людзі будавалі курані, паўзямлянкі, дзе можна было схавацца ў час чарговага прыезду немцаў.

Цяжкім быў для вёскі 1943 г. Бачачы сваю пагібель, гітлераўцы звярэлі. Яны, безумоўна, ведалі, што вёску наведваюць партызаны. А тут яшчэ здарыўся выпадак, калі наш снайпер забіў нямецкага афіцэра. І тады ў Васількоў нахлынулі фашысты. Захопнікі кінуліся па хатах, каб сабраць людзей. Але тыя паспелі пакінуць сядзібы і схавацца ў лесе. Тады гітлераўцы і венгры пачалі прачэсваць бліжэйшыя мясціны. На глінішчах, у ямах, адкуль раней бралася гліна, людзі былі знойдзены. Каторыя з іх былі забіты. Шмат хто быў паранены.

Не лішне зазначыць: сярод карнікаў былі і такія, што не «заўважылі» людзей у ямах і тым самым далі ім магчымасць уратавацца.

Вёска згарэла ў агні. У сваіх хатах прынялі жудасную смерць Сцёпа Сямёнаўна і Арына Майсееўна Капшаі. А да вызвалення заставалася зусім мала.

І зноў вяскоўцам давялося жыць у куранях і паўзямлянках. Прама ў лесе людзі будавалі хаціны, а потым перавозілі іх у Васількоў.

З вясны 1944 г. пачынаецца адраджэнне мясцовага калгаса. Асноўнай сілай калектыўнай гаспадаркі былі пад той час жанчыны, падлеткі ды дзяды. Поле аралі каровамі. Але і гэтае выпрабаванне васількоўцы вытрымалі з годнасцю: залячылі раны вайны, адбудавалі вёску.

...На заканчэнне гэтага артыкула хочацца выказаць шчырую падзяку жыхарам Васількова, якія дапамаглі мне ў збіранні матэрыялу. Шмат даведаўся ад Апанаса Стасевіча Гуза, Якіма Васільевіча Батуры, Усціны Якаўлеўны Ушак. Хочацца нізка схіліць галаву і перад светлай памяццю Цярэшкі Адамавіча Коцура, Просі Капшай, Аляксандры Іванаўны Батура, якіх ужо няма сярод нас і якія шчодра дзяліліся звесткамі аб гісторыі роднага краю. Добрую дапамогу аказала і былая загадчыца Васількоўскай сельскай бібліятэкі Лідзія Кірылаўна Шафарэнка.

П. М. Батура, кандыдат філасофскіх навук

КАМСАМОЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Адпяванне жывых. (Аповесць пра в. Шоўкавічы)

(Факты, дакументы, успаміны)

...Шукаць Шоўкавічы ў старых друкаваных радках — тое самае, што шукаць іголку ў стозе сена. Нават цяпер, калі мы выйшлі па кнігах на першае месца на душу, пра маленькую вёску — ні слоўца, як бы яна даўно не існуе. Пахавана. Адпета. Мясцовая газета і тая ніколі не пісала пра Шоўкавічы, як бы там няма жывых душ, як бы людзям нічога не баліць.

Але, кажуць, пот не заўсёды дарэмна праліваецца. Хто шукае — той знаходзіць. Вось і я адшукаў у стогадовай кнізе, выдадзенай у Санкт-Пецярбургу, цікавыя звесткі. З усёй нашай акругі там упамінаецца казённая вёска Васілевічы. Ляжыць яна, пішуць, на рубяжы непраходных балот, якія называюцца Хмяльніцкімі. Непадалёк знаходзяцца глыбозныя калодзежы — Іоўжыны. Іх нібыта выкапалі па загаду княгіні Вольгі, падчас яе паходу на драўлян.

А далей, за гэтымі калодзежамі, у той час пачыналася царства туманаў, лясоў і балот.

Вось у тым царстве, за сорак кіламетраў ад казённай вёскі Васілевічы, аблюбаваў некалі сабе палянку для аселага жытла першы пасяленец з будучай вёскі Шоўкавічы. Ён мог быць адзіным смельчаком на той палянцы, але не адзінокім. Наўкол ужо меліся паселішчы.

Але адкуль назва — Шоўкавічы? Рэдкая і, можа, адзіная на ўсё Палессе. Ёсць ажно тры версіі. Кожная па-свойму цікавая.

Жыў тут некалі Мамэрт. Людзі яго панам называлі. А ён служыў стражнікам у панскім лясніцтве. Ездзіў на брычцы. Бачыўся і знаўся з панамі, дык для цёмных людзей гэтага даволі, каб лічыць і яго панам, бо сам ён зямлі не араў, сенажаці не касіў, а трымаў парабкаў. Але самае галоўнае — насіў той Мамэрт лапці з шаўковымі аборамі. Дык вось, кажуць, ад тых шыкоўных абораў і пайшла назва вёскі.

А яшчэ кажуць, на нашых палетках, адваяваных некалі ад бароў і дуброў, радзіў вельмі лён. Як цвіў, здаецца, сінія азарыны гайдаліся хвалямі ледзь не да саменькіх хат. Нібыта Шоўкавічы тады пазіралі ў сусвет вялізнымі блакітнымі вачыма. І ўсе, хто гойсаў той парой па Млечным Шляху, а шоўкаўцы, як і ўсе на зямлі, не ведалі яшчэ пра касманаўтаў, верылі толькі ўладару неба і яго святым служкам, дык і спадзяваліся, што Бог і анёлы бачаць іх адкрытыя і добрыя вочы. Мо таму з асаблівай пяшчотай даглядалі льняныя палеткі. Пасля шчыравалі, каб давесці да ладу ўраджай.

Магчыма, было так: прабіліся нашы льнаробы праз царства туманаў на нейкі рынак, каб абмяняць лён на соль, свечкі, цвікі, а там сустрэўся шчыры гандляр, не стрымаў свайго захаплення: «Ды ў вас жа не лён — шоўк!» І закупіў увесь тавар. А пасля чутка пайшла пра майстроў, пачалі цікавіцца: «Дзе тыя шоўкаўцы?.. Калі зноў прывязуць свой шаўковы лён?..»

Вось і нарадзілася назва паселішча — Шоўкавічы.

А цяпер пра версію, можа, асноўную. Засведчана ў архівах, што ў Мінскай губерні, а наш Рэчыцкі павет уваходзіў у яе здаўна, жыў-быў дваранскі род Шолкаўскіх. Самыя розныя прадстаўнікі яго бадзяліся па многіх паветах. Аднаго з іх, Фаму Шолкаўскага, нават судзілі за зладзейства. Свіснуў у двараніна Гадзеўскага рэчаў і грошай на суму трыццаць рублёў. Дык вельмі ж строга пакаралі: пазбавілі ўсіх правоў і аддалі ў салдаты без выкупу.

Пазбаўлены дваранскага звання Андрэй Шолкаўскі з сынам Канстанцінам за тое, што некалі запісаліся па бацьку Францавымі, а былі — Юр'евы.

А вось Станіслаў Шолкаўскі выслужыўся да маршалка, прадвадзіцеля дваранства Вілкамірскага павета. Меў у розных мясцінах маёнткі — Даўнарышкі, Ваўшыкі, Пашутэ, Ваські, Дайнаў і... Шоўкава. Мо якраз тое Шоўкава і было сярод нашых туманаў, балот і лясоў?

Але валодаць маёнткам — справа няхітрая. Купіў ці атрымаў у спадчыну — карыстайся. Можаш дзесьці жыць, а падаткі ад твайго ўласнага маёнтка самі прыплывуць. Той нехта з дваранскага роду Шолкаўскіх, калі напраўду меў дачыненне да нашага паселішча, то мог нават ні разочку не бываць у гэтых балотах. Бо гэта ж цяпер асфальт паклалі ледзь не да саменькай вёскі, а даўней трэба было мець адчайны характар, каб густым чмырэззем ды хісткімі альсамі прабіцца да Шоўкавічаў.

Хто ж быў той першы адчаюга, што прабіўся сюды і аблюбаваў месца для жытла?

Ясна адно — чалавек смелы і панятлівы. Выбраў сухі грудок зямлі з розумам. З аднаго боку — густая сцяна дубняку, з другога — сенажаць, а за ёй — дрыгва. Побач — ладныя лясныя паляны, на якіх можна вырошчваць хлеб і лён, агародніну і садавіну.

Адшукаў толькі адно даўнейшае прозвішча шоўкаўца. Не веру, што ён заснавальнік вёскі. Але ж радасць была такая, нібыта сустрэў свайго далёкага не проста прашчура, а родзіча.

Мужныя мінскія архіварыусы, праз пекла вайны і пажараў, захавалі інвентарную кнігу Горвальскага маёнтка памешчыцы сапраўднай стацкай саветніцы Марыі Раманаўны Халадоўскай, прыроджанай Фурман Гет Халадоўскай. У кнізе, пазначанай 1844 г., запісана ўся рухомая і нерухомая маёмасць уладаркі. Ёсць пералік вёсак: Задзірэеўка — чатыры хаты, Селішчы — семнаццаць, Чарнейкі — дванаццаць, Крапіўня — трыццаць шэсць, Дзюрдзеў — трыццаць дзевяць.

А вось — Вузнаж. Гэта ж зусім недалёка ад Шоўкавічаў. Чытаю перапіс сялянскіх сямействаў: Сідарэнка, Кастрама, Петравец, Яўланаў, Гошка, Бобла... Божа! Каля парадкавага нумара 20 пазначана: «Шелковичь». І далей распісваецца, хто там жыве: сям'я Мукасеяў! Нечаканае прозвішча. Сучаснікі дзівяцца: нават не чулі такога. Няма яго і ў навакольных вёсках. А можа, Мукасей — не прозвішча, а прафесія? Мо тут гэтыя людзі ўстанавілі якія-небудзь каменныя жорны і малолі, сеялі муку, тым і жылі, карміліся?

Скупыя запісы інвентарнай кнігі засведчылі: у Шоўкавічах тады жылі два браты Мукасеі, Васіль і Максім, але падчас перапісу абодва памерлі. Дзве ўдавіцы-маладзіцы жылі на лясным хутары — Мар'я, 44 гады, Аксіння, 37 год. З імі іх дзеці — Васіль, 18 год, Аляксей, 14 год, Насця, 13 год. Здавалі памешчыцы падаткаў: воз сена, тры маткі пражы, тры куры, трыццаць яек, дзевяць кілаграмаў сушаных грыбоў. І яшчэ пазначана: «хаты няма».

Заверыў інвентарную кнігу ўпраўляючы памешчыцкага маёнтка. З неразборлівага подпісу вылучаюцца першыя тры літары: «Шол...» Няўжо Шолкаўскі? Мо ён меў хату ў нашым лесе, трымаў пры сабе парабкаў Мукасеяў?..

...Як перападалі шоўкаўцам кавалкі зямлі?

На іх яны гарбацелі і паміралі. Ад зямелькі — хлеб і слёзы. Але і не думалі яе цурацца, трымаліся моцна сваёй кармілцелькі. Аж пакуль не сталі іх абагульваць, сілком абрываць карані.

Удалося даведацца вось што. Усе землі ад вусця Дняпра і Бярэзіны, уніз па Бярэзіне да рэчачкі Сведзь належалі некалі багатаму памешчыку графу Вікенцію Францаву Патоцкаму. Пасля па купчай перайшлі да правадзейнага стацкага саветніка Энгеля. А той у сваю чаргу падзяліў сваю законную спадчыну на тры часткі. Было гэта летам 1851 г.

Для таго каб «палюбоўна» размежаваць рухомую і нерухомую маёмасць і землі, пісалася пісьмо ў Санкт-Пецярбург самому Усесвятлейшаму, Дзяржаўнейшаму, Вялікаму гасудару Мікалаю Паўлавічу, самадзержцу Усерасійскаму, цару Усяміласцівейшаму. З высокай і адказнай місіяй прыбыў у Горваль землямер Плясаў.

Маёнтак размежавалі паміж родзічамі Энгеля.

Памешчыку Раману Фурману перапаў фальварак Кабанаўка з прылягаючымі да яго вёскамі. Яму перайшло 627 рэвізскіх мужчынскага полу душ (жаночыя «душы» тады мала хто браў ва ўлік).

Памешчыку Івану Адамавічу выдзелілі фальварак Заходы з навакольнымі вёскамі, у якіх жыла 561 мужчынская душа.

Найбольшы кавалак перапаў любімай унучцы Энгеля Марыі Раманаўне Фурман, пазней жонцы правадзейнага стацкага саветніка Халадоўскага. Ёй выдзелілі два фальваркі: фальварак Дзюрдзеў з мястэчкам Горваль, вёскамі Дзюрдзеў, Берагавая Слабада, Чарнейкі, Селішчы, Шоўкавічы, Сведскае, Задзірэеўка і фальварак Балашаўка з вёскамі Гавінавічы, Шыбенка, Васількоў, Святое, Вузнаж. Усяго тут было 1149 рэвізскіх мужчынскіх душ.

Як жылі сяляне памешчыцы Халадоўскай?

У іх было 880 двароў і 4137 дзесяцін зямлі. Пасвіць жывёлу за межамі сваёй зямельнай латкі — не дазвалялася. Рыбу лавіць у азёрах, рэках, сажалках, залівах — забаранялася. Дрэвы на паліва адпускаліся за грошы. І выключна толькі ламачча, сухастой. Лес на будоўлю — за асобную, па дагавору, аплату. Пчалаводства ў лясах памешчыцы забаранялася, каб не псавалі дрэў.

Збіраць грыбы, ягады, арэхі без дазволу — забаранялася.

Сяляне адбывалі паншчыну. У год трэба было адпрацаваць на гаспадыню 104 дні: мужчыну — з канём, жанчыне — «пешшай». А яшчэ, апроч усяго, — па дванаццаць дзён згону. Звычайна ў час пасяўной, уборкі, малацьбы.

Дазвалялася не адпрацоўваць гэтыя дні. Але, будзь ласкавы, заплаці ў касу памешчыцкай эканоміі ўстаноўленую таксу: 12 капеек за рабочы дзень мужчыну з канём, 8 капеек за жаночы «пешшы» дзень. Усяго за год — 22 рублі 72 капейкі. Сума па тым часе рабаўніцкая для селяніна, калі ўлічыць, што пуд жытняй мукі каштаваў 45 капеек, фунт свініны — 6 капеек, фунт мёду — 10 капеек.

Неўзабаве наступіў час так званага вызвалення сялян.

«Маніфест» мала што змяніў у жыцці сялян. Ім, як і даўней, трэба было з зоркай уставаць, маліцца на неба, каб пасылала па патрэбе дождж і расу, сонечную восень і снежную зіму. Але ўсё-ткі з'явілася надзея. Цяпер можна было, моцна падцягнуўшы пружку, згарбацеўшы ў тры пагібелі, сабраць грошай і купіць свой кавалак зямлі. Набыў — і ты на ім гаспадар. Адвечная мара селяніна!

Гэта надавала смеласці людзям, рашучасці. І яны праўдамі і няпраўдамі дамагаліся сваёй незалежнасці, сваёй самастойнасці. Адны — мазалём, другія — удалай жаніцьбай, трэція — адданай парабкоўскай службай.

Былі і адчайныя. Наймалі пісара, бо самі не ведалі літар, за апошнія сярэбранікі куплялі дарагую паперу, пасылалі прашэнні памешчыкам, губернатару, а то і самому цару.

Ад шоўкаўцаў, праўда, я не адшукаў такіх пісьмаў. А вось Лаўрэн Драгуноў з Чарнеек пісаў. Вузнажцы Мікола Козыраў, Карней Петравец, Павел Кастрама, Андрэй Яўланаў — пісалі. Хведар Маханько са Святога, Карней Карака са Свецкага, Карп Бабіч з Горваля — пісалі.

Найчасцей на іх гербавых паперах высокія чыноўнікі накладвалі адну і тую ж рэзалюцыю: «Прашэнне пакінуць без вынікаў». Але ж хоць нейкі час свяцілася надзея, хоць мелася магчымасць нагадаць аб сваіх правах, заявіць, што і ты чалавек.

Тут трэба ўлічыць і перамены ў памешчыцкім маёнтку. Пасля «Маніфеста» па нейкіх прычынах маёнтак Халадоўскай перайшоў да графа Менкдзіна. Ад яго — спадчыннікам графа Платона Аляксандравіча Зубава.

Мы ведаем фаварыта Кацярыны II Платона Зубава, які вельмі хутка з паручнікаў коннай гвардыі займеў вышэйшыя чыны, графскае званне і паўсюдна вялізныя маёнткі з дзесяткамі тысяч прыгонных.

Пасля смерці царыцы рушылася і кар'ера Зубава. Ён дажываў апошнія гады ў маёнтку Янішкі Віленскай губерні. Там пра яго, як пра памешчыка, засталася дурная слава. Памёр без патомства ў 1822 г.

Дык якія ж спадчыннікі Платона Аляксандравіча Зубава валодалі маімі Шоўкавічамі?

Вядома, што ў Платона быў брат Валяр'ян. Яму, як родзічу царыцынага фаварыта, перапаў за нішто чын генерал-маёра. Удзельнічаў у польскіх падзеях на чале з Суворавым. Паводле сведчання сучаснікаў, запляміў сябе «бессаромнымі, абуральнымі адносінамі з некаторымі палякамі і іх жонкамі». Быў паранены ў нагу, якую пасля ампутавалі.

Але вось цікавая біяграфічная звестка: Валяр'ян Зубаў быў жанаты з графіняй Патоцкай. У іх былі дзеці. Магчыма, быў сын Аляксандр, названы ў гонар дзеда. А Аляксандр назваў свайго сына Платонам. Вось і з'явіўся к канцу дзевятнаццатага стагоддзя новы Платон Аляксандравіч Зубаў, які і займеў маёнтак Халадоўскай-Менкдзіна. Пасля яго смерці маёнтак перайшоў непаўналетнім спадчыннікам — Ганне і Аляксандру Зубавым. Іх маці, графіня — удава Вера Сяргееўна прызначыла ўпраўляючым маёнтка Пятра Андрэевіча Лейна. Ён меў даверанасць графіні, згодна якой вырашаў усе сялянскія спрэчкі, чыніў «палюбоўныя» размежаванні, вёў дзелавыя перагаворы, прызначаў штрафы, збіраў падаткі. У дакументе, завераным санкт-пецярбургскім натарыусам, рукой удавы напісана: «Ва ўсім, што ён, Лейн, па гэтай даверанасці зробіць, я яму веру, спрачацца і патрабаваць не буду».

Так што цяперашнія шоўкаўцы, нават самыя старыя, сапраўдных паноў не бачылі, шапкі перад імі не здымалі, у ногі не кідаліся. А калі што і помняць, дык прымаюць за пана ўпраўляючага Лейна ці яго памагатых.

Да прыходу савецкай улады кожны шоўкавец ужо меў, расстараўся свой кавалачак

зямлі. На 32 аднаасобніцкія гаспадаркі было ворнай зямлі 84 дзесяціны, сенакосу — 18 дзесяцін, пад пабудовамі — 2 дзесяціны. У вёсцы жыло 159 чалавек. Яны трымалі 45 кароў, 32 валы, 37 авечак, 31 свінню.

Самым багатым лічыўся Калач. Меў шэсць дзесяцін зямлі. Як жа займеў такую спадчыну?

З сямі гадоў Калач застаўся сіратою, бацькі паўміралі. Прытуліў яго да сябе ў Шоўкавічы нейкі бяздзетны Кулеўскі. Падрос сіротка дый стаў батрачыць на яго. А як памерла жонка Кулеўскага, ён перавёз да сябе з Горваля ўдаву лесніка з дачкой Соняй. Вось і пакахаліся парабак Ян з падчарыцай Кулеўскага Соняй. Пажаніліся.

А як памер Кулеўскі, хата і зямля яго перайшлі да Яна і Соні, як законных спадчыннікаў. От так і яны нечакана сталі багацеямі. Давай жыць-пажываць і на радасцях дзяцей нараджаць — Жэню, Шуру, Івана, Жору, Лёню, Барыса.

...Шоўкаўцы перажылі за апошнія семдзесят гадоў дзве вялікія трагедыі — вайну і калгас. Вайна ўраз пакалечыла, асіраціла, унізіла ўсіх. А ў калгасе гэта рабілася паступова, павольна. Са «смакам» адлучалі людзей ад зямлі. Усё гэта рабілася пад вясёлыя жарты, пад бадзёрыя песні пра заможнае жыццё.

Мы збяром у гэтым годзе
Небывалы ўраджай,
Для ўборкі маем жнейкі,
Маем сталінскі камбайн.

Азарту ў працы паддавала радыё:

Закіпелі самавары,
Чайнікі закракалі.
Ўсе калгаснікі запелі,
Кулакі заплакалі...

А жыццё было такое: адно — на паперы, на радыё, другое — у людскіх хатах і сэрцах.

На паперы было так, як пісала «Палеская праўда» пра шоўкаўскі калгас «Парастак сацыялізму»:

«Пасяўны плян калгасу складае 66 га. На 17 мая засеяна пшаніцы 4,75 га (плян 4), ячменю — 1 га (плян 4), аўсу — 4 га (плян 18), лёну — нічога (плян 6), вікі — 1 га (плян 2). Усяго засеяна 10,75 га, што складае 15,5 працэнтаў да пляну.

Тэмпы сяўбы, як бачна, зусім недастатковыя. Калгас не мае насення аўсу, не хапае бульбы. У добрым стане знаходзяцца толькі трынаццаць рабочых коней.

Як дрэннае з'явішча ў калгасе тое, што цяглавая сіла і інвэнтар не прымацаваны к паасобным калгаснікам, і на гэтым вучастку існуе поўная абязьлічка. Гэта з'яўляецца асноўным тормазам у паспяховым правядзенні сяўбы.

Адбыўся агульны сход калгаснікаў і беднякоў, сераднякоў-аднаасобнікаў вёскі Шоўкавічы, на якім падрабязна абгаворана аб пляне збожжанарыхтовак і аб новым законе аб сельскагаспадарчым падатку на 1932 г. Пастанавілі дамагчыся рашучага пералому ў рабоце...»

Так пісалі.

Патрабавалі ад сялян «пляну» і працэнтаў. Ніхто не лічыўся з тым, што шоўкаўцы звеку сеялі авёс тады, калі пачыналі квакаць жабы, калі з'яўляліся чырвоныя казяўкі каля каранёў дрэў і на гнілых пнях. Ячмень сеялі, калі цвіла каліна. Лён — перад Сёмухай, на нізкай глебе.

Заўважце: галоўны недахоп у тым, што «цяглавая сіла і інвэнтар не прымацаваны к паасобным калгаснікам». Што ж атрымлівалася? Спачатку сілай усё абагулілі, а тады пачалі «прымацоўваць к паасобным калгаснікам». Сваё здаў — табе ж яго і замацуюць. Але гэта ўжо не тваё, а калгаснае, агульнае. Атрымалася — нічыё. А нічыё звычайна рана псуецца, іржавее, гіне. Так здарылася і з «Парасткам сацыялізму».

З успамінаў Яўгеніі Іванаўны Калач (цёткі Жэні):

...Прыгадваецца наш старшыня Думка. Ён быў першым нашым начальнікам. Іванам зваўся, а празвалі — Думка. Усё казаў: «У мяне ёсць думка». То ў яго ёсць думка з'ездзіць у райфо, то ёсць думка пачынаць касьбу. Думкі ўсё меў, а грамаці не было. От і празвалі яго — Думка... Вой, галубок, помню добра, як сталі агіціраваць за калгас. Гэта ж цяперака, як хочаш, дак забірай зноў зямлю ў арэнду, а тады — аддай усё са шлункам і не пікні... Пастанавілі былі: на Акцябра каб ніхто не смеў рабіць. Святкуй — хоць лопні. Баба Якубіха сядзіць на етае Акцябра, прадзе кудзельку. Аж брыгадзір ідзе ў хату. Дык яна, бедная, была разбілася, хаваючы тую кудзельку. А тады ўжо сядзіць, як мы во з табой, ды гуляе, празнуе ўжо тое Акцябра. Гэта ж указ такі прыдумалі, галоўка ў некага зварыла, каб ніхто, ані Божа мой, палец аб палец не ўдарыў. Во як, галубок, было, не тое што цяперака: рабі калі хочаш, хоць у нітку выцягніся... І от што за моду былі ўвялі: у калгас агіціравалі ноччу. Прыедуць, устураць усіх сонных і чытаюць сваю малітву. Ды не абы-як, а пагрозліва, надалызна. Па іх выходзіла, што калі сёння ноччу не будзе створаны калгас, то здарыцца нешта непапраўнае, здрыганецца ў гневе зямля... Аднаго разу стукаюць у дзверы бабе Якубісе. Думала, хто свой, адшча-

піла крук. А як сталі ісці, мо чалавек сем: і з райвона, і з вобласці. У бабы дзве нявесткі жылі. Дак давай крычаць: «Вой, Шаша, Маша, адчыніла, да не знаю каму...»

...Мы з бацькам самыя-самыя першыя пайшлі ў калгас, хаця трохі багатымі лічыліся. Карову, кабылу завялі ў агульны гурт. Вой, дак нас жа яшчэ й раскулачвалі. От, бляха, забралі ўсё на свеце, падчыстую. Шырму, падла, зрывае, сыпле туды зерне, а яно рассыпаецца. Не ён жа сеяў, не ён жаў, не ён малаціў... Часы былі, ходзікі. Вельмі красіва ігралі. Дак і часы тыя прыхапілі. Усё падгрэблі... Бацька, праўда, некага папрасіў да напісаў іхняму начальству, што сам быў батраком, што ў калгас першым запісаўся. Праз два тыдні вярнулі са Сведскага ўсё наша багацце... Прывозяць назад, тваю маць, вочы ў сабак пазычалі, у зямлю пазіраюць. А часы так і не знайшліся. Прапілі ці хто прытарабарыў сабе?..

Абагулілі кароў, сагналі ў адзін хлеў. А далей што? Хадзі туды да сваю карову дой. Малако нясі дадому, на чорта яно там. Вой-вой, што рабі-і-ілася-я-я... Трэба араць. Залыгваем валоў, едзем у поле. А дзіўна неяк. У кожнага была свая дзялка, цяпер — усё калгаснае. Дзе што сеяць, як даглядаць не сваё?.. Здаецца, і худоба адчула нейкую неразбярыху сярод людзей. Валы як зазыкуюць, як паляцяць у свет — рады няможна даць. А мо і авадні адчулі, што худоба цяпер калгасная, можна і яе смялей кусаць?.. Нават мужчыны не спраўляліся з валамі. Мікола-араты ўсё кляў іх: «Каб вас ваўкі паелі, да абаіх адразу». Век не забудуся гэтага... А як малацілі цапамі? Маладыя ўжо і ня ведаюць, што ета за цапы. Палка да палкі прывязаная. От і гасіш ёй па снапах, пакуль зерне не выб'еш. Увосень як пачынаем малаціць — дак да вясны. Рукі адвальваюцца, а паспрабуй не пайдзі — у зрыўшчыкі запішуць, у раён патураць. Адтулека немаведама якім вернешся... Таму і стаханаўцаў багата было. З неба само нічога не падала. Обшчым, жызня такая — плюнь і разатры...

А пасля вайны — зноў нічоганькі: ні ў рот пакласці, ні ў печ паставіць, ні на плечы нацягнуць. Надзяром буракоў, зварым, сёрбаем, аж нос у прысядкі ходзіць — эх, смаката. Бульбачка дробная вялася, ведама ж без гною, але і без хіміі, як цяперака. Дык што лепей?.. Адна каровка Арыніна на ўсю вёску. Тады мы ўжо з мамай купілі казу. А тады ўжо хатку як-небудзь зладзілі. О-о Госпадзі, Госпадзі!.. Як падумаю, колькі ўсяго перажыла — страшна робіцца... А тут звёў чорт — пайшла пакупалася ў нашай сажалцы. Дык мяне было сагнула, як цяперака во. Касіць магу, а жаць — не сагнуся. Нараўне з мужчынамі касіла. І па шэсцьдзесят сотак у дзень, і нават болей... Прымак тут у нас адзін быў, дак ён махне, махне касой і прысядзе, адсопваецца. А на язык востры быў. Усё жартаваў: «Як косяць — не просяць, як жнуць — не даюць...» А мне, стаханаўцы, не да яго жартаў. Пайду касіць — добры рог займу. Пакладу свой лепачок грэцкі на пракосе. Дакашу да яго — укушу. Далей махаю, далей махаю, каб зноў дацягнуцца да ласунка. І ватэта так гаравалі... Тады ўжо парсючка ўзгадавалі. Цёлку купілі. І зноў разбагацелі. Цяпер усё ёсць, а яно нічога не лезе. Здароўя няма. Трэба б да доктара выбрацца, дак дзе ж выберашся — работы заўсёды па вушы. Мо такіх ідзівотаў на ўсім свеце няма?.. Мо такая наша планіда — гараваць?.. Зімою ў шэсць устаю, летам — у чатыры. З гэтай пары і бічуюся цалюткі дзень. Кароўку ж яшчэ трымаю. Але, відаць, ужо развітаюся. Пастуха наймі, яму ў торбу бутэльку белай пакладзі. Да два разы ў месяц. А дзе іх узяць, тых бутэлек?.. Дый каштуюць жа яны паўпенсіі. Дак на чорта мне такое дзела?.. А як падумаю, што нада развітвацца з кароўкай, — плачу. І ў яе, здаецца, вочы слязяцца. Адно добра — травы хапае. Гэта ж не тое, што даўней. Укосіш дзе-небудзь ношачку травы для сваёй кароўкі, а брыгадзір унюхае ды забярэ, сабака, зацягне на калгасны двор. Яшчэ й прыгрозіць, мацюкоў нагне, што ледзь не ўвесь калгас абабрала... Цяпер во ідзі, еш сенакос. Другі год нечапаны. Здзічэў... Ох, ёлкі-зялёныя, скора нічога не застанецца тут. Зноў вёска хутарам стане, як і даўней, з чаго пачаліся Шоўкавічы...

Уладзімір Ліпскі.
«Адпяванне жывых». Мн.: 1993.

Паміж пустак, балот...
(З гісторыі населеных пунктаў Каравацицкага сельсавета)

У маі 1793 г. з зямель, якія адышлі да Расіі ў выніку другога падзелу Польшчы, была ўтворана Менская губерня. У яе увайшла Маладушская воласць Рэчыцкага павета. Вёскі Каравацічы і Цішкаўка былі ў складзе гэтай воласці. Яны належалі казне.

Некалькі дзесяткаў нізенькіх хат пад саламянымі стрэхамі... Гэта — Каравацічы. Такі ж выгляд мела і Цішкаўка.

З успамінаў Ксенафонта Гапоненкі бачна: «...Зямля радзіла дрэнна. Багна ж. Рэдка каторы год не вымакала. Ды і мала было тае зямлі. Каб мець нейкую капейчыну, вяскоўцы змушаны былі падавацца на лесараспрацоўкі. Але ж і там не мёдам намазана...»

Нярэдка сялянскія гаспадаркі драбіліся, распадаліся. Хто-ніхто пакідаў абжытую мясціну, падаваўся ў пошуках прыдатнай латкі зямлі. Менавіта такім чынам і быў пакладзены пачатак вёскі Дуброва (цяпер Чырвоная Дуброва).

Ішоў час. Жыхары Каравaціч распачалі гаворку аб патрэбе адкрыцця школкі.

Настаўнікам-арганізатарам яе стаў мясцовы жыхар І. С. Міхалка. У 1867 г. ён скончыў чатыры класы ў Маладушы. Незвычайныя здольнасці да вучобы прыцягнулі ўвагу настаўнікаў, і Міхалка быў пакінуты ў гэтай жа школе для работы ў якасці памочніка настаўніка. Затым яго перавялі на пасаду валаснога пісара.

Нарэшце, у 1881 г. школка была адчынена і ў Каравaцічах. Была аднакласнай, царкоўнапрыходскай. За настаўніка рабіў І. С. Міхалка. Неўзабаве школка выросла да чатырохкласнай. Хаціна ж, у якой яна тулілася, стаяла ў цэнтры Каравaціч побач з царквой.

У 1911 г. школа стала называцца земскай. Перайшла ў падпарадкаванне мясцовага самакіраўніцтва, якое ажыццяўлялася праз чыноўнікаў з судова-адміністрацыйнай і паліцэйскай уладай.

У 1912 г. было пабудавана спецыяльна для школы памяшканне. Узвялі яго на ўзвышаным месцы. У памяшканні меліся два класныя пакоі і доўгі калідор, а на другой палавіне — дзве кватэры для настаўнікаў. З 1915 па 1917 гг. загадчыцай школы з'яўлялася маладая настаўніца Я. Р. Тэадаровіч. Яна вяла адзін клас-камплект. З другім камплектам працавала В. К. Завалей.

Старажылы Каравaціч памятаюць і настаўніка Ярмолінскага. Ён рабіў у школе падчас узвядзення новага памяшкання. Загадваў школай. Быў чалавекам строгім і патрабавальным, цалкам карыстаўся правам дарэвалюцыйнай школы за правіннасці караць вучняў фізічна.

Да пачатку 1924/25 навучальнага года ў кожным з чатырох класаў было столькі дзяцей, што двухкамплектнасць не магла забяспечыць належнае навучанне. Таму ў Каравaціцкую школу былі прысланы яшчэ два настаўнікі.

Пасля Я. Р. Тэадаровіч школай загадваў настаўнік Грамыка, затым — Мамчыц, Кажамякін. З 1924 па 1932 гг. — І. І. Бойка.

Да пачатку 30-ых гадоў у Каравaцічах была адкрыта растучая сямігадовая школа. У верасні 1930 г. у ёй рабілі пяць настаўнікаў: І. І. Бойка, З. А. Баубель, Л. О. Бойка, А. Брэнч і Н. Е. Махнач.

У 30-ых гадах быў пабудаваны другі корпус на два класныя пакоі і піянерская.

Першы выпуск сямікласнікаў адбыўся ў 1933/34 навучальным годзе. Сярод выпускнікоў былі будучыя настаўнікі М. Ц. Блізнец, У. К. Гапоненка, У. Ф. Міхалка, У. К. Міхалка.

З мэтай добраўпарадкавання школьнага двара пасадзілі фруктовы сад. Гэты ўчастак затым доўгія гады з'яўляўся прышкольна-доследным.

У 1936 г. на работу ў Каравaціцкую сямігадовую школу прыехала маладая настаўніца М. Ц. Блізнец. Гэта першая настаўніца — выпускніца Каравaціцкай школы, якая атрымала педагагічную адукацыю.

Да 1938 г. колькасць вучняў дасягнула 200.

Першаму выпуску дзесяцікласнікаў выпадаў 1941/42 навучальны год. Дырэктар школы Ф. Ф. Пейсуховіч у гутарцы з вучнямі старэйшых класаў казаў у чэрвені 1941 г.: «Адпачывайце, набірайцеся сіл. Вы першымі ў гісторыі Каравaціцкай школы праз год атрымаеце дакументы аб сярэдняй адукацыі...»

...Некалькі дзесяткаў жыхароў вёсак Каравaцічы і Цішкаўка бралі ўдзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайне, адстойваючы заваёвы новага ладу. Але станаўленне яго ў Каравaцічах і Цішкаўцы было не зусім гладкім.

У 1928 г. дзевяць жыхароў Цішкаўкі стварылі таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі. Яны мелі дзевяць пар коней, дзевяць плугоў, конную малатарню.

Аб арганізацыі калгасаў у Каравaцічах і Цішкаўцы ўпершыню загаварылі ў канцы 1929 г. Растлумачальную работу праводзілі сярод насельніцтва мясцовыя партыйцы і 25-тысячнікі — Адамовіч, Клімовіч, Саўкоў, Шульгін, Нікіценка, Кашпур, Махнач, Баубель і г. д.

24 студзеня 1931 г. у Каравaцічах адкрыўся сход, на якім было пастаўлена пытанне аб стварэнні ў вёсцы калгаса.

Быў марозны зімовы вечар. На сход сабралася шмат людзей. Яго адкрыў мясцовы актывіст Мікалай Апанасавіч Сідарэйка. Даў слова ўпаўнаважанаму з райцэнтра Васілю Кастраме.

Затым выступаў Клім Ярац. Ён агітаваў за ўступленне ў калгас. Расказаў аб сваёй паездцы на Украіну, дзе знаёміўся з вопытам работы аднае з калектыўных гаспадарак.

У час выступлення Ярца прагучаў стрэл, якім ён быў паранены ў руку. Актывісту аказалі дапамогу, а ў двары выставілі пасты. Сход працягваўся.

Урэшце было прынята рашэнне аб ства-

рэнні калгаса. Старшынёй гаспадаркі быў абраны М. А. Сідарэйка. У калгас тут жа запісаліся 17 вяскоўцаў. Сярод іх — Іван Блізнец, Цімафей Блізнец, Іван Тужык, Раман Ярац, Яўсей Блізнец, Ксенафонт Гапоненка.

У наступным, 1932 г. у калгасе вёскі Каравацічы было звыш 200 двароў. Арганізаваліся дзве брыгады.

А стрэлы працягвалі гучаць. Двойчы рабіўся замах на актывіста, настаўніка пачатковых класаў М. Я. Махнача. Першы раз яму ўдалося схавацца ад бандытаў. Была спроба расправіцца з Махначом у той час, калі ў будынку школы праходзіла праўленне калгаса. Настаўнік цудам уратаваўся. Але быў забіты член праўлення гаспадаркі С. Тужык.

У ноч з 3 на 4 мая 1934 г. у Каравацічах успыхнулі некалькі дамоў найбольш актыўных калгаснікаў. У тым ліку і Цімафея Блізняца, які ахоўваў грамадскія свірны са збожжам. Блізнец бачыў, як агонь нішчыць ягонае дабро, але паста не пакінуў.

У 1933—1934 гг. калгас «Запаветы Леніна» праводзіў работы па асушэнню балот. Лепшым стаханаўцам на меліярацыі быў Сямён Сідарэйка, які рэгулярна дзённыя нормы выпрацоўкі перавышаў на 50—90 %.

У 1937 г. калгас «Запаветы Леніна» набыў першы аўтамабіль — легендарную палутарку. На ім працаваў Фёдар Герасімавіч Блізнец. Неўзабаве гаспадарка набыла яшчэ адзін аўтамабіль і трактар.

Шмат зрабілі для станаўлення калгаса вёскі Каравацічы яго старшыні Захар Тарасавіч Сілкоў і Міхаіл Смольскі.

У 1938 г. калгас «Запаветы Леніна» стаў адной з перадавых гаспадарак тагачаснага Васілевіцкага раёна. Ён быў удастоены гонару ўдзельнічаць на ВДНГ, якая была адкрыта 1 жніўня 1939 г. 1940 г. Новы поспех. Калгас заносіцца ў Ганаровую кнігу ВДНГ. І не выпадкова: з кожнага гектара пасяўной плошчы было атрымана больш чым па 17 цэнтнераў проса.

...Таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі вёскі Цішкаўка, аб якім нагадвалася вышэй, праіснавала да 1931 г. На ягонай базе быў створаны калгас «Пяцігодка». Першы агульны сход калгаснікаў вёскі Цішкаўка адбыўся 11 мая 1931 г. Напачатку «Пяцігодка» мела 20 кароў, 10 галоў маладняку буйной рагатай жывёлы, 30 коней. У ліпені таго ж, 1931 г., у калгас уступілі яшчэ 60 сем'яў. Першы старшыня гаспадаркі — Платон Сыч. Ён рабіў на гэтай пасадзе да 1934 г. За гэты час былі пабудаваны два памяшканні на 200 кароў, 150 коней і 200 авечак.

Восенню 1934 г. калгас «Пяцігодка» меў 80 коней, 200 кароў, столькі ж авечак, 150 галоў маладняку буйной рагатай жывёлы. Да 1941 г. дойны статак гаспадаркі ўзрос да 300 кароў.

...Вясной 1931 г. быў створаны калгас і ў вёсцы Дуброва. Яго назвалі «Чырвоная Дуброва». Першым старшынёй быў абраны мясцовы актывіст Міхаіл Рыгоравіч Кандраценка. Першыя калгаснікі — Аляксей Міхалка, Іван Дзейкун, Несцер Ярац, Ануфрый Шарун, Канстанцін Ярац, Міканор Дзейкун.

Зразумела, на першым часе было надта нялёгка. У калгасах не ставала зямельных угоддзяў. Наўкола ж лес і балоты. Даводзілася раскарчоўваць і ачышчаць невялікія ўчасткі, расшыраючы такім чынам пасяўныя плошчы. Усе работы па асваенню зямель праводзіліся ўручную. Вялікі ўклад у меліярацыю ўнеслі Іван Андрэевіч Міхалка і ягоны памочнік Пятро Міхалка.

Асабліва выраслі зямельныя ўгоддзі калгаса «Чырвоная Дуброва». Гаспадарка набірала сілу. Па рэкамендацыі сельскага Савета яе ўзначаліў Іван Іванавіч Ярац. Затым — Малінін, Кандраценка. З цягам часу калгас пабудаваў некалькі жывёлагадоўчых фермаў, гумно і свіран.

Асабліва значных поспехаў калгас «Чырвоная Дуброва» дасягнуў пры старшыні Рыгору Гапоненку. Найбольш плённымі сталі для арцелі 1937 і 1939 гг. Пацвярджэнне аб тым у Ганаровай кнізе Усесаюзнай выстаўкі народнай гаспадаркі ў Маскве. У ёй запісана, што калгас «Чырвоная Дуброва» ў сярэднім за названыя два гады атрымаў звыш 12 цэнтнераў збожжа з гектара. У гэтай жа кнізе прозвішча старшыні калгаса. І ў 1940 г. гаспадарка займае ганаровае месца на ВДНГ. У Кнігу гонару занесены калгас, яго старшыня і лепшыя калгаснікі-стаханаўцы — конюх Даніла Дзейкун, палявод Трафім Міхалка, брыгадзір Дзмітрый Ярац. Дарэчы, у 1938—1939 гг. у брыгадзе, якую ўзначальваў Ярац, быў атрыманы ўраджай проса больш чым па 21 цэнтнеру з кожнага гектара. Гэта быў найвышэйшы паказчык не толькі ў раёне, а і ў вобласці.

...У 1941 г. калгасы «Запаветы Леніна», «Пяцігодка» і «Чырвоная Дуброва» зноў абаранялі гонар раёна на галоўнай выстаў-

цы краіны. Некалькі іхніх працаўнікоў былі занесены ў Кнігу гонару. Сярод іх — тэхнік па штучнаму асемяненню жывёлы Герман Крутой, даглядчык жывёлы Цімафей Блізнец, даярка Матруна Тужык, паляводы-стаханаўцы Сямён Сідарэйка і Герман Ярац. Усе яны атрымалі каштоўныя падарункі. Да іх ездзілі за перайманнем перадавога вопыту.

Але ўсё перакрэсліла вайна. У першыя ж дні яе звыш 500 жыхароў Караваціч, Цішкаўкі і Чырвонай Дубровы пайшлі на фронт. Толькі 200 вярнуліся дамоў. Сярод загінуўшых былі і былыя старшыні гаспадарак. Склаў галаву, набліжаючы Перамогу, Мікалай Яфімавіч Махнач, які паказаў сябе здольным і энергічным кіраўніком калгаса «Запаветы Леніна». Івану Рыгоравічу Ярцу, таксама былому старшыні, было даручана перагнаць у тыл калгасны статак, каб ён не дастаўся ворагу. Удава Івана Рыгоравіча Агаф'я Майсееўна нагадвае: «Калі што, то жывым не дамся у палон. Дайшоў з каровамі да Тамбова. Адтуль пайшоў на фронт. Загінуў, як і багата хто з нашых...»

Быў закатаваны ворагамі былы старшыня калгаса, а затым сувязны партызанскага атрада М. В. Смольскі, забіты старшыня калгаса «Пяцігодка» С. П. Дорах. Яго выдалі карнікам Гаўрыла і Ціт Сычы. Абодва былі расстраляны партызанамі ў 1942 г.

...У лістападзе 1943 г. рэчыцкая зямля была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Найбольш цяжкія баі мелі месца каля Караваціч. Вёска некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі. Танкавая дывізія фашыстаў мела намер прарвацца праз вёску да Рэчыцы. На яе шляху стала 41-ая асобная знішчальна-супрацьтанкавая артылерыйская брыгада палкоўніка Когана.

На самым цяжкім участку знаходзіўся 1958-ы полк на чале са смелым і рашучым камандзірам — беларусам, падпалкоўнікам Мікалаем Міхайлавічам Забелам.

Трое сутак цягнуліся жорсткія баі за вёску. Шматлікія атакі ворага захлёбваліся, разбіваючыся аб мужнасць артылерыстаў, пехацінцаў і коннікаў. Масавы гераізм паказалі байцы першай, другой, трэцяй і чацвёртай батарэй брыгады, якімі камандавалі капітан Мікалай Сцяпанавіч Казлоў, старшы лейтэнант Мікалай Ільіч Барэеў, старшы лейтэнант Аляксей Якаўлевіч Сухарукаў, старшы лейтэнант Шарыф Суляйманавіч Суляйманаў.

За паспяховае выкананне баявой задачы па вызваленні вёскі падпалкоўнік М. М. Забела быў адзначаны ордэнам Леніна, а старшым лейтэнантам М. І. Барэеву, А. Я. Сухарукаву, Ш. С. Суляйманаву і камандзіру гарматы трэцяй батарэі В. В. Крыкліваму было прысвоена званне Герояў Савецкага Саюза.

...Да адраджэння сваіх калектыўных гаспадарак працаўнікі калгасаў «Запаветы Леніна», «Пяцігодка» і «Чырвоная Дуброва» прыступілі ўжо ў снежні 1943 г. Давялося пачынаць як бы спачатку. Не было жывёлы, тэхнікі, памяшканняў. У Цішкаўцы, напрыклад, удалося сабраць 5 вазоў, 12 плугоў. Ва ўсёй вёсцы меліся толькі тры каровы.

Першымі пасляваеннымі кіраўнікамі калгасаў былі: у Караваціч — Пятро Ракавец, у Цішкаўцы — Платон Сыч, у Чырвонай Дуброве — Андрэй Астапенка.

Ва ўсіх трох гаспадарках для правядзення веснавой сяўбы насенне збожжа і бульбу збіралі ў вяскоўцаў. Зямлю апрацоўвалі ўручную, рыдлёўкамі. Нярэдка ў плуг упрагаліся людзі.

На чале калгаса «Запаветы Леніна» з 1944 па 1950 гг. з'яўляўся Кузьма Сямёнавіч Кулажанка. За гэты перыяд гаспадарка набыла новы аўтамабіль, жняярку, касілку, трыер, іншы дробны сельскагаспадарчы інвентар.

У студзені 1947 г. калгас «Чырвоная Дуброва» узначаліў Фёдар Іларыёнавіч Блізнец. На гэты перыяд гаспадарка мела 60 кароў, 40 коней. З інвентару — толькі конную малатарню.

У жніўні 1950 г. калгасы «Запаветы Леніна», «Пяцігодка» і «Чырвоная Дуброва» аб'ядналіся. За старшыню быў абраны Фёдар Іларыёнавіч Блізнец. Неўзабаве яго змяніў Станіслаў Норбетавіч Траўнічак. Калгас меў 450 кароў, 150 коней, свінаферму, птушкаферму, ферму па развядзенню авечак, 40 пар валоў, 3 трактары «Наці», адзін ХТЗ.

...Шмат давялося зрабіць для таго, каб аднавіліся заняткі ў Караваціцкай дзесяцігодцы. У часе вайны ацалеў толькі адзін будынак з двума класнымі пакоямі. Не хапала настаўнікаў. Загінулі ў баях за Радзіму такія выкладчыкі, як В. П. Зямлянскі, М. Каплуноў, Н. Рыбачэнка, М. Я. Махнач, М. Бірыла.

Дзеці займаліся ў наёмных памяшканнях. Класнай дошкай служылі дзверы. Не

было падручнікаў, сшыткаў. Навучэнцы пісалі на кавалках паперы, абрыўках газет.

Аднак неўзабаве было пабудавана для школы новае памяшканне. У 1947/48 навучальным годзе вучнямі школы былі 446 дзяцей.

У 1952 г. адбыўся першы выпуск дзесяцікласнікаў. Атэстаты сталасці атрымалі 18 хлопцаў і дзяўчат.

...Вось ужо некалькі дзесяцігоддзяў аб'яднаная калектыўная гаспадарка вёсак Каравацічы, Цішкаўка і Чырвоная Дуброва носіць назву «XXI з'езд КПСС». Па выніках работы за 1977 і 1978 гады калгас выходзіў пераможцам Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва і ўзнагароджваўся пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ. Ён двойчы заносіўся на Усесаюзную Дошку гонару ВДНГ СССР.

Звыш 30 гадоў калгас «XXI з'езд КПСС», адну з перадавых гаспадарак Рэчыцкага раёна, узначальвае Мікалай Мікалаевіч Коваль. Ён узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, многімі медалямі. М. М. Коваль — былы народны дэпутат Рэспублікі Беларусь.

У калгасе нямала працаўнікоў, чыімі добрымі справамі ганарыцца гаспадарка. Адзін з іх — П. Я. Ярац. У свой час ён выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

У вёсках Каравацічы, Цішкаўка, Чырвоная Дуброва, якія ўваходзяць у калгас «XXI з'езд КПСС», нямала зроблена для паляпшэння дабрабыту людзей. Узводзіцца жыллё, працуюць магазіны. Дзеці вучацца ў прасторных школах. У Цішкаўцы школа пачатковая, у Чырвонай Дуброве — няпоўная сярэдняя, у Каравацічах — сярэдняя. Дарэчы, апошняя — тыпавая, на 536 месцаў.

...Як сімвал мужнасці і гераізму стаіць над брацкай магілай у вёсцы Каравацічы высокі абеліск з надпісам «1941—1945». На плітах выбіты прозвішчы і імёны ўсіх землякоў, якія загінулі, баронячы ў час Вялікай Айчыннай вайны Радзіму. Велічным помнікам тым, хто вызваляў тутэйшую зямлю ў лістападзе 1943 г., з'яўляецца магутны танк.

Землякі ганарацца і Фёдарам Гардзеевічам Сычом, які загінуў у Афганістане.

...Некалі землі вакол Караваціч, Цішкаўкі і Чырвонай Дубровы ўяўлялі сабой як не суцэльнае балота. Але дрыгву скарылі людзі. Яны прымусілі яе даваць высокія ўраджаі. І гэта таксама бы помнік усім тым, хто рабіў тут, марыў і кахаў. А калі спатрэбілася, то без роздуму ўзяў у рукі зброю, каб бараніць Айчыну. Усім тым, каму пашчасціла вярнуцца дамоў з Перамогай, зноў узяць у рукі плуг...

Э. П. Залескі, В. А. Ярамчук

ЛІСКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Пасяліліся ля крыніц (в. Крынкі)

Мясціна, дзе знаходзіцца наша вёска Крынкі, у далёкія часіны ўяўляла сабой ладны востраў, атулены з усіх бакоў балотамі. Адно з іх мела назву Бель. Справа ў тым, што на балоце раскашавала трава, якая, расцвіўшы, распускала доўгую белую мяцёлку. І тады пух плыў над дрыгвою.

Шмат якія ўрочышчы і палі, размешчаныя паблізу Крынак, таксама маюць назвы, звязаныя з вадою. Напрыклад, урочышча Верхлессе. Мясціна гэтая была парослай кустоўем, вясной і восенню залівалась вадою. Ды так, што з вады вытыркаліся адно макаўкі кустоў — вярхі лесу. Назва ўрочышча Вадзянка таксама кажа сама за сябе: тут заўсёды стаяла вада. А вось урочышча Заверхлессе знаходзіцца на больш сухім месцы, дзе канчаецца Верхлессе.

Укруг востраваў быў і дрымучы лес. На высокіх пясчаных выспах стаялі стромкія сосны, а на ніжэйшых мясцінах — магутныя дубы.

На паўночна-ўсходнім баку востраў, дзе сутыкаецца ён з балотам, на паверхню зямлі выбіваліся некалькі крыніц. Былі яны па лініі ад Сычовай Копані і па краі зямельных участкаў насельнікаў цяперашняй Школьнай вуліцы.

Многія з далёкіх продкаў жыхароў вёскі Крынкі жылі некалі ў пасяленні, якое знаходзілася на паўночны ўсход ад Крынак. Зараз гэта месца мае назву Селішча. І менавіта адсюль праз урочышча Папоўшчына вяла дарога да вёскі Дземяхі.

Як сцвярджае паданне, жыхары Селішча належалі пану вёскі Салтанова. І той рабіў усё, каб выцягнуць з людзей як мага больш падаткаў.

Першым не вытрымаў здзекаў селянін па прозвішчы Кот. Разам з сям'ёю ён перабраўся праз балоты і пасяліўся на востраве. Панскія ж паслугачы пабаяліся сунуцца ў багну.

Тут, на востраве, уцякач пачаў апрацоўваць участак зямлі, які і да сёння мае назву Котавага поля.

У першага насельніка нашай вёскі быў сын Ілья, які ў сваю чаргу меў сына Уладзіміра і некалькіх дачок.

Праз пэўны час да вальнадумца Кота далучыліся яшчэ некалькі жыхароў не толькі Селішча, а і іншых вёсак. Тыя, што перабраліся на востраў з Селішча, мелі ў асноўным прозвішча Коцур. Перасяленцаў з недалёкіх мясцін назвалі Блізняцамі. Каторыя ж прыбіліся на востраў здалёк, атрымалі прозвішчы Захожыя і Іовенкі.

Паступова на востраве выраслі 40—50 хацін. Вёска атрымала назву Крынкі. Яна ад тых жа крыніц, што выбіваліся з зямлі і ля якіх ставілі сабе жытло ўцекачы ад панскага прымусу.

Цяжка казаць, калі ж дакладна з'явілася вёска Крынкі. Хутчэй за ўсё ў сярэдзіне XVII ст.

Вядома ж, зямлі для ўсіх на востраве не хапала. Менавіта таму каторыя з вяскоўцаў узяліся за раскарчоўку ўчастка на другім баку балота Бель. І гэта мясціна атрымала назву Закрынічча, бо знаходзілася за крыніцамі.

Вёска Крынкі знаходзілася на казённай зямлі, то і жыхары яе былі дзяржаўнымі сялянамі. За карыстанне зямлёю яны плацілі ў казну грашовы налог. Разам з тым абавязаны былі выконваць так званыя дарожную і падводную павіннасці: рамантаваць дарогі і перавозіць сваім цяглом дзяржаўныя грузы. Меўся яшчэ адзін абавязак — карміць салдат і коней, калі каторая з вайсковых часцей мусіла была супыніцца ў Крынках.

У 1882 г. пачалося будаўніцтва Палескай чыгункі. Яна павінна была прайсці ў двух кіламетрах ад вёскі. Таму шмат хто з беззямельных і малазямельных жыхароў Крынак пайшлі на будаўніцтва чыгункі. Займаліся ў асноўным нарыхтоўкай лесу для шпал.

Разам з іншымі быў вымушаны ўзяць у рукі сякеру і пайсці ў наймы да лесапрамыславіка Давіда Бабрынскага Сямён Фаміч Блізнец, хаця і было яму тады ўсяго пятнаццаць гадоў.

Крынкаўскія балоты ўшчыльную пады-ходзілі да чыгункі. Каб зменшыць узровень вады, ад багны да рэчкі Ведрыч была пракапана канава. У выніку з'явіліся ўчасткі зямлі, прыдатныя для нарыхтоўкі сена. Адзін з такіх участкаў быў замацаваны за тымі сем'ямі жыхароў Крынак, родныя якіх адбывалі салдатчыну. Урочышча гэта атрымала назву Салдацкі Рог.

Неўзабаве праз балота была насыпана і грэбля. Яна злучыла Крынкі з вёскай Ліскі.

На першым часе канава ад крынкаўскіх балот да Ведрыча не мела назвы. Але праз год-другі назва адшукалася як бы сама сабою. Канава пачала зарастаць крапівою, то і назвалі яе Крапіўняй.

Адметным для гісторыі вёскі Крынкі з'яўляецца 1885 г. Менавіта тады ў нас была адкрыта земская пачатковая школа. Яе пусціў да сябе ў хату Іван Мітрафанавіч Гвоздзь. Затым школа мясцілася ў хаце Майсея Сыча.

Загадваў крынкаўскай школкай Анастас Варфаламеевіч Паўлюкоўскі.

Ад Майсея Сыча школа перайшла ў хату Івана Рыгоравіча Іовенкі. Настаўнікамі ў ёй рабілі Ханько, Трапачка і Пуцейка.

У 1914 г. у вёсцы, нарэшце, для школы была ўзведзена будыніна з чатырох класных пакояў, кватэры для настаўніка. Школа размясцілася на Котавым полі. Побач з ёй быў пабудаваны і малітоўны дом.

Як вядома, згодна сталыпінскай аграрнай рэформе, кожны селянін атрымаў права выйсці з сялянскай абшчыны і атрымаць ва ўласную маёмасць свой зямельны надзел, заснаваць хутар.

Таму з 1911 і па 1916 гг. ля дваццаці сем'яў нашай вёскі пайшлі на хутары. Каторыя на старажытнае Селішча, іншыя — у новыя мясціны. За хутарамі гэтымі замацаваліся такія назвы: Крапіўня, Расолаў Рог, Падгарадзішча, Лузіцкі, Самойлаў.

Кастрычнік 1917-га прынёс змены і для жыхароў Крынак. Неўзабаве шмат хто з вяскоўцаў пайшоў у Чырвоную Армію. Напрыклад, актыўнымі ўдзельнікамі грамадзянскай вайны былі Дзмітрый Дзянісавіч Блізнец, Сямён Фаміч Блізнец, Фёдар Блізнец, Яфім Сцяпанавіч Гвоздзь, Ігнат Дзямянавіч, Максім Іванавіч і Мікалай Кузьміч

Коцуры, Фёдар Францавіч Ткач. С. Ф. Блізнец скончыў курсы чырвоных камандзіраў, камандаваў на фронце ротай. Змагаўся на Заходнім фронце з белапалякамі, прымаў удзел у баях з Дзянікіным. У якасці камандзіра эскадрона браў удзел у штурме Перакопа.

Жыхары Крынак дапамагалі Чырвонай Арміі прадуктамі харчавання, фуражом для коней.

Шмат хто з жыхароў нашай вёскі выпісваў газеты і часопісы. Але без аніякага перабольшвання можна зазначыць аб наступным: культурнае жыццё Крынак як бы групавалася вакол школы. Глыбокай павагай карысталіся ў вяскоўцаў настаўнікі Дабраслаўскі (загадчык школы) і Касцецкі, якія рабілі ў нашай школе да 1929 г. Потым дырэктарам школы быў прызначаны Басянкоў, у 1932 г. — Малашчыцкі.

Да пачатку 1931 г. жыхары вёскі Крынкі жылі, як кажуць, аднаасобна. У сакавіку таго ж года ў вёску прыбыў прадстаўнік абласнога выканкама Рыгор Канавалаў. Ён меў перад сабой задачу склікаць вясковы сход, на якім і вырашыць пытанне аб утварэнні ў Крынках калгаса. Сход сабраўся ў хаце Кацярыны Рыгораўны Коцур. Актыўны ўдзел прынялі ў ім Сямён Фаміч Блізнец, Іван Кузьміч і Максім Іванавіч Коцуры, Андрэй Спірыдонавіч Грыб.

Сход прыняў рашэнне: стварыць у Крынках калектыўную гаспадарку і даць ёй назву «Піянер». Старшынёй калгаса быў абраны Сямён Фаміч Блізнец, былы чырвоны камандзір. Першыя калгаснікі — Макар Ціханавіч Блізнец, Дзмітрый Фёдаравіч Блізнец, Андрэй Спірыдонавіч Грыб, Дзям'ян Ануфрыевіч Грыб, Елісей Сцяпанавіч Грыб, Пётр Ціханавіч Зайцаў, Андрэй Клешчанка, Рыгор Фёдаравіч Клешчанка, Піліп Фёдаравіч Клешчанка, Архіп Навумавіч Коцур, Іван Кузьміч Коцур, Максім Іванавіч Коцур, Сцяпан Сямёнавіч Коцур і Уладзімір Ільіч Коцур.

Да восені 1931 г. у калгас «Піянер» уступілі 60 сем'яў, потым яшчэ некалькі дзесяткаў вяскоўцаў.

На адным з чарговых сходаў калгаснікаў намеснікам старшыні (заўгасам) быў абраны Андрэй Спірыдонавіч Грыб.

На працягу 1932 г. у калгасе былі ўзведзены тры хлявы, у якія размясцілі 60 кароў, столькі ж коней і ля сотні авечак.

Адначасова вялося будаўніцтва вясковага клуба, дзіцячых ясляў, калгаснай канцылярыі.

Калектыўная гаспадарка вёскі Крынкі атрымала ад дзяржавы малацілку з конным прывадам, веялку і саламарэзку.

У 1934 г. матэрыяльная база калгаса «Піянер» адчувальна ўмацавалася. Членамі калектыўнай гаспадаркі сталі ля 80 працэнтаў жыхароў Крынак. Калгас меў 100 кароў, 130 коней, 185 авечак. Былі набыты дзве конныя жняркі і адна сенакасілка. Вясной таго ж 1934 г. у калгас прыбыў з МТС і першы колавы трактар. На ім рабілі жыхары Крынак Дзмітрый Фёдаравіч і Іван Мацвеевіч Блізняцы, а таксама Вольга Цітаўна Клешчанка. Як след пашчыраваўшы ў полі, яны дапамаглі калгасу своечасова правесці веснавую сяўбу.

У 1934 г. у Крынкі прыйшло і кіно. Вяскоўцы, што запоўнілі калгасны клуб, паглядзелі кінастужку «Мы з Кранштата». А вось першую радыёперадачу яны праслухалі годам раней.

У 1935 г. калгас «Піянер» аб'яднаў каля 85 працэнтаў сялянскіх гаспадарак Крынак. Шмат на каго адчувальна падзейнічаў нядаўні пажар. Людзі ўбачылі, што калгас дбае ў першую чаргу аб сваіх членах.

Неўзабаве (1936 г.) калгас узначаліў жыхар вёскі Воўчая Гара Мікалай Іванавіч Кандраценка. Гаспадарку ён атрымаў даволі моцную.

Вясной 1936 г. у Крынках было завершана будаўніцтва памяшкання для дзіцячых ясляў, і неўзабаве яно напоўнілася дзіцячымі галасамі. Загадчыцай гэтай установы была прызначана Лёкса Дзмітраўна Блізнец, а старшай выхавальніцай Варвара Ісакаўна Клешчанка. Яны былі дыпламаванымі спецыялістамі, бо скончылі спецыяльныя курсы. Увогуле ў калгасных дзіцячых яслях знаходзіліся 80 хлопчыкаў і дзяўчынак.

У тым жа 1936 г. да памяшкання Крынкаўскай пачатковай школы была зроблена прыбудова, і школа стала сямігодкай. Дырэктарам яе быў прызначаны Васіль Паўлавіч Комар, які толькі што скончыў педагагічны інстытут. Дарэчы, разам з жыхаром Крынак Андрэем Андрэевічам Клешчанкам, які таксама пачаў рабіць настаўнікам у роднай вёсцы.

У школе нашай вёскі вучыліся не толькі дзеці Крынак, а і Лісак, Будак, Шыбенак. Дарослае ж насельніцтва мела магчымасць наведваць лікбез.

Шырокі ўплыў на моладзь вёскі аказвала камсамольская арганізацыя школы.

У 1936 г. яна прыняла рашэнне ліквідаваць малітоўны дом. З капліцы быў зняты крыж. Гэта зрабіў камсамолец Юра Астапенка. А неўзабаве і сама капліца была разабрана.

У сакавіку 1938 г. старшынёй калгаса «Піянер» быў абраны жыхар Лісак Васіль Ануфрыевіч Палівач.

Неўзабаве распачалася ліквідацыя хутароў, якія туліліся ўкруг Крынак. Іхнія жыхары былі пераселены ў вёску. Яны атрымалі прысядзібныя ўчасткі, грашовыя дапамогі, піламатэрыялы. Калгас дапамог цяглом, каб звезці маёмасць. Перасяленцы ўтварылі дзве новыя вуліцы — Новую і Мохавую. Увогуле з хутароў у Крынкі перабраліся 48 сем'яў. Перабраліся з надзеяй на добрае жыццё. Дарэчы, заробак кожнага працаўніка калгаса «Піянер» склаў на кожны працадзень па выніках 1938 г. кілаграм жыта, чатырыста грамаў грэчкі, столькі ж — ячменю, па восем кілаграмаў бульбы.

Работы, звязаныя з асушэннем балот, дазвалялі калгасу рэгулярна ўводзіць у сельскагаспадарчы абарот землі, што раней былі пад дрыгвой. Калгас увесь час нешта ды будаваў. Але будаўнічыя работы стрымліваліся недахопам матэрыялаў. І тады было вырашана прыступіць да ўзвядзення свайго цагельнага завода. Сваю першую прадукцыю гэты завод даў у 1939 г. Дырэктарам яго рабіў Рыгор Фёдаравіч Коцур, які раней узначальваў калектыў аднае з фермаў. А вось асноўнымі спецыялістамі па выпуску цэглы сталі Іван Іванавіч Гвоздзь і Юрый Ярушэвіч, якія атрымалі належную падрыхтоўку на іншых цагельных заводах вобласці. Нялёгкай справе па вырабу цэглы Гвоздзь і Ярушэвіч абучылі неўзабаве і Нікіфара Дзям'янавіча Коцура.

Летам 1939 г. В. А. Палівач быў прызваны ў Чырвоную Армію. Узнікла неабходнасць выбараў новага старшыні калгаса. Ім стаў жыхар вёскі Ліскі Павел Аляксеевіч Астапенка. Ён узначальваў калгас «Піянер» да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Павел Аляксеевіч нямала зрабіў для ўмацавання калектыўнай гаспадаркі. Былі ўзведзены памяшканні для збожжасушылкі, два новыя хлявы для жывёлы. Калгас набыў грузавы аўтамабіль. Працягвалася меліярацыя. Калгас пабудаваў лазню і г. д.

Кіраўніцтва калектыўнай гаспадаркі не забывалася і на культуру. У мясцовым клубе рэгулярна наладжваліся канцэрты мастацкай самадзейнасці, папаўнялася новымі творамі бібліятэка хаты-чытальні, якая, дарэчы, адчынілася ў Крынках у 1934 г.

Калгас дбаў і пра школу, калектыў якой у 1939 г. узначаліла Феня Дзмітраўна Кавальчук. У сваёй рабоце яна апіралася на руплівых педагогаў Валянціну Мікітаўну Філончык, Васіля Паўлавіча Іванейчыка і г. д.

У наступным, 1940 г. Крынкаўская сямігодка была рэарганізавана ў растучую сярэднюю школу. Выпускнікі яе пайшлі ў восьмы клас.

Жыхары Крынак з упэўненасцю глядзелі ў заўтрашні дзень, спадзяваліся на шчаслівую долю для сябе і сваіх дзяцей. Але планы гэтыя перакрэсліла вайна.

З першых дзён яе амаль усе мужчыны прызыўнога ўзросту пайшлі на фронт. А той набліжаўся з кожным днём. І тады ў калгасе «Піянер» была створана група з васьмі чалавек, якім належала гнаць у глыб краіны калгасны статак. За старшага быў Фёдар Восіпавіч Коцур. Ягоныя памочнікі — Барыс Блізнец, Настасся Сцяпанаўна Белая, Міхаіл Іванавіч Грыб, Марыя Андрэеўна Клешчанка, Андрэй Ігнатавіч Коцур, Марк Трафімавіч Коцур і Міхаіл Елісеевіч Сыч.

У пачатку ліпеня 1941-га калектыўны статак «Піянера» рушыў на ўсход. У ім былі 120 кароў, 350 авечак, 40 свіней.

Ф. В. Коцур і ягоныя таварышы па нялёгкай справе здзейснілі сапраўдны грамадзянскі подзвіг. Па дарозе на ўсход яны не толькі захавалі даручаную ім жывёлу, але і прынялі ад іншых калгасаў яшчэ 70 кароў, 250 авечак, 10 свіней. Свіней здалі ў Старадубе, а з каровамі і авечкамі прайшлі праз Бранскую і Варонежскую вобласці, пераправіліся праз Дон, уступілі на тэрыторыю Сталінградскай вобласці. У лістападзе 1941-га здалі мясцовым уладам 190 кароў і 600 авечак. Такім чынам за пяць месяцаў яны прайшлі са статкам паўтары тысячы кіламетраў.

Міша Сыч і Барыс Блізнец сталі чырвонаармейцамі. Астатнія ж вырашылі прабівацца ў родную вёску. Вярнуліся яны сюды ў студзені 1942 г.

А тут ужо ва ўсю гаспадарылі фашысты. Яны разрабавалі калгасную маёмасць, двойчы палілі вёску разам з яе жыхарамі. Чужынцы расстралялі, спалілі ў агні, закатавалі звыш 150 чалавек. У асноўным — старых, жанчын, дзяцей.

Але светлы дзень вызвалення прыйшоў. Каб наблізіць яго, на франтах страшэннай

вайны з карычневай фашысцкай чумой аддалі свае жыцці амаль паўтары сотні нашых землякоў. Светлая памяць аб іх у сэрцах тых, што засталіся ў жывых, у сэрцах іхніх нашчадкаў будзе вечнай.

А вёска... Яна вырасла з папялішчаў зноў. Жыццё на старажытнай зямлі, якую нашы продкі адваявалі ў балот, працягваецца...

А. С. Коцур, ветэран вайны і працы, настаўнік гісторыі

Будаваліся, каб жыць. (З гісторыі в. Ліскі)

Як прыйшло ад старых людзей: Ліскі з'явіліся ў XVII ст. Дзве сям'і — украінца Астапа і латыша Лобана — нагледзелі сабе зямлю на высокім месцы ля Ведрыча, ды і купілі яе ў арэнду ў пана.

Сем'і былі шматдзетнымі, таму і рабіць на зямлі было каму. Дзеці раслі, жаніліся ды выходзілі замуж. Сяліліся ля бацькоў. У тутэйшыя мясціны прыбіліся і іншыя людзі. Аралі зямлю, займаліся бортніцтвам, лавілі рыбу. Добрым падмацункам для кожнае сям'і былі грыбы. Кажуць, што найбольш шанцавала на лісічкі. У бліжэйшых лясах іх было, што хоць касу закладвай. Ад таго мо і Ліскі.

Вакол вёскі з'явіліся хутары. Першы быў узведзены ва ўрочышчы Ніўкі. Але ж радзіла тут толькі ў сухія гады, бо месца ва ўрочышчы нізкае. Таму гаспадар хутара ссяліўся неўзабаве вярсты за дзве на паўночны-захад, дзе намнога вышэй.

У 1884 годзе побач з Ліскамі распачалося будаўніцтва чыгункі. Ад таго часу больш шпарка пачала расці і вёска.

У 1889 годзе ў хаце Фёдара Астапенкі была адкрыта царкоўнапрыходская школа. Наглядваў за ёй святар з Дземяхоў.

Спачатку ў школцы займаліся толькі хлопчыкі. А настаўнічаў тут мясцовы жыхар Міканор Віктаравіч Астапенка. Адпрацаваў ён дзесяць гадоў.

Падзеі першай рускай рэвалюцыі Ліскі не закранулі. А вось першая сусветная вайна *жыццяў забрала нямала.*

Шмат хто з вяскоўцаў быў актыўным удзельнікам грамадзянскай вайны. З яе не вярнуліся дамоў Піліп Міканоравіч і Фама Міканоравіч Астапенкі, Дзмітрый Дзмітравіч Блізнец, Аляксей Якаўлевіч і Міхаіл Аляксеевіч Лобаны, Якаў Цімафеевіч Ярац.

Вярнуліся і карысталіся належнымі льготамі Анісім Цярэнцьевіч, Андрэй Харытонавіч, Іван Піліпавіч і Сямён Іванавіч Астапенкі, Васіль Адамавіч Блізнец, Іван Восіпавіч, Ігнат Мартынавіч і Сідар Уладзіміравіч Ласіцы, Якаў Самсонавіч Мурашка, Павел Мартынавіч і Яфрэм Мартынавіч Навасады. Яны і з'яўляліся застрэльшчыкамі новага жыцця.

У 1924 г. у Лісках арганізавалася камсамольская ячэйка. Узначаліў яе Павел Аляксеевіч Астапенка. Чатырма гадамі пазней у вёсцы ўтварылася ячэйка з камуністаў. Членамі партыі сталі ўсе былыя камсамольцы. На чале ячэйкі камуністаў быў Ануфрый Гардзеевіч Астапенка.

Сакавік 1929 г. — час арганізацыі ў Лісках калгаса. У калектыўную гаспадарку на першым часе ўвайшлі 30 сем'яў. Калгас назвалі «КІМ» — Камуністычны інтэрнацыянал моладзі.

Ішоў час, гаспадарка расла. У вёсцы былі пабудаваны клуб і школа.

У 1930 г. непадалёку ад Лісак пачаў дзейнічаць торфазавод, які забяспечваў палівам спіртзавод у Дземяхах. За кошт рабочых торфазавода павялічылася насельніцтва вёскі.

Цяжкім колам насунуліся на Ліскі сталінскія рэпрэсіі 30-ых гадоў. 15 вяскоўцаў, а таксама і каторыя з членаў іхніх сем'яў былі арыштаваны. Абвінавачванні супраць людзей былі найчасцей самымі прымітыўнымі. Так, быў схоплены камуніст, старшыня калгаса «КІМ», актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны Сцяпан Апанасавіч Астапенка. Супраць гэтага чалавека *як бы спрацавала тое, што ягоная жонка* Марыля была па нацыянальнасці полькай. *Значыць, маюць сувязь з польскай разведкай.*

Толькі адзін з забраных органамі НКУС у 1937—1938 гг. — Павел Мартынавіч Навасад — вярнуўся дамоў. Ён пражыў звыш ста гадоў, але да канца сваіх дзён баяўся гаворкі пра тое, як было ў лагерах ГУЛАГа.

Пасля 1953 г. вярнулася і названая вышэй Марыля Астапенка, але ў хуткім часе памерла.

20 жыхароў Лісак былі ўдзельнікамі

савецка-фінскай вайны 1939—1940 гг. Прытым чацвёра з іх з'яўляліся старшымі афіцэрамі.

Страшэнным выпрабаваннем для жыхароў Лісак стала Вялікая Айчынная вайна.

У сярэдзіне жніўня 1941-га праз вёску прайшлі чырвонаармейцы, якія рухалі ў бок Лоева, да пераправы праз Дняпро. Дзён праз пяць пасля гэтага з'явіліся фашысты. Яны былі на конях.

Непадалёку ад Лісак акупанты абсталявалі пасты. У асноўным на чыгунцы.

Фашысты бамбілі вёску з самалёта, страчылі з кулямётаў па тых, хто працаваў у полі. Наязджалі, каб рабаваць.

З вясны 1942 г. акупанты пачалі адпраўляць людзей на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Усяго — 120 вяскоўцаў. Некалькі з іх дамоў не вярнуліся, і лёс іхні невядомы. Без абедзвюх ног вярнуўся Фёдар Сямёнавіч Астапенка...

19 снежня 1942 г. карнікі спалілі вёску. Згарэлі каля 300 дамоў, калгасны двор і г. д. Усіх жа жыхароў Лісак сабралі і пагналі ў Рэчыцу. Пратрымалі там суткі. Потым расстралялі 8 сем'яў. Астатніх адпусцілі.

Увогуле, за час акупацыі гітлераўцы загубілі каля 50 жыхароў Лісак.

За гібель родных і блізкіх, сваіх землякоў ворагу помсцілі тыя з вяскоўцаў, якія былі на фронце, у партызанскіх атрадах. Дарэчы, толькі на фронце склалі галовы, каб наблізіць светлы дзень вялікай Перамогі, каля 130 жыхароў Лісак.

Дзень вызвалення вёскі — 18 лістапада 1943 г.

Ліскі, спаленыя ў 1942 г., аднавіліся на ранейшым месцы. Вёска — цэнтр калгаса «Новы шлях». Толькі за апошні час у ёй узведзены новая школа, магазіны, цудоўны Дом культуры. Ліскі сталі новай радзімай для многіх сем'яў, якія жылі раней у Брагінскім і Хойніцкім раёнах і пацярпелі ад аварыі ў Чарнобылі.

Н. В. Астапенка,
настаўніца Ліскаўскай СШ

НОВАБАРСУЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

Гэта Чырвоная вёска... (З гісторыі в. Лясное)

...1832 год. Царскі ўрад агнём і мячом падаўляе паўстанне ў Польшчы і Беларусі, накіраванае супраць самадзяржаўнай тыраніі і нацыянальнага ўціску. Актыўны ўдзельнік паўстання Адам Каласоўскі разам з жонкай Мальвінай, уцякаючы ад царскіх халуёў, знайшоў прытулак у Маладушы. Неўзабаве, прабраўшыся на востраў сярод дрыгвы і лесу, Каласоўскія агорваюць хаціну. Мальвіна ашчаслівіла мужа 7 дочкамі — мажнымі, чарнабровымі прыгажунямі.

1863 г. у Польшчы і Беларусі новае паўстанне. Ізноўку няўдача.

І на гэты раз паўстанцы знаходзяць паратунак у беларускіх лясах. Некалькі з іх адшукалі дарогу на востраў, дзе жылі Каласоўскія. А неўзабаве на востраве зноўку дружна зацюкалі сякеры: сямёра зяцёў Каласоўскіх ставілі сабе хаты. Яны, хаты, рассыпаліся на пясчанай грыве, адкуль між прагалін віднеюцца абшары балот Падтарасы, Куліна, Шчоўб. За апошняй хатай, на захад ад вёскі, высіцца Лысая гара, якая ранняй вясной зацвітае кветкамі сон-травы, а па восені пазірае фіялетавымі вочкамі верасу.

...Шмат хто з насельнікаў вёскі браў удзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайне. Сярод іх браты Тамашэўскія.

Так, Адоль Тамашэўскі задоўга да 1917-га года патрапіў у Кіеў. Уладкаваўся там у кавальскі цэх. Гаспадар быў задаволены хлопцам, і неяк прызнаўся яму:

— Хутка, Адоль, ты будзеш гаспадаром гэтае кузні.

Ад Тамашэўскага патрабавалася толькі адно — узяць гаспадарскую дачку ў жонкі.

Адоль не паквапіўся на гаспадарскае дабро. У жонкі ўзяў сабе тую, якую кахаў. Таму ў хуткім часе апынуўся без работы. Праз месяц — другі ўладкаваўся на завод «Арсенал». Там стаў членам РСДРП(б).

У 1922 г. вёска была перайменавана ў Чырвоны Востраў.

...У сярэдзіне трыццатых гадоў Чырвоны Востраў наведаў старшыня ЦВК і СНК Беларусі А. Р. Чарвякоў. Ягоная машына забуксавала ў мясцовых брадах і мужчыны ў чатыры пары валоў прыцягнулі легкавік у вёску.

На сходзе вяскоўцаў А. Р. Чарвякоў назваў мясцовыя балоты «залатым дном», параіў брацца за асушэнне дрыгвы.

Тады і выспела ў лясноўцаў думка: пабудаваць тры грэблі, якія б злучылі Чырвоны Востраў з суседнімі вёскамі, пракапаць канал і спусціць у яго ваду з мясцовых балот.

Гоманам і шумам напоўніліся неўзабаве балоты. Бадай, упершыню лясноўцы працавалі ў гэткім калектыве, упершыню па-сапраўднаму адчулі моц і еднасць яго. Урэшце магістральны канал быў выкапаны, і ў яго па асушыцелях хлынула ржавая вада.

Пасля арганізацыі калгаса сяляне пачалі засяваць балотную аблогу. Ураджаі на навіне былі цудоўнымі. Маладая настаўніца Людміла Раманаўна Райкевіч нават табурэт падстаўляла пад ногі, каб вымераць даўжыню проса, што радзіла тут. Раслі, нібы той чарот, каноплі. Недарэмна ж за атрыманне высокіх ураджаяў калгас «Чырвоны Востраў» стаў удзельнікам сельскагаспадарчай выставы ў Маскве.

Праўда, тарфяныя палі былі невялікімі па памерах, ды і мясціліся яны ўзбоч магістральнага канала — далей было мокра. Але лясноўцы верылі: дай толькі час — уся дрыгва будзе ператворана ў шырокае поле.

Але гэтым думкам і спадзяванням перашкодзіла вайна.

На барацьбу з ворагам узняліся як не ўсе вяскоўцы. Адны змагаліся на фронце, іншыя — у патрыятычным падполлі і ў партызанах.

Па сутнасці, Чырвоны Востраў стаў партызанскай вёскай. Ідучы на заданні, лясныя мсціўцы адпачывалі тут. У кожнай хаце жанчыны пяклі для іх хлеб, латалі парваную вопратку. Калі не хапала бінтоў, для параненых даставалі з глыбокіх скрыняў ручнікі і настольнікі.

У вёсцы знаходзіўся выязны штаб партызанскага атрада імя Варашылава. Адсюль планаваліся аперацыі па захопу варожых гарнізонаў, на чыгункі.

Настаўніца Людміла Раманаўна Райкевіч, якая згадвалася вышэй, таксама са зброяй у руках змагалася з ворагам. У 1942 г. яна ўступіла ў шлюб з Антонам Венядзіктавічам Райкевічам, камандзірам аддзялення партызанскага атрада «Мсцівец» (затым — камандзір роты). Не лішне зазначыць, што ў названы вышэй атрад увайшлі звыш 30 чырванавостраўцаў.

Калі праз наш раён праходзіла партызанскае злучэнне легендарнага А. С. Каўпака, атрады ўкраінскіх партызан сустрэліся ў Чырвоным Востраве на цэлы тыдзень. Адпачывалі тут, набіраліся сілы перад новымі баямі з чужынцамі.

Фашысты, уведаўшы пра тое, падрыхтавалі жудасную расправу над няскоранай вёскай. У блакаду 1943 г. фашысты датла спалілі Чырвоны Востраў. На папялішчы засталіся адны печы ды натужліва паскрыпвалі пад ветрам абгарэлыя вочапы калодзежных журавоў.

Але планам гітлераўцаў здзейсніцца цалкам не выпала. Чырванавостраўцы своечасова зрабілі ў лесе другую вёску, толькі замест хат тут былі зямлянкі. З таго часу паралельна з назвай Чырвоны Востраў з'явілася яшчэ адна — Лясное.

Вярнуўшыся з лесу, чырванавостраўцы нанава адбудавалі вёску на старым месцы. Кожны на сваім спаленым падворку грукаў сякерай, узводзячы драўляныя хаты з сасновых барвёнаў. Нібы легендарная птушка Фенікс, вырас, аднавіўся на былым папялішчы Чырвоны Востраў (Лясное).

У цяжкія пасляваенныя гады лясноўцы прыступілі да ўпарадкавання сваёй карміцелькі-зямлі, якая зноўку забагнела, зарасла хмызам. Дзе-нідзе падкапалі магістральны канал, падрамантавалі як след асушыцелі. Дапамаглі ў тым рэчыцкія меліяратары. Разам з тым яны, меліяратары, на сотнях гектараў асушылі балоты, перадалі іх калгасу імя Фрунзе, у складзе якога і брыгада Чырвонага Вострава (Ляснога). Дарэчы — лепшая брыгада гаспадаркі.

...З Лысае гары, што на ўскраі вёскі, бачна ўлетку, як гойдаецца пад ласкавым ветрыкам збажына на полі, дзе некалі раскашавала дрыгва. Бачна адсюль і буравая, якая пампуе з глыбіні «чорнае золата» — нафту.

Словам, вёска жыве. Хочацца пажадаць, каб жыццё яе цягнулася як мага даўжэй.

Р. Андрэявец, П. Рабянок

Шукалі лепшай долі (з гісторыі в. Новы Барсук)

Вёску Новы Барсук заснавалі перасяленцы ў 1886 г. Першыя яе насельнікі — Каваленкі і Майсеенкі. Да іх далучыліся неўзабаве звыш васьмідзесяці сем'яў, якія жылі ў асноўным у Старым Барсуку, вёсцы, гісторыя якой уходзіць каранямі ў глыб стагоддзяў.

Перасяленцы выкупілі ў пана 3700 дзесяцін зямлі, большая частка якой — лясы і балоты. Адна дзесяціна, як нагадвалі старажылы, каштавала 14 рублёў. Вядома, грошай, неабходных на аплату за зямлю — 51 800 рублёў, — у вяскоўцаў не было. Давялося браць іх у крэдыт. Працэнт якога склаў 27 тысяч рублёў.

Але людзі, нягледзячы на цяжкасці, верылі ў лепшую долю: распрацоўвалі дзялянкі, будавалі хаты, нараджалі дзяцей.

У 1891 г. у вёсцы была пабудавана школа. Дапамог у тым наступны выпадак. Староста Нічыпар Жаўноў незаконна расходаваў грошы з абшчыннае касы. Калі гэта высветлілася, грамада вырашыла: Нічыпар павінен пабудаваць хату, якая б стала грамадскім домам для школы.

Праўда, першая вясковая школа працавала як след толькі год. Настаўнічаў тут чалавек, адукацыя якога складала два класы царкоўнапрыходскай школы. Вядома, навучыць мясцовых дзетак глыбокім ведам ён не мог. Ды гэта, калі на тое, вяскоўцы і не лічылі надтай патрэбай. У 1892 г. у Новым Барсуку пачалося ўзвядзенне царквы. Для грамады гэта было вялікім цяжарам, таму з мэтай эканоміі сродкаў школа была прыкрыта.

Аднавілася яна праз некалькі гадоў. Сяляне Раман Хадоркін і Аляксей Каваленка знайшлі недзе ў горадзе двух настаўнікаў. Яны скончылі гарадскія вучылішчы, але не здолелі знайсці работы. Адзін з хлопцаў-настаўнікаў у Новым Барсуку доўга не затрымаўся, а вось другі застаўся. Плацілі яму па рублю ў год за кожнага вучня-хлапчука, кармілі па чарзе.

Рэвалюцыя 1917 г. унесла значныя змены ў жыццё Новага Барсука. Адбыўся перадзел зямлі. У выніку яго надзелы атрымалі шмат хто з тых, каторыя зямлі раней мелі мала.

Актыўныя ўдзельнікі падзей 1917 г. і грамадзянскай вайны — Фёдар Гуц, Амяльян Перпачоў, браты Шпакавы.

У 1928 г. у Новым Барсуку была створана сельскагаспадарчая арцель. А праз год — першы калгас. Далі яму імя Фрунзе, за старшыню абралі Гаўрылу Лявонавіча Балшакова. Першыя члены арцелі — Лявон Каваленка, Сяргей Данільчанка, Трафім Іваненка.

У 1930 г. калгас імя Фрунзе аб'ядноўваў 30 двароў.

Вядома, станаўленне новага і ў нашай вёсцы праходзіла праз пэўныя складанасці. Далёка не ўсе жадалі рабіць у суполцы, аддаўшы калектыву ўсё тое, што было здабыта гадамі стараннай працы на ўласным кавалку зямлі.

Аб супярэчлівасці 20-ых гадоў у жыцці насельнікаў Новага Барсука сведчыць перш за ўсё забойства Івана Восіпавіча Пшанова, старшыні выканкама мясцовага Савета. Ён адслужыў у Чырвонай Арміі, вярнуўся дамоў. Неўзабаве быў абраны членам выканкама, а потым і старшынёй яго. Абапіраючыся на камітэт сялянскай беднаты, Пшаноў актыўна праводзіў у жыццё дырэктывы і патрабаванні, што зыходзілі ад партыйных і вышэйстаячых савецкіх органаў. Старшыня выканкама рэгулярна наведваўся ў вёскі, наладжваў гутаркі, мітынгі і г. д. Адзін з такіх мітынгаў павінен быў адбыцца і ў вёсцы Смагарын. Але якраз у той час, калі І. В. Пшаноў заходзіў у хату, прызначаную для мітынгу, пачуўся стрэл. Пшаноў, смяротна паранены, упаў на падлогу... У забойстве ягоным былі абвінавачаны двое з заможных гаспадароў Новабарсуцкага Савета.

Пачатак 30-х гадоў для Новага Барсука адметны будаўніцтвам памяшкання для школы, выкладчыцкі калектыў якой узначальваў Ул. К. Астаф'еў.

У 1936 г. калгас імя Фрунзе набыў аўтамашыну. Шафёр для яе быў знойдзены ў Рэчыцы. Ён рабіў па найму.

Праз два гады пасля гэтай падзеі гаспадарка набыла і два трактары. Тады ж былі накіраваны на курсы трактарыстаў Іван Мядзведзеў, Фёдар Астапенка, Мікалай Казора, Васіль Марчанка.

У вёсцы быў адкрыты і новы клуб. Сюды людзі збіраліся на адпачынак. Многія ж дзеля таго, каб паслухаць радыёпрыёмнік, які быў набыты за кошт калгаса.

Вялікая Айчынная вайна з'явілася суровым выпрабаваннем для жыхароў і Новага Барсука. Дзесяткі вяскоўцаў выправіліся

на фронт, многія змагаліся з ворагам у партызанскіх атрадах. Гэта прыводзіла ў шаленства фашыстаў. Так, яны расстралялі партызанскія сем'і Хамяковых і Брылёвых, закатавалі партызанскую сувязную Марыю Анікееўну Жураўлёву, жорстка расправіліся з многімі іншымі вяскоўцамі.

Але ніякія рэпрэсіі не маглі прывесці да скарэння перад чужынцамі маіх землякоў. І калі ў 1942 г. праз Новы Барсук праходзілі падраздзяленні партызанскага злучэння Каўпака, то 35 вяскоўцаў накіраваліся ў рэйд са славутым партызанскім генералам.

У лістападзе 1943 г. Новы Барсук быў вызвалены ад чужынцаў. Праз паўтара месяца пасля гэтай падзеі сабраўся калгасны сход. Гэта азначала тое, што калектыўная гаспадарка аднаўляе сваю дзейнасць. Кіраўніком яе быў абраны Іван Іванавіч Лапека.

Старажылы нагадваюць: вясной 1944 г., калі надышоў час сяўбы, насенне давялося збіраць па дварах. Часам, літаральна па жмені. Зямлю капалі ў асноўным звычайнымі рыдлёўкамі. Тым не менш, удалося засеяць 72 гектары. Восенню даход калгаса склаў 90 тысяч рублёў. Па тагачасных цэнах — мізэр. Але ж і гэта была перамога людзей, якія столькі перажылі і жадалі, каб хутчэй скончылася вайна, каб вярнуліся хутчэй дамоў іхнія родныя ды блізкія.

На жаль, да родных хат вярнуліся далёка не ўсе, каго выправіла вёска на фронт. Так, 90 жыхароў Новага Барсука загінулі смерцю героя ці прапалі без вестак.

...Сёння Новы Барсук — адна з прыгажэйшых вёсак раёна. У ёй ёсць усё для жыцця і адпачынку людзей. Нядаўна ўзведзены цудоўнае памяшканне для школы, гандлёвы цэнтр і г. д. Хвалюе ж наступнае: вёску не мінула бяда, што прыйшла з Чарнобыля. Узровень забруджанасці мясцовасці намнога перавышае сярэднераённы паказчык.

Л. Балачкова

ПЕРАСВЯТОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Шляхам сталення (в. Перасвятое)

Перасвятому амаль 300 гадоў. Напачатку вёску называлі Касой Слабадой. Валодаў ёй памешчык па прозвішчу Касы.

Як вядома, у лютым 1861 г. сяляне атрымалі «волю». Але найбольш урадлівыя землі вакол вёскі патрапілі да памешчыка Перасвятоўскага. Нядоўга думаючы, ён і перайначыў населены пункт у Перасвятое.

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі вёска ўваходзіла ў Ровенска-Слабодскую воласць Рэчыцкага павета Магілёўскай, а потым Мінскай губерні.

3-га лістапада 1917 г. (стары стыль) у Перасвятым была агалошана савецкая ўлада. Мясцовыя жыхары ўвогуле з прыхільнасцю сустрэлі гэтую падзею. Але неўзабаве распачалася грамадзянская вайна. На тэрыторыю павета прыйшлі кайзераўцы. Праўда, у Перасвятым іх не было. А вось белапалякі вёску захапілі. Вызвалена ж яна была 19 чэрвеня 1920 г.

Сельскі Савет у Перасвятым з далёкага 1917 г. На першым часе старшынёй яго быў Пётр Харытонавіч Налягач.

Сярод славутых людзей вёскі — Цімафей Гайдаш і Андрэй Грышчанок, якія з'яўляліся актыўнымі ўдзельнікамі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

Калгас быў утвораны ў Перасвятым у 1933 г. Першы старшыня яго — Мікалай Садоўскі. Потым на чале гаспадаркі былі Аляксандр Дзедзік і Савелій Налягач. Першыя і найбольш актыўныя калгаснікі — Андрэй Голіц, Наталля Жданава, Аксіння Астроўская. Дарэчы, спачатку ў калектыўную гаспадарку ўступілі 12 чалавек.

Перасвятоўскі калгас меў назву імя Будзённага і быў даволі заможным. Уступаў хіба што калгасам Ровенскай Слабады, Барсукоў і Сямёнаўкі.

Варта нагадаць: у 1935 г. адбылося аб'яднанне калгаса імя Будзённага з калектыўнай гаспадаркай вёскі Бугрымаўка — калгасам «Працавік», у які ўваходзілі таксама і сяляне пасёлкаў Асавец і Жары. Аб'яднаная гаспадарка атрымала назву імя Чарвякова. Але неўзабаве той, чыё прозвішча ўзяў для сваёй назвы калгас, быў рэпрэсіраваны. У Перасвятое спехам прыбыў упаўнаважаны з Рэчыцы: калгас атрымаў назву імя Будзённага. У Будзёнаўку перайначылі і саму вёску, але назва такая не прыжылася, бо вяскоўцам даспадобы было менавіта Перасвятое.

Суровыя выпрабаванні выпалі на долю жыхароў вёскі ў гады Вялікай Айчыннай

вайны. Немцы з'явіліся 28 жніўня 1941 г. І адразу ж пачаліся рабаванні і здзекі. Цягнулася гэта амаль 27 месяцаў.

Многія жыхары Перасвятога былі звязаны з партызанамі. Дзяліліся з імі прадуктамі харчавання, адзеннем, збіралі для народных мсціўцаў зброю. Партызанскімі сувязнымі з'яўляліся Андрэй Андрэевіч і Аляксей Купрэевіч Налегачы. Некалькі дзесяткаў ураджэнцаў Перасвятога загінулі на фронце.

Як вядома, партызаны Украінскага злучэння, на чале якога быў С. А. Каўпак, у 1942 г. зрабілі гераічны рэйд у Карпаты. Па дарозе туды спыняліся яны і ў Перасвятым.

...Раніцай 15 лістапада 1943 г. трэці полк 194-й стралковай дывізіі 48-ай арміі 1-га Беларускага фронту з боку вёскі Корасцень уварваўся ў вёскі Маўчаны і Падмосце. А ў 10—11 гадзін таго ж дня артылерыйскі абстрэл тылавых нямецкіх часцей, што знаходзіліся ў Перасвятым, распачалі нашы батарэі. Дарэчы, першыя снарады былі выпушчаны па ворагу батарэяй лейтэнанта Уладзіміра Дземянка, ураджэнца Перасвятога.

У 15 гадзін у вёсцы з'явіліся савецкія разведчыкі.

16 лістапада 1943 г. — дзень вызвалення Перасвятога ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У канцы 1943-га быў адноўлены калгас імя Будзённага. У пачатку ж 50-ых гадоў ён увайшоў у аб'яднаны калгас імя Калініна. З 1960 г. Перасвятое ў складзе саўгаса «Х гадоў Кастрычніка». Вёска з'яўляецца цэнтрам аднайменнага сельсавета і саўгаса «Х гадоў Кастрычніка».

ЛЮДЗІ, ЛЮДЗІ — ВЫСОКІЯ ЗОРКІ...

Шмат гераічных падзей адбылося на Рэчыцкай зямлі за яе шматвекавую гісторыю. Сапраўдным подзвігам з'яўляецца і тое, што зроблена яе рупнымі працаўнікамі — земляробамі і жывёлаводамі, рабочымі і інжынерна-тэхнічнымі кадрамі — за пасляваенны перыяд. Яны адрадзілі здратаваныя і разбураныя фашысцкай навалай палі і фермы, узнялі з руінаў цэхі і карпусы рэчыцкіх прадпрыемстваў...

Сярод тых, хто не шкадаваў сябе ў працы ў першыя пасляваенныя гады і на пачатку 1950-ых гадоў, былі нядаўнія мужныя партызаны, а потым першыя сакратары Рэчыцкага раённага камітэта партыі — Віктар Паўлавіч Палавінка і Іван Яўцеевіч Палякоў.

Першымі сакратарамі РК КПБ давялося працаваць таксама Парфену Фёдаравічу Ахраменку, Аляксандру Барысавічу Петухаву, Мікалаю Васільевічу Южыку, Юрыю Конанавічу Серанкову, Андрэю Сямёнавічу Лях аву, Пятру Міхайлавічу Новіку, Анатолю Уладзіміравічу Козелу, Івану Фёдаравічу Тачылкіну. Кожны з іх пакінуў пасля сябе адметны след. Ва ўздыме сельскай гаспадаркі раёна, росце дабрабыту вяскоўцаў, вялікім вытворчым і жыллёвым будаўніцтве 60 — пачатку 90-ых гадоў бачны плён і іхняй паўсядзённай рупнай працы.

Яшчэ ў перадваенны час Рэчыцкі райвыканкам узначальваў Васіль Авяр'янавіч Кастрама. Ён жа стаў і першым старшынёй райвыканкама пасля выгнання фашыстаў з Рэчыцкай зямлі. Быў адзначаны высокімі ўзнагародамі Радзімы. У тым ліку і ордэнам Леніна.

Епіфан Сяргеевіч Буласаў, Гаўрыла Паўлавіч Чэхаў, Адам Васільевіч Кузьмянкоў, Васіль Васільевіч Ярмоленка, Рыгор Дзмітрыевіч Чарняк, Ігар Васільевіч Зіневіч, Якаў Кірылавіч Азёмша, Леанід Ульянавіч Ханяк, Аляксандр Станіслававіч Пятроўскі, Іван Міхайлавіч Бамбіза... Ім таксама давялося займаць нялёгкую пасаду старшыні райвыканкама. Івану ж Фёдаравічу Тачылкіну, цяперашняму старшыні Рэчыцкага райвыканкама, давялося працаваць на розных пасадах. Узначальваў саўгас «Дземяхі», упраўленне сельскай гаспадаркі райвыканкама, працаваў першым сакратаром РК КПБ... І, нарэшце, абранне старшынёй райвыканкама — яскравае пацвярджэнне таго, які высокі аўтарытэт у Івана Фёдаравіча сярод працаўнікоў нашага раёна.

Мікалай Васільевіч Куцко ўзначальваў саўгас «Сцяг Перамогі», пэўны час працаваў у абкаме партыі. Вярнуўся ў Рэчыцкі раён, каб узначаліць упраўленне сельскай гаспадаркі райвыканкама. Быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета РБ 13-га склікання. Зараз Мікалай Васільевіч — старшыня камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па аграрных пытаннях.

Уладзімір Лявонцьевіч Сняжкоў... Працаваў першым сакратаром Рэчыцкага гаркама партыі. Ягоным імем названа адна з вуліц горада.

Доўгі час Рэчыцкі гарвыканкам узначальваў Уладзіслаў Андрэевіч Курэнскі. З ягонай дзейнасцю рэчычане звязваюць шырокі размах у горадзе жыллёвага будаўніцтва, узвядзенне аб'ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння.

Вось ужо некалькі гадоў старшынёй Рэчыцкага гарвыканкама з'яўляецца Мікалай Мікалаевіч Заразака. Ягонае старшынства супала з нялёгкім перыядам у жыцці краіны і грамадства. Але і ва ўмовах парушэння эканамічных сувязей, звужэння, а то і адсутнасці рынкаў збыту, панавання дэфіцыту на сыравіну і г. д. прамысловасць Рэчыцы не толькі выстаяла, але і забяспечыла пэўны рост.

На працягу некалькіх пасляваенных гадоў адной з перадавых гаспадарак не толькі Рэчыцкага раёна, але і Гомельшчыны з'яўляўся калгас імя Сталіна (цяпер імя XXII з'езда КПСС, в. Вышамір). Поспех гаспадаркі ў многім тлумачыўся талентам Фамы Яфімавіча Пешкуна, старшыні калгаса, адзначанага Радзімай ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Кавалерам двух ордэнаў — Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга — з'яўляўся старшыня калгаса «Савецкая Беларусь» Пятро Паўлавіч Шклярэнка. Узначаліўшы гаспадарку ў далёкім 1952 г., ён вывеў калгас у лік перадавых не толькі ў Рэчыцкім раёне, але і ў рэспубліцы.

У 1953 г. старшынёй калгаса імя Кірава быў абраны Сцяпан Яфрэмавіч Драгун. Прыняўшы небагатую гаспадарку, ён знайшоў шляхі па вываду яе ў лік перадавых і заможных. С. Я. Драгун быў адзначаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У 1953 г. старшынёй калгаса імя Варашылава (цяпер — «40 гадоў Кастрычніка», в. Броннае) быў абраны Антон Сяргеевіч Волкаў, які дагэтуль працаваў загадчыкам сельскагаспадарчага аддзела Рэчыцкага РК КПБ. За кароткі перыяд гаспадарка, як кажуць, на ногі стала ўпэўнена. І ў гэтым, безумоўна, быў плён старання і ініцыятыўнасці Антона Сяргеевіча.

З пасады дырэктара Заспенскага крухмальнага завода прыйшоў у калгас «Чырвоны Сцяг», каб узначаліць праўленне гаспадаркі, Мікалай Маркавіч Агуржын. Было гэта ў 1955 г. А неўзабаве пра калгас «Чырвоны Сцяг» пачалі гаварыць як пра адну з лепшых гаспадарак Рэчыцкага раёна. Мікалай Маркавіч узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Ён выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, членам ЦК КПБ.

Уздым калгаса «Камунар» у многім звязаны з плённай працай Рыгора Іванавіча Васільца, кавалера ордэна «Знак Пашаны». Прыемна, што і сёння на чале гаспадаркі здольны і ініцыятыўны кіраўнік — Эдуард Пятровіч Манькоў.

Вялізны ўклад у вытворчы ўздым калгаса імя Дзяржынскага ўнёс Фёдар Андрэевіч Караў, які быў абраны на гэту нялёгкую пасаду ў 1954 г. Многія працаўнікі калгаса за сваю старанную працу былі адзначаны ордэнамі і медалямі. Кавалерам ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга стаў і сам Фёдар Андрэевіч. Разам з тым ён неаднаразова выбіраўся дэпутатам Гомельскага абласнога Савета, членам абласнога абкама КПБ.

Калгасу імя Дзяржынскага пашанцавала і з наступным старшынёй праўлення — Віктарам Антонавічам Пырхам. За той прамежак часу, калі на чале гаспадаркі быў Віктар Антонавіч, калгас стаў заможным і высокарэнтабельным. Былі ўзведзены новыя фермы і комплексы, набыты сотні адзінак сельскагаспадарчай тэхнікі. Цэнтральная ж сядзіба гаспадаркі — вёска Ровенская Слабада — пераўтварылася фактычна ў гарадскі пасёлак. І нездарма В. А. Пырх выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Спаўна раскрыўся арганізатарскі талент Станіслава Цімафеевіча Петачэнкі пасля таго, як яму было даверана ўзначаліць саўгас (затым племзавод) «Ведрыч». Гаспадарка з'яўлялася неаднаразовым пераможцам усесаюзнага і рэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва, была адзначана ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, занесена на рэспубліканскую Дошку гонару. Што да самога С. Ц. Петачэнкі, то ён выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, быў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

На ведрыцкай зямлі выраслі тры Героі Сацыялістычнай Працы — Сцяпан Дзмітрыевіч Фешчанка, Кацярына Апанасаўна Мятлушка, Уладзімір Данілавіч Юрчанка. Звыш 80 працаўнікоў славутай гаспадаркі з'яўляюцца ардэнаносцамі. Сярод іх кіраўнік паляводчага звяна, двойчы кавалер ордэна Леніна Марыя Рыгораўна Рабянок, яе сын механізатар Рыгор Іванавіч Рабянок, даяркі

Валянціна Іванаўна Блізнец, Валянціна Цярэнцьеўна Гусакова, кіраўнік механізаванага звяна Анатоль Маркавіч Дземідзенка і г. д.

40 гадоў таму на пасаду старшыні калгаса «Чырвоная Дуброва» быў абраны Мікалай Мікалаевіч Коваль. Гаспадарка з'яўлялася адной з адсталых у раёне. Старшыні праўлення тут не затрымліваліся, мяняліся ледзь не штогод. Таго, што не здолелі зрабіць папярэднікі, дамогся М. М. Коваль: умацавалася працоўная дысцыпліна, на пасады кіраўнікоў сярэдняга звяна былі вылучаны ініцыятыўныя працаўнікі. І здарылася амаль неверагоднае: гаспадарка імкліва ўвайшла ў лік перадавых. Пасля ўзбуйнення калгаса, які атрымаў назву — імя XXI з'езда КПСС, старшынёй праўлення застаўся Мікалай Мікалаевіч. Мінулі дзесяцігоддзі, але гаспадарка, на чале якой колішні просты механізатар М. М. Коваль, і да сёння адзін з флагманаў сельскагаспадарчай вытворчасці Рэчыцкага раёна. Мікалай Мікалаевіч адзначаны ордэнамі і медалямі, двойчы выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

Дарэчы, у Рэчыцкім раёне нямала старшынь калгасаў, вытворчы стаж якіх вымяраецца дзесяткамі гадоў. Сярод такіх кіраўнікоў старшыня калгаса «50 гадоў Кастрычніка» Рыгор Купрыянавіч Шпакаў.

Зусім нядаўна калгас «Савецкая Беларусь» узначаліў Аляксандр Аляксандравіч Канякін, які дагэтуль шмат гадоў быў намеснікам старшыні. Гаспадарка нібы займела другое дыханне. Старшыня калгаса — сам у паўсядзённай працы і патрабуе самых сур'ёзных адносін да справы ад спецыялістаў гаспадаркі. У выніку таго — калгас, хоць ён таксама адчувае цяжкасці, звязаныя з нялёгкім сённяшнім днём, заняў лідыруючае становішча не толькі ў Рэчыцкім раёне, але і на Гомельшчыне. Нядаўна А. А. Канякіну прысвоена званне заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Беларусі.

...На Рэчыцкай зямлі выраслі, працавалі і працуюць сотні земляробаў і жывёлаводаў, якія з'яўляюцца «залатым фондам» раёна. Гэта: механізатары саўгаса «Рэчыцкі» Іван Валяр'янавіч Багушэвіч, Міхаіл Іванавіч Багдановіч, Аляксандр Іванавіч Хлебаказаў; механізатар калгаса «Чырвоны Сцяг» Уладзімір Канстанцінавіч Кулёк; камбайнер калгаса «Шлях да камунізму» Сцяпан Мікалаевіч Коваль; камбайнер калгаса «Камунар» Віктар Міхайлавіч Грыгарэнка; механізатар саўгаса «Сцяг Перамогі» Іван Іосіфавіч Мацыеўскі; жывёлавод саўгаса «Дзяржхі» Лідзія Іванаўна Курс; даяркі калгаса «XXI з'езд КПСС» Кацярына Юр'еўна Міхалка і Марыя Антонаўна Грыгарэнка; даярка калгаса імя Дзяржынскага Марыя Іванаўна Маджара; цялятніца племзавода «Ведрыч» Валянціна Іванаўна Макарэвіч; даярка калгаса «Савецкая Беларусь» Валянціна Сцяпанаўна Ляшчынская; даярка саўгаса «Сцяг Перамогі» Алена Андрэеўна Заранок; даярка калгаса імя Фрунзе Тамара Сяргееўна Бондар; даярка калгаса імя XXII з'езда КПСС Марыя Аляксееўна Трацякова... А хіба нельга не радавацца працоўнаму подзвігу шафёра райаграпрамтэхнікі Генадзя Георгіевіча Тачыленкі, які на працягу многіх гадоў з'яўляецца нязменным пераможцам раённага спаборніцтва па дастаўцы ў час жніва збожжа з гаспадарак на камбінат хлебапрадуктаў!

...Гордасцю прамысловай Рэчыцы з'яўляецца метызны завод. У мінулым — прадпрыемства усесаюзнага значэння. Прадукцыя завода ішла ў многія краіны свету. Прадпрыемства заносілася на Усесаюзную Дошку гонару, узнагароджвалася пераходным Чырвоным Сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ. Пасля развалу краіны прадпрыемства апынулася ў цяжкім становішчы, але ўрэшце пераадолела нягоды і сёння ўпэўнена нарошчвае вытворчасць, пашырае рынак збыту і г. д. Поспех метызнага завода ў многім залежыць ад арганізатарскага таленту дырэктара Аляксандра Лявонцьевіча Каралькова, які, дарэчы, у пачатку бягучага года атрымаў ганаровае званне Заслужанага работніка прамысловасці Беларусі. Тут, на Рэчыцкім метызным, працавалі і працуюць цэлыя дынастыі — Бабчанкі, Барысавы, Кавaленкі, Васіленкі... Чалавекам з легенды з'яўляецца і Мікалай Пятровіч Радзанаў. Франтавік, заслужаны метызнік, ганаровы грамадзянін Рэчыцы.

Рэчыца — горад нафтавікоў. Можна назваць дзесяткі прозвішчаў людзей, звязаных з пошукам ці здабычай «чорнага золата», распрацоўкай радовішчаў у Заходняй Сібіры, якія вызначыліся як здольныя кіраўнікі ці выдатныя рацыяналізатары. Сярод іх — А. Ф. Бубноў, М. В. Бурдыка, У. Я. Дубчак, У. П. Казлоў, В. А. Кірычэнка, П. Р. Курловіч, С. С. Лапацін, Б. М. Мінееў, В. Л. Панфіленка, М. М. Раменчык, М. М. Самончык, А. Ф. Саўчанка, У. М. Сіманін...

Сярод тых, хто пакінуў у рэчычан добрую памяць, стваральнікі Глыбаўскага на-

роднага музея працоўнай і баявой славы Іван Рыгоравіч Грыгор'еў і Аляксандр Георгіевіч Дубровін. Гэта таксама ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны Іван Ігнатавіч Вырадаў. СПТУ-6, дзе ён працаваў дырэктарам, на працягу многіх гадоў з'яўлялася лепшым прафесійна-тэхнічным вучылішчам рэспублікі. Гонарам Рэчыцы і раёна з'яўляюцца медыкі Міхаіл Фядосавіч Мітраховіч, Іван Іванавіч Рогач, Мікалай Іванавіч Локцік; работнікі народнай асветы Наталля Піліпаўна Гусінцава, Адам Рыгоравіч Галавач...

А якую добрую памяць пакінуў пасля сябе Акім Савельевіч Краўчанка! Хаця пасада ягоная — начальнік Рэчыцкага ГРАУС — патрабавала нярэдка і суровасці, і строгасці. Але ж яны спалучаліся са справядлівасцю і спагадай, бачаннем у чалавеку, нават у злачынцу, не толькі адмоўнага, але і светлага.

...Людзі, людзі — высокія зоркі... Вялікі сэнс у гэтых словах. І няхай не крыўдуюць тыя, каторыя не ўпамянёныя ў гэтым невялікім артыкуле, і якія вартыя добрага, спагаднага слова. Гераічнае і добрае заўсёды застаецца. У нашай агульнай памяці.

Т. І. ЛІТВІНАВА,
старшыня камісіі па напісанні кнігі «ПАМЯЦЬ» г. Рэчыцы і Рэчыцкага раёна

ЗМЕСТ

У полымі вайны 17

І вызвалення дзень прыйшоў (17). Горвальская аперацыя (26). Пісьмо камандавання 37-ай гвардзейскай Чырванасцяжнай Рэчыцкай стралковай дывізіі сакратару Гомельскага абкама КП(б)Б І. П. Кожару з нагоды вызвалення Чырвонай Арміяй г. Гомеля (28). З дакладной запіскі начальніка тылу 1-га Беларускага фронту Анціпенкі ваеннаму савету 1-га Беларускага фронту, ЦК КП(б)Б аб ходзе выканання пастановы 1-га Беларускага фронту № 046 ад 25.02.1944 г. «Аб мерах дапамогі з боку фронту ў аднаўленні народнай гаспадаркі Беларускай рэспублікі» з 1 па 30 красавіка 1944 г. (28). Герой з вёскі Горваль (29). «Выклікаю агонь на сябе!» (30). Мужнасць была бязмежнай (31). «Загадваю: толькі ўперад!» (32). Вытрымаць і перамагчы (33). Ад Валадарска да Прусіі (34). З кагорты мужных (35). Бясстрашны камандзір (36). За паядынак з «тыграмі» (37). Вуліца імя героя (37). Сцяганосец Перамогі (38). Трагедыя сям'і Шпакавых (40). На Рэчыцкім напрамку (43). Першымі пайшлі мы (45). Крок за крокам (45). У тыя памятныя дні (46). Яны ўдзельнічалі ў вызваленні Рэчыцы і раёна (47). Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны (50). Воіны, якія не з'яўляліся нашымі землякамі, але перад вайной ці ў час яе жылі ў Рэчыцы ці раёне і загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны (93). Воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі і пахаваны на тэрыторыі раёна (104). Рэпрэсіраваныя ў 1941 (пасля 22 чэрвеня) — 1950 гг. (199).

У мірнай працы 204

Яшчэ ішла вайна (204). За радком пастаноў (210). З пастановы № 15 Рэчыцкага гарадскога выканаўчага камітэта дэпутатаў працоўных ад 15 снежня 1943 г. (210). З пратакола № 2 пасяджэння выканкама Рэчыцкага райсавета дэпутатаў працоўных ад 14 лютага 1944 г. (210). Час цяжкі, пасляваенны (210). З эканамічнай запіскі па г. Рэчыца (214). З палітыка-эканамічнай характарыстыкі Рэчыцкага раёна на канец 1949 г. (215). З неймавернымі цяжкасцямі (216). Газета паведамляла... (218). Па старонках васілевіцкай раённай газеты «Сацыялістычная праца» за 1945 г. (218). Па старонках рэчыцкай раённай газеты «Зара камуны» за 1948—1949 гг. (219). Па старонках васілевіцкай раённай газеты «Сацыялістычная праца» за 1949 г. (223). За годам — год (224). Іхні лёс — у лёсе Рэчыцы і раёна (231). Палавінка Віктар Паўлавіч (231). Палякоў Іван Яўцеевіч (231). Таварыш сакратар (231). Хлус Парфірый Мацвеевіч (232). Вызначыліся працай (232). Героі Сацыялістычнай Працы (232). Служэнне людзям (234). Са званнем «Заслужаны...» (235). Загінулі ў Афганістане (236). Загінуў у Сірыі (239). Народныя калектывы (239). Азершчынскі народны хор (239). Гучалі песні ў гонар вызваліцеляў (239). Той незабыўны канцэрт... (240). Рэчыцкі народны ансамбль «Дняпро» (241). Рэчыцкі народны ансамбль песні і танца «Рэчыца» (241). Рэчыцкі народны аркестр народных інструментаў (241). Рэчыцкі народны духавы аркестр (243). Рэчыцкі народны тэатр (243). Рэчыцкі народны хор ветэранаў вайны і працы (244). Землякі — дзеячы навукі і культуры (244). Агуновіч Эдуард Канстанцінавіч (244). Асіпенка Віктар Рыгоравіч (245). Атрошчанка Алег Аляксандравіч (245). Бейлькін Хайм Юдкавіч (245). Бірукоў Марат Паўлавіч (245). Блішч Міхаіл Андрэевіч (246). Бяркоўскі Барыс Міхайлавіч (246). Верамейчык Уладзімір Міхайлавіч (246). Ермачэнкаў Генадзь Аляксандравіч (246). Заранок Таццяна Піліпаўна (247). Зубрыцкі Іван Васільевіч (247). Капелян Яфім Захаравіч (247). Капшай Уладзімір Міхайлавіч (247). Коўтун Валянціна Міхайлаўна (247). Красоўскі Мікалай Піліпавіч (248). Лазарэвіч Рыгор Дзяменцьевіч (248). Лапата Георгій Паўлавіч (248). Лапаціна Таццяна Карнееўна (248). Лаўшук Сцяпан Сцяпанавіч (248). Ліпскі Уладзімір Сцяпанавіч (249). Ліўшыц Мордух Насонавіч (249). Навуменка Іван Якаўлевіч (249). Панамарэнка Леанід Фёдаравіч (250). Паўлянок Барыс Уладзіміравіч (250). Пінчук Аркадзь Фёдаравіч (250). Смаляк Віктар Мікалаевіч (251). Сыс Анатоль Ціханавіч (251). Тулупава Нэлі Іванаўна (251). Ярац Віктар Уладзіміравіч (251). Яшкін Валерый Канстанцінавіч (251). Выяўленчае мастацтва (252). Шырокая плынь (252). Аб Аляксандры Ісачове (253). Мастак без абедзвюх рук (255). Яны выдалі кнігі (256). Вішняк Пётр Сцяпанавіч (256). Караленка Анатоль Захаравіч (256). Рабянок Пятро Піліпавіч (256). Рудзішкін Міхаіл Мікітавіч (256). Рэпіч Фёдар Дзянісавіч (257). Стрыжак Віктар Іванавіч (257). Тулупаў Іван Савельевіч (257). Спартыўная гордасць Рэчыцы (257). Чорнае крыло Чарнобыля (257). Жыве ў душы трывога (258). Становішча не радуе (259). Даныя радыеактыўнага забруджвання населе-

ных пунктаў Рэчыцкага раёна (260). Шануем гісторыю (264). Рэчыцкі краязнаўчы музей (264). Ровенска-Слабодскі гісторыка-мемарыяльны музей «Памяць» (264). Населеныя пункты, якія не існуюць (264). Населеныя пункты Рэчыцкага раёна (269).

Матэрыяльная і духоўная спадчына Рэчыцкай зямлі 270

Этнаграфія (270). З навукова-творчай спадчыны М. В. Доўнар-Запольскага (274). Легенды і паданні (278). Жарты, анекдоты, гумарэскі (280). Народны тэатр (281). Замовы (283). Жыццё і навуковая спадчына Часлава Пяткевіча (285). Прыказкі і прымаўкі (287). Выслоўі (290).

З гісторыі населеных пунктаў 291

Азершчына... бо сярод азярын (в. Азершчына) (291). З вытокаў легенды (в. Капань) (292). На старажытнай зямлі (в. Чорнае) (293). На шляху княгіні Вольгі... (дакастрычніцкі перыяд г. Васілевічы) (294). Племзавод «Ведрыч» (вёскі Ведрыч і Рассвет) (296). Зашчоб'е... бо за Шчобам? (в. Зашчоб'е) (298). Гарадок, якога няма (300). Адкуль ёсць і пайшла... (в. Васількоў) (300). Адпяванне жывых (аповесць пра в. Шоўкавічы). Факты, дакументы, успаміны (305). Паміж пустак, балот... (з гісторыі населеных пунктаў Караваціцкага сельсавета) (309). Пасяліліся ля крыніц (в. Крынкі) (313). Будаваліся, каб жыць (в. Ліскі) (317). Гэта Чырвоная вёска... (в. Лясное) (318). Шукалі лепшай долі (в. Новы Барсук) (320). Шляхам сталення (в. Перасвятое) (321).

Людзі, людзі — высокія зоркі... 322

ДАПАМАГАЛІ Ў ЗБОРЫ МАТЭРЫЯЛАЎ ДЛЯ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

М. І. Абібак, В. Р. Асіпенка, Н. В. Астапенка, П. М. Астапенка, М. П. Атаманчук, В. Н. Бабовіч, П. М. Батура, Я. Л. Безмен, Х. Ю. Бейлькін, К. А. Біруковіч, У. Д. Бурачонак, М. Р. Бур'як, Е. П. Быстранкова, А. М. Быстранкоў, Н. Д. Бысянкова, Л. І. Вашчыла, А. Д. Гузаў, Л. А. Дворнік, Н. С. Дворнік, М. С. Дземяновіч, І. У. Дзенісенка, І. А. Забіран, Л. І. Забіран, Э. П. Залескі, А. І. Кавалёў, Л. П. Канавалава, А. В. Карбаценка, А. С. Коцур, Т. М. Кошалева, І. Я. Краўцоў, М. І. Кузьменка, А. В. Кузьмянкоў, М. К. Кулага, М. З. Лазічная, Т. П. Маеўская, Д. С. Малчанава, І. С. Мануйлікава, С. У. Масяйчук, Л. І. Найдзенка, А. А. Нежывёнак, Л. А. Фралова, І. А. Процкін, А. Ф. Пяхота, Р. А. Рабцава, А. П. Рабянок, В. І. Рабянок, М. С. Рабянок, М. М. Рудзішкін, Л. Р. Рудзішкіна, А. В. Саламаха, У. В. Сідарэнка. Я. Р. Склімянок, Л. В. Сыпава, В. А. Сяргеева, І. В. Шастапалаў, І. А. Шафір, М. Ф. Шпадарук, В. А. Ярамчук, П. М. Ярац, А. А. Яцко.

Аказвалі фінансавую дапамогу ў падрыхтоўцы да выдання гісторыка-дакументальнай хронікі:

Рэчыцкі гарвыканкам, Рэчыцкі райвыканкам, рэдакцыя газеты «Дняпровец» (галоўны рэдактар А. В. Чурылаў), доследна-прамысловы гідролізны завод (дырэктар А. М. Турок).

Каляровыя здымкі: Ю. В. Міхалеўскага і А. С. Цішчанкі

Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Рэчыц. раёна.
П15 Кн. 2. / Укл. П. П. Рабянок. — Мн.: Беларусь, 1998. — 327 с.: іл.
ISBN 985-01-0162-8.

Кніга — гісторыка-дакументальная хроніка, у якой на падставе архіўных матэрыялаў музеяў, замалёвак, артыкулаў, успамінаў непасрэдных удзельнікаў падзей расказваецца аб гісторыі Рэчыцкага раёна ад вызвалення ў 1943 годзе да нашых дзён. Прыводзяцца спісы загінуўшых у другой сусветнай вайне на тэрыторыі раёна.

Для масавага чытача.

УДК 947.62
ББК 63.3(4Беи)

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Рэчыцкага раёна.
Кніга 2.

Мастацкія рэдактары
В. Р. Мішчанка, А. П. Макаўцоў
Тэхнічны рэдактар
С. Л. Печанёва
Карэктары
Р. П. Іваненка, Н. І. Лешчанка,
Л. Б. Шынкевіч

Здадзена ў набор 01.10.97. Падпісана да друку 08.05.98. Фармат $70\times100^{1}/_{16}$. Папера Афс. № 1. Гарнітура Кудрашоўская. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 26,65. Ум. фарб.-адб. 35,1. Ул.-выд. арк. 42,3. Тыраж 5000 экз. Зак. 2207.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 2 ад 31.12.97. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат ВПП імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.